Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
Кафедра беларускага мовазнаўства

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_______________________________
"____"_______________201__г.

БГПУ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС

вучэбнай дысцыпліны "Методыка выкладання беларускай мовы"
для спецыяльнасцей:

1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура
1 – 02 03 03–02 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (польская, літоўская)
1 – 02 03 03–03 Беларуская мова і літаратура. Сусветная і айчынная культура
1 – 02 03 03–05 Беларуская мова і літаратура. Журналістыка
1 – 02 03 07–01 Замежная мова (англійская, нямецкая). Беларуская мова і літаратура

Узгоднена: дэкан факультэта_________________________________________

Разгледжана і рэкамендавана да зацвярджэння на пасяджэнні кафедры пратакол №7 ад "16" снежня 2010 г.

Мінск, 2011

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне вышэйшых навучальных устаноў
Рэспублікі Беларусь па педагагічнай адукацыі

ЗАЦВЕРДЖВАЮ
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
______________________ А. І. Жук
14. 04. 2010 г.
Рэгістрацыйны № ТД-А.273/тып.

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Тыпавая вучэбная праграма
для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасцях:
1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура; 1 -02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Дадатковая спецыяльнасць; 1 -02 01 02 Гісторыя. Дадатковая спецыяльнасць (1-02 01 02 -02 Гісторыя. Беларуская мова і літаратура); 1 -02 03 04 Руская мова і літаратура. Дадатковая спецыяльнасць (1-02 03 04 -01 Руская мова і літаратура. Беларуская мова і літаратура); 1 -02 03 05 Беларуская мова і літаратура. Журналістыка; 1 -02 04 05 Геаграфія. Дадатковая спецыяльнасць (1 -02 04 05 -02 Геаграфія. Беларуская мова і літаратура); 1-02 03 07 Замежная мова (з указаннем мовы). Дадатковая спецыяльнасць (1-02 03 07 -01 Замежная мова (з указаннем мовы). Беларуская мова і літаратура)

**УЗГОДНЕНА**
Старшыня вучэбна-метадычнага аб’яднання вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па педагагічнай адукацыі
_________________ П. Дз. Кухарчык
__________________________________

**УЗГОДНЕНА**
Рэктар Дзяржаўнай установы адукацыі “Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы”
___________________ М. І. Дзямчук
__________________________________

Начальнік Упраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі
___________________ Ю. І. Міксюк
__________________________________

Эсперт-нормакантралёр
________________ _______________
________________________________

Мінск 2010

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**СКЛАДАЛЬНІКІ**:

У. П. Саўко, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

М. Г. Яленскі, намеснік дырэктара навукова-метадычнай установы “Нацыянальны інстытут адукацыі” Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, доктар педагагічных навук, прафесар

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

кафедра беларускага мовазнаўства ўстановы адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава”;

Ф. М. Літвінка, прафесар кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар педагагічных навук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**

кафедрай беларускага мовазнаўства установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка” (пратакол № 3 ад 21 кастрычніка 2008 г.);

навукова-метадычным саветам ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка” (пратакол № 2 ад 10 снежня 2008 г.);

навукова-метадычным саветам па гуманітарнай адукацыі Вучэбна-метадычнага аб’яднання вышэйшых навучальных установаў Рэспублікі Беларусь па педагагічнай адукацыі (пратакол № 5 ад 14 снежня 2008 г.)

Адказны за выпуск: П. А. Міхайлаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

**1. Актуальнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны ў вышэйшых навучальных установах і яе роля ў прафесійнай падрыхтоўцы выпускніка ВНУ.**

Моўная адукацыя ў сучаснай школе накіравана на выхаванне высокай маўленчай культуры вучняў, фарміраванне ў іх камунікатыўных уменняў і навыкаў, што забяспечваюць эфектыўнасць моўных зносін у розных сферах жыцця і дзейнасці чалавека. Праца настаўніка-славесніка накіроўваецца на забеспячэнне практычнага авалодання школьнікамі мовай як найважнейшым сродкам зносін, пазнання рэчаіснасці, сацыялізацыі асобы.

Дасягненне пастаўленых мэт у значнай ступені залежыць ад узроўню прафесійна-метадычнай кампетэнцыі настаўнікаў, што і абумоўлівае актуальнасць дысцыпліны “Методыка выкладання беларускай мовы”. Ад якасці прафесійна-метадычнай падрыхтоўкі студэнтаў па методыцы выкладання беларускай мовы залежыць ступень засваення імі тэорыі навучання школьнікаў беларускай мове і ўзровень развіцця уменняў вучыць дзяцей эфектыўна карыстацца беларускай мовай ў розных сферах яе прымянення.

У працэсе выкладання дысцпліны “Методыка выкладання беларускай мовы” ажыццяўляецца фарміраванне і развіццё сацыяльна-прафесійнай кампетэнцыі студэнтаў, якая дазваляе спалучаць акадэмічныя, прафесійныя і сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі для вырашэння задач у сферы прафесійнай і сацыяльнай дзейнасці.

Вывучэнне студэнтамі методыкі выкладання беларускай мовы садзейнічае фарміраванню ў іх наступных кампетэнцый:

1) акадэмічных:

– валоданне базавымі навукова-тэарэтычнымі ведамі, уменнем прымяняць іх для вырашэння тэарэтычных і практычных задач;

– валоданне метадамі сістэмнага і параўнальнага аналізу;

– валоданне даследчымі навыкамі, уменнямі працаваць самастойна, прапаноўваць новыя ідэі;

– валоданне уменнем улічваць міждысцыплінарны падыход пры вырашэнні педагагічных праблем;

– валоданне навыкамі выкарыстання тэхнічных сродкаў, у тым ліку камп’ютара;

– валоданне лінгвістычнымі навыкамі (вусная і пісьмовая камунікацыя);

– уменне вучыцца, пастаянна павышаць уласную кваліфікацыю;

2) прафесійных:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– арганізацыя працы калектыва для дасягнення пастаўленых мэт, кантроль за вучэбнай і працоўнай дысцыплінай;

– падрыхтоўка неабходнай дакументацыі па ўстаноўленых формах;

– узаемадзеянне са спецыялістамі розных профіляў;

– аналіз і ацэнка сабраных дадзеных, распрацоўка матэрыялаў, неабходных для прафесійнай дзейнасці;

– падрыхтоўка дакладаў, матэрыялаў да прэзентацый;

– карыстанне глабальнымі інфармацыйнымі рэсурсамі, валоданне сучаснымі сродкамі тэлекамунікацый;

3) сацыяльна-асобасных:

– валоданне якасцямі грамадзянскасці, патрыятызму;

– здольнасць да сацыяльнага ўзаемадзеяння, міжасобасных камунікацый;

– уменне працаваць у камандзе;

– валоданне навыкамі крытычнага мыслення;

– валоданне навыкамі захавання здароўя, самаўдасканалення;

– сфарміраванасць адказнасці, арганізаванасці, мэтанакіраванасці, самастойнасці і іншых асобасных якасцей.

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

**2. Мэты і задачы вучэбнай дысцыпліны “Методыка выкладання беларускай мовы”.**

**Мэта** дысцыпліны – тэарэтычная і практычная падрыхтоўка студэнтаў да самастойнай прафесійна-педагагічнай дзейнасці ў якасці настаўніка беларускай мовы ў навучальных установах рознага тыпу.

**Задачы** дысцыпліны:

– даць студэнтам фундаментальныя навукова-метадычныя веды аб працэсе навучання беларускай мове;

– азнаёміць студэнтаў з мэтай, задачамі, прынцыпамі, метадамі, сродкамі, формамі арганізацыі вучэбнай дзейнасці вучняў, са зместам і структурай школьнага курса беларускай мовы, з сучаснымі тэхналогіямі навучання прадмету;

– сфарміраваць у студэнтаў неабходныя прафесійна-метадычныя ўменні і навыкі, падрыхтаваць іх да выканання функцый настаўніка беларускай мовы;

– развіць у студэнтаў прафесійныя якасці, неабходныя сучаснаму настаўніку, метадычнае мысленне, творчы падыход да педагагічнай дзейнасці і інш.

**3. Агульныя патрабаванні да ўзроўню засваення зместу вучэбнай дысцыпліны “Методыка выкладання беларускай мовы”.**

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны **ведаць**:

– прадмет, задачы, фундаментальныя паняцці і катэгорыі методыкі выкладання беларускай мовы;

– мэты і задачы навучання беларускай мове ў сучасных агульнаадукацыйных установах, змест і структуру школьнага курса беларускай мовы;

– прынцыпы, сродкі, метады, арганізацыйныя формы навучання беларускай мове;

– змест, задачы, прынцыпы, метады і прыёмы вывучэння раздзелаў школьнага курса беларускай мовы;

– мэты і змест працы па развіцці вуснага і пісьмовага маўлення вучняў;

– нормы ацэнкі вучэбных дасягненняў школьнікаў па беларускай мове, віды, формы, метады кантролю.

У працэсе вывучэння дысцыпліны ў студэнтаў фарміруюцца наступныя **ўменні**:

– планаваць вучэбны працэс па беларускай мове; дакладна вызначаць мэты ўрока, яго тып і структуру;

– адбіраць змест вучэбнага матэрыялу (вызначаць яго аб’ём, сістэму практыкаванняў і заданняў і інш.);

– абгрунтавана выбіраць найбольш эфектыўныя і рацыянальныя сродкі, метады і прыёмы навучання беларускай мове;

– распрацоўваць планы-канспекты ўрокаў беларускай мовы розных тыпаў, ствараць неабходны наглядны і раздатачны матэрыял;

– абгрунтавана выкарыстоўваць формы і метады кантролю за вучэбнай дзейнасцю школьнікаў, правільна ацэньваць вынікі вучэбных дасягненняў вучняў;

– аналізаваць ўрокі беларускай мовы з улікам сучасных патрабаванняў да навучальнага працэсу.

**4. Структура зместу вучэбнай дысцыпліны.**

Праграма дысцыпліны “Методыка выкладання беларускай мовы” складаецца з 5 раздзелаў:

1. Агульныя пытанні методыкі выкладання беларускай мовы.
2. Методыка вывучэння раздзелаў школьнага курса беларускай мовы.
3. Методыка развіцця маўлення вучняў.
4. Паглыбленае вывучэнне беларускай мовы.
5. Метадычная праца настаўнікаў беларускай мовы.

У першым раздзеле разглядаюцца такія тэмы, як “Методыка беларускай мовы як навука”, “Беларуская мова як вучэбны прадмет у сучаснай школе”, вывучаюцца прынцыпы, сродкі, метады і прыёмы навучання беларускай мове, тыпы і структура ўрокаў і інш.

Другі раздзел прысвечаны методыцы вывучэння фанетыкі, лексікі, словаўтварэння, граматыкі, арфаграфіі, пунктуацыі, стылістыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У трэцім раздзеле разглядаюцца асноўныя напрамкі развіцця маўлення школьнікаў: узбагачэнне слоўнікавага запасу і развіццё граматычнага ладу маўлення вучняў, фарміраванне культуры маўлення, развіццё звязнага маўлення.

Агульная колькасць гадзін па спецыяльнасці 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура – 196, з іх аўдыторных – 94 (лекцыі – 54 гадзіны, практычныя заняткі – 26 гадзін, лабараторныя – 14 гадзін).

Агульная колькасць гадзін па спецыяльнасцях 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Дадатковая спецыяльнасць, 1-02 03 05 Беларуская мова і літаратура. Журналістыка – 196, з іх аўдыторных – 94 (лекцыі – 48 гадзін, практычныя заняткі – 26 гадзін, лабараторныя – 20 гадзін).

Агульная колькасць гадзін па спецыяльнасці 1 -02 01 02 Гісторыя. Дадатковая спецыяльнасць (1-02 01 02 -02 Гісторыя. Беларуская мова і літаратура) – 142, з іх аўдыторных – 64 (лекцыі – 30 гадзін, семінарскія заняткі – 34 гадзіны).

Агульная колькасць гадзін па спецыяльнасці 1 -02 03 04 Руская мова і літаратура. Дадатковая спецыяльнасць (1-02 03 04 -01 Руская мова і літаратура. Беларуская мова і літаратура) – 120, з іх аўдыторных – 64 (лекцыі – 34 гадзіны, семінарскія заняткі – 30 гадзін).

Агульная колькасць гадзін па спецыяльнасці 1 -02 04 05 Геаграфія. Дадатковая спецыяльнасць (1 -02 04 05 -02 Геаграфія. Беларуская мова і літаратура) 152, з іх аўдыторных – 72 (лекцыі – 38 гадзін, семінарскія заняткі – 34 гадзіны).

Агульная колькасць гадзін па спецыяльнасці 1-02 03 07 Замежная мова (з указаннем мовы). Дадатковая спецыяльнасць (1-02 03 07 -01 Замежная мова (з указаннем мовы). Беларуская мова і літаратура) – 80, з іх аўдыторных – 54 (лекцыі – 24 гадзіны, практычныя заняткі – 10 гадзін, семінарскія заняткі – 20 гадзін).

**5. Метады і тэхналогіі навучання, якія рэкамендуецца выкарыстоўваць пры выкладанні дысцыпліны.**

Для развіцця асобы студэнта, фарміравання яго прафесійнай кампетэнцыі ў працэсе навучання методыцы выкладання беларускай мовы можна выкарыстоўваць, акрамя традыцыйных метадаў:

– тэхналогію праблемнага навучання, якая мае на мэце стварэнне на занятках праблемных сітуацый і актыўную самастойную дзейнасць студэнтаў па іх вырашэнні, у выніку чаго адбываецца фарміраванне прафесійна-метадычных уменняў, развіццё педагагічнага мыслення, творчых здольнасцей;

– праектную тэхналогію, якая ўяўляе сабой самастойную доўгатэрміновую індывідуальную ці калектыўную працу па пэўнай тэме і ўключае пошук, адбор і сістэматызацыю матэрыялу, дае магчымасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

развіваць у студэнтаў самастойнасць у планаванні, арганізацыі і кантролі сваёй вучэбнай дзейнасці;

– ігравыя тэхналогіі, якія рэалізуюцца з дапамогай дзелавых гульняў розных відаў і дазваляюць зымітаваць правядзенне пэўнага тыпу ўрока ці яго структурнай часткі, адпрацаваць выкананне канкрэтных педагагічных дзеянняў і інш.;

– камунікатыўныя тэхналогіі (вучэбныя дыскусіі, дэбаты, дыспуты і інш.), заснаваныя на аналізе розных меркаванняў і пазіцый, што дазваляе развіваць камунікатыўныя здольнасці студэнтаў, фарміраваць уменні абгрунтоўваць свой пункт погляду і г. д.;

– камп’ютарныя тэхналогіі, заснаваныя на выкарыстанні спецыяльных праграм, што дазваляе інтэнсіфікаваць вучэбна-пазнавальную дзейнасць студэнтаў, больш эфэктыўна арганізаваць іх самастойную працу, удасканальваць кантрольна-ацэначную дзейнасць выкладчыка і інш.

Для арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці рэкамендуецца выкарыстоўваць традыцыйныя, а таксама рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбных і даследчых дасягненняў студэнтаў.

**6. Арганізацыя самастойнай працы студэнтаў.**

Самастойная праца студэнтаў арганізуецца ў адпаведнасці з Палажэннямі і метадычнымі рэкамендацыямі Міністэрства адукацыі, вучэбна-метадычных аб’яднанняў і саветаў вышэйшых навучальных устаноў.

**7. Дыягностыка кампетэнцый студэнтаў.**

У адпаведнасці з Адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі першай ступені па цыкле сацыяльна-гуманітарных дысцыплін і стандартамі па спецыяльнасці дыягностыка дасягненняў (кампетэнцый) студэнта праводзіцца ў наступнай паслядоўнасці:

– вызначэнне аб’екта дыягностыкі;

– выяўленне факта вучэбных дасягненняў студэнта з дапамогай розных сродкаў дыягностыкі, у тым ліку і крытэрыяльна-арыентаваных тэстаў;

– вымярэнне ступені адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта патрабаванням адукацыйнага стандарта;

– ацэньванне вынікаў вучэбных дасягненняў студэнта.

Ацэнка вучэбных дасягненняў студэнтаў па методыцы выкладання беларускай мовы праводзіцца па дзесяцібальнай шкале. Для ацэнкі выкарыстоўваюцца крытэрыі, зацверджаныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН
## для спецыяльнасці 1– 02 03 01 Беларуская мова і літаратура

| № раздзелаў, тэм | Назвы раздзелаў і тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Усяго аўдыторных | Лекцыі | Практычныя заняткі | Лабараторныя заняткі |
| **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** |
| 1. | **Агульныя пытанні методыкі выкладання беларускай мовы** | **26** | **18** | **8** | |
| 1.1. | Методыка выкладання беларускай мовы як навука | 3 | 3 | | |
| 1.2. | Беларуская мова як вучэбны прадмет у сучаснай школе | 2 | 1 | 1 | |
| 1.3. | Прынцыпы навучання беларускай мове | 2 | 2 | | |
| 1.4. | Сродкі навучання беларускай мове | 1 | | 1 | |
| 1.5. | Метады і прыёмы навучання беларускай мове | 6 | 4 | 2 | |
| 1.6. | Сучасны ўрок беларускай мовы: тыпы і структура | 8 | 6 | 2 | |
| 1.7. | Кантрольна-ацэначная дзейнасць настаўніка на ўроках беларускай мовы | 4 | 2 | 2 | |

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 2. | **Методыка вывучэння раздзелаў школьнага курса беларускай мовы** | **46** | **22** | **14** | **10** |
| 2.1. | Методыка вывучэння фанетыкі | 6 | 2 | 2 | 2 |
| 2.2. | Методыка вывучэння лексікі і фразеалогіі | 4 | 2 | 2 | |
| 2.3. | Методыка вывучэння марфемнай будовы слова, словаўтварэння | 4 | 2 | 2 | |
| 2.4. | Агульныя пытанні выкладання граматыкі | 1 | 1 | | |
| 2.5. | Методыка вывучэння марфалогіі | 7 | 3 | 2 | 2 |
| 2.6. | Методыка вывучэння сінтаксісу | 7 | 3 | 2 | 2 |
| 2.7. | Методыка навучання арфаграфіі | 10 | 6 | 2 | 2 |
| 2.8. | Методыка навучання пунктуацыі | 7 | 3 | 2 | 2 |
| 3. | **Методыка развіцця маўлення вучняў** | **19** | **11** | **4** | **4** |
| 3.1. | Развіццё маўлення як адна з асноўных задач навучання беларускай мове | 1 | 1 | | |
| 3.2 | Узбагачэнне слоўнікавага запасу і развіццё граматычнага ладу маўлення вучняў | 1 | 1 | | |

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| . | | | | | |
| 3.3. | Фарміраванне культуры маўлення вучняў | 1 | 1 | | |
| 3.4. | Развіццё звязнага маўлення вучняў | 16 | 8 | 4 | 4 |
| 4. | **Паглыбленае вывучэнне беларускай мовы** | **2** | **2** | | |
| 5. | **Метадычная праца настаўнікаў беларускай мовы** | **1** | **1** | | |
| | **Усяго** | **94** | **54** | **26** | **14** |

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН
### для спецыяльнасцей
### 1– 02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Дадатковая спецыяльнасць,
### 1– 02 03 05 Беларуская мова і літаратура. Журналістыка

| № раздзелаў, тэм | Назвы раздзелаў і тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Усяго аўдыторных | Лекцыі | Практычныя заняткі | Лабараторныя заняткі |
| **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** |
| 1. | **Агульныя пытанні методыкі выкладання беларускай мовы** | **28** | **16** | **8** | **4** |
| 1.1. | Методыка выкладання беларускай мовы як навука | 1 | 1 | | |
| 1.2. | Беларуская мова як вучэбны прадмет у сучаснай школе | 2 | 1 | 1 | |
| 1 | Прынцыпы навучання беларускай мове | 2 | 2 | | |

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| .3. | | | | | |
| 1.4. | Сродкі  навучання беларускай мове | 1 | | 1 | |
| 1.5. | Метады і прыёмы навучання беларускай мове | 6 | 4 | 2 | |
| 1.6. | Сучасны ўрок беларускай мовы: тыпы і структура | 8 | 6 | 2 | |
| 1.7. | Кантрольна-ацэначная дзейнасць настаўніка на ўроках беларускай мовы | 8 | 2 | 2 | 4 |
| 2. | **Методыка вывучэння раздзелаў школьнага курса беларускай мовы** | **46** | **20** | **14** | **12** |
| 2.1. | Методыка вывучэння фанетыкі | 6 | 2 | 2 | 2 |
| 2.2. | Методыка вывучэння лексікі і фразеалогіі | 4 | 2 | 2 | |
| 2.3. | Методыка вывучэння марфемнай будовы слова, словаўтварэння | 4 | 2 | 2 | |
| 2.4. | Агульныя пытанні выкладання граматыкі | 1 | 1 | | |
| 2.5. | Методыка вывучэння марфалогіі | 6 | 2 | 2 | 2 |
| 2. | Методыка вывучэння сінтаксісу | 6 | 2 | 2 | 2 |

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 6. | | | | | |
| 2.7. | Методыка навучання арфаграфіі | 11 | 6 | 2 | 3 |
| 2.8. | Методыка навучання пунктуацыі | 8 | 3 | 2 | 3 |
| **3.** | **Методыка развіцця маўлення вучняў** | **17** | **9** | **4** | **4** |
| 3.1. | Развіццё маўлення як адна з асноўных задач навучання беларускай мове | 1 | 1 | | |
| 3.2. | Узбагачэнне слоўнікавага запасу і развіццё граматычнага ладу маўлення вучняў | 1 | 1 | | |
| 3.3. | Фарміраванне культуры маўлення вучняў | 1 | 1 | | |
| 3.4. | Развіццё звязнага маўлення вучняў | 14 | 6 | 4 | 4 |
| **4.** | **Паглыбленае вывучэнне беларускай мовы** | **2** | **2** | | |
| **5.** | **Метадычная праца настаўнікаў беларускай мовы** | **1** | **1** | | |
| | **Усяго** | **94** | **48** | **26** | **20** |

**ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН**
**для спецыяльнасці 1-02 03 07 Замежная мова (з указаннем мовы). Дадатковая спецыяльнасць (1-02 03 07 -01 Замежная мова (з указаннем мовы). Беларуская мова і літаратура)**

| **№ раз** | | **Колькасць аўдыторных гадзін** |
|---|---|---|

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

| | Назвы раздзелаў і тэм | Усяго аўдыторных | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі |
|---|---|---|---|---|---|
| **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** |
| 1. | **Агульныя пытанні методыкі выкладання беларускай мовы** | **20** | **10** | **4** | **6** |
| 1.1. | Методыка выкладання беларускай мовы як навука | 1 | 1 | | |
| 1.2. | Беларуская мова як вучэбны прадмет у сучаснай школе | 2 | 1 | 1 | |
| 1.3. | Прынцыпы навучання беларускай мове | 1 | 1 | | |
| 1.4. | Сродкі навучання беларускай мове | 1 | | 1 | |
| 1.5. | Метады і прыёмы навучання беларускай мове | 4 | 2 | | 2 |
| 1.6. | Сучасны ўрок беларускай мовы: тыпы і структура | 6 | 4 | | 2 |
| 1.7. | Кантрольна-ацэначная дзейнасць настаўніка на ўроках беларускай мовы | 5 | 1 | 2 | 2 |
| 2. | **Методыка вывучэння раздзелаў школьнага курса беларускай мовы** | **24** | **10** | **4** | **10** |
| 2.1. | Методыка вывучэння фанетыкі, лексікі і фразеалогіі, марфемнай будовы слова, словаўтварэння, марфалогіі, сінтаксісу | 10 | 4 | 2 | 4 |

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| –2.6 | | | | | |
| 2.7. | Методыка навучання арфаграфіі | 10 | 4 | 2 | 4 |
| 2.8. | Методыка навучання пунктуацыі | 4 | 2 | | 2 |
| **3.** | **Методыка развіцця маўлення вучняў** | **10** | **4** | **2** | **4** |
| 3.4. | Развіццё звязнага маўлення вучняў | 10 | 4 | 2 | 4 |
| | **Усяго** | **54** | **24** | **10** | **20** |

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

**ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН**
**для спецыяльнасці 1 -02 03 04 Руская мова і літаратура. Дадатковая спецыяльнасць (1-02 03 04 -01 Руская мова і літаратура. Беларуская мова і літаратура)**

| **№ раз** | | **Колькасць аўдыторных гадзін** |
|---|---|---|

| | Назвы раздзелаў і тэм | Усяго аўдыторных | Лекцыі | Семінарскія заняткі |
|---|---|---|---|---|
| **1** | **2** | **3** | **4** | **5** |
| 1. | **Агульныя пытанні методыкі выкладання беларускай мовы** | **28** | **16** | **12** |
| 1.1. | Методыка выкладання беларускай мовы як навука | 1 | 1 | |
| 1.2. | Беларуская мова як вучэбны прадмет у сучаснай школе | 2 | 1 | 1 |
| 1.3. | Прынцыпы навучання беларускай мове | 2 | 2 | |
| 1.4. | Сродкі  навучання беларускай мове | 1 | | 1 |
| 1.5. | Метады і прыёмы навучання беларускай мове | 6 | 4 | 2 |
| 1.6. | Сучасны ўрок беларускай мовы: тыпы і структура | 10 | 6 | 4 |
| 1.7. | Кантрольна-ацэначная дзейнасць настаўніка на ўроках беларускай мовы | 6 | 2 | 4 |
| 2. | **Методыка вывучэння раздзелаў школьнага курса беларускай мовы** | **26** | **12** | **14** |
| 2.1. | Методыка вывучэння фанетыкі, лексікі і фразеалогіі, марфемнай будовы слова, словаўтварэння, марфалогіі, сінтаксісу | 10 | 4 | 6 |

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| –2.6. | | | | |
| 2.7. | Методыка навучання арфаграфіі | 10 | 6 | 4 |
| 2.8. | Методыка навучання пунктуацыі | 6 | 2 | 4 |
| 3. | **Методыка развіцця маўлення вучняў** | **10** | **6** | **4** |
| 3.4. | Развіццё звязнага маўлення вучняў | 10 | 6 | 4 |
| | **Усяго** | **64** | **34** | **30** |

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

**ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН**
**для спецыяльнасці 1 -02 01 02 Гісторыя. Дадатковая спецыяльнасць**
**(1-02 01 02 -02 Гісторыя. Беларуская мова і літаратура)**

| № раз | | Колькасць аўдыторных гадзін |
|---|---|---|

| | Назвы раздзелаў і тэм | Усяго аўдыторных | Лекцыі | Семінарскія заняткі |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1. | **Агульныя пытанні методыкі выкладання беларускай мовы** | **28** | **14** | **14** |
| 1.1. | Методыка выкладання беларускай мовы як навука | 1 | 1 | |
| 1.2. | Беларуская мова як вучэбны прадмет у сучаснай школе | 2 | 1 | 1 |
| 1.3. | Прынцыпы навучання беларускай мове | 2 | 2 | |
| 1.4. | Сродкі навучання беларускай мове | 1 | | 1 |
| 1.5. | Метады і прыёмы навучання беларускай мове | 6 | 4 | 2 |
| 1.6. | Сучасны ўрок беларускай мовы: тыпы і структура | 10 | 4 | 6 |
| 1.7. | Кантрольна-ацэначная дзейнасць настаўніка на ўроках беларускай мовы | 6 | 2 | 4 |
| 2. | **Методыка вывучэння раздзелаў школьнага курса беларускай мовы** | **26** | **10** | **16** |
| 2.1. | Методыка вывучэння фанетыкі, лексікі і фразеалогіі, марфемнай будовы слова, словаўтварэння, марфалогіі, сінтаксісу | 10 | 4 | 6 |

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 2.6. | | | | |
| 2.7. | Методыка навучання арфаграфіі | 10 | 4 | 6 |
| 2.8. | Методыка навучання пунктуацыі | 6 | 2 | 4 |
| **3.** | **Методыка развіцця маўлення вучняў** | **10** | **6** | **4** |
| 3.4. | Развіццё звязнага маўлення вучняў | 10 | 6 | 4 |
| | **Усяго** | **64** | **30** | **34** |

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

**ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН**
**для спецыяльнасці 1 -02 04 05 Геаграфія. Дадатковая спецыяльнасць (1 -02 04 05 -02 Геаграфія. Беларуская мова і літаратура)**

| № раздзелаў, тэм | Назвы раздзелаў і тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго аўдыторных | Лекцыі | Семінарскія заняткі |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| 1. | **Агульныя пытанні методыкі выкладання беларускай мовы** | **34** | **18** | **16** |
| 1.1. | Методыка выкладання беларускай мовы як навука | 2 | 2 | |
| 1.2. | Беларуская мова як вучэбны прадмет у сучаснай школе | 4 | 2 | 2 |
| 1.3. | Прынцыпы навучання беларускай мове | 2 | 2 | |
| 1.4. | Сродкі  навучання беларускай мове | 2 | | 2 |
| 1.5. | Метады і прыёмы навучання беларускай мове | 8 | 4 | 4 |
| 1.6. | Сучасны ўрок беларускай мовы: тыпы і структура | 10 | 6 | 4 |
| 1.7. | Кантрольна-ацэначная дзейнасць настаўніка на ўроках беларускай мовы | 6 | 2 | 4 |
| 2. | **Методыка вывучэння раздзелаў школьнага курса беларускай мовы** | **28** | **14** | **14** |
| 2.1.–2.6. | Методыка вывучэння фанетыкі, лексікі і фразеалогіі, марфемнай будовы слова, словаўтварэння, марфалогіі, сінтаксісу | 12 | 6 | 6 |
| 2 | Методыка навучання арфаграфіі | 1 | 6 | 4 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| .7. | | 0 | | |
| 2.8. | Методыка навучання пунктуацыі | 6 | 2 | 4 |
| 3. | **Методыка развіцця маўлення вучняў** | **10** | **6** | **4** |
| 3.4. | Развіццё звязнага маўлення вучняў | 10 | 6 | 4 |
| | **Усяго** | **72** | **38** | **34** |

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

### 1.1. МЕТОДЫКА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ЯК НАВУКА

Методыка выкладання беларускай мовы як навука, яе прадмет, змест, задачы. Фундаментальныя паняцці і катэгорыі методыкі беларускай мовы: мэты і змест моўнай адукацыі, працэс навучання мове, заканамернасці засваення мовы, прынцыпы навучання, метады, прыёмы і формы навучання, адукацыйная тэхналогія, моўная, маўленчая і этнакультурная кампетэнцыі.

Сувязь методыкі беларускай мовы з іншымі навукамі: філасофіяй, педагогікай, псіхалогіяй, лінгвістыкай, псіхалінгвістыкай і інш.

Арганізацыя і структура навукова-метадычнага даследавання: вызначэнне актуальнай праблемы, прадмета і аб’екта даследавання, фармулёўка гіпотэзы, абгрунтаванне канцэпцыі, распрацоўка методыкі даследавання, правядзенне канстатацыйнага зрэзу, навучальнага і кантрольнага эксперыментаў, аналіз вынікаў даследавання, вывады. Найбольш пашыраныя метады даследавання: вывучэнне метадычнай спадчыны і перадавога педагагічнага вопыту, дасягненняў сумежных навук, назіранне за вучэбным працэсам, эксперымент, аналіз прац вучняў, анкетаванне і інш.

Станаўленне і развіццё метадычнай думкі на Беларусі. Асветніцкая дзейнасць Ф. Скарыны. Л. Зізаній, М. Сматрыцкі, С. Собаль, С. Полацкі – аўтары першых славянскіх буквароў і граматык. Роля Б. Тарашкевіча, Б. Пачобкі, А. Смоліч, Я. Лёсіка, І. Пратасевіча, І. Самковіча і інш. у развіцці методыкі роднай мовы. Метадычная спадчына К. Міцкевіча (Якуба Коласа). Актывізацыя метадычнай думкі ў 60–70, 80–90 гады XX стагоддзя, пачатку XXI стагоддзя.

Беларускія педагагічныя часопісы, іх роля ў асэнсаванні і распаўсюджанні педагагічнай тэорыі і перадавога педагагічнага вопыту.

Агляд асноўнай літаратуры па методыцы выкладання беларускай мовы.

## 1.2. БЕЛАРУСКАЯ МОВА ЯК ВУЧЭБНЫ ПРАДМЕТ У СУЧАСНАЙ ШКОЛЕ

Беларуская мова – прадмет вывучэння, сродак навучання, фарміравання і развіцця асобы школьніка. Канцэпцыя моўнай адукацыі ў агульнаадукацыйных установах Рэспублікі Беларус. Адукацыйны стандарт па беларускай мове: прызначэнне, змест, структура.
Мэта і задачы навучання беларускай мове ў сярэдняй школе. Змест і структура школьнага курса беларускай мовы. Крытэрыі адбору сучаснага зместу беларускай мовы ў агульнаадукацыйных установах.
Вучэбная праграма па беларускай мове для 5–11 класаў агульнаадукацыйных устаноў: яе накіраванасць, структура, змест, прынцыпы пабудовы. Арыентацыя праграмы на развіццё маўленчых і інтэлектуальных здольнасцей вучняў, асэнсаванне імі законаў мовы, фарміраванне вучэбна-моўных уменняў і навыкаў, выхаванне школьнікаў. Асноўныя кампаненты праграмы, іх характарыстыка.

## 1.3. ПРЫНЦЫПЫ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

Паняцце "прынцып навучання". Агульнадыдактычныя і спецыяльныя прынцыпы навучання беларускай мове.

Агульнадыдактычныя прынцыпы навучання роднай мове: навуковасці, сістэматычнасці і паслядоўнасці, даступнасці, свядомасці і актыўнасці, трываласці ведаў, пераемнасці і перспектыўнасці, нагляднасці, сувязі тэорыі з практыкай, уліку індывідуальных асаблівасцей вучняў, адзінства навучання, выхавання і развіцця.

Агульнаметадычныя (прадметнаарыентаваныя) прынцыпы навучання роднай мове: увагі да матэрыі мовы, разумення моўных значэнняў, ацэнкі выразнасці мовы, развіцця адчування мовы, каардынацыі вуснага і пісьмовага маўлення, функцыянальнай накіраванасці, камунікатыўнай накіраванасці, структурна-семантычны, апоры на этнакультуру, улік фактару бікультурнага развіцця асобы вучня і інш.

Узаемадзеянне агульнадыдактычных і агульнаметадычных прынцыпаў навучання.

## 1.4. СРОДКІ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Сродкі навучання беларускай мове як метадычнае паняцце.

Класіфікацыя сродкаў навучання беларускай мове.

Падручнік – асноўны сродак навучання беларускай мове. Псіхолага-педагагічныя патрабаванні да школьнага падручніка. Узаемасувязь праграмы і падручніка. Функцыі падручніка: інфармацыйная, трансфармацыйная, сістэматызавальная, выхаваўчая і інш. Структурныя кампаненты школьных падручнікаў. Характарыстыка сучасных падручнікаў па беларускай мове: формы падачы новага матэрыялу, сістэма практыкаванняў і заданняў, рэалізацыя дыферэнцыраванага падыходу ў навучанні, сістэма паўтарэння вывучанага, метадычны апарат.

Дапаможнікі і матэрыялы, што дапаўняюць падручнік (зборнікі практыкаванняў, слоўнікі, даведнікі і інш.), і іх выкарыстанне ў навучальным працэсе.

Сродкі нагляднасці на ўроках роднай мовы: слыхавыя, зрокавыя, зрокава-слыхавыя (гуказапісы, табліцы, схемы, рэпрадукцыі карцін, дыяпазітывы, слайды, відэафільмы і інш.).

Тэхнічныя сродкі навучання: мультымедыяпраектар, кадаскоп, магнітафон, відэамагнітафон і інш. Выкарыстанне камп'ютара на ўроках мовы.

## 1.5. МЕТАДЫ І ПРЫЁМЫ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паняцце метаду і прыёму навучання. Класіфікацыя метадаў навучання ў залежнасці ад: а) этапаў навучання мове; б) крыніцы атрымання ведаў; в) характару вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў; г) логікі перадачы і ўспрымання інфармацыі і інш.

Характарыстыка найбольш пашыраных і прызнаных метадычнай навукай і школьнай практыкай метадаў навучання (паведамленне настаўніка, гутарка, лекцыя, назіранне і моўны аналіз, лінгвістычны эксперымент, чытанне падручніка, моўны разбор, практыкаванні і інш.).

Асноўныя прыёмы навучання роднай мове: аналіз, сінтэз, параўнанне і супастаўленне, алгарытмізацыя і інш.

Выкарыстанне метадаў і прыёмаў навучання ў залежнасці ад мэт урока, зместу моўнага матэрыялу, узросту і ступені падрыхтаванасці школьнікаў.

## 1.6. СУЧАСНЫ ЎРОК БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ: ТЫПЫ І СТРУКТУРА

Урок як асноўная арганізацыйна-педагагічная форма навучання і выхавання ў школе. Сучасныя патрабаванні да ўрока беларускай мовы. Структурныя кампаненты ўрока мовы і іх функцыі.

Тыпы ўрокаў роднай мовы: урок вывучэння новага матэрыялу; урок замацавання ведаў, уменняў і навыкаў; урок паўтарэння і абагульнення вывучанага; камбінаваны ўрок; урок развіцця звязнага маўлення (навучання перакладам, пераказам, сачыненням); урокі кантролю; урокі аналізу пісьмовых прац.

Нетрадыцыйныя формы правядзення ўрока беларускай мовы ў сучаснай школе: урок-лекцыя, урок-семінар, урок-залік, урок-гульня і інш.

Падрыхтоўка настаўніка да ўрока мовы. Планаванне вучэбнага матэрыялу. Віды вучэбных планаў: каляндарны (гадавы), тэматычны, каляндарна-тэматычны, паўрочны.

Умовы эфектыўнага правядзення ўрока роднай мовы. Аналіз урока беларускай мовы.

Сучасныя педагагічныя тэхналогіі навучання беларускай мове ў агульнаадукацыйных установах (агляд).

## 1.7. КАНТРОЛЬНА-АЦЭНАЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ НАСТАЎНІКА НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Асноўныя патрабаванні да арганізацыі кантролю ведаў, уменняў і навыкаў вучняў па беларускай мове. Функцыі, формы, метады

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кантролю. Дзесяцібальная сістэма і нормы ацэнкі вучэбных дасягненняў школьнікаў па беларускай мове.

# 2. МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ РАЗДЗЕЛАЎ ШКОЛЬНАГА КУРСА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

## 2.1. МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ ФАНЕТЫКІ

Значэнне, змест, задачы вывучэння фанетыкі. Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння фанетыкі (апора на маўленчы слых вучняў, разгляд гука ў марфеме, супастаўленне гукаў і літар). Метады і прыёмы вывучэння фанетычных тем. Характар і віды фанетычных і фанетыка-графічных практыкаванняў. Фанетыка-графічны разбор, методыка яго правядзення.

Фарміраванне арфаэпічных і акцэнталагічных навыкаў пры вывучэнні фанетыкі. Вымаўленчыя памылкі, іх прычыны. Папярэджванне арфаэпічных і акцэнталагічных памылак.

Узаемасувязь засваення фанетыкі з развіццём маўлення школьнікаў, удасканаленнем правапісных уменняў і навыкаў.

## 2.2. МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ ЛЕКСІКІ І ФРАЗЕАЛОГІІ

Значэнне, змест, задачы, прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння лексікі і фразеалогіі ў агульнаадукацыйных установах. Методыка азнаямлення вучняў з асноўнымі лексічнымі і фразеалагічнымі паняццямі. Віды лексічных і фразеалагічных практыкаваняў.

Методыка ўзбагачэння і актывізацыі лексічнага і фразеалагічнага запасу школьнікаў. Папярэджванне памылак, абумоўленых парушэннем лексічных нормаў. Фарміраванне ўмення працаваць са слоўнікамі розных тыпаў.

## 2.3. МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ МАРФЕМНАЙ БУДОВЫ СЛОВА, СЛОВАЎТВАРЭННЯ

Значэнне і задачы вывучэння марфемнай будовы слова і словаўтварэння. Лінгвістычныя асновы школьнага курса марфемікі і словаўтварэння, яго змест. Прыватнаметадычныя прынцыпы, метады і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прыёмы вывучэння марфемнай будовы слова і словаўтварэння. Сістэма практыкаванняў і заданняў.

Марфемны і словаўтваральны разборы, методыка іх правядзення.

Удасканаленне словаўтваральных уменняў і навыкаў пры вывучэнні часцін мовы.

Выкарыстанне марфемнага і словаўтваральнага слоўнікаў на ўроках роднай мовы. Фарміраванне арфаграфічных навыкаў пры вывучэнні словаўтварэння.

## 2.4. АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ ВЫКЛАДАННЯ ГРАМАТЫКІ

Значэнне і задачы вывучэння граматыкі ў школе. Кароткія звесткі з гісторыі выкладання граматыкі. Асноўныя прынцыпы вывучэння граматыкі. Роля граматычных ведаў у фарміраванні вучэбна-моўных, правапісных і камунікатыўных уменняў і навыкаў вучняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 2.5. МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ МАРФАЛОГІІ

Месца і значэнне раздзела "Марфалогія і арфаграфія" ў школьным курсе роднай мовы. Мэты і змест вывучэння часцін мовы. Прыватнаметадычныя прынцыпы навучання марфалогіі. Методыка азнаямлення вучняў з марфалагічнымі паняццямі.

Віды марфалагічных практыкаванняў. Марфалагічны разбор, методыка яго правядзення.

Узнаўленне ведаў па марфалогіі пры вывучэнні сінтаксісу. Арганізацыя працы па развіцці маўлення пры вывучэнні марфалогіі. Асэнсаванне школьнікамі сэнсава-стылістычнай і тэкстаўтваральнай ролі часцін мовы.

Удасканаленне арфаграфічных навыкаў пры вывучэнні марфалагічных тэм.

Папярэджванне памылак, абумоўленых парушэннем марфалагічных нормаў. Фарміраванне ўмення працаваць са слоўнікамі і даведнікамі пры вывучэнні часцін мовы.

## 2.6. МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ СІНТАКСІСУ

Месца і значэнне сінтаксісу ў школьным курсе беларускай мовы. Мэты, змест, прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння сінтаксісу. Фарміраванне сінтаксічных паняццяў. Этапы вывучэння сінтаксісу ў школе. Вывучэнне прапедэўтычнага курса сінтаксісу ў 5 класе.

Арганізацыя працы па сінтаксісе пры вывучэнні марфалогіі ў 5–7 класах. Вывучэнне сістэматычнага курса сінтаксісу ў 8–9 класах.

Віды сінтаксічных практыкаванняў. Сінтаксічны разбор, методыка яго правядзення.

Развіццё маўлення школьнікаў пры вывучэнні сінтаксісу. Засваенне сінтаксісу ў працэсе маўленчай дзейнасці: інтанаванне сказаў, пабудова розных тыпаў сінтаксічных адзінак і іх выкарыстанне ў вусным і пісьмовым маўленні ў адпаведнасці з камунікатыўнай мэтазгоднасцю.

Папярэджванне памылак, абумоўленых парушэннем сінтаксічных нормаў.

## 2.7. МЕТОДЫКА НАВУЧАННЯ АРФАГРАФІІ

Мэты навучання арфаграфіі і яе месца ў школьным курсе беларускай мовы. Змест навучання арфаграфіі. Арфаграфічныя ўменні і навыкі.Псіхалагічныя і метадычныя ўмовы і асаблівасці фарміравання арфаграфічных уменняў і навыкаў. Прынцыпы методыкі арфаграфіі.

Паняцце аб арфаграме. Методыка азнаямлення вучняў з арфаграмай і арфаграфічным правілам. Арфаграфічныя практыкаванні, іх віды, методыка правядзення.

Арганізацыя працы па арфаграфіі пры вывучэнні неарфаграфічных тэм у 5–7 класах. Развіццё арфаграфічных уменняў у 8–9 і 10–11 класах.

Удасканаленне арфаграфічных уменняў і навыкаў у працэсе падрыхтоўкі школьнікаў да напісання творчых прац (пераказаў, сачыненняў і інш.).

Месца і роля арфаграфічнага слоўніка ў сістэме навучання правапісу. Віды практыкаванняў са слоўнікам, іх метадычная мэтазгоднасць.

Папярэджанне арфаграфічных памылак, іх прычыны. Праверка пісьмовых прац вучняў. Класіфікацыя, улік, прыёмы выпраўлення памылак. Методыка работы над арфаграфічнымі памылкамі на ўроках мовы.

## 2. 8. МЕТОДЫКА НАВУЧАННЯ ПУНКТУАЦЫІ

Мэты навучання пунктуацыі, яе месца ў школьным курсе беларускай мовы. Змест і этапы навучання пунктуацыі. Прынцыпы методыкі пунктуацыі.

Азнаямленне вучняў з пунктуацыйнымі паняццямі (пунктаграма, пунктуацыйна-сэнсавы адрэзак), методыка работы над пунктуацыйным правілам. Фарміраванне пунктуацыйных уменняў і навыкаў. Віды пунктуацыйных практыкаванняў, методыка іх правядзення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Асаблівасці навучання пунктуацыі пры вывучэнні несінтаксічных тэм у 5–7 класах. Удасканаленне пунктуацыйных уменняў у сувязі з развіццём звязнага маўлення школьнікаў. Праца па пунктуацыі ў 10–11 класах. Методыка работы над пунктуацыйнымі памылкамі.

# 3. МЕТОДЫКА РАЗВІЦЦЯ МАЎЛЕННЯ ВУЧНЯЎ

## 3.1. РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ ЯК АДНА З АСНОЎНЫХ ЗАДАЧ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Развіццё маўлення як метадычнае паняцце.
Навуковыя асновы методыкі развіцця маўлення (тэорыя маўленчай дзейнасці, тэорыя тэксту, стылістыка і інш.). Прынцыпы методыкі развіцця маўлення: адзінства развіцця маўлення і мыслення, узаемасувязі развіцця вуснага і пісьмовага маўлення, развіцця маўлення ў сувязі з вывучэннем усіх раздзелаў школьнага курса беларускай мовы і інш.
Сутнасць маўленчай дзейнасці. Асноўныя віды маўленчай дзейнасці: слуханне (аўдзіраванне), чытанне, гаварэнне, пісьмо.
Удасканаленне навыкаў аўдзіравання і чытання. Фарміраванне і развіццё вымаўленчых навыкаў.

## 3.2. УЗБАГАЧЭННЕ СЛОЎНІКАВАГА ЗАПАСУ І РАЗВІЦЦЁ ГРАМАТЫЧНАГА ЛАДУ МАЎЛЕННЯ ВУЧНЯЎ

Узбагачэнне слоўнікавага запасу вучняў. Мэты і змест слоўнікавай працы на ўроках роднай мовы. Прыёмы семантызацыі незнаёмых і маласнаёмых слоў і выразаў. Фарміраванне ў вучняў умення карыстацца слоўнікамі розных тыпаў (тлумачальным, сінонімаў і блізказначных слоў, антонімаў і інш.). Віды слоўнікавых практыкаванняў.
Узбагачэнне граматычнага ладу маўлення вучняў, выпрацоўка ўменняў будаваць словазлучэнні і сказы.

## 3.3. ФАРМІРАВАННЕ КУЛЬТУРЫ МАЎЛЕННЯ ВУЧНЯЎ

Фарміраванне культуры маўлення школьнікаў. Навучанне школьнікаў нормам беларускай літаратурнай мовы. Навучанне камунікатыўным

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

якасцям маўлення (правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, дарэчнасць, багацце, выразнасць), маўленчаму этыкету. Тыпы практыкаванняў па фарміраванні культуры маўлення, методыка іх правядзення.

## 3.4. РАЗВІЦЦЁ ЗВЯЗНАГА МАЎЛЕННЯ ВУЧНЯЎ

Значэнне, задачы, змест работы па развіцці звязнага вуснага і пісьмовага маўлення вучняў.

Тэкст як прадукт (вынік) маўленчай дзейнасці. Фарміраванне ў вучняў паняцця пра тэкст, яго асноўныя прыметы: тэматычнае адзінства, звязнасць, разгорнутасць, паслядоўнасць, завершанасць і інш. Методыка азнаямлення з асноўнымі тыпамі маўлення (апавяданне, апісанне, разважанне), з жанрава-стылістычнымі разнавіднасцямі тэкстаў. Сістэма практыкаванняў па развіцці звязнага вуснага і пісьмовага маўлення школьнікаў.

Значэнне, задачы, асаблівасці вывучэння стылістыкі. Методыка азнаямлення вучняў з функцыянальнымі стылямі маўлення. Арганізацыя працы па стылістыцы пры вывучэнні розных тэм школьнага курса роднай мовы. Стылістычныя ўменні. Практыкаванні па фарміраванні стылістычных уменняў і навыкаў.

Пераказ у сістэме работы па развіцці звязнага маўлення школьнікаў. Класіфікацыя пераказаў: па мэце правядзення (навучальныя і кантрольныя), па спосабу перадачы зместу зыходнага тэксту (падрабязныя, (поўныя), блізкія да тэксту, сціслыя, выбарачныя, з дадатковым заданнем) і інш. Методыка правядзення навучальных і кантрольных пераказаў.

Сачыненне як від работы па развіцці звязнага маўлення, сродак самавыражэння асобы школьніка, яго жыццёвай пазіцыі, унутранага свету. Класіфікацыя сачыненняў: па мэце правядзення (навучальныя і кантрольныя), па месцы выканання (класныя і дамашнія), па крыніцы атрымання ведаў (на аснове жыццёвага вопыту, асабістых назіранняў і ўражанняў; па карціне; на літаратурныя і вольныя тэмы і інш.), па тыпу тэксту (апавяданні, апісанні, разважанні, апавяданні з элементамі апісання і інш.), па жанру (артыкул у газету, водгук, рэцэнзія і г.д.) і інш.

Спосабы падрыхтоўкі да сачынення. Методыка правядзення сачыненняў.

Пераклад як від навучальных практыкаванняў па развіцці маўлення. Метадычная мэтазгоднасць выкарыстання перакладу на ўроках мовы ў школах Беларусі. Тыпалогія перакладаў. Прыёмы перакладу. Методыка правядзення перакладаў.

Ацэнка камунікатыўнай пісьменнасці вучняў. Класіфікацыя, улік, прыёмы выпраўлення памылак. Нормы ацэнкі творчых прац .

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 4. ПАГЛЫБЛЕНАЕ ВЫВУЧЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Факультатыўныя заняткі па беларускай мове, іх мэты, формы арганізацыі, методыка правядзення.
Курсы на выбар: мэты, формы арганізацыі, методыка правядзення.
Значэнне і задачы пазакласнай працы па беларускай мове. Прынцыпы арганізацыі пазакласнай працы. Формы пазакласнай працы. Гурток як асноўная форма пазакласнай працы. Асаблівасці заняткаў гуртка. Віды пазакласных мерапраемстваў, методыка іх правядзення.

## 5. МЕТАДЫЧНАЯ ПРАЦА НАСТАЎНІКАЎ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Значэнне метадычнай працы. Формы ўдасканалення метадычнага майстэрства настаўнікаў. Змест работы метадычных аб'яднанняў.
Установы павышэння кваліфікацыі педагагічных кадраў.
Школьны кабінет беларускай мовы: абсталяванне, арганізацыя працы.

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

### АСНОЎНАЯ

*Врановіч, З. Б.* Методыка выкладання беларускай мовы / З. Б. Варановіч. – Мінск, 1995.
Методыка выкладання беларускай мовы / М. Г. Яленскі [і інш.]; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск, 2007.
*Яленскі, М. Г.* Методыка выкладання беларускай мовы: практыкум / М. Г. Яленскі, У. П. Саўко, Л. С. Васюковіч. – Мінск, 2006.
*Ляшчынская, В. А.* Методыка выкладання беларускай мовы / В. А. Ляшчынская, З. У. Шведава. – Мінск, 2007.
Яленскі, М. Г. Методыка выкладання беларускай мовы. Сучасная лінгвадыдактыка / М. Г. Яленскі. – Мінск, 2005.
*Протчанка, В. У.* Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове / В. У. Протчанка. – Мінск, 2001.
Вучэбныя праграмы і падручнікі па беларускай мове для агульнаадукацыйных устаноў (апошнія выданні).

### ДАДАТКОВАЯ

*Алгазина, Н. Н.* Формирование орфографических навыков/ Н. Н. Алгазина. – М., 1987.
*Архипова, Е. В.* Основы методики развития речи учащихся / Е. В. Архипова. – М., 2004.
*Баранов, М. Т.* Методика лексики и фразеологии в средней школе / М. Т. Баранов. – М., 1988.
*Блинов, Г. И.* Методика изучения пунктуации в школе / Г. И. Блинов. – М., 1990.
*Валочка, Г. М.* Тэарэтыка-метадычныя асновы развіцця звязнага маўлення вучняў на ўроках беларускай мовы: 5–10 класы / Г. М. Валочка. – Мінск, 2005.
*Васюковіч, Л. С.* Вучэбны тэкст у школьным падручніку па беларускай мове / Л. С. Васюковіч. – Мінск, 2005.
*Воителева, Т. М.* Теория и методика обучения русскому языку / Т. М. Воителева. – М., 2006.
*Выгонная, Л. Ц.* Фанетыка беларускай мовы ў школе / Л. Ц. Выгонная. – Мінск, 1995.
*Даніловіч, М. А.* Вывучэнне фразеалогіі на ўроках мовы / М. А. Даніловіч. – Мінск, 1991.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Жуковская, О. А.* Изучение словобразования в восьмилетней школе / О. А. Жуковская, Т. А. Шаповалова. – М., 1983.

*Зельманова, Л. М.* Кабинет русского языка в средней школе / Л. М. Зельманова. – М., 1981.

*Зельманова, Л. М.* Наглядность в преподавании русского языка / Л. М. Зельманова. – М., 1984.

*Ипполитова, Н. А.* Текст в системе обучения русскому языку в школе / Н. А. Ипполитова. – М., 1998.

*Капинос, В. И.* Развитие речи: теория и практика обучения. 5–7 классы / В. И. Капинос, Н. Н. Сергеева, М. С. Соловейчик. – М., 1991.

*Красней, В. П.* Грані слова: факультатыўны курс "Лексіка і фразеалогія беларускай мовы" / В. П. Красней. – Мінск, 1986.

*Лаўрэль, Я. М.* Вывучэнне марфалогіі ў школе / Я. М. Лаўрэль, Т. Р. Новікава, С. А. Язерская. – Мінск, 1991.

*Литвинко, Ф. М.* Методика изучения разделов школьного курса русского языка (функциональный подход). – Минск, 2001.

*Львов, М. Р.* Словарь-справочник по методике русского языка / М. Р. Львов. – М., 1999.

*Ляшчынская, В. А.* Методыка выкладання беларускай мовы: задачы і практыкаванні / В. А. Ляшчынская. – Мінск, 1998.

*Малажай, Г. М.* Пазакласная праца па беларускай мове / Г. М. Малажай, С. Р. Рачэўскі. – Мінск, 1990.

Методика преподавания русского языка в школе / М. Т. Баранов [и др.]; под ред. М. Т. Баранова. – М., 2000.

Методика развития речи на уроках русского языка / Под ред. Т. А. Ладыженской. – М., 1980.

*Морозова, И. Д.* Виды изложений и методика их проведения / И. Д. Морозова. – М., 1984.

*Панов, Б. Т.* Типы и структура уроков русского языка / Б. Т. Панов. – М., 1986.

*Паўлоўская, В. І.* Мова: цікава і займальна / В. І. Паўлоўская. – Мінск, 1989.

*Петровский, Г. Н.* Педагогические и образовательные технологии современной школы / Г. Н. Петровский. – Минск, 2003.

*Протчанка, В. У.* Вывучэнне сінтаксісу ў школе. Складаны сказ / В. У. Протчанка. – Мінск, 1989.

*Протчанка, В. У.* Вывучэнне сінтаксісу ў школе. Словазлучэнне. Просты сказ / В. У. Протчанка.– Мінск, 1984.

*Протчанка, В. У.* Шматаспектны аналіз пры вывучэнні сінтаксісу беларускай мовы / В. У. Протчанка. – Мнінск, 1987.

*Саўко, У. П.* Развіццё маўлення школьнікаў пры вывучэнні марфалогіі (назоўніка і прыметніка) / У. П. Саўко. – Мінск, 2000.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Селевко, Г. К.* Современные образовательные технологии / Г. К. Селевко. – М., 1998.

Теория и практика обучения русскому языку / Е. В. Архипова [и др.]; под ред. Р. Б. Сабаткоева. – М., 2005.

*Туркевіч, В. М.* Творчасці зярняты залатыя / В. М. Туркевіч. – Мінск, 1988.

*Яленскі, М. Г.* Развіццё вуснай мовы вучняў: 4–6 класы / М. Г. Яленскі. – Мінск, 1985.

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

“Зацвярджаю”
Прарэктар па вучэбнай рабоце
__________________ Ю. А. Быкадораў
“___”___________________ 2010 г.
Рэгістрацыйны № УД________/ р.

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Вучэбная праграма для спецыяльнасцяў
1– 02 03 01 Беларуская мова і літаратура,

Факультэт беларускай філалогіі і культуры

Кафедра беларускага мовазнаўства

Курсы 2–3

Семестры 4–5

Лекцыі – 54 гадзіны

Практычныя заняткі – 26 гадзін

Лабараторныя заняткі – 14 гадзін Экзамен – 5 семестр

Усяго аўдыторных гадзін па дысцыпліне – 94

Форма атрымання
вышэйшай адукацыі дзённая

Складальнік Саўко У. П.

2010 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове тыпавой праграмы “Методыка выкладання беларускай мовы”, зацверджанай 14. 04. 2010 г., рэгістрацыйны нумар ТД–А.273/тып.

Разгледжана і рэкамендавана на пасяджэнні кафедры беларускага мовазнаўства 24. 06. 2010 г., пратакол № 16.

Загадчык кафедры ________________ Д. В. Дзятко

Адобрана і рэкамендавана да зацвярджэння саветам факультэта беларускай філалогіі і культуры

____ ____________________ 2010 г.

Старшыня ___________Ф. С. Шумчык

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

**1. Актуальнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны ў ВНУ і яе роля ў прафесійнай падрыхтоўцы выпускніка ВНУ.**

Моўная адукацыя ў сучаснай школе накіравана на выхаванне высокай маўленчай культуры вучняў, фарміраванне ў іх камунікатыўных уменняў і навыкаў, што забяспечваюць эфектыўнасць моўных зносін у розных сферах жыцця і дзейнасці чалавека. Праца настаўніка-славесніка накіроўваецца на забеспячэнне практычнага авалодання школьнікамі мовай як найважнейшым сродкам зносін, пазнання рэчаіснасці, сацыялізацыі асобы.

Дасягненне пастаўленых мэт у значнай ступені залежыць ад узроўню прафесійна-метадычнай кампетэнцыі настаўнікаў, што і абумоўлівае актуальнасць дысцпліны "Методыка выкладання беларускай мовы". Ад якасці прафесійна-метадычнай падрыхтоўкі студэнтаў па методыцы выкладання беларускай мовы залежыць ступень засваення імі тэорыі навучання школьнікаў беларускай мове і ўзровень развіцця уменняў вучыць дзяцей эфектыўна карыстацца беларускай мовай ў розных сферах яе прымянення.

У працэсе выкладання дысцпліны "Методыка выкладання беларускай мовы" ажыццяўляецца фарміраванне і развіццё сацыяльна-прафесійнай кампетэнцыі студэнтаў, якая дазваляе спалучаць акадэмічныя, прафесійныя і сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі для вырашэння задач у сферы прафесійнай і сацыяльнай дзейнасці.

**2. Мэты і задачы вучэбнай дысцыпліны "Методыка выкладання беларускай мовы".**

**Мэта** дысцыпліны – тэарэтычная і практычная падрыхтоўка студэнтаў да самастойнай прафесійна-педагагічнай дзейнасці ў якасці настаўніка беларускай мовы ў навучальных установах рознага тыпу.

**Задачы** дысцыпліны:

– даць студэнтам фундаментальныя навукова-метадычныя веды аб працэсе навучання беларускай мове;

– азнаёміць студэнтаў з мэтай, задачамі, прынцыпамі, метадамі, сродкамі, формамі арганізацыі вучэбнай дзейнасці вучняў, са зместам і структурай школьнага курса беларускай мовы, з сучаснымі тэхналогіямі навучання прадмету;

– сфарміраваць у студэнтаў неабходныя прафесійна-метадычныя ўменні і навыкі, падрыхтаваць іх да выканання функцый настаўніка беларускай мовы;

– развіць у студэнтаў прафесійныя якасці, неабходныя сучаснаму настаўніку, метадычнае мысленне, творчы падыход да педагагічнай дзейнасці і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**3. Агульныя патрабаванні да ўзроўню засваення зместу вучэбнай дысцыпліны “Методыка выкладання беларускай мовы”.**

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны **ведаць**:

– прадмет, задачы, фундаментальныя паняцці і катэгорыі методыкі выкладання беларускай мовы;

– мэты і задачы навучання беларускай мове ў сучасных агульнаадукацыйных установах, змест і структуру школьнага курса беларускай мовы;

– прынцыпы, сродкі, метады, арганізацыйныя формы навучання беларускай мове;

– змест, задачы, прынцыпы, метады і прыёмы вывучэння раздзелаў школьнага курса беларускай мовы;

– мэты і змест працы па развіцці вуснага і пісьмовага маўлення вучняў;

– нормы ацэнкі вучэбных дасягненняў школьнікаў па беларускай мове, віды, формы, метады кантролю.

У працэсе вывучэння дысцыпліны ў студэнтаў фарміруюцца наступныя **ўменні**:

– планаваць вучэбны працэс па беларускай мове; дакладна вызначаць мэты ўрока, яго тып і структуру;

– адбіраць змест вучэбнага матэрыялу (вызначаць яго аб’ём, сістэму практыкаванняў і заданняў і інш.);

– абгрунтавана выбіраць найбольш эфектыўныя і рацыянальныя сродкі, метады і прыёмы навучання беларускай мове;

– распрацоўваць планы-канспекты ўрокаў беларускай мовы розных тыпаў, ствараць неабходны наглядны і раздатачны матэрыял;

– абгрунтавана выкарыстоўваць формы і метады кантролю за вучэбнай дзейнасцю школьнікаў, правільна ацэньваць вынікі вучэбных дасягненняў вучняў;

– аналізаваць ўрокі беларускай мовы з улікам сучасных патрабаванняў да навучальнага працэсу.

**4. Структура зместу вучэбнай дысцыпліны.**

Праграма дысцыпліны “Методыка выкладання беларускай мовы” складаецца з 4 раздзелаў:

1. Агульныя пытанні методыкі выкладання беларускай мовы.
2. Методыка развіцця маўлення вучняў.
3. Методыка вывучэння раздзелаў школьнага курса беларускай мовы.
4. Пазакласная праца па беларускай мове.

Дысцыпліна вывучаецца на працягу 4 і 5 семестраў: 4 семестр – 58 гадзін, у тым ліку лекцыі – 34 г., практычныя заняткі – 16 г., лабараторныя заняткі – 8 г.; 5 семестр – 36 гадзін, у тым ліку лекцыі – 20 г., практычныя заняткі – 10 г., лабараторныя заняткі – 6 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

### 1.1. Методыка выкладання беларускай мовы як навука

Методыка выкладання беларускай мовы як навука, яе прадмет, змест, задачы. Фундаментальныя паняцці і катэгорыі методыкі беларускай мовы: мэты і змест моўнай адукацыі, працэс навучання мове, заканамернасці засваення мовы, прынцыпы навучання, метады, прыёмы і формы навучання, адукацыйная тэхналогія, моўная, маўленчая і этнакультурная кампетэнцыі.

Сувязь методыкі беларускай мовы з іншымі навукамі: філасофіяй, педагогікай, псіхалогіяй, лінгвістыкай, псіхалінгвістыкай і інш.

Найбольш пашыраныя метады даследавання: вывучэнне метадычнай спадчыны і перадавога педагагічнага вопыту, дасягненняў сумежных навук, назіранне за вучэбным працэсам, эксперымент, аналіз прац вучняў, анкетаванне і інш.

### 1.2. Станаўленне і развіццё метадычнай думкі ў Беларусі

Асветніцкая дзейнасць Ф. Скарыны. Л. Зізаній, М. Сматрыцкі, С. Собаль, С. Полацкі – аўтары першых славянскіх буквароў і граматык. Роля Б. Тарашкевіча, Б. Пачобкі, А. Смоліч, Я. Лёсіка, І. Пратасевіча, І. Самковіча і інш. у развіцці методыкі роднай мовы. Метадычная спадчына К. Міцкевіча (Якуба Коласа). Актывізацыя метадычнай думкі ў 60–70, 80–90 гады XX стагоддзя, пачатку XXI стагоддзя.

### 1.3. Беларуская мова як вучэбны прадмет у сучаснай школе

Беларуская мова – прадмет вывучэння, сродак навучання, фарміравання і развіцця асобы школьніка.

Мэта і задачы навучання беларускай мове ў агульнаадукацыйных установах. Змест і структура школьнага курса беларускай мовы. Крытэрыі адбору сучаснага зместу беларускай мовы ў агульнаадукацыйных установах.

Вучэбная праграма па беларускай мове для 5–11 класаў агульнаадукацыйных устаноў: структура, змест, прынцыпы пабудовы. Асноўныя кампаненты праграмы, іх характарыстыка.

### 1.4. Прынцыпы навучання беларускай мове

Паняцце “прынцып навучання”. Агульнадыдактычныя і спецыяльныя прынцыпы навучання беларускай мове.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Агульнадыдактычныя прынцыпы навучання роднай мове: навуковасці, сістэматычнасці і паслядоўнасці, даступнасці, свядомасці і актыўнасці, трываласці ведаў, пераемнасці і перспектыўнасці, нагляднасці, сувязі тэорыі з практыкай, уліку індывідуальных асаблівасцей вучняў, адзінства навучання, выхавання і развіцця.

Агульнаметадычныя (прадметнаарыентаваныя) прынцыпы навучання роднай мове: функцыянальнай накіраванасці, камунікатыўнай накіраванасці, структурна-семантычны, апоры на этнакультуру, улік фактару бікультурнага развіцця асобы вучня і інш.

Узаемадзеянне агульнадыдактычных і агульнаметадычных прынцыпаў навучання.

## 1.5. Сродкі навучання беларускай мове

Сродкі навучання беларускай мове як метадычнае паняцце.

Класіфікацыя сродкаў навучання беларускай мове.

Падручнік – асноўны сродак навучання беларускай мове. Узаемасувязь праграмы і падручніка. Функцыі падручніка: інфармацыйная, трансфармацыйная, сістэматызавальная, выхаваўчая і інш. Структурныя кампаненты школьных падручнікаў. Характарыстыка сучасных падручнікаў па беларускай мове: формы падачы новага матэрыялу, сістэма практыкаванняў і заданняў, рэалізацыя дыферэнцыраванага падыходу ў навучанні, сістэма паўтарэння вывучанага, метадычны апарат.

Дапаможнікі і матэрыялы, што дапаўняюць падручнік (зборнікі практыкаванняў, слоўнікі, даведнікі і інш.), і іх выкарыстанне ў навучальным працэсе.

## 1.6. Метады і прыёмы навучання беларускай мове

Паняцце метаду і прыёму навучання. Класіфікацыя метадаў навучання ў залежнасці ад: а) этапаў навучання мове; б) крыніцы атрымання ведаў; в) характару вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў; г) логікі перадачы і ўспрымання інфармацыі і інш.

Характарыстыка найбольш пашыраных і прызнаных метадычнай навукай і школьнай практыкай метадаў навучання (паведамленне настаўніка, гутарка, лекцыя, назіранне і моўны аналіз, лінгвістычны эксперымент, чытанне падручніка, моўны разбор, практыкаванні і інш.).

Асноўныя прыёмы навучання роднай мове: аналіз, сінтэз, параўнанне і супастаўленне, алгарытмізацыя і інш.

Выкарыстанне метадаў і прыёмаў навучання ў залежнасці ад мэт урока, зместу моўнага матэрыялу, узросту і ступені падрыхтаванасці школьнікаў.

## 1.7. Кантрольна-ацэначная дзейнасць настаўніка на ўроках беларускай мовы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Асноўныя патрабаванні да арганізацыі кантролю ведаў, уменняў і навыкаў вучняў па беларускай мове. Функцыі, формы, метады кантролю.
Дзесяцібальная сістэма і нормы ацэнкі вучэбных дасягненняў школьнікаў па беларускай мове.
Адзіны моўны рэжым установы, якая забяспечвае атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі.

### 1.8. Сучасны ўрок беларускай мовы: тыпы і структура

Урок як асноўная арганізацыйна-педагагічная форма навучання і выхавання ў школе. Сучасныя патрабаванні да ўрока беларускай мовы. Структурныя кампаненты ўрока мовы і іх функцыі.

Тыпы ўрокаў роднай мовы: урок вывучэння новага матэрыялу; урок замацавання ведаў, уменняў і навыкаў; урок паўтарэння і абагульнення вывучанага; камбінаваны ўрок; урок развіцця звязнага маўлення (навучання перакладам, пераказам, сачыненням); урокі кантролю; урокі аналізу пісьмовых прац.

Нетрадыцыйныя формы правядзення ўрока беларускай мовы ў сучаснай школе: урок-лекцыя, урок-семінар, урок-залік, урок-гульня і інш.

Падрыхтоўка настаўніка да ўрока мовы. Планаванне вучэбнага матэрыялу. Віды вучэбных планаў: каляндарны (гадавы), тэматычны, каляндарна-тэматычны, паўрочны.

Умовы эфектыўнага правядзення ўрока роднай мовы. Аналіз урока беларускай мовы.

## 2. МЕТОДЫКА РАЗВІЦЦЯ ЗВЯЗНАГА МАЎЛЕННЯ ВУЧНЯЎ

### 2.1. Фарміраванне ў вучняў паняцця пра тэкст

Тэкст як прадукт (вынік) маўленчай дзейнасці. Фарміраванне ў вучняў паняцця пра тэкст, яго асноўныя прыметы: тэматычнае адзінства, звязнасць, разгорнутасць, паслядоўнасць, завершанасць і інш.

### 2.2. Пераказ у сістэме работы па развіцці звязнага маўлення школьнікаў

Класіфікацыя пераказаў: па мэце правядзення (навучальныя і кантрольныя), па спосабу перадачы зместу зыходнага тэксту (падрабязныя, (поўныя), блізкія да тэксту, сціслыя, выбарачныя, з дадатковым заданнем) і інш. Методыка правядзення навучальных і кантрольных пераказаў.

### 2.3. Сачыненне як від работы

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

**па развіцці звязнага маўлення вучняў**

Класіфікацыя сачыненняў: па мэце правядзення (навучальныя і кантрольныя), па месцы выканання (класныя і дамашнія), па крыніцы атрымання ведаў (на аснове жыццёвага вопыту, асабістых назіранняў і ўражанняў; па карціне; на літаратурныя і вольныя тэмы і інш.), па тыпу тэксту (апавяданні, апісанні, разважанні, апавяданні з элементамі апісання і інш.), па жанру (артыкул у газету, водгук, рэцэнзія  і г.д.) і інш.

Спосабы падрыхтоўкі да сачынення. Методыка правядзення сачыненняў.

### 2.4. Пераклад як від навучальных практыкаванняў па развіцці маўлення вучняў

Метадычная мэтазгоднасць выкарыстання перакладу на ўроках мовы ў школах Беларусі. Тыпалогія перакладаў. Прыёмы перакладу. Методыка правядзення перакладаў.

### 2.5. Ацэнка камунікатыўнай пісьменнасці вучняў

Класіфікацыя, улік, прыёмы выпраўлення памылак. Нормы ацэнкі творчых прац.

## 3. МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ РАЗДЗЕЛАЎ ШКОЛЬНАГА КУРСА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

### 3.1. Методыка навучання арфаграфіі

Мэты навучання арфаграфіі і яе месца ў школьным курсе беларускай мовы. Змест навучання арфаграфіі. Арфаграфічныя ўменні і навыкі. Псіхалагічныя і метадычныя ўмовы і асаблівасці фарміравання арфаграфічных уменняў і навыкаў. Прынцыпы методыкі арфаграфіі.

Паняцце аб арфаграме. Методыка азнаямлення вучняў з арфаграмай і арфаграфічным правілам. Арфаграфічныя практыкаванні, іх віды, методыка правядзення.

Арганізацыя працы па арфаграфіі пры вывучэнні неарфаграфічных тэм у 5–7 класах. Развіццё арфаграфічных уменняў у 8–9 і 10–11 класах.

Удасканаленне арфаграфічных уменняў і навыкаў у працэсе падрыхтоўкі школьнікаў да напісання творчых прац (пераказаў, сачыненняў і інш.).

Месца і роля арфаграфічнага слоўніка ў сістэме навучання правапісу. Віды практыкаванняў са слоўнікам, іх метадычная мэтазгоднасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Папярэджанне арфаграфічных памылак, іх прычыны. Праверка пісьмовых прац вучняў. Класіфікацыя, улік, прыёмы выпраўлення памылак. Методыка работы над арфаграфічнымі памылкамі на ўроках мовы.

### 3.2. Методыка навучання пунктуацыі

Мэты навучання пунктуацыі, яе месца ў школьным курсе беларускай мовы. Змест і этапы навучання пунктуацыі. Прынцыпы методыкі пунктуацыі.

Азнаямленне вучняў з пунктуацыйнымі паняццямі (пунктаграма, пунктуацыйна-сэнсавы адрэзак), методыка работы над пунктуацыйным правілам. Фарміраванне пунктуацыйных уменняў і навыкаў. Віды пунктуацыйных практыкаванняў, методыка іх правядзення.

Асаблівасці навучання пунктуацыі пры вывучэнні несінтаксічных тэм у 5–7 класах. Праца па пунктуацыі ў 10–11 класах. Методыка работы над пунктуацыйнымі памылкамі.

### 3.3. Методыка вывучэння фанетыкі

Значэнне, змест, задачы вывучэння фанетыкі. Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння фанетыкі (апора на маўленчы слых вучняў, разгляд гука ў марфеме, супастаўленне гукаў і літар). Метады і прыёмы вывучэння фанетычных тем. Характар і віды фанетычных і фанетыка-графічных практыкаванняў. Фанетыка-графічны разбор, методыка яго правядзення.

Фарміраванне арфаэпічных і акцэнталагічных навыкаў пры вывучэнні фанетыкі. Вымаўленчыя памылкі, іх прычыны. Папярэджванне арфаэпічных і акцэнталагічных памылак.

Узаемасувязь засваення фанетыкі з развіццём маўлення школьнікаў, удасканаленнем правапісных уменняў і навыкаў.

### 3.4. Методыка вывучэння лексікі і фразеалогіі

Значэнне, змест, задачы, прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння лексікі і фразеалогіі ў агульнаадукацыйных установах. Методыка азнаямлення вучняў з асноўнымі лексічнымі і фразеалагічнымі паняццямі. Віды лексічных і фразеалагічных практыкаваняў.

Методыка ўзбагачэння і актывізацыі лексічнага і фразеалагічнага запасу школьнікаў. Фарміраванне ўмення працаваць са слоўнікамі розных тыпаў.

### 3.5. Методыка вывучэння марфемнай будовы слова, словаўтварэння

Значэнне і задачы вывучэння марфемнай будовы слова і словаўтварэння. Лінгвістычныя асновы школьнага курса марфемікі і словаўтварэння, яго змест. Прыватнаметадычныя прынцыпы, метады і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прыёмы вывучэння марфемнай будовы слова і словаўтварэння. Сістэма практыкаванняў і заданняў.

Марфемны і словаўтваральны разборы, методыка іх правядзення.

Удасканаленне словаўтваральных уменняў і навыкаў пры вывучэнні часцін мовы.

Выкарыстанне марфемнага і словаўтваральнага слоўнікаў на ўроках роднай мовы. Фарміраванне арфаграфічных навыкаў пры вывучэнні словаўтварэння.

### 3.6. Методыка вывучэння марфалогіі

Месца і значэнне раздзела "Марфалогія і арфаграфія" ў школьным курсе роднай мовы. Мэты і змест вывучэння часцін мовы. Прыватнаметадычныя прынцыпы навучання марфалогіі. Методыка азнаямлення вучняў з марфалагічнымі паняццямі.

Віды марфалагічных практыкаванняў. Марфалагічны разбор, методыка яго правядзення.

Узнаўленне ведаў па марфалогіі пры вывучэнні сінтаксісу. Арганізацыя працы па развіцці маўлення пры вывучэнні марфалогіі. Удасканаленне арфаграфічных навыкаў пры вывучэнні марфалагічных тэм.

### 3.7. Методыка вывучэння сінтаксісу

Месца і значэнне сінтаксісу ў школьным курсе беларускай мовы. Мэты, змест, прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння сінтаксісу. Фарміраванне сінтаксічных паняццяў. Этапы вывучэння сінтаксісу ў школе. Вывучэнне прапедэўтычнага курса сінтаксісу ў 5 класе. Арганізацыя працы па сінтаксісе пры вывучэнні марфалогіі ў 5–7 класах. Вывучэнне сістэматычнага курса сінтаксісу ў 8–9 класах.

Віды сінтаксічных практыкаванняў. Сінтаксічны разбор, методыка яго правядзення.

### 3.8. Методыка вывучэння стылістыкі

Значэнне, задачы, асаблівасці вывучэння стылістыкі. Методыка азнаямлення вучняў з функцыянальнымі стылямі маўлення. Арганізацыя працы па стылістыцы пры вывучэнні розных тэм школьнага курса роднай мовы. Стылістычныя ўменні. Практыкаванні па фарміраванні стылістычных уменняў і навыкаў.

## 4. ПАЗАКЛАСНАЯ ПРАЦА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Значэнне і задачы пазакласнай працы па беларускай мове. Прынцыпы арганізацыі пазакласнай працы. Формы пазакласнай працы. Гурток як

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

асноўная форма пазакласнай працы. Асаблівасці заняткаў гуртка. Віды пазакласных мерапраемстваў, методыка іх правядзення.

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

**Вучэбна-метадычная карта дысцыпліны**
**(дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі)**

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў; пералік пытанняў, што вывучаюцца | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя заняткі | лабараторныя заняткі | кіруемая самаст. праца | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | **МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ (94 г.)** | **54** | **26** | **14** | | | | |
| 1.1. | **Агульныя пытанні методыкі выкладання беларускай мовы (28 г.)** | **20** | **8** | | | | | |
| 1.1.1. | Методыка выкладання беларускай мовы як навука.<br>1. Прадмет, задачы, змест методыкі выкладання беларускай мовы, метады даследавання.<br>2. Сувязь методыкі з іншымі навукамі.<br>3. Станаўленне і развіццё метадычнай думкі ў Беларусі. | 2 | | | | | [1]<br>[2]<br>[3] | Пісьмовая праца (канспектаванне матэрыялаў вучэбнага дапаможніка) |
| 1.1.2. | Беларуская мова як вучэбны прадмет у сучаснай школе.<br>1. Мэта і задачы навучання | 2 | | | | | [1]<br>[2]<br>[6] | |

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | беларускай мове ў агульнаадукацыйных установах.<br>2. Змест і структура школьнага курса беларускай мовы. | | | | | | | |
| 1.1.3. | Вучэбная праграма па беларускай мове для 5–11 класаў агульнаадукацыйных установаў. | | 1 | | | Вучэбныя праграмы па беларускай мове | [1]<br>[2]<br>[6] | Розныя віды апытвання |
| 1.1.4. | Прынцыпы навучання беларускай мове.<br>1. Агульнадыдактычныя прынцыпы навучання роднай мове.<br>2. Агульнаметадычныя прынцыпы навучання роднай мове. | 2 | | | | | [1]<br>[2] | |
| 1.1.5. | Сродкі навучання беларускай мове..<br>1. Класіфікацыя сродкаў навучання беларускай мове.<br>2. Падручнік – асноўны сродак навучання.<br>3. Дапаможнікі і матэрыялы, што дапаўняюць падручнік. | | 1 | | | Падручнікі па беларускай мове | [1]<br>[2]<br>[6] | Розныя віды апытвання |
| 1.1.6. | Метады і прыёмы навучання беларускай мове.<br>1. Класіфікацыя метадаў навучання.<br>2. Характарыстыка найбольш пашыраных і прызнаных метадычнай навукай і школьнай практыкай метадаў навучання. | 4 | | | | | [1]<br>[2] | |

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.1.7. | Метады навучання беларускай мове.<br>1. Разгляд розных класіфікацый метадаў навучання.<br>2. Характарыстыка метадаў навучання | | 2 | | | | [1]<br>[2] | Розныя віды апытвання |
| 1.1.8. | Кантрольна-ацэначная дзейнасць настаўніка на ўроках беларускай мовы.<br>1. Асноўныя патрабаванні да арганізацыі кантролю ведаў, уменняў і навыкаў вучняў па беларускай мове.<br>2. Функцыі, формы, метады кантролю. | 2 | | | | Наглядны матэрыял | [1]<br>[2]<br>[5] | |
| 1.1.9. | Сучасны ўрок беларускай мовы: тыпы і структура.<br>1. Урок як асноўная арганізацыйна-педагагічная форма навучання і выхавання ў школе.<br>2. Тыпы ўрокаў роднай мовы.<br>3. Нетрадыцыйныя формы правядзення ўрока беларускай мовы ў сучаснай школе. | 8 | | | | | [1]<br>[2] | |
| 1.1.10. | Віды вучэбных планаў.<br>1. Каляндарны план.<br>2. Каляндарна-тэматычны план.<br>3. Тэматычны план.<br>4. Паўрочны план. | | 4 | | | Узоры афармлення канспекта ўрока і каляндарна-тэматычнага плана | [1]<br>[2] | |
| 1.2. | **Методыка развіцця звязнага маўлення вучняў (16 г.)** | **12** | **2** | **2** | | | | |

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.2.1. | Фарміраванне ў вучняў паняцця пра тэкст.<br>1. Тэкст як прадукт (вынік) маўленчай дзейнасці.<br>2. Фарміраванне ў вучняў паняцця пра тэкст, яго асноўныя прыметы. | 2 | | | | | [1]<br>[2]<br>[13] | |
| 1.2.2. | Пераказ у сістэме работы па развіцці звязнага маўлення школьнікаў.<br>1. Класіфікацыя пераказаў.<br>2. Методыка правядзення навучальных і кантрольных пераказаў. | 4 | | | | | [1]<br>[2]<br>[8] | |
| 1.2.3. | Методыка правядзення пераказаў.<br>1. Методыка правядзення падрабязнага пераказу.<br>2. Методыка правядзення сціслага пераказу.<br>3. Методыка правядзення выбарачнага пераказу. | | 2 | | | | [1]<br>[2]<br>[8] | Розныя віды апытвання |
| 1.2.4. | Сачыненне як від работы па развіцці звязнага маўлення вучняў.<br>1. Класіфікацыя сачыненняў.<br>2. Спосабы падрыхтоўкі да сачынення.<br>3.Методыка правядзення сачыненняў | 4 | | | | | [1]<br>[2]<br>[8] | |
| 1.2.5. | Пераклад як від навучальных практыкаванняў па развіцці маўлення вучняў.<br>1. Тыпалогія перакладаў.<br>2. Прыёмы перакладу. | 2 | | | | | [1]<br>[2]<br>[8] | |

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 3. Методыка правядзення перакладаў. | | | | | | | |
| 1.2.6. | Ацэнка камунікатыўнай пісьменнасці вучняў.<br>1. Класіфікацыя, улік, прыёмы выпраўлення памылак.<br>2. Нормы ацэнкі творчых прац. | | | 2 | | Нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па беларускай мове. | [1]<br>[2]<br>[5] | Канспектаванне нарматыўнага дакумента |
| **1.3.** | **Методыка вывучэння раздзелаў школьнага курса беларускай мовы (48 г.)** | **20** | **16** | **12** | | | | |
| 1.3.1. | Методыка навучання арфаграфіі.<br>1. Мэты, змест, прынцыпы навучання арфаграфіі.<br>2. Методыка азнаямлення вучняў з арфаграмай і арфаграфічным правілам.<br>3. Арфаграфічныя практыкаванні, іх віды, методыка правядзення.<br>4. Удасканаленне арфаграфічных уменняў і навыкаў. | 6 | | | | | [1]<br>[2] | |
| 1.3.2. | Методыка навучання арфаграфіі.<br>1. Змест і задачы навучання арфаграфіі ў школе.<br>2. Методыка азнаямлення вучняў з арфаграмай і арфаграфічным правілам (правядзенне фрагмента ўрока).<br>3. Арфаграфічныя практыкаванні, іх віды, методыка правядзення (правядзенне фрагмента ўрока). | | 4 | | | Вучэбная праграма і падручнікі па беларускай мове для агульнаадукацыйных установ | [1]<br>[2] | |
| 1.3.3. | Методыка навучання арфаграфіі. | | | 2 | | Вучэбная праграма і | [1] | Напісанне |



РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1. Правядзенне ўрока па арфаграфіі.<br>2. Аналіз праведзенага ўрока. | | | | | падручнікі па беларускай мове для агульнаадукацыйных устаноў | [2] | плана-канспекта ўрока |
| 1.3.4. | Класіфікацыя, улік, прыёмы выпраўлення арфаграфічных памылак. | | | 1 | | Нормы ацэнкі вучэбных дасягненняў школьнікаў | [1]<br>[2]<br>[5] | Канспектаванне нарматыўнага дакумента |
| 1.3.5. | Методыка навучання пунктуацыі.<br>1. Мэты, змест, прынцыпы навучання пунктуацыі.<br>2. Методыка работы над пунктуацыйным правілам.<br>3. Віды пунктуацыйных практыкаванняў, методыка іх правядзення.<br>4. Асаблівасці навучання пунктуацыі пры вывучэнні несінтаксічных тэм. | 2 | | | | | [1]<br>[2] | |
| 1.3.6. | Методыка навучання пунктуацыі.<br>1. Змест і задачы навучання пунктуацыі.<br>2. Методыка работы над пунктуацыйным правілам (правядзенне фрагмента ўрока).<br>3. Віды пунктуацыйных практыкаванняў, методыка іх правядзення (правядзенне фрагмента ўрока). | | 2 | | | Вучэбная праграма і падручнікі па беларускай мове для агульнаадукацыйных устаноў | [1]<br>[2] | |

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.3.7. | Методыка навучання пунктуацыі.<br>1. Правядзенне ўрока па пунктуацыі.<br>2. Аналіз праведзенага ўрока. | | | 2 | | Вучэбная праграма і падручнікі па беларускай мове для агульнаадукацыйных устаноў | [1]<br>[2]<br>[7] | Напісанне плана-канспекта ўрока |
| 1.3.8. | Класіфікацыя, улік, прыёмы выпраўлення пунктуацыйных памылак. | | | 1 | | Нормы ацэнкі вучэбных дасягненняў школьнікаў | [1]<br>[2]<br>[5] | Канспектаванне нарматыўнага дакумента |
| 1.3.9. | Методыка вывучэння фанетыкі.<br>1. Значэнне, змест, задачы, прынцыпы вывучэння фанетыкі.<br>2. Характар і віды фанетычных і фанетыка-графічных практыкаванняў.<br>3. Фарміраванне арфаэпічных і акцэнталагічных навыкаў пры вывучэнні фанетыкі. | 2 | | | | | [1]<br>[2]<br>[10] | |
| 1.3.10. | Методыка вывучэння фанетыкі.<br>1. Змест, задачы, прынцыпы вывучэння фанетыкі.<br>2. Фанетычныя і фанетыка-графічныя практыкаванні, методыка іх правядзення. | | 2 | | | Вучэбная праграма і падручнікі па беларускай мове для агульнаадукацыйных устаноў | [1]<br>[2]<br>[10] | |
| 1.3.11. | Методыка вывучэння лексікі і фразеалогіі.<br>1. Значэнне, змест, задачы, прынцыпы вывучэння лексікі і фразеалогіі.<br>2. Методыка азнаямлення вучняў з | 2 | | | | | [1]<br>[2]<br>[11] | |

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | асноўнымі лексічнымі і фразеалагічнымі паняццямі.<br>3. Віды лексічных і фразеалагічных практыкаваняў. | | | | | | | |
| 1.3.12. | Методыка вывучэння лексікі і фразеалогіі.<br>1. Змест, задачы, прынцыпы вывучэння лексікі і фразеалогіі.<br>2. Методыка азнаямлення вучняў з асноўнымі лексічнымі і фразеалагічнымі паняццямі (правядзенне фрагмента ўрока)..<br>3. Віды лексічных і фразеалагічных практыкаваняў, методыка іх правядзення. | | 2 | | | Вучэбная праграма і падручнікі па беларускай мове для агульнаадукацыйных устаноў | [1]<br>[2]<br>[11] | Розныя віды апытвання |
| 1.3.13. | Методыка вывучэння марфемнай будовы слова, словаўтварэння.<br>1. Значэнне, задачы, змест, прынцыпы вывучэння марфемнай будовы слова і словаўтварэння.<br>2. Сістэма практыкаванняў і заданняў.<br>3. Удасканаленне словаўтваральных уменняў і навыкаў пры вывучэнні часцін мовы. | 2 | | | | | [1]<br>[2] | |
| 1.3.14. | Методыка вывучэння марфемнай будовы слова, словаўтварэння.<br>1. Змест, прынцыпы вывучэння марфемнай будовы слова і | | 2 | | | Вучэбная праграма і падручнікі па беларускай мове для агульнаадукацыйных | [1]<br>[2] | Розныя віды апытвання |

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | словаўтварэння.<br>2. Сістэма практыкаванняў і заданняў, методыка іх правядзення. | | | | | устаноў | | |
| 1.3.15. | Методыка вывучэння марфалогіі.<br>1. Месца, значэнне, змест, мэты, прынцыпы вывучэння марфалогіі.<br>2. Методыка азнаямлення вучняў з марфалагічнымі паняццямі.<br>3. Віды марфалагічных практыкаванняў.<br>4. Узнаўленне ведаў па марфалогіі пры вывучэнні іншых раздзелаў курса. | 2 | | | | | [1]<br>[2]<br>[12]<br>[21] | |
| 1.3.16. | Методыка вывучэння марфалогіі.<br>1.Змест, мэты, прынцыпы вывучэння марфалогіі.<br>2. Методыка азнаямлення вучняў з марфалагічнымі паняццямі (правядзенне фрагмета ўрока).<br>3. Віды марфалагічных практыкаванняў, методыка іх правядзення. | | 2 | | | Вучэбная праграма і падручнікі па беларускай мове для агульнаадукацыйных устаноў | [1]<br>[2]<br>[12]<br>[21] | Розныя віды апытвання |
| 1.3.17. | Методыка вывучэння марфалогіі.<br>1. Правядзенне ўрока па марфалогіі.<br>2. Аналіз праведзенага ўрока. | | | 2 | | Вучэбная праграма і падручнікі па беларускай мове | [1]<br>[2]<br>[12]<br>[21] | Напісанне плана-канспекта ўрока |
| 1.3.18. | Методыка вывучэння сінтаксісу.<br>1. Месца, значэнне, мэты, змест, прынцыпы, этапы вывучэння | 2 | | | | | [1]<br>[2]<br>[18] | |

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | сінтаксісу.<br>2. Фарміраванне сінтаксічных паняццяў.<br>3. Віды сінтаксічных практыкаванняў. | | | | | | [19] | |
| 1.3.19. | Методыка вывучэння сінтаксісу.<br>1. Мэты, змест, прынцыпы вывучэння сінтаксісу.<br>2. Фарміраванне сінтаксічных паняццяў (правядзенне фрагмента ўрока)<br>3. Віды сінтаксічных практыкаванняў, методыка іх правядзення. | | 2 | | | Вучэбная праграма і падручнікі па беларускай мове для агульнаадукацыйных устаноў | [1]<br>[2]<br>[18]<br>[19] | Розныя віды апытвання |
| 1.3.20. | Методыка вывучэння сінтаксісу.<br>1. Правядзенне ўрока па сінтаксісе.<br>2. Аналіз праведзенага ўрока. | | | 2 | | | [1]<br>[2]<br>[18]<br>[19] | Напісанне плана-канспекта ўрока |
| 1.3.21. | Методыка вывучэння стылістыкі.<br>1. Значэнне, задачы, асаблівасці вывучэння стылістыкі.<br>2. Методыка азнаямлення вучняў з функцыянальнымі стылямі маўлення.<br>3. Практыкаванні па фарміраванні стылістычных уменняў і навыкаў. | 2 | | | | | [1]<br>[2] | |
| 1.3.22. | Правілы фарміравання культуры вуснай і пісьмовай мовы ў агульнаадукацыйных установах. | | | 2 | | Правілы фарміравання культуры вуснай і пісьмовай мовы | [2] | Пісьмовая праца (канспектаванне нарматыўнага дакумента) |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.4. | **Пазакласная праца па беларускай мове (2 г.)** | **2** | | | | | | |
| 1.4.1. | Пазакласная праца па беларускай мове.<br>1. Значэнне, задачы і прынцыпы арганізацыі пазакласнай працы па беларускай мове.<br>2. Формы і віды пазакласнай працы, методыка іх правядзення. | **2** | | | | | [1]<br>[2]<br>[14] | |

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

## ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

### АСНОЎНАЯ


1. Методыка выкладання беларускай мовы / М. Г. Яленскі [і інш.]; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск, 2007.
2. *Яленскі, М. Г.* Методыка выкладання беларускай мовы: практыкум / М. Г. Яленскі, У. П. Саўко, Л. С. Васюковіч. – Мінск, 2006.
3. Яленскі, М. Г. Методыка выкладання беларускай мовы. Сучасная лінгвадыдактыка / М. Г. Яленскі. – Мінск, 2005.
4. *Протчанка, В. У.* Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове / В. У. Протчанка. – Мінск, 2001.
5. Ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» // Нормы оценки результатов учебной деятельности учащихся общеобразовательных учреждений по учебным предметам. – Минск, 2009.
6. Вучэбная праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская мова. V–XI класы. – Мінск, 2010.
7. Падручнікі па беларускай мове для агульнаадукацыйных устаноў (апошнія выданні).


### ДАДАТКОВАЯ


8. *Валочка, Г. М.* Тэарэтыка-метадычныя асновы развіцця звязнага маўлення вучняў на ўроках беларускай мовы: 5–10 класы / Г. М. Валочка. – Мінск, 2005.
9. *Васюковіч, Л. С.* Вучэбны тэкст у школьным падручніку па беларускай мове / Л. С. Васюковіч. – Мінск, 2005.
10. *Выгонная, Л. Ц.* Фанетыка беларускай мовы ў школе / Л. Ц. Выгонная. – Мінск, 1995.
11. *Даніловіч, М. А.* Вывучэнне фразеалогіі на ўроках мовы / М. А. Даніловіч. – Мінск, 1991.
12. *Лаўрэль, Я. М.* Вывучэнне марфалогіі ў школе / Я. М. Лаўрэль, Т. Р. Новікава, С. А. Язерская. – Мінск, 1991.
13. *Литвинко, Ф. М.* Методика изучения разделов школьного курса русского языка (функциональный подход). – Минск, 2001.
14. *Малажай, Г. М.* Пазакласная праца па беларускай мове / Г. М. Малажай, С. Р. Рачэўскі. – Мінск, 1990.
15. Методика преподавания русского языка в школе / М. Т. Баранов [и др.]; под ред. М. Т. Баранова. – М., 2000.


РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

16. *Паўлоўская, В. І.* Мова: цікава і займальна / В. І. Паўлоўская. – Мінск, 1989.
17. *Петровский, Г. Н.* Педагогические и образовательные технологии современной школы / Г. Н. Петровский. – Минск, 2003.
18. *Протчанка, В. У.* Вывучэнне сінтаксісу ў школе. Складаны сказ / В. У. Протчанка. – Мінск, 1989.
19. *Протчанка, В. У.* Вывучэнне сінтаксісу ў школе. Словазлучэнне. Просты сказ / В. У. Протчанка.– Мінск, 1984.
20. *Протчанка, В. У.* Шматаспектны аналіз пры вывучэнні сінтаксісу беларускай мовы / В. У. Протчанка. – Мінск, 1987.
21. *Саўко, У. П.* Развіццё маўлення школьнікаў пры вывучэнні марфалогіі (назоўніка і прыметніка) / У. П. Саўко. – Мінск, 2000.
22. *Селевко, Г. К.* Современные образовательные технологии / Г. К. Селевко. – М., 1998.
23. Теория и практика обучения русскому языку / Е. В. Архипова [и др.]; под ред. Р. Б. Сабаткоева. – М., 2005.

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

# АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ ВЫКЛАДАННЯ ГРАМАТЫКІ

## Актуалізацыя ведаў па лінгвістыцы і педагогіцы

1. Як вы разумееце тэрмін “граматыка”? У якіх значэннях ён ужываецца?

2. Што вывучае граматыка як раздзел мовазнаўства? З якіх частак яна складаецца?

3. Растлумачце сэнс паняцця “прынцыпы навучання”. Назавіце асноўныя агульнадыдактычныя прынцыпы.

## Праблемныя пытанні

1. Якое значэнне мае вывучэнне граматыкі ў школе?
2. Якія напрамкі існавалі ў методыцы выкладання граматыкі?
3. На якіх прынцыпах асноўваецца выкладанне граматыкі ў сучаснай школе?
4. Як ажыццяўляецца ўзбагачэнне граматычнага ладу маўлення вучняў?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 1. Значэнне і задачы вывучэння граматыкі ў школьным курсе беларускай мовы

Засвоіць мову, навучыцца карыстацца ёй можна шляхам пераймання. Так адбываецца з кожным чалавекам, які, пачынаючы з першых гадоў жыцця, паступова авалодвае лексічным багаццем і нормамі роднай мовы. Аднак засвоіць мову на такім узроўні, які неабходны для кожнага культурнага, адукаванага чалавека, можна толькі ў выніку сістэматычнага і мэтанакіраванага яе вывучэння.

У школьным курсе беларускай мовы цэнтральнае месца займае граматыка. Яе вывучэнне дазваляе асэнсаваць і засвоіць асноўныя граматычныя законы і правілы, авалодаць нормамі беларускай літаратурнай мовы, узбагаціць граматычны лад маўлення і слоўнікавы запас школьнікаў, удасканаліць камунікатыўныя ўменні і навыкі. Значную ролю адыгрываюць граматычныя веды і ў фарміраванні арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці вучняў. Вывучэнне гэтага раздзела беларускай мовы садзейнічае таксама развіццю лагічнага мыслення, памяці, увагі, пашырае агульны кругагляд школьнікаў.

Пры навучанні граматыцы неабходна вырашыць наступныя задачы:

– пазнаёміць вучняў з граматычным ладам беларускай мовы, з асноўнымі асаблівасцямі граматычных адзінак;

– паказаць функцыю граматычных адзінак у маўленні;

– сфарміраваць у школьнікаў неабходныя вучэбна-моўныя ўменні і навыкі;

– развіць граматычны лад маўлення, узбагаціць слоўнік вучняў;

– выпрацаваць навыкі свядомага выкарыстання законаў граматыкі пры стварэнні ўласных вусных і пісьмовых выказванняў;

– стварыць умовы (перадумовы) для фарміравання арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці вучняў.

## 2. Кароткія звесткі з гісторыі выкладання граматыкі

У методыцы выкладання граматыкі існавалі розныя напрамкі: логіка-граматычны, фармальна-граматычны, семантыка-граматычны, структурна-семантычны і інш. Кожны з іх быў адметны новымі метадычнымі ідэямі, поглядамі яго прадстаўнікоў на асноўныя пытанні навучання мове.

Л о г і к а - г р а м а т ы ч н ы накірунак асноўваўся на аднайменнай лінгвістычнай школе Ф. І. Буслаева, якая разглядала граматыку як навуку, што адлюстроўвае агульныя законы логікі і мовы. Прызнаючы сувязь паміж мовай і мысленнем, Ф. І. Буслаеў аддаваў перавагу фармальнай логіцы ў параўнанні з канкрэтнымі спосабамі вырашэння думкі сродкамі мовы. У далейшым гэта прывяло да збліжэння і нават змешвання лагічных катэгорый з граматычнымі. Напрыклад, сказам Ф. І. Буслаеў лічыў суджэнне, выражанае словамі[1].

Прадстаўнікі логіка-граматычнага напрамку (І. І. Сразнеўскі, К. Дз. Ушынскі, У. П. Шарамецеўскі і інш.) лічылі, што галоўнай мэтай выкладання граматыкі ў школе з'яўляеецца развіццё лагічнага мыслення і духоўных здольнасцей вучняў. На думку Ф. І. Буслаева, граматыка ў школе замяняе логіку і павінна быць дадаткам да чытання, да вусных і пісьмовых практыкаванняў. У выніку засваенню вучнямі спецыфікі мовы, яе граматычных формаў, структурных асаблівасцей не надавалі належнай увагі.

Ф а р м а л ь н а - г р а м а т ы ч н ы накірунак выкладання граматыкі сфарміраваўся ў пачатку XX стагоддзя. Найбольш вядомым яго прадстаўніком з'яўляўся А. М. Пяшкоўскі. У Беларусі актыўным прыхільнікам фармальна-граматычнага напрамку быў Я. Лёсік, аўтар папулярных у 20-я гады падручнікаў "Пачатковая граматыка" і "Школьная граматыка беларускай мовы". Пачынаючы з першых гадоў Савецкай улады і да прыняцця ў 1931 годзе пастановы ЦК ВКП(б) "Аб пачатковай і сярэдняй школе" фармальна-граматычны напрамак быў асноўным у школьным выкладанні граматыкі. У адпаведнасці з ім моўныя адзінкі адрозніваліся толькі знешнімі, фармальнымі прыметамі. Напрыклад, прыметнікам называлася любое слова, якое мела форму роду і скланялася: *зялены, скошаны, пяты, кожны*. Вызначэнне склону адбывалася не на

[1] Буслаев Ф. И. Историческая грамматика русского языка. Синтаксис. – М., 1869. – С. 8.

аснове пытанняў, а па канчатках, г. зн. па знешніх прыметах. Асноўным аб’ектам вывучэння сінтаксісу прызнавалася словазлучэнне, як від словазлучэння разглядаўся сказ.

Галоўным і, па сутнасці, адзіным метадам вывучэння граматыкі лічылася назіранне над мовай, таму што яно развівала мысленне вучняў, вучыла іх знаходзіць і класіфікаваць моўныя з’явы, абагульняць факты, рабіць неабходныя вывады.

Фармальна-граматычны накірунак меў значныя недахопы: моўныя з’явы вывучаліся аднабакова, увага школьнікаў засяроджвалася выключна на знешніх прыметах граматычных адзінак, не ствараліся ўмовы для арганізацыі працы па арфаграфіі, пунктуацыі, развіцці маўлення і інш.

С е м а н т ы к а - г р а м а т ы ч н ы напрамак быў адметны тым, што вывучэнне моўных фактаў і з’яў адбывался на аснове раскрыцця іх семантычных і структурных асаблівасцей. Прычым асноўная ўвага скіроўвалася на семантычныя прыметы, а знешнія, фармальныя прыметы адсоўваліся на другі план. І як вынік гэтага, пры вывучэнні граматыкі многія моўныя факты трактаваліся недакладна, няправільна. Напрыклад, даданыя часткі ў складаназалежным сказе разглядаліся як разгорнутыя даданыя члены сказа.

С т р у к т у р н а - с е м а н т ы ч н ы напрамак у методыцы выкладання граматыкі ўзнік у пачатку 60-х гадоў XX стагоддзя. Яго асаблівасцю з’яўляецца тое, што любая лінгвістычная адзінка, якая вывучаецца на ўроках мовы, разглядаецца ў непарыўным адзінстве і ўзаемасувязі формы (структуры) і значэння (семантыкі), а ў далейшым і ўжывання ў маўленчай практыцы. У прыватнасці, словазлучэннем лічылася граматычна аформленае спалучэнне двух ці больш слоў, якія абазначаюць прадмет, прымету, дзеянне больш дакладна, чым асобнае слова.

Ідэі структурна-семантычнага напрамку ў значнай ступені рэалізуюцца і ў сучасных школьных праграмах і падручніках па беларускай мове. Хоця трэба зазначыць, што курс беларускай мовы ў сучаснай школе набывае ўсё большую маўленчую накіраванасць: аўтары падручнікаў імкнуцца паказаць прызначэнне, функцыю моўных адзінак ў маўленні, раскрыць іх ролю ў рэалізацыі асноўнай, камунікатыўнай функцыі мовы.

### 3. Асноўныя прынцыпы выкладання граматыкі

Выкладанне граматыкі ў школе асноўваецца на агульнадыдактычных і спецыяльных, метадычных, прынцыпах. І першыя, і другія выкарыстоўваюцца на ўроках вывучэння граматыкі з улікам яе спецыфікі, асаблівасцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Да спецыяльных прынцыпаў выкладання граматыкі адносяцца структурна-семантычны, функцыянальны, камунікатыўнай накіраванасці, нарматыўна-стылістычны, узаемасувязі вывучэння ўсіх узроўняў беларускай мовы, гістарычны і інш.

С т р у к т у р н а - с е м а н т ы ч н ы прынцып патрабуе пры аналізе моўных з’яў звяртаць аднолькавую ўвагу на іх структуру (будову) і семантыку (значэнне). Наяўнасць гэтага прынцыпу тлумачыцца тым, што ў мове рэальна існуе ўзаемасувязь формы і зместу, і гэта трэба паказаць вучням. Напрыклад, формы роднага склону назоўнікаў могуць абазначаць частку ад цэлага (*кілаграм мукі*), прыналежнасць (*дом бацькі*), аб’ект дзеяння (*напісанне кнігі*) і інш. Формы назоўнікаў з суфіксамі ацэнкі не толькі называюць прадмет, але і выражаюць пэўныя адносіны да яго таго, хто гаворыць: *Але як весела і міла тут пчолка ў вуллях гаманіла!* (Я. Колас). Пры вывучэнні складанага сказа вучні павінны не толькі пазнаёміцца з яго структурай, сродкамі сувязі частак, але і ўсвядоміць тыя сэнсавыя адносіны, якія выражаюцца паміж часткамі.

Ф у н к ц ы я н а л ь н ы прынцып прадугледжвае паказ ролі, функцыі граматычных адзінак ў маўленні. Напрыклад, пры вывучэнні прыметніка школьнікі ўсведамляюць, што словы гэтай часціны мовы ўжываюцца там, дзе трэба ахарактарызаваць прадмет, паказаць яго прыметы па адносінах да часу, месца, матэрыялу, прасторы (*учарашні, вясковы, драўляны, высокі*), звярнуць увагу на знешнія і унутраныя якасці і ўласцівасці (*стройны, малады, прыгожы, добры*), прыналежнасць каму-небудзь (*бацькаў*), колер (*белы*), прызначэнне (*лекцыйная*) і інш. Пры вывучэнні словазлучэння ўвага вучняў засяроджваецца на тым, што словазлучэнне, як і слова, таксама выконвае намінатыўную функцыю, але, у адрозненне ад слова, дае разгорнутую назву прадметаў і з’яў рэчаіснасці, адначасова канкрэтызуючы і звужаючы іх значэнне.

Прынцып к а м у н і к а т ы ў н а й н а к і р а в а н а с ц і прадугледжвае, што пры вывучэнні граматыкі школьнікі вучацца выкарыстоўваць часціны мовы, іх формы, разнастайныя сінтаксічныя канструкцыі ў маўленні з улікам сітуацыі зносін. Гэты прынцып арыентуе настаўніка на арганізацыю на ўроку актыўнай маўленчай дзейнасці вучняў і тым самым на вырашэнне галоўнай задачы навучання мове – авалоданне ёй як сродкам зносін.

Н а р м а т ы ў н а - с т ы л і с т ы ч н ы прынцып мае на ўвазе навучанне нормам беларускай літаратурнай мовы, правільнаму выбару моўных адзінак з улікам стылю і жанру маўлення. Пры вывучэнні граматыкі асаблівая ўвага надаецца граматычным нормам (словаўтваральным, марфалагічным, сінтаксічным), функцыянаванню часцін мовы і сінтаксічных канструкцый у тэкстах пэўных функцыянальных стыляў. Напрыклад, пры аналізе сказаў з аднароднымі членамі ўвага вучняў засяроджваецца і на тым, что аднародныя члены

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

павінны ўяўляць сабой суадносныя, лексічна і марфалагічна адпаведныя паняцці, таму сказ тыпу “Ішоў вучань і снег” пабудаваны з парушэннем сінтаксічных нормаў беларускай мовы. Часціцы, выклічнікі, словы з ярка выражанай эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбоўкай (*плакса, задавака, сынок* і інш.) з’яўляюцца характэрнай асаблівасцю гутарковага стылю, якому таксама ўласцівы няпоўныя канструкцыі, словы-сказы, пытальныя і клічныя сказы і інш.

Сутнасць прынцыпу ў з а е м а с у в я з і в ы в у ч э н н я ў с і х р а з д з е л а ў беларускай мовы яскрава відаць з самой яго назвы. Вядома, што ў школьным курсе беларускай мовы вывучаюцца розныя яе ўзроўні: фанетычны, лексічны, граматычны. І вельмі часта свядомае засваенне граматычных тэм не можа адбывацца без апоры на фанетыку, лексіку. Напрыклад, пры вывучэнні скланення назоўнікаў школьнікі абапіраюцца на такія паняцці, як націск, цвёрдыя, мяккія, зацвярдзелыя зычныя, лексічнае значэнне слова і інш. У сваю чаргу трывалыя веды па граматыцы з’яўляюцца неабходнай умовай для паспяховага фарміравання пэўных арфаграфічных і пунктуацыйных уменняў і навыкаў вучняў.

Г і с т а р ы ч н ы прынцып прадугледжвае улік змен, якія адбыліся ў мове з цягам часу. Пры вывучэнні некаторых граматычных тэм да месца будуць і невялікія гістарычныя каментарыі. Напрыклад, пры вывучэнні склону назоўнікаў можна паведаміць, што ў старажытнай беларускай мове быў сёмы склон – клічны. Яго формы і сёння ўжываюцца ў мастацкім, гутарковым і публіцыстычным стылях: *Лепш змагацца вольным, браце, чым цярпець ды гнуцца* (Я. Колас). Вучні павінны зразумець, што мова – гэта “жывая сістэма”, якая знаходзіцца ў пастаянным развіцці. Рэалізацыя гістарычнага прынцыпу будзе садзейнічаць фарміраванню лінгвістычнага светапогляду вучняў, павышэнню цікавасці школьнікаў да вывучэння мовы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 4. Узбагачэнне граматычнага ладу маўлення вучняў

Граматыку роднай мовы дзеці засвойваюць з першых гадоў жыцця і ўжо ў дашкольным узросце ў асноўным правільна ўтвараюць марфалагічныя формы слоў, будуюць простыя і складаныя сказы, выказваюць свае думкі дастаткова зразумела, выкарыстоўваючы пры гэтым сінтаксічныя канструкцыі, характэрныя для гутарковага стылю. Авалоданне маўленнем адбываецца ў працэсе пераймання маўлення дарослых, пры гэтым стымулам служыць імкненне да пазнання навакольнага свету, патрэбнасць у зносінах.

Актыўнае ўзбагачэнне маўлення адбываецца ў школе. У малодшых класах фарміруюцца навыкі чытання і пісьма, дзеці вучацца правільна будаваць адказы на пытанні, узнаўляць змест тэкстаў, ствараць уласныя

выказваннні. Вынікам гэтага з’яўляецца колькаснае павелічэнне слоўнікавага запасу вучняў, рост памераў і складанасці сінтасічных канструкцый, якія выкарыстоўваюць школьнікі ва ўласных выказваннях, і інш. Аналагічныя тэндэнцыі назіраюцца і ў сярэдняй школе. Напрыклад, было ўстаноўлена, што сярэдні памер сказаў у маўленні вучняў чацвертага класа – 7 слоў, шостага – 9, восьмага – 10, дзесятага – 11-12 слоў. Працэнт ужывання складаных сказаў адпаведна 22 – 32 – 36 – 41. Былі выяўлены таксама састаў і суадносіны членаў сказа ў маўленні вучняў розных класаў, якасць засваення школьнікамі рознага ўзросту марфалагічнага складу мовы і інш.

У маўленні школьнікаў у выніку спецыяльных даследаванняў былі вызначаны таксама і шматлікія недахопы, сярод якіх і наступныя: 1) беднасць сінтаксічнага ладу маўлення, якая праяўляецца ва ўжыванні ў пісьмовых тэкстах аднастайных сінтаксічных канструкцый; 2) ужыванне ў выказваннях пэўнага стылю маўлення граматычных адзінак іншай стылёвай афарбоўкі.

Узбагачэнне граматычнага ладу маўлення школьнікаў павінна адбывацца як пры вывучэнні граматычных тэм, так і ў працэсе падрыхтоўкі да напісання творчых прац: пераказаў, сачыненняў і інш.

На ўроках вывучэння граматыкі з мэтай узбагачэння граматычнага ладу маўлення вучняў можна прапанаваць наступныя віды практыкаванняў:

1. Практыкаванні на пабудову словазлучэнняў і сказаў пэўнага тыпу, структуры, з пэўнымі словаформамі.

Канструяванне сінтаксічных адзінак можа адбывацца:

– па пэўным ўзоры. Напрыклад, пры вывучэнні складаных сказаў з даданымі выказнікавымі школьнікам прапануецца пабудаваць некалькі сказаў на ўзор наступнага: *Якое карэнне, такое і насенне*. (Прыказка);

– па прапанаванай мадэлі. Напрыклад, вучні атрымліваюць заданне скласці словазлучэнні тыпу “дзеяслоў + назоўнік”, “прыметнік + назоўнік”, у якіх бы адлюстроўваліся асаблівасці беларускага кіравання;

– па графічнай схеме. Напрыклад, пры вывучэнні простай мовы школьнікі складаюць сказы па схеме “П, – а. – П”.

Эфектыўнасць падобных заданняў значна ўзрастае, калі ўказваецца і зместавы кампанент сінтаксічных канструкцый, г. зн. яны будуюцца на аснове малюнка, рэпрадукцыі карціны, на пэўную тэму і інш.

2. Практыкаванні на замену адных сінтаксічных канструкцый другімі.

Напрыклад, пры вывучэнні тэмы “Адасобленыя азначэнні” вучні атрымліваюць заданне перабудаваць сказы так, каб адасобленыя азначэнні сталі неадасобленымі, і наадварот. Такія практыкаванні можна выконваць і на аснове тэксту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Практыкаванні на выбар з групы слоў, з прапанаваных канструкцый тых, ужыванне якіх будзе дарэчным у пэўнай сітуацыі зносін, у пэўным стылі маўлення.

4. Вольныя дыктанты і пераказы з дадатковым граматычным заданнем.

Вядома, што пры выкананні такіх прац вучні ўзнаўляюць змест зыходнага тэксту, аднак, як сведчыць практыка, дастаткова часта выкарыстоўваюць пры гэтым сінтаксічныя канструкцыі, неўласцівыя стылю зыходнага тэксту.

З мэтай узбагачэння граматычнага ладу маўлення пры правядзенні, напрыклад, вольнага дыктанту: а) ажыццяўляецца папярэдні аналіз зыходнага тэксту, тых сінтаксічных адзінак, якія адлюстроўваюць яго стылістычныя асаблівасці; б) паведамляецца дадатковае заданне (пры перадачы зместу тэксту захаваць структуру пэўных сінтаксічных адзінак); в) рэдагуецца першы варыянт тэксту (увага звяртаецца на дарэчнасць выкарыстання сінтаксічных адзінак пэўнай структуры); г) калектыўна абмяркоўваюцца створаныя тэксты, аналізуюцца сінтаксічныя адзінкі пэўнай структуры, якія выкарыстаны ў адпаведнасці з дадатковым заданнем.[2]

5. Пабудова ўласных тэкстаў з выкарыстаннем пэўных марфалагічных і сінтаксічных адзінак.

Такі від працы ўяўляе для вучняў пэўную складанасць, таму што ў рэальнай маўленчай сітуацыі тэксты будуюцца не для таго, каб выкарыстаць у іх пэўныя моўныя сродкі, а з мэтаю знасін. Таму настаўнік павінен вызначыць, пры вывучэнні якой тэмы такая праца будзе мэтазгоднай, на якую тэму будуць пісаць школьнікі, тэкст якога стылю і жанру яны павінны пабудаваць і інш. Як правіла, вучням прапаноўваюцца дастаткова простыя, зразумелыя і даступныя тэмы, якія не патрабуюць дадатковых тлумачэнняў па змесце выказвання. Школьнікі будуюць такія разнавіднасці тэкстаў, да напісання якіх яны ўжо ў значнай ступені падрыхтаваны.

Напрыклад, пры вывучэнні тэмы “Ступені параўнання прыметнікаў” вучні атрымліваюць заданне ўтварыць ад прыметнікаў *прыгожы, зялёны, высокі, нізкі, круты, абрывісты* і інш. формы вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання, а затым напісаць невялікае сачыненне-апісанне берагоў ракі, выкарыстоўвачы ў ім па магчымасці гэтыя формы прыметнікаў.

У некаторых выпадках школьнікам можна прапанаваць магчымы пачатак сачынення, які накіруе іх думкі, падкажа жанр, стыль, тып маўлення будучага выказывання. Напрыклад, пасля вывучэння тэмы

[2] Методика преподавания русского языка в школе: Учебник для студ. высш. пед. учеб. заведений / Под ред. М. Т. Баранова. – М., 2000. – С. 263.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“Прыналежныя прыметнікі, іх скланенне і правапіс” вучням прапануецца напісаць невялікае сачыненне-апавяданне па зададзеным пачатку, выкарыстоўваючы наступныя словазлучэнні: *бабуліны акуляры, Колеў партфель, бацькаў касцюм, Валіны лялькі* і інш. Прыкладны пачатак сачынення можа быць такі:

*Аднойчы, калі нікога не было дома, у Колевым пакоі сабраліся розныя рэчы і завялі размову пра тое, як ім жывецца...*

## Рэзюме

На праблему выкладання школьнага курса граматыкі існавалі розныя погляды, якія знаходзілі свае адлюстраванне ў розных напрамках: логіка-граматычным, фармальна-граматычным, семантыка-граматычным, структурна-семантычным і інш.

У курсе беларускай мовы граматыка займае асноўнае месца. Яе выкладанне ў школе асноўваецца на наступных метадычных прынцыпах: структурна-семантычным, функцыянальным, камунікатыўнай накіраванасці, нарматыўна-стылістычным, узаемасувязі вывучэння ўсіх узроўняў беларускай мовы, гістарычным і інш.

Вывучэнне граматыкі дазваляе школьнікам набыць неабходныя веды пра мову, яе граматычны лад, сфарміраваць неабходныя вучэбна-моўныя ўменні і навыкі. На аснове граматычных ведаў адбываецца засваенне арфаграфіі, пунктуацыі, нормаў літаратурнай мовы і інш.

## Дыскусія

Ці ўсе метадычныя прынцыпы выкладання граматыкі можна рэалізаваць пры вывучэнні кожнай граматычнай тэмы? Чаму?

## Літаратура

1. Выкладанне беларускай мовы ў школе / М. Г. Яленскі, Л. В. Васюковіч, І. М. Саматыя і інш. – Мн., 1994.

2. *Дудников А. В.* Методика изучения грамматики в восьмилетней школе. – М., 1977.

3. *Львов М. Р.* Тенденции развития речи учащихся средней школы. – М., 1978.

4. Методика преподавания русского языка в школе: Учебн. для студ. высш. педагог. учебн. заведений / Под ред. М. Т. Баранова. – М., 2000.

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

5. *Озерская В. П.* Изучение морфологии на синтаксической основе. – М., 1989.

6. *Протчанка В. У.* Шматаспекты аналіз пры вывучэнні сінтаксісу беларускай мовы. – Мн., 1987.

7. *Саўко У. П.* Развіццё маўлення школьнікаў пры вывучэнні марфалогіі (назоўніка і прыметніка): Дапаможнік для настаўнікаў. – Мн., 2000.

## ПЕРАКАЗ У СІСТЭМЕ РАБОТЫ ПА РАЗВІЦЦІ ЗВЯЗНАГА МАЎЛЕННЯ ШКОЛЬНІКАЎ

### Праблемныя пытанні

1. Якую ролю адыгрывае пераказ у сістэме работы па развіцці звязнага маўлення вучняў?
2. Як класіфікуюцца пераказы?
3. Якая методыка правядзення навучальных і кантрольных пераказаў?

У сістэме фарміравання навыкаў звязнага маўлення значнае месца займаюць пераказы.

**Пераказ** – від работы, накіраваны на перадачу ў вуснай ці пісьмовай форме прачытанага ці ўспрынятага на слых тэксту, стварэнне тэксту на аснове дадзенага. У працэсе падрыхтоўкі і правядзення пераказаў у вучняў выпрацоўваюцца ўменні ўспрымаць змест тэкстаў розных стыляў, тыпаў і жанраў, вызначаць іх тэму і асноўную думку, кампазіцыйную структуру, складаць план выказвання, удасканальваць напісанае і інш. Гэты від працы станоўча ўплывае на ўзбагачэнне слоўніка вучняў, развівае граматычны лад іх маўлення, удасканальвае арфаграфічную і пунктуацыйную пісьменнасць, садзейнічае фарміраванню ўмення правільна і мэтанакіравана выкарыстоўваць моўныя сродкі ў адпаведнасці з мэтай і ўмовамі зносін.

Нягледзячы на тое што пераказы з’яўляюцца традыцыйным відам працы на ўроках мовы, у метадычнай літаратуры няма адзінага погляду на іх класіфікацыю, адсутнічае і агульнапрынятая тэрміналогія для абазначэння відаў пераказаў. Аднак большасць навукоўцаў (Т. А. Ладыжанская, І. Дз. Марозава, Л. П. Падгайскі, А. В. Цекучоў і інш.) лічыць, што асноўныя характарыстыкі пераказу звязаны з мэтай правядзення, асаблівасцямі перадачы зместу зыходнага тэксту, спосабамі яго ўспрымання і інш.

Па мэце правядзення адрозніваюцца пераказы навучальныя і кантрольныя; па спосабу перадачы зыходнага тэксту – падрабязныя,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сціслыя і выбарачныя; па характары тэкставага матэрыялу – апавяданні, апісанні, разважанні і інш.; па ўспрыманні тэксту – пераказ прачытанага тэксту, пераказ пачутага тэксту, пераказ тэксту, успрынятага на слых і зрокава; па ступені самастойнасці выканання – індывідуальныя і калектыўныя; па ўскладненасці моўным заданнем – пераказы з лексічным, граматычным і іншымі заданнямі.

## Методыка правядзення навучальных пераказаў

На ўроках беларускай мовы найбольш часта выкарыстоўваюцца навучальныя пераказы, асноўная мэта правядзення якіх – навучыць школьнікаў ствараць тэкст на аснове зыходнага (дадзенага).

### Падрабязны пераказ

**Падрабязны пераказ** патрабуе ад вучняў як мага больш поўнага ўзнаўлення зместу прачытанага ці ўспрынятага на слых тэксту з захаваннем яго кампазіцыйнай формы і стылёвых асаблівасцей. Праца над падрабязным пераказам садзейнічае ўдасканаленню такіх агульнакамунікатыўных уменняў, як:

– уменне вызначаць тэму і асноўную думку тэксту, яго сэнсавую і кампазіцыйную структуру;

– уменне складаць план і падбіраць матэрыял да кожнага яго пункта;

– уменне выкарыстоўваць моўныя сродкі ў адпаведнасці з камунікатыўнай задачай;

– уменне ўдасканальваць створаны тэкст і інш.

Асноўныя **этапы правядзення навучальнага падрабязнага пераказу** наступныя:

1. Паведамленне тэмы, пастаноўка мэты ўрока.

Акрамя асноўнай мэты (фарміраванне ў вучняў умення паслядоўна і дэталёва перадаваць змест тэксту, захоўваючы яго стылёвыя асаблівасці), на кожным канкрэтным уроку вырашаюцца і дадатковыя мэты (задачы), якія залежаць ад таго, якія менавіта камунікатыўна-маўленчыя ўменні будуць фарміравацца ці ўдасканальвацца: уменне аналізаваць тэкст пераказу, знаходзіць у ім ключавыя словы, выкарыстоўваць у маўленні тыя ці іншыя моўныя сродкі і г. д.

2. Уступнае слова настаўніка.

На гэтым этапе ўрока можна паведаміць пра аўтара тэксту, твор, адкуль узяты тэкст для пераказу, звярнуць увагу на пэўныя праблемы (падзеі, факты), пра якія ідзе гаворка ў тэксце, і інш. Уступнае слова займае невялікі прамежак часу (2 – 3 хвіліны) і накіравана на падрыхтоўку школьнікаў да ўспрымання зместу тэксту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. В ы р а з н а е  ч ы т а н н е  т э к с т у.

Тэкст пераказу, як правіла, чытае настаўнік. Аднак, калі тэкст змешчаны ў падручніку, гэта могуць зрабіць і найбольш падрыхтаваныя вучні.

4. А н а л і з  т э к с т у  п е р а к а з у.

У працэсе аналізу вызначаецца стыль тэксту, яго тэма і асноўная думка. Затым адбываецца гутарка па змесце. Паколькі пераказ падрабязны, то ў час гутаркі неабходна высветліць, як школьнікі зразумелі і запомнілі не толькі тэкст у цэлым, але і пэўныя яго эпізоды, дэталі і інш.

Далей адбываецца аналіз кампазіцыі тэксту, састаўленне плана. Структура тэксту ў асноўным залежыць ад таго, да якога тыпу маўлення (апавяданне, апісанне, разважанне) ён адносіцца ці колькі тыпаў маўлення ў ім спалучаецца. Тэкст дзеліцца на лагічна завершаныя часткі (падтэмы, мікратэмы), састаўляецца яго план.

У малодшых класах сярэдняй школы план мэтазгодна састаўляць калектыўна, абапіраючыся на тыя ўменні, якімі вучні авалодалі ў пачатковай школе. Зытым, улічваючы магчымасці вучняў пэўнага класа, неабходна паступова пераходзіць да самастойнага састаўлення школьнікамі плана.

5. Л е к с і к а-с т ы л і с т ы ч н а я  п р а ц а.

У працэсе яе правядзення ўдакладняецца сэнс пэўных слоў і выразаў, аналізуюцца моўныя сродкі, выкарыстаныя ў тэксце пераказу.

У 5 – 6 класах сярэдняй школы лексіка-стылістычную працу можна спалучыць з састаўленнем плана і аформіць гэта ў выглядзе наступнай табліцы:

| План | Апорныя словы | Сродкі маўленчай выразнасці |
|---|---|---|
| | | |

Апорныя (ключавыя) словы – гэта словы (спалучэнні слоў), якія нясуць у тэксце асноўную сэнсавую нагрузку. Яны запісваюцца ў той паслядоўнасці, у якой выкарыстаны ў зыходным тэксце, і дапамагаюць школьнікам падрабязна ўзнавіць яго змест.

Сродкі моўнай выразнасці (эпітэты, метафары, параўнанні і інш.) адлюстроўваюць спецыфіку стылю маўлення, асаблівасці аўтарскага тэксту.

Запаўненне табліцы мэтазгодна пачынаць калектыўна, пры гэтым настаўнік дапамагае вучням, накіроўвае іх дзеянні на пошук тых ці іншых слоў і словазлучэнняў.

6. А р ф а г р а ф і ч н а я  п р а ц а.

Мэта такой працы – папярэдзіць арфаграфічныя памылкі. Гэта можна зрабіць наступным чынам:

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

а) выпісаць на дошку словы, з правапісам якіх вучні яшчэ не знаёміліся;

б) правесці невялікі папераджальны ці тлумачальны дыктант;

в) правесці ўскладненае спісванне (заданне: спісаць, устаўляючы прапушчаныя літары, растлумачыць іх правапіс) і інш.

Выконваючы падобныя заданні, вучні паўтараюць тыя арфаграмы, якія сустракаюцца ў тэксце пераказу.

7. П у н к т у а ц ы й н а я  п р а ц а.

Мэта пунктуацыйнай працы – папярэджанне пунктуацыйных памылак. Для яе правядзення можна выкарыстаць заданні, у якіх патрабуецца:

а) растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку ў пэўных сказах;

б) пры спісванні (запісванні) сказаў расставіць і растлумачыць знакі прыпынку;

в) перабудаваць адзін тып сінтаксічнай канструкцыі ў другі, растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку;

г) пабудаваць пунктуацыйныя схемы пэўных сказаў і інш.

8. В у с н ы  п е р а к а з  т э к с т у.

Пры вусным пераказе неабходна прывучаць школьнікаў абапірацца на план, выкарыстоўваць апорныя слова і сродкі маўленчай выразнасці, якія былі выпісаны ў час аналізу тэксту.

9. П а ў т о р н а е  ч ы т а н н е  т э к с т у.

10. П а д р ы х т о ў к а  п е р ш а г а (чарнавога) в а р ы я н т а  п е р а- к а з у.

11. А н а л і з  і  р э д а г а в а н н е  п е р ш а г а  в а р ы я н т а.

Як правіла, на гэтым этапе добра падрыхтаваны школьнік зачытвае свой варыянт тэксту. У гэты час настаўнік і вучні ўважліва слухаюць і адзначаюць, што было прапушчана ў тэксце, якія яго часткі перададзены недакладна ці няправільна і інш.

12. Н а п і с а н н е  п е р а к а з у.

Як бачым, праца над падрабязным пераказам павінна праходзіць у пэўнай паслядоўнасці, дзе кожны этап выконвае ўласцівую яму функцыю. Аднак рэалізацыя некаторых яе кампанентаў (арфаграфічная, пунктуацыйная праца) можа адбывацца на ўроках, якія папярэднічаюць напісанню пераказу.

## С ц і с л ы  п е р а к а з

**Сціслы пераказ** – гэта такі пераказ, пры якім адбываецца сціслая і абагульненая перадача зместу зыходнага тэксту.

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

Пры навучанні сціsламу пераказу, акрамя агульнакамунікатыўных, у вучняў фарміруюцца ўменні знаходзіць у тэксце асноўнае і другараднае, скарачаць тэкст рознымі спосабамі, адбіраць і выкарыстоўваць для абагульненай перадачы зместу адпаведныя моўныя сродкі.

На ўроку правядзення сціслага пераказу ў асноўным прысутнічаюць тыя ж **структурныя кампаненты**, што і пры напісанні падрабязнага пераказу. Аднак у змесце працы ёсць адрозненні, на якія мы і звернем увагу:

1. Паведамленне тэмы, пастаноўка мэты ўрока.

2. Уступнае слова настаўніка.

3. Выразнае чытанне тэксту.

Для сціслага пераказу выкарыстоўваюцца тэксты, якія па аб'ёме большыя за тэксты для падрабязнага пераказу. Яны звычайна ўключаюць дыялогі, апісанні прыроды, пачуццяў герояў і інш. Такія тэксты лёгка скарачаюцца, таму што вучні хутка знаходзяць тое, што можна перадаць сцісла, а што наогул можна апусціць.

4. Аналіз тэксту пераказу.

Пасля вызначэння тэмы, асноўнай думкі, стылю маўлення адбываецца гутарка па змесце тэксту. У час яе правядзення ўвага школьнікаў не засяроджваецца на тых дэталях, фактах і частках тэксту, якія ў далейшым будуць апушчаны.

Затым ідзе аналіз кампазіцыі тэксту, складанне плана і адбор неабходнага матэрыялу для пераказу. Працу можна арганізаваць наступным чынам. Тэкст дзеліцца на лагічна закончаныя часткі. У кожнай з іх называюцца падтэмы і мікратэмы, вызначаецца, якія з іх можна перадаць у скарочаным выглядзе, а якія ўвогуле апусціць, таму што яны не маюць істотнага значэння для перадачы зместу тэксту. Пасля гэтага складаецца план пераказу.

Пры адборы матэрыялу для пераказу складаныя канструкцыі замяняюцца простымі, сэнс дыялогаў перадаецца ўскоснай мовай, з вобразных сродкаў пакідаюцца толькі тыя, якія адыгрываюць у тэксце надзвычай важную ролю, некалькі сказаў, што служаць для перадачы пэўнай думкі, па магчымасці замяняюцца адным і г. д. Аднак, праводзячы такую працу, неабходна заўсёды памятаць, што тэкст пераказу павінен атрымацца зразумелым і звязным.

Для таго каб аблегчыць працу школьнікаў па напісанні сціслага пераказу, можна ў працэсе аналізу тэксту рабіць неабходныя запісы, напрыклад у выглядзе наступнай табліцы:

| **План** | **Рабочыя матэрыялы** |
|---|---|
| | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Насупраць пунктаў плана ў другой частцы табліцы запісваюцца словы, словазлучэнні, сказы, якія трэба выкарыстаць для сціслай перадачы зместу абзацаў, іх сувязі і г. д.

5. А р ф а г р а ф і ч н а я  п р а ц а.

Праводзіца так, які і пры падрабязным пераказе, але з улікам таго, як будзе гучаць сціслы пераказ.

6. П у н к т у а ц ы й н а я  п р а ц а.

Праводзіцца з улікам таго, што пераказ сціслы.

7. В у с н ы  п е р а к а з  т э к с т у.

8. П а д р ы х т о ў к а  п е р ш а г а (чарнавога) в а р ы я н т а  п е р а -к а з у .

9. А н а л і з  і р э д а г а в а н н е  п е р ш а г а  в а р ы я н т а  п е р а- к а з у.

10. Н а п і с а н н е  п е р а к а з у.

## В ы б а р а ч н ы  п е р а к а з

**Выбарачны пераказ** – гэта такі від пераказу, пры якім адбываецца ўзнаўленне зместу адной падтэмы (сюжэтнай лініі), яе перадача ў патрэбнай лагічнай паслядоўнасці.

Праца над выбарачным пераказам дазваляе школьнікам удасканаліць наступныя камунікатыўныя ўменні:

– вызначаць тэму і падтэмы зыходнага тэксту;

– адбіраць і сістэматызаваць матэрыял у адпаведнасці з тэмай і асноўнай думкай новага выказвання;

– будаваць тэкст іншага тыпу маўлення ў параўнанні з зыходным;

– знаходзіць і выкарыстоўваць моўныя сродкі для сувязі сабранага матэрыялу, для пабудовы тэксту ў тым стылі маўлення, якога патрабуе новае (другаснае) выказванне.

Урок правядзення выбарачнага пераказу мае наступную **структуру**:

1. П а в е д а м л е н н е  т э м ы  і  м э т ы  ў р о к а.

(Неабходна акцэнтаваць увагу школьнікаў, што пераказ выбарачны.)

2. У с т у п н а е  с л о в а  н а с т а ў н і к а.

3. В ы р а з н а е  ч ы т а н н е  т э к с т у.

Для выбарачнага пераказу падбіраюцца тэксты, у якіх можна выбраць і перадаць пэўную падтэму, элементы зместу якой знаходзяцца ў розных частках тэксту. Як правіла, такія тэксты спалучаюць некалькі тыпаў маўлення: апавяданне з элементамі апісання, апавяданне з элеменамі разважання і інш.

4. А н а л і з  т э к с т у  п е р а к а з у.

На гэтым этапе ўрока праца можа адбывацца ў наступнай паслядоўнасці:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

а) вызначэнне колькасці падтэм зыходнага тэксту і выбар той, якую трэба будзе перадаць;

б) гутарка па змесце выбранай падтэмы. (Адной з мэтаў такой гутаркі з'яўляецца першасны адбор матэрыялу, таму пытанні фармулююцца так, каб гаворка ішла толькі па выбранай падтэме і ў такой паслядоўнасці, у якой яна будзе перададзена ў другасным тэксце.);

в) вызначэнне стылю і тыпу маўлення таго тэксту, які патрэбна будзе стварыць, актуалізацыя ведаў пра структуру гэтага тыпу маўлення;

г) састаўленне плана выбарачнага пераказу.

5. Адбор матэрыялаў для пераказу і іх групаванне ў адпаведнасці з састаўленым планам.

Тэкст чытаецца яшчэ раз, а вучні (індывідуальна ці калектыўна) выбіраюць з яго толькі той матэрыял, які спатрэбіцца для перадачы зместу пэўнай падтэмы. Апорныя словы і словазлучэнні, сказы, якія дапамагаюць звязаць часткі тэксту, аформіць пачатак і інш., мэтазгодна запісаць, як і пры сціслым пераказе, у графу "Рабочыя матэрыялы". У час такой працы вучні павінны памятаць, што матэрыял па падтэме ў першасным тэксце можа размяшчацца не ў такой паслядоўнасці, якая павінна быць у другасным тэксце.

6. Арфаграфічная і пунктуацыйная праца.

Праца па папярэджанні арфаграфічныях і пунктуацыйных памылак праводзіцца толькі на тым матэрыяле, які можа быць выкарыстаны ў другасным тэксце.

7. Вусны пераказ тэксту.

У час вуснага пераказу вучні павінны абапірацца на план і размешчаныя ў патрэбнай паслядоўнасці рабочыя матэрыялы.

8. Падрыхтоўка першага (чарновага) варыянта пера-казу.

9. Аналіз і рэдагаванне першага варыянта пера- казу.

10. Напісанне пераказу.

## Пераказ з дадатковым заданнем

**Пераказы з дадатковымі заданнямі** патрабуюць ад вучняў не толькі перадаць змест зыходнага тэксту, але і: а) захаваць ці выкарыстаць у другасным тэксце пэўныя моўныя сродкі; б) перадаць змест тэксту ад імя іншай асобы; в) увесці ў тэкст апісанне, прыдумаць заканчэнне і інш.

Методыка правядзення такіх пераказаў амаль поўнасцю нагадвае методыку правядзення падрабязнага пераказу, толькі на пэўных этапах урока звяртаецца ўвага на дадатковае заданне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

К а н т р о л ь н ы   п е р а к а з

Акрамя навучальных, на ўроках беларускай мовы праводзяцца і **кантрольныя пераказы**. Іх мэта заключаецца ў тым, каб праверыць сфарміраванасць у школьнікаў неабходных камунікатыўных уменняў і навыкаў.

Урок правядзення кантрольнага пераказу мае наступную **структуру**:

1. П а в е д а м л е н н е   т э м ы,   п а с т а н о ў к а   м э т ы   ў р о к а.
2. У с т у п н а е   с л о в а   н а с т а ў н і к а. (Можа адсутнічаць.)
3. В ы р а з н а е   ч ы т а н н е   т э к с т у.
4. С а м а с т о й н а я   п р а ц а   в у ч н я ў.

На гэтым этапе, які займае прыблізна 10 – 15 хвілін, школьнікі складаюць план, запісваюць у патрэбнай паслядоўнасці ключавыя словы, словазлучэнні і інш.

5. П а ў т о р н а е   ч ы т а н н е   т э к с т у.
6. Н а п і с а н н е   п е р а к а з у.
7. З б о р   с ш ы т к а ў.
8. А д к а з ы   н а   п ы т а н н і   в у ч н я ў.

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

## Рэзюме

На ўроках беларускай мовы значнае месца займаюць пераказы. Іх выкарыстанне садзейнічае фарміраванню камунікатыўна-маўленчых уменняў школьнікаў, засваенню вучнямі нормаў літаратурнай мовы, удасканаленню арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці навучэнцаў.

У навукова-метадычнай літаратуры няма агульнапрынятай класіфікацыі пераказаў, аднак асноўныя характарыстыкі пераказу звязаны з мэтай яго правядзення (навучальныя і кантрольныя), спосабамі перадачы зыходнага тэксту (падрабязныя, сціслыя і выбарачныя); з ускладненасцю моўным заданнем (пераказы з лексічным, граматычным і іншымі заданнямі) і інш.

Структура ўрокаў правядзення розных відаў навучальных пераказаў у асноўным супадае, адрозненні ж назіраюцца ў змесце пэўных этапаў урока. Тыповая структурная схема правядзення ўрока навучальнага пераказу наступная: 1) паведамленне тэмы і мэты ўрока; 2) уступнае слова настаўніка; 3) выразначе чытанне тэксту; 4) аналіз тэксту пераказу; 5) лексіка-стылістычная праца (можа праводзіцца ў працэсе аналізу тэксту); 6) арфаграфічная праца; 7) пунктуацыйная праца; 8) вусны пераказ ці паўторнае чытанне тэксту; 9) падрыхтоўка першага варыянта тэксту;

10) аналіз і рэдагаванне першага варыянта пераказу; 11) напісанне пераказу.

## Літаратура

1. *Ивченков П. Ф.* Обучающие изложения. 5 – 9 классы. – М., 1994.

2. *Лаўрэль Я. М.* Выбарачны пераказ і методыка яго правядзення // Народная асвета. – 1986, № 5. – С. 37 – 42.

*3. Лаўрэль Я. М.* Навучанне сцісламу пераказу // Народая асвета. – 1985, № 2. – С. 34 – 39.

4. *Лаўрэль Я. М.* Пераказ з творчымі заданнямі // Народная асвета. – 1986, № 8. – С. 43 – 48.

5. *Морозова И. Д.* Виды изложений и методика их проведения. – М., 1984.

6. *Плёнкин Н. А.* Изложения с языковым разбором текста. – М., 1988.

7. *Савко И. Э., Савко В. П.* Формирование речевых умений школьников при подготовке к выборочному изложению текста // Коммуникативная компетенция: принципы, методы, приёмы формирования: Сборник научных статей. Вып. 4. – Мн., 2002. – С. 34 – 38.

# РАЗВІЦЦЁ ЗВЯЗНАГА МАЎЛЕННЯ

## Праблемныя пытанні

1. Якія мэта і змест работы па развіцці звязнага маўлення вучняў?
2. Якія практыкаванні садзейнічаюць фарміраванню камунікатыўных уменняў школьнікаў?

Развіццё звязнага маўлення – найважнейшы напрамак у рабоце па развіцці маўлення вучняў. Аўтар першага метадычнага дапаможніка для настаўнікаў “Методыка роднай мовы” К. Міцкевіч (Якуб Колас) пісаў, што “школа павінна імкнуцца навучыць дзяцей звязна і паслядоўна перадаваць свае думкі ў жывsм слове...”[3]

У сучаснай методыцы выкладання мовы тэрмін “звязнае маўленне” ўжываецца ў трох значэннях: 1) дзейнасць таго, хто гаворыць; працэс выражэння думак; 2) тэкст, выказванне, прадукт маўленчай дзейнасці; 3) назва раздзела методыкі развіцця маўлення.[4] Звязнае маўленне характарызуецца як маўленне змястоўнае, сэнсава і структурна цэласнае, тэматычна завершанае, якое адпавядае нормам літаратурнай мовы.

[3] Міцкевіч К. (Я. Колас). Методыка роднай мовы. – Мн., 1926. – С. 89.
[4] Львов М. Р. Словарь-справочник по методике русского языка. – М., 1988. – С. 181.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Асноўная задача работы па развіцці звязнага маўлення заключаецца ў тым, каб сфарміраваць у школьнікаў уменне ствараць вусныя і пісьмовыя тэксты, разнастайныя па стылістычнай і жанравай прыналежнасці, структурнай арганізацыі, выкарыстоўваючы пры гэтым патрэбныя моўныя сродкі ў адпаведнасці з мэтай і ўмовамі зносін. Авалоданне звязным маўленнем – адна з галоўных задач вывучэння курса беларускай мовы ў сярэдняй школе.

Фарміраванне і ўдасканаленне звязнага маўлення вучняў патрабуе сістэматычнай і мэтанакіраванай працы. У адпаведнасці з сучаснымі праграмамі па беларускай мове такая праца павінна праводзіцца як пры вывучэнні ўсіх раздзелаў навукі аб мове, так і на ўроках, спецыяльна адведзеных для гэтага. Змест работы па развіцці звязнага вуснага і пісьмовага маўлення складаецца са спецыяльных тэарэтычных ведаў пра маўленне і камунікатыўных уменняў і навыкаў. Напрыклад, у 5 класе вучні павінны засвоіць пэўныя маўленчыя паняцці (маўленне, сітуацыя маўлення, функцыянальныя стылі маўлення (агульнае ўяўленне), тэкст, тэма і асноўная думка тэксту (паўтарэнне), тып маўлення (апавяданне, апісанне, разважанне), гутарковы стыль, мастацкі стыль), а таксама пазнаёміцца з асноўнымі якасцямі маўлення і прыметамі тэксту. У 6 класе школьнікі ўзнаўляюць веды пра тэкст, яго прыметы, вывучаюць навуковы і афіцыйна-справавы стылі, сродкі сувязі сказаў у тэксце, разважанне як асобы тып тэксту.

Спецыяльныя веды пра маўленне ствараюць тэарэтычную аснову для фарміравання камунікатыўна-маўленчых уменняў і навыкаў. “Тэарэтычныя веды... – гэта галоўным чынам веды пра спосабы дзейнасці, пра тое, што і як трэба рабіць, каб раскрыць тэму і асноўную думку выказвання, як збіраць і сістэматызаваць матэрыял да выказвання, як правіць напісанае і г. д. Спецыфіка гэтых ведаў у іх накіраванасці на авалоданне камунікатыўнымі ўменнямі”.[5]

Асноўныя камунікатыўна-маўленчыя ўменні, якія павінны быць сфарміраваны ў вучняў, акрэслены ў праграме. Напрыклад, у 5 класе школьнікі павінны ўмець асэнсавана карыстацца тэрмінамі “мова”, “маўленне”, “тэкст” і інш., вызначаць тэму, асноўную думку і тып тэксту, дзяліць яго на часткі, ствараць невялікія тэксты тыпу апавядання і апісання, рабіць падрабязны пераказ тэксту і інш. У 6 класе ў вучняў фарміруюцца ўменні адрозніваць мастацкае апісанне ад навуковага і афіцыйна-справавога, рабіць вусныя і пісьмовыя апісанні прадметаў, жывёл, раслін у навуковым і мастацкім стылях, складаць апавяданне з элементамі апісання памяшканняў, асобных рэчаў, жывёл і інш.

У наступных класах работа па развіцці звязнага маўлення ўскладняецца: пашыраецца тэматыка выказванняў, павялічваецца іх

[5] Ладыженская Т. А. Связная речь // Методика развития речи на уроках русского языка. – М., 1991. – С. 200.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

стылёвая і жанравая разнастайнасць, пры напісанні пераказаў прапануюцца дадатковыя заданні і інш.

Усе камунікатыўныя ўменні, якія фарміруюцца пры вывучэнні школьнага курса беларускай мовы, маюць дакладную мэтавую накіраванасць. Аднак сярод іх ёсць агульныя, скразныя ўменні, гэта значыць тыя, якія неабходныя пры стварэнні амаль любога тэксту. Да такіх уменняў адносяцца:

– уменне раскрываць тэму выказвання, падпарадкоўваць яго асноўнай думцы;

– уменне збіраць і сістэматызаваць матэрыял, на аснове якога будзе створаны тэкст;

– уменне пабудаваць выказванне ў пэўнай кампазіцыйнай форме, у канкрэтным маўленчым жанры;

– уменне выкарыстаць пры стварэнні тэксту моўныя сродкі, якія найбольш дакладна адпавядаюць задачы і ўмовам зносін;

– уменне ўдасканальваць створаны тэкст (яго змест, будову, моўнае афармленне).

Для паспяховага фарміравання камунікатыўна-маўленчых уменняў школьнікаў неабходна выкарыстоўваць спецыяльную сістэму практыкаванняў. С і с т э м а п р а к т ы к а в а н н я ў, якая прапануецца ніжэй, асноўваецца на класіфікацыі камунікатыўных заданняў, распрацаванай Т. А. Ладыжанскай[6]:

1) практыкаванні аналітычнага характару па гатовым тэксце: вызначэнне тыпу, стылю, тэмы, асноўнай думкі тэксту; падбор загалоўкаў да тэксту і яго частак, тлумачэнне залежнасці ўжывання пэўных моўных сродкаў ад задач выказвання і г. д.;

2) практыкаванні на перапрацоўку пэўнага тэксту: удакладненне напісанага, знаходжанне і ліквідацыя моўных памылак і недахопаў у змесце і інш.;

3) практыкаванні па стварэнні новага тэксту на аснове зыходнага: творчае спісванне, творчы дыктант, вольны дыктант, састаўленне сказаў па апорных словах і словазлучэннях, тэзісаў, пераказ, перабудова кампазіцыі, развіццё таго ці іншага эпізоду, пераклад;

4) практыкаванні па стварэнні вучнямі ўласных тэкстаў: разгорнутыя адказы на лінгвістычныя тэмы, рэзэнзіі на вусныя адказы школьнікаў, падрыхтоўка дакладаў, напісанне нататак, нарысаў, водгукаў і інш.

## Рэзюме

[6] Методика преподавания русского языка в школе: Учебник для студ. высш. пед. учебн. заведений / Под ред. М. Т. Баранова. – М., 2000. – С. 283 – 284.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Праца па развіцці звязнага маўлення праводзіцца пры вывучэнні ўсіх раздзелаў курса беларускай мовы для таго, каб школьнікі авалодалі ўменнем выказваць свае думкі ў вуснай і пісьмовай форме, выкарыстоўваючы пры гэтым моўныя сродкі ў адпаведнасці з сітуацыяй зносін. Змест працы па развіцці звязнага маўлення ўключае азнаямленне вучняў з тэарэтычнымі звесткамі пра маўленне і фарміраванне ў школьнікаў камунікатыўных уменняў і навыкаў у працэсе выканання спецыяльных практыкаванняў і заданняў.

### Дыскусія

У методыцы выкладання мовы доўгі час дамінавала думка, што развіццё звязнага маўлення – задача спецыяльных урокаў. Згодна з патрабаваннямі сучаснай методыкі, удасканальваць звязнае маўленне неабходна і паралельна з вывучэннем школьнага курса лексікі, граматыкі і г. д. Якога пункту гледжання на гэтую праблему прытрымліваецеся вы? Чаму?

### Літаратура


1. *Баринова Е. А.* Связная речь и пути овладения ею в школе // Развитие устной и письменной речи. – Л., 1976. – С. 3 – 12.

2. Методика преподавания русского языка в школе: Учебник для студ. высш. пед. учебн. заведений / Под ред. М. Т. Баранова. – М., 2000.

3. Методика развития речи на уроках русского языка: Книга для учителя / Под ред. Т. А. Ладыженской. – М., 1991.

4. *Протчанка В. У.* Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове. – Мн., 2001.


## САЧЫНЕННЕ ЯК ВІД РАБОТЫ ПА РАЗВІЦЦІ ЗВЯЗНАГА МАЎЛЕННЯ ШКОЛЬНІКАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

### Актуалізацыя лінгвістычных ведаў

1. Як вы разумееце сэнс паняццяў “стыль маўлення”, “жанр маўлення”?

2. Назавіце жанры, характэрныя для навуковага, публіцыстычнага, афіцыйна-справавога і мастацкага стыляў маўлення.

### Праблемныя пытанні

1. Якое значэнне маюць сачыненні ў сістэме работы па развіцці звязнага маўлення вучняў?

2. Як класіфікуюцца сачыненні?

3. Якія існуюць спосабы падрыхтоўкі вучняў да напісання сачынення?

4. Як павінна адбывацца навучанне школьнікаў стварэнню выказванняў у пэўным жанры?

**Сачыненне** – гэта самастойнае звязнае выказванне вучнямі сваіх думак, пачуццяў, разважанняў, меркаванняў на пэўную тэму. У параўнанні з пераказам сачыненне больш складаны від працы, таму што патрабуе ад школьнікаў стварэння ўласнага (у поўным сэнсе гэтага слова) тэксту пэўнага стылю і жанру. Сачыненне характарызуецца творчым падыходам да раскрыцця тэмы, з'яўляецца сродкам самавыражэння асобы вучня, яго жыццёвай пазіцыі, унутранага свету. Праца над сачыненнем развівае ў школьнікаў уменне назіраць, асэнсоўваць, даваць ацэнку ўбачанаму, выказваць уражанні аб прачытаным ці пачутым, разважаць, даказваць, супастаўляць і параўноўваць прадметы і з'явы, абагульняць і інш. Сачыненне таксама дае магчымасць меркаваць пра веданне вучнямі фактычнага матэрыялу, пра іх уменне карыстацца моўнымі сродкамі ў пэўнай сітуацыі зносін.

Школьныя сачыненні адрозніваюцца вялікай разнастайнасцю. Яны класіфікуюцца ў залежнасці ад: 1) мэты правядзення (навучальныя і кантрольныя); 2) месца выканання (класныя і дамашнія); 3) крыніцы атрымання інфармацыі (на аснове вопыту і асабістых назіранняў вучняў, па карціне, на літаратурныя і вольныя тэмы і інш.); 4) тыпу тэксту (апавяданне, апісанне, разважанне, апавяданне з элементамі апісання ці разважання і інш.); 5) аб'ёму (разгорнутыя і мініяцюры); 6) жанру (апавяданне, водгук, нататка, праблемны артыкул і інш.); 7) ускладненасці дадатковым заданнем (з лексічным, граматычным заданнем, па зададзеным пачатку, па апошніх радках і інш.).

Праца над сачыненнем дазваляе выпрацоўваць у вучняў такія камунікатыўна-маўленчыя ўменні, як:

– уменне разумець тэму, асэнсоўваць яе межы і паслядоўнаць раскрыцця;

– уменне збіраць і сістэматызаваць матэрыял для сачынення;

– уменне планаваць выказванне і будаваць яго ў адпаведнасці з планам;

– уменне ствараць выказванне ў канкрэтным стылі і жанры;

– уменне выказваць свае думкі правільна, у адпаведнасці з нормамі літаратурнай мовы, задачамі выказвання і асаблівасцямі маўленчай сітуацыі;

– уменне знаходзіць у тэксце памылкі і недахопы, удасканальваць напісанае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У тэорыі методыкі і школьнай практыцы вядомы розныя **спосабы падрыхтоўкі да сачынення**: 1) збор і сістэматызацыя матэрыялу; 2) састаўленне плана; 3) разгрупаваная па часе лексіка-стылістычная падрыхтоўка; 4) аналіз тэксту-узору і інш.

Збор матэрыялу да сачынення можа адбывацца па-рознаму, гэта залежыць ад таго, якое сачыненне неабходна будзе напісаць вучням. Напрыклад, можна праводзіць мэтанакіраваныя назіранні (за прыродай, жывёламі, прадметамі і з'явамі рэчаіснасці, знешнасцю і паводзінамі людзей і інш.) і рабіць неабходныя запісы, фіксаваць ключавыя словы і выразы ў час аналізу карціны, пазначаць часткі тэксту, якія змяшчаюць патрэбную інфармацыю, і інш.

Сабраны матэрыял неабходна ўпарадкаваць, сістэматызаваць – гэта значыць выбраць з яго тое, што будзе дарэчы пры раскрыцці тэмы і асноўнай думкі сачынення; згрупаваць матэрыял па асобных пытаннях (пунктах плана), устанавіць сувязь паміж часткамі і размясціць іх ў неабходным парадку.

Састаўленне плана – надзвычай пашыраны спосаб падрыхтоўкі да сачынення. Ён дапамагае вучням асэнсаваць змест будучага тэксту, яго структуру, фарміруе ўменне выказваць думкі ў неабходнай паслядоўнасці. Аднак, як сведчыць практыка, школьнікі не заўсёды ўмеюць складаць план, нават калі ведаюць, пра што будуць пісаць. Фарміраванне адпаведнага ўмення можа адбывацца з дапамогай практыкаванняў, у якіх патрабуецца: а) скласці план тэксту-узору; б) дапоўніць план пэўнымі пунктамі; в) знайсці ў плане тыя пункты, якія не адпавядаюць тэме сачынення; г) прааналізаваць некалькі планаў на адну і тую ж тэму і вызначыць, які з іх лепшы і чаму, і інш.

Існуюць розныя меркаванні наконт таго, калі трэба пачынаць складаць план будучага выказвання. Прыблізны план пажадана скласці адразу пасля аналізу, асэнсавання тэмы сачыненння, больш дэталёвы і структурна вывераны – у працэсе сістэматызацыі сабранага матэрыялу.

Разгрупаваная лексіка-стылістычная падрыхтоўка да сачынення праводзіцца на ўроках, якія папярэднічаюць яго напісанню. Школьнікам можна прапаноўваць заданні на тлумачэнне ці ўдакладненне лексічнага значэння ключавых слоў, пабудову з імі словазлучэнняў і сказаў на канкрэтную тэму, актуалізацыю ведаў пра асаблівасці і моўныя сродкі пэўнага стылю маўлення і інш.

Дастаткова эфектыўным спосабам падрыхтоўкі да сачыненняў з'яўляецца аналіз тэксту-узору. Як правіла, у якасці такіх тэкстаў выкарыстоўваюць урыўкі з мастацкіх ці публіцыстычных твораў, а таксама ўзоры раней напісаных іншымі вучнямі сачыненняў на тую ж ці блізкую тэму. Аналіз пазітыўнага тэксту-узору дазваляе школьнікам зразумець, пра што яны павінны пісаць у сачыненні, да якога тэксту ім неабходна імкнуцца. У працэсе ж аналізу негатыўнага (з пэўнымі недакладнасцямі ці

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

памылкамі) тэксту высвятляецца, ці адпавядае змест тэксту яго тэме, ці ў патрэбнай паслядоўнасці яна раскрыта, якія моўныя сродкі пры гэтым былі выкарыстаны і інш.

Сістэма працы па навучанню школьнікаў традыцыйным відам сачыненняў (на аснове ўласных назіранняў, па карціне і інш.) дастаткова поўна распрацавана ў методыцы выкладання мовы (В. А. Дабрамыслаў, Т. А. Ладыжанская, Л. П. Падгайскі, Ю. С. Пічугоў, М. Г. Яленскі і інш.). Менш распрацавана (асабліва ў беларускай метадычнай навуцы) пытанне **навучання школьнікаў пабудове выказванняў у пэўным жанры**. Аднак у сучаснай праграме па беларускай мове ўсё большае значэнне надаецца выпрацоўцы ўменняў ствараць тэксты ў пэўным жанры, таму гэтая праблема патрабуе больш дэталёвага асвятлення.

Ж а н р   м а ў л е н н я – гэта разнавіднасць тэкстаў, якая вызначаецца маўленчай сітуацыяй, існуе ў межах таго ці іншага функцыянальнага стылю і мае адносна ўстойлівыя зместавыя, кампазіцыйныя і лінгвастылістычныя асаблівасці.[7] Сутнасць гэтага тэрміна вучні ўсведамляюць практычным шляхам у працэсе знаёмства з тымі разнавіднасцямі жанраў маўлення, якія прадугледжаны для вывучэння ў школе.

Як вынікае з азначэння паняцця “жанр маўлення”, жанраўтваральнымі фактарамі з’яўляюцца маўленчая сітуацыя, зместавыя, кампазіцыйныя і лінгвастылістычныя асаблівасці выказвання.

З паняццем “маўленчая сітуацыя” школьнікі павінны пазнаёміцца пры вывучэнні функцыянальных стыляў, а пры рабоце над жанрамі ўвага звяртаецца на сферу выкарыстання пэўнага жанру і асноўную мэту выказвання.

У працэсе аналізу зместавых асаблівасцей жанру на ўроках беларускай мовы (у адрозненне ад урокаў літаратуры) разглядаецца не канкрэтны змест пэўнага тэксту, а тыповыя яго рысы, агульныя законы перадачы сэнсу, уласцівыя гэтаму віду тэкстаў.

Пры знаёмстве з кампазіцыйнымі асаблівасцямі жанраў размова павінна ісці аб агульнай кампазіцыйнай схеме, характэрнай для той ці іншай жанравай разнавіднасці, пра спецыфічнасць кампазіцыі розных жанраў.

Пры разглядзе лінгвастылістычных асаблівасцей жанраў увага вучняў засяроджваецца на моўных сродках, характэрных як для таго стылю, да якога адносіцца жанр, так і непасрэдна для гэтага жанру.

Сістэма работы па навучанні школьнікаў стварэнню тэкстаў у пэўным жанры павінна прадугледжваць наступныя этапы: 1) азнаямленне з жанрам у працэсе аналізу адпаведнага тэксту; 2) падрыхтоўку да пабудовы

---

[7] *Николаенко Г. И.* Теоретико-методические основы обучения жанрам речи на уроках русского языка в средней школе. – Мн., 2001. – С. 16.

выказванняў у дадзеным жанры; 3) стварэнне ўласных выказванняў у вызначаным жанры.

На першым этапе навучання кожны жанр разглядаецца ў наступнай паслядоўнасці: а) асаблівасці зместу; б) асаблівасці кампазіцыі; в) лінгвастылістычныя прыметы.

На другім этапе адбываецца падрыхтоўка вучняў да стварэння тэкстаў у тым жанры, які вывучаецца. Школьнікам можна прапанаваць заданні на рэдагаванне тэкстаў, стварэнне выказванняў па малюнку, па дадзеным пачатку, падрабязны пераказ тэксту з захаваннем яго жанравых асаблівасцей, сістэматызацыю і абагульненне вывучанага пра жанр і г. д. На гэтым этапе адбываеца фарміраванне тых прыватных уменняў (збіраць матэрыял, структурыраваць змест, падбіраць моўныя сродкі, уласцівыя пэўнаму жанру, і інш.), якія з'яўляюцца неад'емнай часткай комплекснага ўмення прадуцыраваць тэксты розных жанраў маўлення.

На трэцім этапе вучні ствараюць уласныя тэксты ў пэўным жанры. Праца можа адбывацца як на ўроку, так і дома, таму што школьнікі тэарэтычна і практычна да яе падрыхтаваны.

Праілюструем гэтую сістэму працы на прыкладзе навучання школьнікаў стварэнню выказванняў у жанры нататкі.

Вядома, што ў праграме па беларускай мове для сярэдняй школы рэкамендуецца ў 6 класе напісанне нататкі ў газету пра ўдзел вучняў у азеляненні школьнай тэрыторыі, вуліцы, двара, у 7 – нататкі пра дыспут "Каго можна назваць сапраўдным сябрам". Аднак, на наш погляд, вывучэнне гэтага жанру пажадана праводзіць комплексна ў адным (сёмым) класе на працягу 3 – 4 урокаў. Гэта дазволіць школьнікам атрымаць цэласнае ўяўленне пра нататку як жанр, замацаваць тэарэтычныя веды і сфарміраваць неабходныя ўменні пабудовы тэкстаў у жанры нататкі. Сістэма працы павінна прадугледжваць: 1) азнаямленне вучняў з нататкай як жанрам: асаблівасцямі яе зместу, кампазіцыі і моўнага афармлення; 2) аналіз, рэдагаванне і трансфармацыю тэкстаў адпаведнага жанру; 3) самастойнае напісанне сямікласнікамі нататкі.

Азнаямленне з нататкай мэтазгодна пачаць з узнаўлення ведаў вучняў пра публіцыстычны стыль, яго асаблівасці, сферу ўжывання. Затым школьнікам паведамляецца, што ўяўляе сабой нататка як жанр публіцыстыкі. На наступным этапе ўрока ў працэсе аналізу канкрэтных тэкстаў адбываецца знаёмства сямікласнікаў з асаблівасцямі зместу нататкі. Для гэтага можна прапанаваць адказаць на такія пытанні: 1. Які па аб'ёму тэкст нататкі? 2. Ці можна ў нататцы знайсці адказы на наступныя пытанні: што, калі і дзе адбылося? 3. Як, падрабязна ці сцісла, выкладаецца матэрыял? 4. Як суадносяцца час выхаду газеты і час, пра які ідзе гаворка ў нататцы? У выніку школьнікі павінны ўсвядоміць, што нататка – гэта невялікае паведамленне ў публіцыстычным стылі пра падзею (ці факт) з жыцця, у якім аўтар гаворыць, што адбылося (ці адбудзецца), дзе, калі, з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кім, па якой прычыне. Асноўныя асаблівасці зместу нататкі – дакладнасць інфармацыі, яе навізна, сціслась і праўдзівасць паведамлення.

Для замацавання ведаў вучняў пра асаблівасці зместу нататкі можна выкарыстаць наступныя заданні: 1) знайдзіце ў нататцы адказы на асноўныя пытанні жанру (што, калі і дзе адбылося?); б) дакажыце, што прапанаваны тэкст з’яўляецца нататкай, і інш.

Далей на прыкладзе канкрэтных тэкстаў неабходна пазнаёміць вучняў з відамі нататкі. Безумоўна, няма неабходнасці паведамляць пра ўсе разнавіднасці гэтага жанру, дастаткова ахарактарызаваць толькі тыя, якія сустракаюцца найбольш часта: хранікальнае паведамленне, стандартную і пашыраную нататкі. У выніку вучні ўсвядомяць, што хранікальнае паведамленне – гэта невялікі па аб’ёму тэкст без падрабязнасцей, дэталяў, які адлюстроўвае сутнасць факта. Нататкі гэтага віду ахопліваюць вялікую колькасць падзей, таму на старонках перыядычнага друку часта даюцца без загалоўкаў, пад агульнай рубрыкай тыпу “Толькі факт”, “Навіны з Гомельшчыны” і інш. Стандартная нататка – паведамленне ў 10 – 30 радкоў, якое заўсёды мае назву і раскрывае навіну ў агульных рысах. У пашыранай (дэталізаванай) нататцы даецца дастаткова падрабязнае апісанне пэўнай падзеі. Тут можа быць не толькі інфармацыя, але і каментарый аўтара.

Пасля азнаямлення з відамі нататак неабходна перайсці да аналізу іх кампазіцыі. Увага школьнікаў засяроджваецца на тым, што нататкі розных відаў маюць розную будову. Так, у стандартнай і пашыранай нататках існуюць зачын і асноўная частка. У зачыне лаканічна і дакладна паведамляецца пра падзею, факт, звычайна даюцца адказы на пытанні, дзе, калі і што адбылося ці адбудзецца. У асноўнай частцы больш падрабязна, чым у зачыне, даецца апісанне самой падзеі. Тут аўтар адказвае не толькі на асноўныя, але і на дадатковыя пытанні (з кім адбылося, па якой прычыне, як адбылося?). У пашыранай нататцы, акрамя зачыну і асноўнай часткі, могуць быць і вывады, якія звычайна змяшчаюць уласныя меркаванні аўтара, яго погляды на падзею, факт. Хранікальнае ж паведамленне не мае ні зачыну, ні вывадаў.

Замацаванню ведаў вучняў пра кампазіцыю нататкі будуць садзейнічаць практыкаванні з наступнымі заданнямі:

1. Прачытайце нататкі. З якіх структурных частак яны складаюцца?

2. Прачытайце нататкі і вызначце, у якіх тэкстах адсутнічаюць уступ, вывады. У якіх нататках ёсць усе структурныя часткі?

3. Складзіце план пашыранай нататкі. Дайце тэксту загаловак.

Далей неабходна пазнаёміць школьнікаў з асноўнымі моўнымі асаблівасцямі нататкі як жанру публіцыстыкі. Гэта можна зрабіць з дапамогай розных метадаў: паведамлення настаўніка, гутаркі ў спалучэнні з аналізам канкрэтных тэкстаў і інш. У выніку вучні павінны зразумець, што для нататкі характэрна маналагічная форма паведамлення ад трэцяй

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

асобы. Тут дамінуе агульнаўжывальная, стылістычна нейтральная лексіка, адсутнічаюць эмацыянальна афарбаваныя словы, рэдка ўжываюцца вобразныя сродкі мовы. У нататцы шырока выкарыстоўваюцца назоўнікі, дамінуюць займеннікі трэцяй асобы, дзеясловы ў форме трэцяй асобы і безасабовыя дзеясловы, але адсутнічаюць займеннікі першай асобы і дзеясловы ў форме першай асобы. У тэкстах гэтага жанру часта сустракаюцца аднародныя і адасобленыя члены сказа, пабочныя і ўстаўныя канструкцыі, якія дапамагаюць паведаміць у адным сказе пра некалькі падзей, і г.д.

На наступным этапе навучання адбываецца замацаванне ведаў пра нататку як жанр публіцыстычнага стылю, фарміруюцца ўменні аналізаваць тэксты, адрозніваць нататку ад іншых жанраў публіцыстыкі (напрыклад, праблемнага артыкула, ліста ў рэдакцыю), рэдагаваць тэксты, трансфармаваць адзін від нататкі ў другі. Для гэтага можна выкарыстаць наступныя практыкаванні і заданні:

1. Прачытайце нататкі, вызначце іх віды. Абгрунтуйце сваю думку.

2. Прачытайце тэксты. У якім з іх паведамляецца пра падзею, а ў якім аўтар разважае над праблемай? Ці можна абодва тэксты аднесці да жанру нататкі?

3. Вызначце, ці з’яўляюцца тэксты нататкамі. Абгрунтуйце сваю думку.

4. Уявіце сябе дыктарам радыё і выразна прачытайце наступны тэкст. Вызначце, да якога віду нататкі ён належыць.

5. Прачытайце тэкст. Якія недахопы ў змесце і моўным афармленні трэба выправіць, каб атрымалася нататка?

6. Трансфармуйце прапанаваныя тэксты ў хранікальныя нататкі.

Пасля вывучэння нататкі як жанру маўлення вучням прапануецца (у якасці дамашняга задання) напісаць нататку пра падзеі школьнага жыцця або жыцця горада (вёскі), рэспублікі, прычым гэта можа быць цыкл хранікальных нататак, стандартная або пашыраная нататка.

Пасля праверкі творчых прац настаўнікам праводзіцца (пры неабходнасці) іх аналіз і рэдагаванне вучнямі ўласных нататак, што дазваляе ажыццявіць выніковую карэкціроўку ведаў і ўменняў, якія набылі сямікласнікі на працягу вывучэння тэмы.

Як паказвае практыка работы, менавіта такое вывучэнне тэмы “Нататка як адзін з інфармацыйных жанраў публіцыстычнага стылю” забяспечвае разуменне школьнікамі асаблівасцей зместу, кампазіцыі, моўнага афармлення нататкі і фарміраванне ў вучняў камунікатыўна-маўленчых уменняў, неабходных для стварэння тэкстаў у гэтым жанры .

## Рэзюме

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сачыненне – гэта самастойнае творчае выказванне вучнямі сваіх думак, пачуццяў, разв617жанняў на пэўную тэму. Праца над сачыненнем развівае мысленне, памяць, уяўленне школьнікаў, вучыць іх назіраць, параўноўваць, разважаць, даказваць і г. д. Гэты від працы дае магчымасць меркаваць пра  веданне вучнямі фактычнага матэрыялу, уменне карыстацца  моўнымі сродкамі пры стварэнні тэкстаў рознай стылёвай і жанравай накіраванасці.

Сачыненні класіфікуюцца па мэце правядзення (навучальныя і кантрольныя), месцы выканання (класныя і дамашнія), крыніцы атрымання інфармацыі (на аснове вопыту і асабістых назіранняў вучняў, па карціне, на літаратурныя і вольныя тэмы і інш.), жанру (апавяданне, водгук, нататка, праблемны артыкул і інш.) і г. д.

З мэтай падрыхтоўкі да сачынення праводзяцца збор і сістэматызацыя матэрыялу, састаўленне плана, лексіка-стылістычная падрыхтоўка, аналіз тэксту-узору і інш.

Навучанне школьнікаў стварэнню тэкстаў у пэўным жанры адбываецца ў наступнай паслядоўнасці: 1) азнаямленне з жанрам у працэсе аналізу адпаведнага тэксту; 2) падрыхтоўка да пабудовы выказванняў у дадзеным жанры; 3) стварэнне ўласных выказванняў у вызначаным жанры.

**Літаратура**


1. *Лаўрэль Л.* Водгук на апавяданне як жанр // Роднае слова. – 1992, № 10. – С. 12 –14.

2. Методические указания к факультативному курсу «Теория и практика сочинений разных жанров» (8 – 9 классы) / Сост. Т. А. Ладыженская, Т. С. Зепалова. – М., 1990.

3. *Николаенко Г. И.* Теоретико-методические основы обучения жанрам речи на уроках русского языка в средней школе. – Мн., 2001.

4. *Петрович В. Г.* Как надо писать сочинения. – М., 1998.

5. *Пичугов Ю. С.* Обучение сочинениям на свободную тему. – М., 1986.

6. *Савко И. Э.* Изучение жанров речи на уроках русского языка в средней школе // Лекции по актуальным вопросам методики преподавания русского и белорусского языка: Пособие для студентов филологических факультетов вузов. – Мн., 2003. – С. 53 – 60.

7. *Саўко У. П.* Водгук і рэцэнзія як жанры школьнага сачынення // Актуальныя пытанні  беларускай лінгвістыкі: Зборнік навуковых артыкулаў. – Мн., 2002. – С. 154 – 156.

8. *Туркевіч В.* Сачыненне-рэцэнзія // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1991, № 6. – С. 13 – 15.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

9. *Яленскі М. Г.* Развіццё вуснай мовы вучняў: 4 – 6 класы. – Мн., 1985.

10. *Яленкі М. Г.* Сачыненне па карціне ў 5 – 8 класах // Народная асвета. – 1984, № 7. – С. 54 – 58.

## ТЭКСТ ЯК ПРАДУКТ (ВЫНІК) МАЎЛЕНЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ. ФАРМІРАВАННЕ Ў ВУЧНЯЎ ПАНЯЦЦЯ ПРА ТЭКСТ, ЯГО АСНОЎНЫЯ ПРЫМЕТЫ

### Актуалізацыя лінгвістычных ведаў

1. Як называецца галіна мовазнаўства, у якой даследуюцца агульныя заканамернасці пабудовы тэксту?
2. Дайце азначэнне паняцця “тэкст”.
3. Якія прыметы тэксту вы ведаеце?

### Праблемныя пытанні

1. Калі вывучаецца тэкст на ўроках беларускай мовы?
2. Якія ўменні фарміруюцца ў школьнікаў пры вывучэнні тэорыі тэкстаўтварэння?
3. З якімі прыметамі тэксту неабходна пазнаёміць вучняў пры асэнсаванні гэтага паняцця?
4. Якая методыка азнаямлення вучняў з прыметамі тэксту?

* * *

Асаблівасцю выкладання беларускай мовы ў сучаснай школе з’яўляецца камунікатыўная накіраванасць. Увага настаўніка засяроджваецца ў першую чаргу на маўленчай дзейнасці вучняў, а адной з асноўных адзінак навучання становіцца тэкст.

У змесце школьнага курса роднай мовы значная ўвага надаецца тэорыі тэкстаўтварэння. Вучні знаёмяцца з паняццем “тэкст”, прыметамі тэксту, яго тыпамі, жанравымі і стылістычнымі разнавіднасцямі. Тэкст, такім чынам, з’яўляецца і аб’ектам вывучэння.

**Тэкст** (ад лац. *textum* – сувязь, злучэнне) – звязнае і адносна завершанае выказванне на пэўную тэму, якое характарызуецца камунікатыўнай прызначанасцю і звычайна складаецца з групы сказаў, аб’яднаных сэнсава і граматычна. Тэкст з’яўляецца вынікам мысліцельнай і маўленчай дзейнасці чалавека.

Першапачатковае ўяўленне пра тэкст як адзінку маўлення вучні атрымліваюць у малодшых класах. Затым у 4–9 класах веды школьнікаў узнаўляюцца, пашыраюцца і паглыбляюцца ў працэсе знаёмства з асноўнымі прыметамі тэксту, сродкамі сувязі сказаў у тэксце, тыпамі і

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

стылямі маўлення і інш. У курсе 10 класа, а затым 12-га ўсе тэарэтычныя звесткі пра тэкст паўтараюцца на больш высокім узроўні, абагульняюцца і сістэматызуюцца.

У працэсее вывучэння тэорыі тэкстаўтварэння ў школьнікаў фарміруюцца наступныя **ўменні**:

– асэнсавана карыстацца тэрмінамі “мова”, “маўленне”, “тэкст” і інш.;

– вызначаць тэму, асноўную думку, адрасата і мэтанакіраванасць тэксту;

– вызначаць тып маўлення, структурныя часткі тэксту;

– падбіраць загалоўкі да тэксту і яго частак, складаць план тэксту;

– вызначаць віды і сродкі сувязі сказаў у тэксце;

– аналізаваць тэкст, улічваючы яго асноўныя прыметы;

– адэкватна ўспрымаць чужыя выказванні;

– узнаўляць у вуснай і пісьмовай форме змест прачытаных ці ўспрынятых на слых тэкстаў, захоўваючы пры гэтым іх жанрава-стылістычныя асаблівасці;

– ствараць уласныя выказванні пэўнага тыпу і структуры, беручы пад увагу іх мэтанакіраванасць і адрасатаў;

– рэдагаваць уласныя і чужыя выказванні, удасканальваць іх змест, логіка-кампазіцыйную арганізацыю і моўнае афармленне.

Асэнсаванне паняцця “тэкст” адбываецца ў працэсе знаёмства вучняў з асноўнымі **прыметамі тэксту**: члянімасцю (наяўнасцю групы сказаў), сэнсавай цэласнасцю, тэматычным адзінствам, звязнасцю, разгорнутасцю, паслядоўнасцю, завершанасцю.

Для азнаямлення з **члянімасцю** і **сэнсавай цэласнасцю** тэксту можна выкарыстаць прыём супастаўлення сказа і тэксту. Пры супастаўленні ўвага школьнікаў засяроджваецца на тым, что ў тэксце, у адрозненне ад сказа, думка не толькі выражаецца, але і развіваецца за кошт таго, што кожны новы сказ дабаўляе да сказана нешта новае. Напрыклад:

*1. Эх, і пагода ж стаіць на Палессі!*

*2. Эх, і пагода ж стаіць на Палессі!.. Толькі старыя людзі памятаюць такія прыгожыя дні. У сіняй смузе песцяцца далі. Залатая чырвань лістоў нерухома звісае на купчастых галінах высокіх вязаў. Цёмныя ночы тояць урачысты спакой. А квяцістыя зоры ўсыпаюць усё неба*. (Паводле Я. Коласа.)

Вучні робяць вывад, што тэкст – гэта група сказаў. І тут шляхам супастаўлення неабходна адразу ж звярнуць увагу на тое, што не любая група сказаў утварае тэкст, а толькі тая, дзе сказы аб’яднаны тэмай і асноўнай думкай. Вучням прапануецца прачытаць дзве групы сказаў і адказаць на наступныя пытанні:

– У якой групе сказаў гаворыцца пра адно і тое ж, а ў якой – пра рознае?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– У якой групе сказы аб’яднаныя агульнай думкай, а ў якой – не?

– У якой групе сказы звязаны паміж сабой, а ў якой – не?

*1. Прыход красавіка заўсёды доўгачаканы і цудоўны. Уся прырода ажывае, цягнецца да святла. Паветра напаўняецца непаўторнай духмянасцю пупышак і першых веснавых кветак. І калі ў сакавіку вясна рабіла яшчэ толькі нясмелыя крокі, не давяраючы першаму цяплу, то ў красавіку яна ў поўную сілу, лёгка і ўпэўнена крочыць па зямлі.* (Паводле В. Стомы.)

*2. Прыход красавіка заўсёды доўгачаканы. У густым ельніку было цёмна і сыра. З наступленнем восені птушкі адлятаюць у вырай.*

У выніку робіцца вывад, што сказы першай групы ўтвараюць тэкст, таму што звязаны сэнсава і тэматычна.

Пры аналізе такой прыметы тэксту, як **т э м а т ы ч н а е а д з і н с т- в а**, неабходна звярнуцца да паняццяў “т э м а ” і “а с н о ў н а я д у м к а”.

Азнаямленне (актуалізацыю ведаў) з першым паняццем можна правесці наступным чынам. Школьнікам прапануецца паслухаць невялікі тэкст, адказаць на пытанне “Пра што расказваецца ў тэксце?”, а потым вызначыць, які з загалоўкаў больш дакладна адлюстроўвае змест тэксту: “У лесе”, “Сустрэча з вавёркай”, “Вячэра вавёркі”.

*Нахадзіўшыся па лесе, я сеў адпачыць на сасну, якую з карэннем вывернула навальніца. Раптам над галавою трэснула галінка. Я глянуў угору. На галіне сасны, трымаючы ў лапках зялёную шышку, прытоена сядзела вавёрка.*

*Нашы позіркі сустрэліся. Звярок адразу кінуў шышку, прабег па галіне і скокнуў на суседняе дрэва – у паветры прамільгнула вогненная паласа. Вавёрка забралася на самую вершаліну сасны і адтуль пачала назіраць за мною. Пераканаўшыся, што ёй нішто не пагражае, яна вярнулася на галіну, дзе толькі што сядзела, адарвала шышку, зручней уладкавалася і пачала вячэраць. Кінутыя ёю лускавінкі, кружачыся ў паветры, павольна ападалі на дол. Вавёрка назірала за мною. Выгляд яе нібыта гаварыў: “Ну, паглядзі, паглядзі, як я вячэраю”.* (Паводле З. Бяспалага.)

Такім чынам школьнікі ўсведамляюць, што тэма – гэта прадмет думкі, тое, пра што гаворыцца ў выказваннні.

Затым вучням неабходна паведаміць, што ў кожным тэксце існуюць апорныя словы, якія перадаюць асноўны змест тэксту і дапамагаюць узнавіць яго пры пераказе. Апорныя словы нясуць у сказах асноўную сэнсавую нагрузку і, як правіла, у вусным маўленні выдзяляюцца лагічным націскам. Напрыклад, у першым абзацы папярэдняга тэксту апорнымі словамі будуць “лес”, “сеў адпачыць”, “трэснула галінка”, “глянуў угору”, “ваверка”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Для фарміравання ў вучняў умення разумець тэму тэксту, вызначаць яе межы можна выкарыстоўваць наступныя прыёмы:

– супастаўленне групы сказаў, не звязаных адной тэмай, і тэкстаў;

– супастаўленне вузкіх і шырокіх тэм, напрыклад: “Восень” – “Восень ў лесе”, “Вуліца майго дзяцінства” – “Мой родны горад”;

– падзел шырокіх тэм на падтэмы, напрыклад: “Навальніца” – “Неба перад навальніцай”, “Прырода перад навальніцай”, “Бушуе навальніца”, “Пасля навальніцы”;

– падбор да вузкіх тэм (падтэм) шырокіх, напрыклад: “У асеннім лесе”, “Казка зімовага лесу”, “Вясна ў лесе” – “Лес у розныя поры года”;

– рэдагаванне сачыненняў з недахопамі ў раскрыцці тэмы, напрыклад:

*Як я правёў летнія канікулы*

*На летніх канікулах я быў у вёсцы. Там было вельмі цікава.*

*Аднойчы я хадзіў у грыбы. Гэты было ў канцы жніўня.*

*Устаў я рана, узяў карзіну, ножык і пайшоў у лес, які знаходзіўся недалёка ад вёскі. Спачатку мне не шанцавала. Грыбоў было мала. За тры гадзіны блукання па лесе я знайшоў некалькі маладзенькіх падбярозавікаў і падасінавікаў, трохі сыраежак і лісічак. Настрой быў дрэнны. Я вырашыў прайсці глыбей у лес і, калі нічога не будзе, вярнуцца дамоў.*

*Раптам густы ельнік скончыўся, і я выйшаў на паляну, на якой было многа верасу. Спачатку я нічога не заўважыў, але затым застыў ў захапленні. Такой колькасці вялікіх і прыгожых баравікоў я ніколі не бачыў. Хутка мая карзіна была поўная. Радасны і вясёлы вяртаўся я дамоў.*

(У сачыненні адлюстраваны толькі адзін эпізод з летніх канікулаў. Тэма ж больш шырокая.)

Акрамя гэтага, вучням можна прапанаваць заданні, у якіх патрабуецца:

1) вызначыць тэму тэксту;

2) вызначыць тэму тэксту па апорных словах;

3) прыдумаць загаловак, які б найбольш дакладна адлюстроўваў тэму тэксту;

4) вызначыць, які з загалоўкаў найбольш дакладна перадае змест тэксту;

5) вызначыць змест тэксту па апорных словах;

6) вызначыць магчымыя падыходы да раскрыцця тэмы.

Фарміраванню ўмення вызначаць асноўную думку тэксту садзейнічаюць наступныя тыпы заданняў:

1. Супаставіць два тэксты на адну тэму, але з антанімічнымі асноўнымі думкамі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*У парку – залатая восень. Яна вельмі багатая на маляўнічыя фарбы. Усё навокал гарыць каляровай лістотай. Тут і золата, і яркая чырвань, і лімонна-жоўтыя колеры, шмат барвовых фарбаў. Ёсць нават фіялетава-чорныя, і амаль не відаць звыклых зялёных. Гарыць і зззяе ў сонечны дзень нават маленькая былінка!* (Паводле В. Ціхановіча.)

*У парку – восень. Шэры туман павіс над зямлёй. Нерухомыя елкі ўткнулі ў неба свае доўгія пікі-верхавіны. А ўнізе пад іх шырокімі лапамі – змрок. Дрэвы стаяць маўклівыя, сонныя, з іх не-не ды і злятаюць пажоўклыя лісты: настаў час. Абарвецца ліст, зашамаціць лагодна, мякка, нібы развітваючыся з тымі, што засталіся вісець. І апускаецца павольна, хапаючыся за малюсенькія расінкі туману. Слухаеш шоргат лісця – і становіцца сумна: шкада лета, цяпла...* (Паводле М. Дзелянкоўскага.)

2. Прааналізаваць тэмы, загалоўкі, якія падказваюць і не падказваюць асноўную думку, напрыклад: “Праца – усяму аснова” (асноўная думка выражана ў фармулёўцы тэмы), “Вясна” (загаловак не падказвае асноўную думку).

Акрамя гэтага, вучням можна прапанаваць заданні, у якіх патрабуецца: а) вызначыць асноўную думку тэксту і спосабы яе раскрыцця; б) вызначыць магчымыя падыходы да раскрыцця тэмы; в) даказаць, што тэксту ўласціва такая прымета, як тэматычнае адзінства; г) прааналізаваць і адрэдагаваць тэксты, няўдалыя з пункту гледжання раскрыцця асноўнай думкі, і інш.

Наступная прымета тэксту, з якой неабходна пазнаёміць школьнікаў, – **з в я з н а с ц ь**. Аснову звязнасці складае камунікатыўная пераемнасць сказаў: кожны наступны сказ будуецца, як правіла, на аснове папярэдняга. Пры гэтым (з пункту гледжання камунікатыўнага сінтаксісу) сказы падзяляюцца на дзве часткі – адносна вядомую (тэму, дадзенае) і новую (рэму, новае). Каб вучні лепш зразумелі гэта, ім можна прапанаваць прачытаць наступны тэкст, у кожным сказе знайсці тыя звесткі, ад якіх “адштурхоўваецца” аўтар (тэму), і тыя, якія з’яўляюцца новымі (рэму):

*Адразу ўнізе, заградой альховых кустоў, пачынаецца сенажаць. На ёй стаяць тысячы коп. Паміж імі дзе-нідзе ўжо ўзвышаюцца стагі. На недавершаных стагах – постаці людзей ва ўсім белым, а ўнізе – стракатыя кофтачкі і хусткі жанчын. Усім хапае працы ў гэтыя напружаныя летнія дні.* (Паводле І. Шамякіна.)

Пасля гэтага школьнікам можна паведаміць, што сказы ў тэксце злучаюцца паслядоўнай і паралельнай сувяззю.

Пры паслядоўнай сувязі структурнымі сродкамі аб’яднання сказаў найчасцей выступаюць займеннікі, прыслоўі, лексічныя паўторы, сінонімы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і інш., напрыклад: *Зімою рака набывае іншы выгляд. Яна становіцца спакойнай, ціхай*.

Пры паралельнай сувязі ў сказах гаворыцца не пра адно і тое ж, таму кожны сказ зразумелы асобна, без кантэксту, напрыклад: *Адвячорак выдаўся ціхі, мяккі, празрысты. Неба было зацягнута лёгкімі хмурынкамі*.

У працэсе знаёмства школьнікаў з такой характарыстыкай тэксту, як звязнасць, неабходна сфарміраваць уменне правільна ўстанаўліваць і паслядоўнасць сказаў, сэнсавыя сувязі паміж імі. Гэтаму могуць садзейнічаць такія практыкаванні:

1. Прачытаць сказы. Знайсці сярод іх тыя, якія звязаны па сэнсу. Запісаць у такой паслядоўнасці, каб атрымаўся тэкст.

*Чэрвеньскае сонца не прабівалася праз густыя шаты. Дом стаяў на беразе возера. Лясныя гукі і спевы ледзь-ледзь даляталі сюды. Здарылася гэта ў час вайны. На паляне было ціха. Стаяў духмяны пах прэлай ігліцы, багуну і разагрэтай смалы.*

2. Узнавіць дэфармаваны тэкст.

*Жывуць дубы да тысячы гадоў. Ствол у яго тоўсты, шурпаты, шырокая раскідзістая верхавіна і шматлікія тоўстыя галіны. Дуб – гэта светлалюбівая расліна. Векавыя дубы ў абхваце ствала дасягаюць дзесяці метраў. Насенне – жалуды.*

Наступным этапам работы з тэкстам з’яўляецца знаёмства з такой яго прыметай, як **разгорнутасць**. Пры гэтым вучням неабходна паказаць, што ў тэксце, як правіла, існуе некалькі падтэм, у якіх у сваю чаргу могуць выдзяляцца мікратэмы. Мікратэма звычайна раскрываецца ў некалькіх сказах, і частка тэксту, аб’яднаная мікратэмай, звычайна ўяўляе сабой абзац. Кожны абзац пачынаецца з чырвонага радка.

Абзац, як правіла, мае такую будову: пачатак (зачын), развіццё думкі, заканчэнне. Класічную структуру абзаца можна паказаць на наступным прыкладзе:

*Ветру не было цэлы дзень. Ён, мусіць, недзе заблудзіўся ці, нагуляўшыся ўчора, стомлена заснуў дзе-небудзь у Налібоцкай пушчы. А пад вечар стала яшчэ цішэй. Здалося, што нехта накрыў гарадок цёмным купалам неба ды яшчэ прыціснуў купал да зямлі, каб ніводзін гук не парушыў глыбокага асенняга спакою. Магчыма, такой празрыстай цішыні больш ніколі не надарыцца, і я цешуся гэтай цішынёй.* (М. Дзелянкоўскі.)

Першы сказ – гэта пачатак, зачын. Другі, трэці і чацвёрты сказы развіваюць думку, выказаную ў зачыне. Апошні сказ сведчыць пра тое, што мікратэма вычарапана.

Як бачым, на гэтым этапе работы ў вучняў фарміруюцца ўменні знаходзіць у тэксце мікратэмы, дзяліць тэкст на абзацы і абазначаць іх чырвоным радком. Адначасова з гэтым школьнікаў неабходна вучыць даваць тэксту і яго часткам загалоўкі, развіваць думку, выказаную ў зачыне, правільна звязваць часткі тэксту. Такая праца неабходна для таго,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

каб навучыць дзяцей складаць план выказвання, папярэдзіць з’яўленне памылак лагічнага характару. Вырашэнню гэтых задач могуць садзейнічаць наступныя тыпы практыкаванняў:

1. Прачытайце тэкст, вызначце яго тэму. Выдзеліце мікратэмы, прыдумайце загалоўкі часткам тэксту.

*Раніца. Да сонца яшчэ больш як гадзіна. На ўсходзе няма нават зарыва. Неба чыстае, ветру зусім няма.*

*Я бяру вуды, вядро, бляшанку з чарвякамі і іду да ракі. Шамаціць трава пад нагамі. На калені сыплецца раса.*

*Спыняюся ля знаёмага карча. Размотваю вуду, чапляю чарвяка і закідваю прынаду ў ваду. Белы папалавок спачатку нерухома застывае, потым пачынае зыбацца і тануць. Я падсякаю і выцягваю першую плотку.* (Паводле М. Лупсякова.)

2. Прачытайце абзац тэксту. Вызначце, у якім сказе сфармулявана асноўная думка ўрыўка, як яна развіваецца, які сказ сведчыць пра тое, што мікратэма вычарпана.

*Фёдар быў рыбак адмысловы. Я яшчэ не паспеў разблытаць леску і закінуць сваю вудачку, а ён ужо цягнуў вялікага паласатага акуня. Хутка за першым шалёна заплёскаў хвастом, затрапятаўся і другі. Не прайшло і гадзіны, а ў нас ўжо над вогнішчам вісела вядзерца, пах з якога прыемна казытаў нашы насы.* (Паводле С. Шуртакова.)

3. Прааналізуйце план сачынення на тэму “Зімовы лес”. Якія з пералічаных падтэм не адпавядаюць тэме сачынення?

*1. Падрыхтоўка да паходу ў зімовы лес.*

*2. Агульнае ўражанне ад зімовага лесу.*

*3. Дрэвы ў лесе.*

*4. Жыхары зімовага лесу.*

*5. Гульні ў лесе.*

*6. Вяртанне дамоў.*

*7. Смачная вячэра.*

4. Прачытайце часткі тэксту. Ці ў патрэбнай паслядоўнасці яны размешчаны. Абгрунтуйце сваю думку.

*Кожны від рыбы зімуе асобна ад іншых. Плоткі трымаюцца разам з плоткамі ў адным месцы, ляшчы разам з ляшчамі ў другім. Карасі і ліні зімуюць, закапаўшыся ў глей на дне вадаёма.*

*Рыбы пад лёдам трымаюцца ў глыбокіх месцах у стане здранцвення. Плоткі, ляшчы і многія іншыя ляжаць нерухома ў ямах на дне рэк і азёр, паўсонныя, ахутаныя слíззю, якая ахоўвае іх ад холаду.*

*Прыйшла зіма. Падаюць з неба чыстыя белыя пушынкі, усцілаючы зямлю мяккім снежным пакрывалам. Замерзлі спачатку сажалкі і азёры, а потым і рэкі.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Звязнасць і разгорнутасць тэксту непарыўна звязаны з **паслядоўнасцю**. Разгортванне задумы ў тэкст ажыццяўляецца ў пэўнай паслядоўнасці, што складае кампазіцыю тэксту.

Вучні павінны зразумець, што кампазіцыя тэксту залежыць ад таго, які тып маўлення ляжыць у яго аснове: апавяданне, апісанне ці раз- важанне.

Апавяданне – тып маўлення, калі расказваецца пра падзеі, дзеянні, што адбываюцца ў пэўнай паслядоўнасці. Апісанне – тып маўлення, калі характарызуюцца прыметы прадмета маўлення; звычайна ў апісанні гаворыцца пра такія прыметы, якія можна ўбачыць адразу, усе разам. Разважанне – гэта такі тып маўлення, калі раскрываюцца прычыны чаго-небудзь, абгрунтоўваецца пэўная думка, тлумачыцца што-небудзь.

Кожны тып маўлення мае сваю структуру. У апавяданні яна наступная: 1) пачатак дзеяння, падзеі; 2) развіццё дзеяння, падзеі; 3) заканчэнне дзеяння, падзеі. Апісанне ўключае ў сябе: 1) агульнае ўражанне ад прадмета; 2) прыметы прадмета; 3) ацэнку прадмета. Разважанне складаецца з: 1) тэзісу; 2) доказаў; 3) вываду.

Аднак неабходна адзначыць, што тэксты, якія ўяўляюць сабой адзін тып маўлення, сустракаюцца даволі рэдка. Як правіла, выкарыстоўваюцца камбінаваныя тыпы маўлення: апавяданне з элементамі апісання, апавяданне з элементамі разважання; разважанне з элементамі апісання і інш.

Знаёмства школьнікаў з асноўнымі тыпамі маўлення лепш за ўсё ажыццявіць практычным шляхам праз супастаўленне і аналіз тэкстаў розных тыпаў маўлення, напрыклад:

*1. Аднойчы іду я дарогай і чую: нехта фыркае ў малінніку. Спыніўся, прыгледзеўся: мішка малінай ласуецца. Наеўся – і трушком на вадапой.*

*Схаваўся я за куст і цікую, куды мядзведзь далей пойдзе. І раптам недалёка ад мяне пляснулася ладная рыбіна. Я паглядзеў і аж вачам сваім не паверыў: ляжыць мой мішка на беразе і стронгу ловіць. Апусціць лапу ў ваду і варушыць кіпцюрамі. Стронга – рыба асцярожная, але цікаўная, спяшаецца паглядзець, што там такое варушыцца, а мядзведзь хоп – і на бераг! І так добра лавілася ў яго, так захапіўся ён лоўляй, што ўвачавідкі з дзесятак выкінуў.* (Паводле А. Пальчэўскага.)

2. *Гэта была дзіўнага выгляду птушачка велічынёю крыху большая за качку. У яе была вялікая галава на доўгай, гнуткай шыі. На галаве тырчалі ззаду пучкі пер'я, нібы чорныя рожкі ці вушкі, а вакол шыі тапарыўся старамодны каўнер залаціста-рыжага колеру з цёмна-карычневай, амаль чорнай аблямоўкай. Шчокі, шыя і ўся ніжняя частка тулава былі бліскуча-белыя, з цёмнымі і зеленаватымі паскамі па баках. Спіна ў птушкі была бурая, а лапы – пляскатыя, цёмна-зеленаватага колеру з шырокімі пальцамі, нібы абшытымі скуранымі шматкамі.* (Паводле В. Вольскага.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. *Усім мовам, якія існуюць на нашай планеце, уласціва адна асаблівасць: любая мова пастаянна мяняецца.*

*Па-першае, безупынна мяняецца сэнс слоў; адны словы знікаюць, на змену ім прыходзяць іншыя. Па-другое, мяняецца гучанне, вымаўленне слоў; могуць знікаць адны гукі і з'яўляцца новыя. Нарэшце, рознымі спосабамі мяняецца граматыка мовы, яе аснова.*

*Праходзіць няшмат часу ("няшмат" для мовы – гэта гадоў сто ці дзвесце) – і мова ўжо не тая, што была. Праходзіць яшчэ крыху часу – і мова мяняецца яшчэ болей. І так адбываецца заўсёды і ўсюды, з любой мовай, якой бы яна ні была і хто б на ёй ні размаўляў. Гэта закон.* (Па В. Плунгяну.)

Пры рабоце з тэкстамі можна выкарыстаць наступныя прыёмы:

1. Прыём супастаўлення трох тэкстаў з аналізам па наступных пытаннях:

– Адзначце, якое з прапанаваных пытанняў можна вызначыць як агульнае да кожнага з тэкстаў: "Што робіць прадмет?", "Які прадмет?", "Чаму прадмет такі?"

– У якім з тэкстаў гаворыцца аб прыметах прадмета, у якім – пра дзеянні, а ў якім – аб прычынах?

2. Прыём "фатаграфавання": вызначыць, змест якога выказвання мог бы змясціцца на адным фотаздымку, якога – на некалькіх, якога – цяжка ці немагчыма перадаць пры дапамозе фотаздымкаў. (Сутнасць гэтага прыёму грунтуецца на тым, што апісанне – гэта свет у статыцы, прыметы прадмета можна ўбачыць усе адразу; апавяданне – свет у дынаміцы, дзеянні, якія адбываюцца адно за другім, убачыць іх у адзін момант нельга; разважанне – тэкст у прычынна-выніковых сувязях, прычыны з'яў часта цяжка ўбачыць, іх трэба зразумець.)

3. Прыём назірання за гатовым тэкстам і розныя віды яго аналізу. Заданні пры гэтым могуць быць розныя: вызначыць тыпалагічную структуру тэксту; вылучыць з тэксту пэўныя тыпы маўлення; вызначыць, ці правільна выбраны тып маўлення для раскрыцця пэўнай тэмы і асноўнай думкі; вызначыць сінтаксічныя канструкцыі, якія выкарыстаны аўтарам для стварэння тэксту пэўнага тыпу маўлення; захоўваючы тып маўлення, пераказаць тэкст; зрабіць выбарачны пераказ тэксту-апавядання з элементамі апісання так, каб у выніку атрымалася апісанне прадмета; вызначыць, які тып маўлення павінен быць у аснове сачынення па прапанаванай тэме, і інш.

Як правіла, тэкст характарызуецца **завершанасцю**. Гэта значыць, што задума, з пункту гледжання аўтара, поўнасцю рэалізавана. Такі тэкст, калі ён правільна пабудаваны, мае пачатак і канец.

Для таго каб школьнікі засвоілі і гэтую прымету тэксту, можна прапанаваць практыкаванні з наступнымі заданнямі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1) параўнайце два тэксты і зрабіце вывад, які з іх завершаны, а які – не;

2) знайдзіце сказы, якія паказваюць, што тэкст завершаны;

3) завяршыце тэкст.

Такім чынам, знаёмства школьнікаў з тэкстам, яго прыметамі дапаможа вучням свядома аналізаваць чужыя выказванні, ствараць свае, развіваць маўленне ўвогуле.

## Дыскусія

У навуковай літаратуры тэрмін "тэкст" ужываецца ў розных значэннях. Некаторыя навукоўцы лічаць, што тэкстам можа называцца любое выказванне, у тым ліку і тое, што ўяўляе сабой сказ ці нават слова. Іншыя ж мяркуюць, што "праблема тэксту існуе толькі там, дзе ёсць, як мінімум, два сказы" [5, с. 23]. Выкажыце свой погляд наконт гэтага.

## Рэюме

Тэкст (ад лац. *textum* – сувязь, злучэнне) – звязнае і адносна завершанае выказванне на пэўную тэму, якое характарызуецца камунікатыўнай прызначанасцю і звычайна складаецца з групы сказаў, аб'яднаных сэнсава і граматычна. Тэкст з'яўляецца вынікам мысліцельнай і маўленчай дзейнасці чалавека.

Асэнсаванне школьнікамі паняцця "тэкст" адбываецца ў працэсе азнаямлення іх з такімі прыметамі тэксту, як чляніmасць, сэнсавая цэласнасць, тэматычнае адзінства, звязнасць, разгорнутасць, паслядоўнасць, завершанасць.

Літаратура

1. *Величко Л. И.* Работа с текстом на уроках русского языка. – М., 1983.

2. *Гальперин И. Р.* Текст как объект лингвистического исследования. – М., 1981.

3. *Зарубина Н. Д.* Текст: лингвистический и методический аспекты. – М., 1981.

4. *Ипполитова Н. А.* Текст в системе обучения русскому языку в школе. – М., 1998.

5. *Капинос В. И., Сергеева Н. Н., Соловейчик М. С.* Развитие речи: теория и практика обучения: 5 – 7 классы. – М., 1991.

6. *Купалова А. Ю.* Текст в занятиях родным языком. – М., 1996.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

7. *Савко И. Э.* Изучение темы «Текст» в XI классе филологического профиля // Народная асвета. – 2004, № 3. – С. 32 – 36.
8. *Саўко І. Э., Саўко У. П.* Паняцце “тэкст” пры вывучэнні беларускай мовы // Беларуская мова і  літаратура. – 1996, вып 4. – С. 3 – 12.
9. *Солганик Г. Я.* Стилистика текста. – М., 1997.

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

# АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ ВЫКЛАДАННЯ ГРАМАТЫКІ

**1.** Параўнайце наступныя выказванні адносна ролі і месца граматыкі ў школьным выкладанні мовы. Якія з прыведзеных думак найбольш блізкія вашаму разуменню ролі граматычных ведаў пры вывучэнні мовы? Чаму?

*"Граматыка не павінна абмяжоўвацца зборам правіл, здабытых эмпірычным шляхам... але павінна ўвесці ў дух мовы, растлумачыўшы тыя ўнутраныя лагічныя асновы, на якіх грунтуецца сама знешняя канструкцыя мовы".* (А. Граноўскі.)

*"Трэцяя мэта, якая дасягаецца пры першапачатковым выкладанні роднай мовы, — засваенне граматыкі. Раней гэта была першая і нават адзіная мэта, цяпер яна часта зусім забываецца. І тое і другое шкодна: выключнае вывучэнне граматыкі не развівае ў дзіцяці дару слова; адсутнасць граматыкі не дае дару слова свядомасці і пакідае дзіця ў хісткім становішчы; на адзін навык і развіты інстынкт слова, ва ўсякім выпадку, спадзявацца цяжка, але веданне граматыкі без навыку і развіцця дару слова таксама ні да чаго не прыводзіць. Значыць, і тое і другое неабходна".* (К. Дз. Ушынскі.)

*“Сістэматычны курс школьнай граматыкі дае школьнікам магчымасць асэнсаваць адну з найбольш важных з’яў рэчаіснасці, адну з умоў існавання чалавечага грамадства – мову, ведаць асноўныя факты роднай мовы (тэарэтычна і практычна), пашырае агульны кругагляд школьнікаў, а таксама садзейнічае развіццю іх лагічнага мыслення, памяці, увагі і інш.”.* (А. В. Цекучоў.)

**2.** Сфармулюйце задачы вывучэння граматыкі ў сярэдняй школе.

**3.** Назавіце і сцісла ахарактарызуйце асноўныя напрамкі ў методыцы выкладання граматыкі. Які з іх у значнай ступені рэалізуецца ў сучасных школьных падручніках? Абгрунтуйце свой адказ на прыкладзе методыкі вывучэння адной з тэм школьнага курса беларускай мовы.

**4.** Рэалізацыі якога спецыяльнага прынцыпу (прынцыпаў) выкладання граматыкі будзе садзейнічаць наступнае практыкаванне:

Напішыце рэцэнзію на адзін з артыкулаў, змешчаных у часопісе “Роднае слова”. Выкарыстайце па магчымасці наступныя маўленчыя формулы, уласцівыя гэтаму жанру навуковага стылю: *артыкул прысвечаны...; спачатку аўтар адзначае, што...; у працы даецца агляд...; у першай частцы многа ўвагі надаецца...; асноўная частка прысвечана...; аўтар правільна зазначае, што...; багаты фактычны матэрыял, змешчаны ў працы, удала ілюструе...; нельга не сказаць і пра...; такім чынам, можна...*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Якія яшчэ спецыяльныя прынцыпы вывучэння граматыкі вы ведаеце? Карыстаючыся школьнымі падручнікамі, прывядзіце прыклады рэалізацыі кожнага з іх.

Ці можна прытрымлівацца ўсіх спецыяльных прынцыпаў выкладання граматыкі пры вывучэнні кожнай граматычнай тэмы? Чаму?

**5.** Як вы разумееце паняцце "граматычны лад мовы"? З якой мэтай вучоныя (М. Р. Львоў, М. І. Жынкін і інш.) даследуюць маўленне школьнікаў? Што было выяўлена ў выніку гэтых даследаванняў? Якія віды практыкаванняў і заданняў садзейнічаюць узбагачэнню граматычнага ладу маўлення школьнікаў? Ці прадстаўлены такія практыкаванні ў сучасных падручніках? Праілюструйце свой адказ канкрэтнымі прыкладамі.

## МЕТОДЫКА МАРФАЛОГІІ

**1.** Раскажыце пра значэнне вывучэння марфалогіі ў сярэдняй школе. Пры неабходнасці выкарыстайце наступнае выказванне: "Без ведання спосабаў словазмянення вучні не змогуць паспяхова засвойваць у далейшым матэрыял па сінтаксісе, так як правілы спалучэння слоў у сказе ў значнай сваёй частцы засноўваюцца менавіта на ўласцівасці слова змяняцца (скланяцца, спрагацца). Са скланеннем і спражэннем, як і наогул з марфалагічным складам слоў, звязаны многія арфаграфічныя правілы, якія не могуць быць добра засвоены вучнямі без ведання асноўных звестак аб граматычнай прыродзе часцін мовы. Паколькі часціны мовы з'яўляюцца лексіка-граматычнымі разрадамі слоў, гэта значыць выдзяляюцца не толькі па прыметах чыста граматычных (фармальных), але і па лексічным значэнні слоў, вывучэнне іх абавязкова звязваецца з працай над слоўнікам вучняў" (А. В. Цекучоў).

**2.** Сфармулюйце задачы вывучэння марфалогіі ў сярэдняй школе.

**3***. Карыстаючыся адпаведнымі праграмамі, параўнайце змест прапедэўтычнага курса марфалогіі ў пачатковых класах і 5 – 8-х класах сярэдняй школы.

**4**. Успомніце, якія агульнадыдактычныя прынцыпы навучання вы ведаеце. Ахарактарызуйце прынцып даступнасці.

Прачытайце наступныя супрацьлеглыя выказванні вучоных адносна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

даступнасці граматычнага матэрыялу для дзяцей. Акрэсліце сваю пазіцыю па гэтым пытанні.

*Дзеці "зусім не здольныя да разумення чаго б там ні было абстрактнага... Пагэтаму пры выкладанні роднай мовы трэба мець на ўвазе, што нішто не можа быць само па сабе больш абстрактным, як тэорыя мовы"* (В. Кендзерскі);

*"Узровень дзіцячага разумення не такі нізкі, як часта думаюць... Дзіця можа зразумець вельмі многае, калі толькі яно будзе прапанавана яму ў даступнай форме і з яго пункту гледжання"* (Я. Грот).

**5**. Выкладанне марфалогіі на сінтаксічнай аснове як вядучы прынцып вывучэння граматыкі ў школе патрабуе ўліку і ўзаемасувязі наступных фактараў:

а) сістэматычнаму вывучэнню марфалогіі папярэднічае ўступны сінтаксічны курс, які фарміруе агульнае ўяўленне пра сінтаксіс як сістэму, яго асноўныя катэгорыі;

б) у працэсе сістэматычнага вывучэння марфалогіі ва ўсіх магчымых выпадках для характарыстыкі марфалагічных катэгорый павінен выкарыстоўвацца сінтаксічна і стылістычна арганізаваны матэрыял пераважна ў выглядзе звязнага тэксту;

в) асобныя марфалагічныя формы вучні павінны выяўляць, тлумачыць на аснове прыроджанага валодання канструкцыямі роднай мовы з пастаяннай апорай на адчуванне мовы;

г) вывучаныя марфалагічныя катэгорыі практычна ўключаюцца ў мову вучняў у працэсе выканання заданняў, якія патрабуюць разнастайных трансфармацый пэўных узораў, мадэліравання або самастойнага канструявання сказаў, звязных тэкстаў.

Прааналізуйце матэрыял двух-трох параграфаў раздзела "Дзеяслоў". У якой ступені рэалізаваны ў іх прынцып вывучэння марфалогіі на сінтаксічнай аснове?

Якія яшчэ спецыяльныя прынцыпы навучання марфалогіі вы ведаеце? У чым іх сутнасць?

**6.** Метадысты лічаць, што абавязковай умовай паспяховага навучання мове "з'яўляецца такая арганізацыя школьнага вывучэння граматыкі, пры якой вучні не толькі разумеюць і засвойваюць лінгвістычную сутнасць асобных фактаў і з'яў граматычнага ладу, але і атрымліваюць уяўленне пра іх функцыянальныя асаблівасці, семантыка-стылістычную ролю ў мове" (А. Дуднікаў).

Прасачыце, як гэта ўстаноўка рэалізуецца на практыцы. Прааналізуйце для гэтага матэрыял раздзела "Прыметнік".

Падрыхтуйце план-канспект урока па тэме "Прыметнік як часціна мовы". Ці можна ў ім выкарыстаць наступнае практыкаванне? Калі так, то

на якім этапе ўрока і з якой мэтай?

Спішыце, устаўляючы прыметнікі, што падыходзяць па сэнсу і стылёвай спалучальнасці. Параўнайце першапачатковы тэкст з тым, які атрымаўся. Вызначце, якую ролю адыгрываюць прыметнікі ў тэксце.

*... лес падобны на ... казку. Вось адна ... хваінка не вытрымала ...снегу, нахілілася. Паглядзела на яе ... ялінка і таксама нахілілася. Бо ёй яшчэ цяжэй было стаяць: яе ... галінкі больш ... . Сустрэліся ... хваінка з ялінкаю, абняліся. Зноў на іх пайшоў снег. Выгнуліся гэтыя два ... дрэўцы, утварылі ... арку, а пасля чаго толькі не намудрылі на гэтай ... арцы ... снег з марозам. Атрымалася ... зімовая казка.*

**7.** Прачытайце выказванні вядомых вучоных першай паловы XX стагоддзя адносна вывучэння марфалогіі. Параўнайце іх з сучасным падыходам. Якія думкі вучоных знайшлі адлюстраванне ў сучаснай методыцы выкладання марфалогіі? А што не было ўвасоблена? Правамерна гэта, на ваш погляд, ці не?

*"Педагагічная мэта тэарэтычнага вывучэння граматыкі... заключаецца ў развіцці, шляхам практыкавання, разумовых здольнасцей вучняў, г. зн. у выпрацоўцы імі навыку правільна думаць... Асноўная задача выкладання граматыкі роднай мовы ў сярэдняй школе, на маю думку, заключаецца ў тым, каб фарміраваць у вучняў свядомыя адносіны да фактаў роднай мовы"* (П. Ф. Фартунатаў).

*"Паколькі граматыка ёсць вынік назіранняў чалавека над уласнай моваю, а не мова — вынік граматыкі, то самы рацыянальны прыём вывучэння граматыкі будзе такі, пры якім стараюцца звярнуць увагу дзіцяці на тое, як яно гаворыць, і толькі скіроўваюць яго назіранні за тымі граматычнымі законамі, якім яно неўсвядомлена падпарадкоўваецца ў сваей мове"* (К. Дз. Ушынскі).

*"Для вучняў граматыка ёсць навука цяжкая, сумная, навука, якая выклікае страх і агіду. Між тым павінна б быць зусім наадварот, бо вывучэнне граматыкі роднай мовы як навукі, зразумела, вельмі лёгкае... Задаволіць розум дзіцяці яшчэ можа быць цяжэй, чым розум дарослага чалавека; яму мала сказаць, колькі часцін мовы і як яны называюцца: растлумачце яму, што такое гэтыя часціны мовы, для чаго яны і чаму іх столькі, а не столькі, — або абвінавачвайце саміх сябе ў яго тупасці і някемлівасці!.."* (В. Р. Бялінскі).

*"Старая граматычная руціна пачне пакрыху саступаць месца новай, больш рацыянальнай методзе навучання мове... Асноўная думка гэтай сістэмы заключаецца ў адыходзе ад ранейшай, мёртвай схаластыкі і ў імкненні надаць жывы сэнс усім граматычным правілам. З гэтай мэтай вывучэнне мовы пачынаюць звычайна не з пакутлівага пераліку*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*граматычных форм з іх незлічонымі выключэннямі, а з цэлага сказа, у якім вучань можа разумець сэнс і сувязь сказанага"* (М. А. Дабралюбаў).

*"Важным з'яўляецца не тое, каб дзеці бойка і без памылак, па старой або новай сістэме, класіфікавалі словы, а важнае тое, каб дзеці самі заўважалі катэгорыі, якія існуюць у мове, удумваліся ў словы, у іх сэнс і сувязі... Усе цяжкасці стануць значна лягчэйшыя, калі мы да канца прызнаем той факт, што дзеці валодаюць усімі граматычнымі катэгорыямі сваёй роднай мовы і што наша задача — толькі абудзіць у іх лінгвістычны інстынкт і прымусіць усвядоміць ужо існуючыя катэгорыі"* (Л. У. Шчэрба).

**8.** Тэрміны “граматыка”, “марфалогія” тлумачацца ў школьнай традыцыйнай практыцы сцісла і суха: "Граматыка складаецца з дзвюх частак: марфалогіі і сінтаксісу. У марфалогіі (ад грэч. *morphe* — 'форма', *logos* — 'паняцце, вучэнне') вывучаюцца часціны мовы, іх формы і правілы змянення”.

Падумайце, як можна зацікавіць вучняў, пераканаць у неабходнасці вывучэння марфалогіі. Падрыхтуйце свае прыклады, аргументы. Распрацуйце адпаведны фрагмент плана-канспекта ўрока.

Прадумайце, калі і як можна скарыстаць на гэтым уроку наступныя выказванні:

"Тупая араторыя, коснаязыкая паэзія, лёгкадумная філасофія, прыкрая гісторыя, двухсэнсоўная юрыспрудэнцыя без граматыкі... Яна правіламі паказвае шлях самому ўжыванню" (М. В. Ламаносаў).

"Паколькі менавіта граматыка вучыць правільнай мове, таму, як трэба гаварыць, чытаць і пісаць, асноўныя звесткі пра яе павінны быць вядомы кожнаму" (Л. К. Граўдзіна).

"Без граматыкі не вывучыш і матэматыкі" (Прыказка).

"Граматыка ёсць філасофія мовы, філасофія чалавечага слова" (В. Р. Бялінскі).

**9.** Прааналізуйце ў метадычным плане гульню "Я задумаў слова" на ўступным уроку па марфалогіі ў 5-м класе.

Парадак гульні наступны: вядучы задумвае слова, яму задаюць пытанні пра марфалагічныя асаблівасці гэтага слова, а вядучы адказвае толькі "так" або "не". Удзельнікі гульні павінны здагадацца, слова якой часціны мовы задумаў вядучы, прычым колькасць пытанняў павінна быць абмежавана, напрыклад, пяць – на пачатку гульні, тры – калі дзеці навучацца правільна фармуляваць патрэбныя пытанні.

Напрыклад:

*– Гэта самастойная часціна мовы?*

*– Так.*

*– Гэтае слова змяняецца па склонах?*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*– Не.*

*– Гэтае слова змяняецца па ліках?*

*– Не.*

Адказ: задуманае слова – прыслоўе.

Правільна арыентавацца ў гульні дапаможа папярэдне складзеная наступная табліца:

| **Часціны мовы** | **Змяняюцца** | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | **па склонах** | **па ліках** | **па родах** | **па часе** | **па асобах** |
| **Самастойныя:** | | | | | |
| назоўнік | + | + | – | – | – |
| прыметнік | + | + | + | – | – |
| дзеяслоў | – | + | + | + | + |
| прыслоўе | – | – | – | – | – |
| **Службовыя:** | | | | | |
| злучнік | | | | | |
| прыназоўнік | – | – | – | – | – |
| часціца | | | | | |

**10.** Прааналізуйце змест праграмы па раздзеле “Назоўнік”. Што павінны ведаць і ўмець школьнікі пасля яго вывучэння?

**11**. Прачытайце наступнае выказванне метадыста А. Д. Смірновай: "Вядома, што веды з'яўляюцца больш трывалымі, калі яны — вынік намагання думкі, а не памяці, што навучанне ідзе паспяхова тады, калі школьнікі вучацца аналізаваць і сінтэзаваць з'явы, якія назіраюць, адрозніваць і абагульняць іх, падводзіць пазнаныя аб'екты пад паняцці, устанаўліваць сувязі паміж паняццямі, пераходзіць ад прыватных паняццяў да агульных і, наадварот, аперыраваць імі".

Кіруючыся прыведзеным выказваннем, прааналізуйце матэрыял школьнага падручніка па адным з раздзелаў "Марфалогіі". На якія веды — як вынік намаганняў памяці або аналітыка-сінтэтычнай дзейнасці вучняў — арыентаваны дыдактычны матэрыял гэтага раздзела?

**12.** Якім з прапанаваных заданняў вы аддалі б перавагу, рыхтуючыся да ўрокаў? Абгрунтуйце свой выбар.

1. Прачытайце тэкст. Выпішыце спачатку агульныя назоўнікі, потым — уласныя, скажыце, якія з іх адушаўлёныя, а якія — неадушаўлёныя.

2. 3 тэксту выпішыце ўласныя назоўнікі, размяркоўваючы іх па групах: 1) уласныя імёны і прозвішчы; 2) назвы кніг, часопісаў; 3) назвы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вуліц, населеных пунктаў, адміністрацыйных адзінак; 4) ганаровыя званні, назвы ўзнагарод.

3. Спішыце сказы, дапісваючы канчаткі назоўнікаў. Растлумачце іх правапіс.

4. Спішыце сказы, ставячы ў пачатку слоў вялікую або малую літару; растлумачце яе напісанне.

5. Паразважайце пісьмова пра тое, што было б, калі б з мовы зніклі ўласныя імёны і назвы. Як бы людзі змаглі адшукаць дом сваіх знаёмых, навучальную ўстанову, магазін? Як адбывалася б падпіска на газеты і часопісы? Як выбіралі б кнігі ў бібліятэцы? Падкрэсліце ў сваёй працы ўласныя назвы.

**13.** Як пры тлумачэнні тэмы "Назоўнікі адушаўлёныя і неадушаўлёныя" можна выкарыстаць наступную табліцу?

| | |
|---|---|
| Вінавальны склон (бачыў **каго**?) | Назвы людзей: *вучняў, будаўнікоў, песняроў, сяброў.* Назвы звяроў: *ласёў, ваўкоў, зайцаў, зуброў, аленяў.* Назвы птушак: *буслоў, вераб'ёў, ластавак, шпакоў.* Назвы рыб: *шчупакоў, акунёў, уюноў, плотак.* Назвы насякомых: *аваднёў, камароў, мурашак, стракоз*. |
| Вінавальны склон (бачыў **што**?) | Назвы рэчаў: *кнігі, карты, алоўкі, ручкі.* Назвы раслін: *бярозы, ружы, гваздзікі, дубы.* Назвы прылад працы: *рыдлёўкі, сякеры, малаткі, нажы.* |

**14.** Вядома, што ў беларускай і рускай мовах род некаторых назоўнікаў не супадае. Назавіце 8 – 10 такіх слоў і прапануйце заданні да практыкаванняў, пры выкананні якіх ўвага школьнікаў засяроджвалася б менавіта на гэтай групе назоўнікаў.

**15.** На пэўным этапе вывучэння роду назоўнікаў вучням было прапанавана растлумачыць лексічнае значэнне слоў *самавучка, гарэза, ціхоня, чысцёха*. Абгрунтуйце мэтазгоднасць такога задання.

**16.** Вызначце, фарміраванню якіх уменняў па тэме "Лік назоўнікаў"

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

садзейнічаюць наступныя практыкаванні:

1. Выпішыце назоўнікі, якія ўжываюцца: а) ў адзіночным і множным ліку; б) толькі ў адзіночным ліку; в) толькі ў множным ліку. Вызначце, што абазначаюць назоўнікі, якія маюць форму толькі адзіночнага ці толькі множнага ліку. З падкрэсленымі назоўнікамі складзіце сказы.

*Змаганне, жорны, паверх, геаграфія, кабінет, дзверы, кросны, школа, акуляры, <u>жыта</u>, сані, <u>сумленне</u>, цэмент, калідор, майстэрня, мёд, <u>прыцемкі</u>.*

2. Згрупуйце назоўнікі ў сінанімічныя рады і падкрэсліце тыя словы, якія ўжываюцца толькі ў форме адзіночнага ліку.

*Радзіма, здарэнне, смеласць, гераізм, гісторыя, папулярнасць, выпадак, Айчына, бацькаўшчына, выпадак, слава, педагог, мужнасць, вядомасць, выкладчык, адвага, настаўнік, прыгода.*

3. Напішыце сачыненне на тэму “Школьная майстэрня”, выкарыстоўваючы па магчымасці назоўнікі, што ўжываюцца толькі ў форме множнага ліку: *абцугі, ціскі, нажніцы* і інш. Множналікавыя назоўнікі падкрэсліце.

**17.** Як вядома, ацэнка метадыстамі ролі склонавых пытанняў назоўнікаў супярэчлівая: ад іх абсалютызацыі да катэгарычнага адмаўлення.

Прааналізуйце розныя меркаванні і акрэсліце сваю пазіцыю ў "пытанні пра пытанні":

1. “...Так званыя "пытанні" пры правільнай пастаноўцы працэсу навучання павінны быць абсалютна выключаны з марфалогіі.

...Пытанні з'яўляюцца галоўнай перашкодай да распаўсюджвання правільных поглядаў на выкладанне граматыкі. Ролю гэтую іграюць яны, канечне, не самі па сабе як метадычны сродак, а выключна таму, што настаўнікі, у большасці сваёй, карыстаюцца імі несвядома.

"Намуштраваны" на "пытанні" вучань не думае ў час разбору ні пра канчатак, які стварае саму форму, ні пра значэнне гэтага канчатка ў параўнанні з другімі канчаткамі або з тым жа канчаткам, але ў другой сувязі, адным словам, не думае пра тое, што вывучае, пра форму.

...Прымяненне "пытання" стварае ілюзію, што вучань пра штосьці думае, нейкую задачу рашае. Тым часам, калі непрадузята ўгледзецца ў гэты спосаб, што выбіраецца для рашэння, то ён з'яўляецца надзвычай дзіўным... Толькі ў адной школьнай "граматыцы" мы павінны пытацца ў саміх сябе і са сваіх уласных глыбінь нейкім цудадзейным спосабам

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

атрымліваць адказ.

...Як выратаваць вучня ад бяздумнага зазубрывання? Я прапаную ў якасці спецыфічнага маста, які звязвае завучванне з першапачатковымі назіраннямі, метад фразавага скланення на пэўных, найбольш агульных, паводле значэння, фразах. Вучань пры такім метадзе не адразу кінецца завучваць складзеныя ім самім шляхам назірання парадыгмы, а папярэдне завучыць іх у фразах, якія я падбіраю так:

Н. *У мяне ёсць...*

Р. *У мяне няма...*

Д. *Я дапамагаю...*

В. *Я бачу...*

Тв. *Я цікаўлюся...*

М. *Я гавару аб...*

...Само сабой зразумела, што прапанаваныя мною фразы могуць усяляк мадыфікавацца і, можа быць, удасканальвацца, справа не ў іх, а ў метадзе фразавых шаблонаў, якімі я прапаную замяніць шаблонныя пытанні" (А. М. Пяшкоўскі).

2. Некаторыя настаўнікі карыстаюцца тэкстамі, дзе ёсць усе формы прапанаванага слова, напрыклад:

1. *З лесу выбегла ліса. У лісы пушысты хвост. Лісе трэба асцерагацца паляўнічага. Ён хоча падстрэліць лісу. Але за лісой цяжка сачыць, бо яна хітрая. Шмат казак склалі аб лісе.*

2. *Мая цёця — даярка. Яна працуе на ферме ў калгасе. Сёння даяркі не было на ферме. Яна была на сходзе. За выдатную працу даярцы ўручылі прэмію — пуцёўку ў санаторый. Даярку віншавалі родныя, знаёмыя. Наш калгас ганарыцца даяркай. Па радыё была перадача аб знакамітай даярцы.*

3. Можна прапанаваць скласці тэкст па загадзя падабраных пытаннях, напрыклад:

Н. *Хто працуе на машынабудаўнічым заводзе? — Мой дзядуля працуе на машынабудаўнічым заводзе.*

Р. *Каго сёння не было на працы? — Дзядулі не было сёння на працы. Ён захварэў.*

Д. *Каму доктар даў бюлетэнь? — Доктар даў бюлетень майму дзядулю.*

В. *Каго ты наведаў у выхадны дзень? -— У выхадны дзень я наведаў дзядулю.*

Тв. *Кім ты заўседы ганарышся? — Я заўсёды ганаруся дзядулем.*

М. *Аб кім ты пісаў у сваім сачыненні? — У сваім сачыненні я пісаў аб дзядулі.*

**18.** Тлумачэнне тэмы “Назоўнікі першага скланення, правапіс іх канчаткаў” пачалося з таго, што вучням было прапанавана выпісаць са

“Слоўніка сінонімаў і блізказначных слоў” 5 назоўнікаў-сінонімаў да слова *завіруха*, у якіх бы асновы заканчваліся на цвёрды зычны, на мяккі, на зацвярдзелы, на *–г-, -к-*. Які сінанімічны рад павінен атрымацца ў вучняў? Запішыце яго. Абазначце ў словах канчаткі, падкрэсліце асновы. Прадумайце далейшы ход працы з гэтымі словамі.

**19.** Для фарміравання ўменняў і навыкаў настаўнік прапанаваў вучням сістэму практыкаванняў. Якое месца ў гэтай сістэме займае наступнае практыкаванне?

Успомніце і запішыце 10 – 12 назоўнікаў першага скланення, якія б адносіліся да лексіка-тэматычнай групы “школа”. Складзіце невялікі тэкст, ужываючы па магчымасці гэтыя назоўнікі.

**20.** Пры вывучэнні якой тэмы могуць быць выкарыстаны наступныя практыкаваннні? Ці ў патрэбнай паслядоўнасці прапанаваны яны вучням?

1. Згрупуйце назоўнікі ў адпаведнасці з іх значэннем: а) зборныя прадметы; б) з’явы прыроды; в) рэчывы; г) хімічныя элементы; д) прасторавыя паняцці; е) грамадскія фармацыі, навуковыя плыні, тэорыі; ж) дзеянні, стан.

*Рэалізм, стэп, вецер, лес, шум, мёд, азот, феадалізм, спакой, чай, агонь, гай, шакалад, кісларод, дождж, край, натрый, дарвінізм.*

2. Выпішыце з арфаграфічнага слоўніка 13 – 15 назоўнікаў мужчынскага роду другога скланення, якія ў родным склоне адзіночнага ліку ўжываюцца з канчаткам *–у (-ю).* Што абазначаюць гэтыя назоўнікі?

3. З назоўнікамі, што ў дужках, складзіце і запішыце словазлучэнні. Растлумачце правапіс канчаткаў гэтых назоўнікаў.

*Выйшлі з (лес, дом, сад, музей); схаваліся ад (холад, сябар, снег, вораг); не купілі (цукар, хлеб, шакалад, кроп); шум (вецер, акіян, дождж, матор); не адчувалі (боль, страх, сорам).*

4. Спішыце сказы, устаўце патрэбныя канчаткі назоўнікаў. Растлумачце сэнс выдзеленых слоў.

*1. Паўз дарогу пайшлі кусты* ***алешнік..*** *і лазняк.. (Т. Хадкевіч). 2. Пасыпаліся буйныя кроплі даждж.., упала некалькі галак град.., як бы нейкі жартаўнік сыпануў жменю белых каменьчыкаў (Я. Колас). 3. Дзед Талаш набіў стрэльбу, усыпаў шчодрую порцыю* ***порах..*** *(Я. Колас). 4.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Прырода рыхтавалася да зімовага адпачынк.., каб пасля яго ўзняцца з новай сілай і хараством (А. Чарнышкевіч). 5. Тым часам з паўднёвага захад.. падымалася злавесная хмара (Я. Колас). 6. Ні звер, ні чалавек, ні птушка не парушалі ранішняя* ***спако..*** *лес.. (Я. Колас).*

5. Пры спісванні раскрыйце дужкі, абазначце канчаткі назоўнікаў роднага склону. Растлумачце сэнс прыказак.

*1. Зіма без (снег) – восень без (хлеб). 2. Лепш мець лішняга (сябар), чым лішняга (вораг). 3. Век пражыў, а (розум) не нажыў. 4. (Мёд) не накачалі, а пчол узлавалі. 5. Плачам (гора) не паможаш. 6. Чалавек без (запас) гіне да (час).*

6. Выпішыце з тлумачальнага ці арфаграфічнага слоўніка некалькі назоўнікаў мужчынскага роду 2-га скланення, якія ў залежнасці ад лексічнага значэння могуць мець у родным склоне канчаткі *–а(-я)* і *–у(-ю).*

7. Прачытайце сказы. Знайдзіце назоўнікі мужчынскага роду, якія ў родным склоне ўжыты з канчаткамі, якія не адпавядаюць норме. Выпраўце памылкі.

*1. Апошнія клубы ранішняга тумана схваліся ў лагчынах. 2. Пасля цяжкага пераходa падарожнікі спыніліся на адпачынак. 3. Каля вясковага клуба ўжо сабралася многа народа. 4. Дзеці ў школе вывучалі правілы дарожнага руха. 5. Уночы была завея, і намяло гурбы снега. 6. Лось пастаяў і павольна пайшоў у глыб леса.*

**21.** Ведаючы, што вучні з цяжкасцю засвойваюць тэму “Назоўнікі другога скланення, правапіс іх канчаткаў”, настаўнік адвёў на яе вывучэнне тры гадзіны. Урокі якіх тыпаў, на ваш погляд, яму неабходна правесці? Абгрунтуйце сваё меркаванне. Сфармулюйце і запішыце мэты гэтых урокаў.

**22.** Паразважайце, наколькі мэтазгодна пры вывучэнні тэмы “Назоўнікі трэцяга скланення, правапіс іх канчаткаў” выкарыстоўваць наступныя практыкаванні:

1. Згрупуйце наступныя назоўнікі ў сінанімічныя рады. Запішыце, ставячы кожнае слова ў творным склоне адзіночнага ліку.

*Спагадлівасць, перакананасць, далеч, безнадзейнасць, цемень, храбрасць, далячынь, упэўненасць, цемрадзь, чуласць, бездапаможнасць, мужнасць, даль, смеласць.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Згрупуйце наступныя словы ў антанімічныя пары. Запішыце, ставячы назоўнікі ў творным склоне адзіночнага ліку.

*Актыўнасць, большасць, нянавісць, бодрасць, заканамернасць, гуманнасць, пасіўнасць, меншасць, любоў, стомленасць, выпадковасць, жорсткасць.*

3. Складзіце і запішыце невялікі тэкст-апавяданне “У грыбы”. Выкарыстайце (па магчымасці) назоўнікі 3-га скланення: *ціш, свежасць, сенажаць, рунь, зелень, папараць, сырасць, глуш, стомленасць, радасць* і інш.

**23**. Вядома, што развіццю цікавасці да ўрокаў па марфалогіі спрыяе стварэнне маўленчых сітуацый, у якіх граматычная форма выступае не як правіла, якое трэба запомніць, а як сродак перадачы пэўнага зместу, выражэння думкі.

Напрыклад, перад вывучэннем тэмы "Канчаткі назоўнікаў роднага склону множнага ліку" настаўнік прапануе вучням уявіць сябе ў ролі пакупнікоў: "Як вы звернецеся да прадаўца з просьбай зважыць памідоры (яблыкі, мандарыны), назваўшы патрэбную вагу (2, 3, 5 кг)?” У адказах вучняў, як сведчыць практыка, гучаць розныя варыянты (*5 кілаграмаў (кілаграм) апельсінаў (апельсін)* і г. д.). Перад школьнікамі ставіцца пытанне аб тым, які з варыянтаў правільны, пасля чаго паведамляецца тэма ўрока і ставіцца задача навучыцца правільна ўжываць назоўнікі ў родным склоне множнага ліку.

Прадумайце маўленчыя сітуацыі, з дапамогай якіх можна прадэманстраваць практычную неабходнасць вывучэння тэмы "Канчаткі назоўнікаў першага (другога, трэцяга) скланення". Абгрунтуйце метадычную, псіхалагічную мэтазгоднасць падобных сітуацый перад вывучэннем той ці іншай граматычнай тэмы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**24.** Прачытайце ўрывак з верша Р. Барадуліна “Кед ці кедаў?” Пры вывучэнні якой тэмы, на якім этапе ўрока і з якой мэтай можна выкарыстаць гэты тэкст?

*Просяць дзеда*
*Непаседы,*
*Каб купіў на лета кеды.*
*Дзед купіў пяць новых пар –*
*Хоць у іх*
*на полюс шпар!*

*Напісаць як,*
*дзед не ведаў,*
*Хопіць іх:*
*Ці кед, ці кедаў?*

**25**. Пры вывучэнні якіх тэм раздзела “Назоўнік”, на якіх этапах урока і з якой мэтай можна выкарыстаць наступны матэрыял?

1. Запішыце ў алфавітным парадку назоўнікі першага скланення, што абазначаюць прадметы, якія вывучаюцца ў пятым класе. Складзіце і запішыце сказы з гэтымі словамі, ужываючы іх у творным ці месным склоне.

2. Прачытайце прыказкі, растлумачце іх сэнс. Знайдзіце назоўнікі другога скланення ў форме меснага склону, растлумачце правапіс іх канчаткаў.

*1. На языку мядок, а на сэрцы лядок. 2. Хто апёкся на малацэ, той і ваду студзіць. 3. Сябра не грыб, у лесе не знойдзеш. 4. У іншым шчасці няшчасце схавана. 5. На тое шчупак у возеры, каб карась не драмаў.*

**26.** А. В. Цекучоў у кнізе “Методика русского языка в средней школе” (М., 1980) піша, што вывучэнне тэарэтычных звестак па тэме “Назоўнік” павінна быць арганізавана так, каб граматычныя веды вучняў былі максімальна выкарыстаны для фарміравання арфаграфічных і маўленчых навыкаў. У якой ступені такі падыход рэалізаваны ў сучасных падручніках па беларускай мове? Праілюструйце свой адказ канкрэтнымі прыкладамі.

**27.** Пры вывучэння якой тэмы і з якой мэтай можна выкарыстаць наступныя заданні?

1. Уявіце сябе карэспандэнтам радыё і “зрабіце рэпартаж у прамым эфіры” з заапарка, выкарыстоўваючы па магчымасці наступныя назоўнікі іншамоўнага паходжання: *поні, кенгуру, зебу, гну, шымпанзе, калібры, какаду, фламінга* і інш.

2. Запішыце разам з імёнамі прозвішчы на зычны вучняў вашага класа, спачатку хлопчыкаў, пасля – дзяўчынак. Як павінны падпісваць свае сшыткі першыя з іх і як – другія? Запішыце назоўнікі ў патрэбнай форме.

**28.** Параўнайце выказванні адносна сутнасці і ролі марфалагічнага разбору часцін мовы. Якая ваша пазіцыя па гэтым пытанні?

*"Галоўнай формай падагульняючага паўтарэння вывучанага ў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*раздзеле "Назоўнік" (іншых раздзелах) павінен быць агульны марфолага-словаўтваральны разбор, які патрабуе ацэнкі і тлумачэння ўсіх характэрных асаблівасцей таго ці іншага назоўніка. Апрача агульнага, можа выкарыстоўвацца таксама частковы разбор, пры якім ацэньваюцца і тлумачацца толькі некаторыя, важныя для пэўнай мэтавай устаноўкі асаблівасці"* (А. В. Дуднікаў).

*"Так званы граматычны разбор, які, як правіла, праводзіцца ў нас, сам па сабе вельмі добрае практыкаванне, але пастаяннае скарыстанне аднаго гэтага практыкавання на працягу некалькіх гадоў робіць яго для дзяцей нясцерпна сумным. Мы раім звяртацца да яго зрэдку, толькі для таго, каб паўтарыць ужо засвоеныя дзецьмі граматычныя звесткі і прывесці іх у новую сістэму, адпаведную ўрыўку, які аналізуецца. Такая ператасоўка набытых ведаў вельмі карысная для развіцця і ўмацавання розуму... Гэта любімая форма для заняткаў лянівых настаўнікаў: нічога не можа быць спакайнейшым, як прымушаць вучняў аднаго за другім разбіраць наўздагад разгорнутую старонку, разбіраць не толькі вусна, але і пісьмова... Пісьмовы разбор як рэч цалкам бескарысную мы раім рашуча выключыць і замяніць яго іншымі пісьмовымі практыкаваннямі, у якіх больш сэнсу і займальнасці для вучняў. Да чаго ж могуць прывесці гэтыя вечныя перапісванні на працягу шматлікіх гадоў: "дом — наз., канкр., мужч. р., адзіночн. л. і г. д."* (К. Дз. Ушынскі).

*"Ідэалам была для мяне заўседы замена схаластыкі, механічнага разбору — жывой думкай, назіраннямі над жывымі фактамі мовы"* (Л. У. Шчэрба).

**29.** Часам марфалагічны разбор абмяжоўваецца фармальным пералічэннем прымет той ці іншай часціны мовы. Галоўным жа паказчыкам таго, наколькі свядома вучань праводзіць марфалагічны разбор, павінна стаць "уменне матываваць, даказваць правільнасць сваіх думак" (А. В. Цекучоў).

Параўнайце характар, паслядоўнасць двух узораў марфалагічнага разбору. Магчыма, першы прываблівае сваёй лаканічнасцю, сцісласцю. Другі ўзор марфалагічнага разбору на фоне першага выглядае груваcткім, абцяжараным... Якой схеме марфалагічнага разбору вы аддалі б перавагу ў сваёй настаўніцкай працы? Чаму?

1. *У лесе густа, пералівіста спявала птаства.*

Вусны разбор: *(у) лесе* — назоўнік, абазначае прадмет; пачатковая форма — *лес*; агульны, неадушаўлёны, мужчынскага роду, 2-га скланення, ужыты ў месным склоне, адзіночным ліку; у сказе — акалічнасць.

2. *Сахалін — цудоўны востраў.*

Вусны разбор:

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

I. *Сахалін* — назоўнік, бо ў пачатковай форме адказвае на пытанне “што?” Значыць, абазначае прадмет.

II. Пачатковая форма — форма назоўнага склону адзіночнага ліку – *Сахалін*.

III. Пастаянныя прыметы:

а) назоўнік уласны, таму што з'яўляецца назвай вострава;

б) неадушаўлёны, паколькі: 1) адказвае на пытанне “што?”, а не “хто?”; 2) форма вінавальнага склону супадае з формай назоўнага склону;

в) мужчынскага роду, бо: 1) можа спалучацца з займеннікам *мой*, а не *мая*, *маё*; 2) можа быць заменены займеннікам *ён* (а не *яна*, *яно*);

г) назоўнік 2-га скланення, таму што: а) гэта назоўнік мужчынскага роду, у назоўным склоне мае нулявы канчатак; б) у родным склоне мае канчатак -*а*, а не -*ы*, як назоўнікі 3-га скланення.

IV. Непастаянныя прыметы:

а) у сказе ўжыты ў назоўным склоне, бо адказвае на пытанне “што?”, мае нулявы канчатак і з'яўляецца дзейнікам (у адрозненне ад формы вінавальнага склону, якая не можа выступаць у ролі дзейніка);

б) мае форму толькі адзіночнага ліку, паколькі: 1) з'яўляецца ўласным іменем; 2) можа спалучацца са словам *мой* (а не *мае*).

**30.** Ахарактарызуйце змест праграмы па раздзеле “Прыметнік”. Што павінны ведаць і ўмець школьнікі пасля яго вывучэння?

**31.** Тлумачэнне тэмы “Прыметнік як часціна мовы” пачалося з выканання наступнага практыкавання:

Прачытайце тэксты і параўнайце іх. Знайдзіце словы, дзякуючы якім апісанне веснавой ночы ў другім тэксце становіцца больш поўным. Якой часцінай мовы з’яўляюцца гэтыя словы?

*Ноч толькі што апранула зямлю і раскідала свае чары, поўныя хараства. Зоры ўжо замігалі то там, то сям у небе, а з-за лесу ўзнімаўся месяц. Хмаркі высцілалі яму дарожку сваімі тканямі і расступаліся перад ім, скупанўшы ў яго бляску свае кудры.*

*Веснавая цёплая ноч толькі што апранула зямлю і раскідала свае чары, поўныя смутнага хараства. Трапяткія зоры ўжо замігалі то там, то сям у бяздонным небе, а з-за лесу ўзнімаўся бліскучы месяц. Дробныя белыя хмаркі высцілалі яму дарожку сваімі лёгкімі празрыстымі тканямі і расступаліся перад ім, скупануўшы ў яго бляску свае танкарунныя кудры.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(Паводле Я. Коласа)

Прадумайце далейшы ход працы на гэтым этапе ўрока. Улічыце тое, што матэрыял для вучняў знаёмы: яшчэ з пачатковай школы яны ведаюць азначэнне прыметніка, яго асноўныя граматычныя прыметы, адзначаюць залежнасць роду, ліку, склону гэтай часціны мовы ад адпаведных катэгорый назоўніка.

**32.** Абгрунтуйце мэтазгоднасць (немэтазгоднасць) правядзення пры вывучэнні лексіка-граматычных разрадаў прыметнікаў наступнага выбарачна-размеркавальнага дыктанта:

Выпішыце ў розныя слупкі якасныя і адносныя прыметнікі разам з назоўнікамі, да якіх яны дапасаваны. Падкрэсліце прыметнікі, якія ў тэксце з'яўляюцца мастацкімі азначэннямі (эпітэтамі).

*З першымі жнівеньскімі днямі адчуваецца набліжэнне восені. Ужо пазвоньвае залацістай жаўтляватасцю лістота кучаравых бяроз, губляюць звычайную зялёную афарбоўку кусты арэшніку, лёгкая барвота блукае ў дрыготкіх прычосках асін. І з кожным днём яркіх фарбаў прыбывае. Яны не толькі ў своеасаблівай мазаіцы лісця, траў, але і ў мностве асенніх ягад, лясных пладоў. На змену багаццю чэрвеньскай раніцы прыходзяць ярка-чырвоныя гронкі бруснікі і талакнянкі, напоўненыя вішнёвым бляскам буйныя бусіны журавін, ядавітыя вочкі воўчага лыка, важкія мясістыя ажыны. Набываюць спецыфічны карычневы колер арэхі і жалуды і таксама становяцца выразна бачнымі сярод лісця.*

(Паводле В. Стомы.)

**33.** На якім этапе ўрока па тэме "Прыметнікі якасныя, адносныя і прыналежныя" найбольш мэтазгодна выкарыстаць наступную табліцу? Як можна арганізаваць працу па ёй? У якім выглядзе варта прадставіць гэту табліцу вучням: поўнасцю (часткова) запоўненай ці незапоўненай? Калі незапоўненай, то запаўняць яе калектыўна ці прапанаваць вучням зрабіць гэта самастойна? Правядзіце адпаведны этап ўрока.

| **Прыметнікі, якія спалучаюцца са словам *дом*** | **Што абазначаюць прыметнікі** | **Разрад паводле значэння** |
|---|---|---|
| *Новы, цёплы, прыгожы*<br>*Вялікі, высокі*<br>*Белы, чырвоны* | якасць<br>памер<br>колер | якасныя |
| *Драўляны, цагляны* | матэрыял, з якога зроблены | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | |
|---|---|---|
| *Гарадскі, вясковы*<br>*Жылы*<br>*Летні*<br>*Трохпавярховы* | прадмет<br>месца знаходжання<br>прызначэнне<br>адносіны да часу карыстання<br>адносіны да колькасці | адносныя |
| *Бацькаў, бабулін, вавёрчын* | прыналежнасць чалавеку ці жывёле | прыналежныя |

**34.** Пры вывучэнні якой тэмы і з якой мэтай можна прапанаваць наступнае практыкаванне? Фарміраванню якіх уменняў яно садзейнічае?

Складзіце са слоў сказы, са сказаў – тэкст, запішыце. Дайце тэксту загаловак. Абазначце канчаткі прыметнікаў, растлумачце іх правапіс, вызначце разрады прыметнікаў.

*Быць, халодны, зіма. Стаяць, увесь, час, вялікі, мароз. Але, вясна, прыйсці, і, нечакана, цёплы. Нават, быць, цяжка, у, лес, лапіна, снег, патрапіць. Пайсці, мы, у, лес. Сустрэць, ён, мы, дзіўны, прыгажосць. Распусціцца, жоўта-зялёны, лісточак, арэшнік. Вось-вось, у, бяроза, таполя, распусціцца, набухлы, пупышка. Вольха, прыбрацца, у, чырвона-карычневы, завушніца. Скінуць, цёмны, лускавінка, ракіта, каля, рэчка.*

**35.** Якія віды навучальных дыктантаў можна выкарыстаць пры вывучэнні прыметніка? Падрыхтуйце і правядзіце некалькі такіх дыктантаў. Абгрунтуйце мэтазгоднасць іх выкарыстання пры вывучэнні пэўных тэм.

**36.** Пры вывучэнні якой марфалагічнай тэмы можна ў якасці дыдактычнага матэрыялу выкарыстаць наступныя прыказкі? Сфармулюйце заданне да адпаведнага практыкавання.

*1. На чужой старане і вясна не красна. 2. Не той харош, хто з твару прыгож, а той харош, хто да справы гож. 3. Багаты брат беднаму не рад. 4. Як ем, то глух і нем. 5. Калі ты худ, то не лезь да паноў на кут. 6. Хоць і ростам невялік, ды рука з пудавік.*

**37**. На адным з урокаў па тэме “Лічэбнік” настаўнік прапанаваў вучням прачытаць наступныя прыклады: 246 + 125 = 371; 1 791 – 439 = 1 352; 2 911 276 + 480 = 2 911 756. У чым сэнс такога задання? Калі і з якой мэтай яго можна прапанаваць школьнікам?

**38**. Вядома, што фарміраванню цікавасці да ўрокаў мовы, лепшаму

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

засваенню граматычнага матэрыялу садзейнічае пэўны гістарычны каментарый. Якія дадатковыя гістарычныя звесткі можна паведаміць школьнікам пры вывучэнні лічэбніка?

**39**. Успомніце ці выпішыце з фразеалагічнага слоўніка 8 – 10 фразеалагізмаў, у склад якіх уваходзяць лічэбнікі. Як можна выкарыстаць гэтыя фразеалагізмы пры вывучэнні лічэбніка?

**40**. У падручніку па беларускай мове вучням 6 класа прапануецца скласці вуснае апавяданне на тэму "Мой рэжым дня". Чым тлумачыцца мэтазгоднасць такога задання?

**41***. Падрыхтуйце план-канспект урока паўтарэння і сістэматызацыі па тэме "Лічэбнік".

**42**. Ахарактарызуйце змест праграмы па раздзелу "Займеннік". Што павінны ведаць і ўмець вучні пасля яго вывучэння?

**43***. Падбярыце прыклады (сказы, тэкст), якія можна выкарыстаць пры тлумачэнні тэмы "Займеннік як часціна мовы". Падумайце, як растлумачыць вучням, для чаго ўжываюцца займеннікі ў мове, на што яны ўказваюць, якую сінтаксічную функцыю выконваюць у сказе. Распрацуйце адпаведны этап урока і рэалізуйце яго ў аўдыторыі.

**44**. Вядома, што зваротны займеннік "сябе" ўваходзіць у склад устойлівых спалучэнняў тыпу *само сабой зразумела, не памятаць сябе, сам па сабе, трымаць сябе ў руках, браць праз сябе* і інш. Сфармулюйце і запішыце віды заданняў, якія можна прапанаваць школьнікам, выкарыстоўваючы гэты матэрыял.

**45**. На адным з урокаў настаўнік прапанаваў вучням наступнае практыкаванне:

Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову. Запішыце. Абазначце канчаткі займеннікаў.

*Моей подписи, в вашей шинели, свою шаль, у твоего гуся, наша летопись, твоё какао*.

Скажыце, займеннікі якога разраду вывучаліся на ўроку. Абгрунтуйце мэтазгоднасць/немэтазгоднасць такога практыкавання.

**46***. У сучасных праграмах па беларускай мове падкрэсліваецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

неабходнасць навучання школьнікаў маўленчаму этыкету. Прааналізуйце матэрыял падручніка і выявіце, наколькі гэтае патрабаванне рэалізавана ў матэрыяле па раздзеле "Займеннік".

Падрыхтуйце план-канспект урока па тэме "Асабовыя займеннікі", звяртаючы ўвагу і на ролю займеннікаў у маўленчым этыкеце.

**47**. Прачытайце наступныя тэксты. Вызначце, пры вывучэнні якой тэмы, у якім класе і з якой мэтай іх можна прапанаваць вучням. Сфармулюйце заданні да тэкстаў.

В белорусском языке имеются два способа обращения друг к другу — на «вы» и на «ты». «Вы» адресуется незнакомым или малознакомым, а также старшим. «Ты» символизирует близкие, дружеские отношения. Так разговаривают с дедушкой и бабушкой, отцом и матерью, братом и сестрой, женой и мужем, а также с одноклассниками, сокурсникамн, детьми, близкими знакомыми. Правда, следует учитывать и традиции отдельных регионов нашей страны. Например, в некоторых районах Западной Беларуси к родителям при самых теплых взаимоотношениях принято обращаться на «вы».

В официальном общении предпочтительной формой является «вы» даже между друзьями. Например, в период педагогической практики в присутствии учащихся студенты называют друг друга на «вы», по имени и отчеству, как и заведено между учителями.

Руководитель любого ранга призван обращаться к подчиненным на «вы». В сфере деловых отношений панибратское «ты» воспринимается как унижение достоинства.

В обыденном общении переход знакомых с «ты» на «вы» свидетельствует о взаимном отчуждении.

(Паводле І. Рыданавай.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Для многіх роднай з'яўляецца мясцовая гаворка, якая часам адрозніваецца ад літаратурнай мовы і лексічна, і фанетычна. Народная мова — гэта таксама часціца нашай культуры, якая мае права на павагу і беражлівыя адносіны да сябе. Менавіта ёй літаратурная мова абавязана многімі лінгвістычнымі знаходкамі. Вядомыя пісьменнікі ў прастамоўі чэрпалі тое, што надавала іх мове жыццёвую верагоднасць, экспрэсіўную арыгінальнасць і дзіўную трапнасць.

Калі да нас, гараджан, у госці прыехала вясковая бабуля, няма падстаў саромецца перад сябрамі яе своеасаблівай гаворкі, якая не супадае з літаратурнай нормай, і зусім непрыстойна імкнуцца папраўляць яе на кожным слове. Больш таго, у сямейных гутарках бывае неабходна пераходзіць на мову роднага дыялекту, якая звычная для старога чалавека.

(Паводле І. Рыданавай.)

**48.** Прааналізуйце кантрольныя пытанні і заданні, якія змешчаны на с. 354 – 356 падручніка "Беларуская мова" для 5 класа агульнаадукацыйнай школы з рускай мовай навучання (Мн., 2003). У якой ступені яны дазваляюць узнавіць, паўтарыць і сістэматызаваць веды школьнікаў па тэме "Займеннік"?

**49.** Прааналізуйце праграму па раздзеле "Дзеяслоў". Што павінны ведаць і умець школьнікі пасля яго вывучэння? Складзіце тэматычны план вывучэння дзеяслова ў 7 класе.

**50**. Прааналізуйце сістэму практыкаванняў і заданняў, якая змешчана ў падручніку па тэме "Дзеяслоў як часціна мовы". Вырашэнню якіх задач яна садзейнічае?

**51**. У падручніку па беларускай мове (Беларуская мова: Падручнік для 6-га класа агульнаадукац. шк. з рус. мовай навучання / Г. М. Малажай, З. М. Кавалевіч, С. Р. Рачэўскі. – Мн., 2001) сцвярджаецца, што "знешнія паказчыкі неазначальнай формы – канчаткі *–ць, -ці, -чы: жыць, везці, дапамагчы*". Ці згодныя вы з гэтым? Калі не, то як растлумачыце вучням, што *–ць, -ці, -чы* не канчаткі, а формаўтваральныя суфіксы?

**52**. З якімі мэтамі можна прапанаваць вучням наступнае заданне: "Складзіце і запішыце правілы паводзінаў на прыродзе, выкарыстоўваючы дзеясловы ў неазначальнай форме".

**53**. Пры вывучэнні якой тэмы і з якой мэтай вучням можна прапанаваць наступнае практыкаванне?

Прачытайце прыказкі, замяняючы формы дзеясловаў 2-ой асобы адзіночнага ліку формамі 2-ой асобы множнага ліку. Запішыце дзеясловы парамі, растлумачце правапіс канчаткаў.

*1. Глыбей узарэш – болей збярэш. 2. Як пражывеш, так і праслывеш. 2. За двума зайцамі пагонішся – ні аднаго не зловіш. 4. З кім павядзешся, ад таго і набярэшся. 5. Якую робіш справу, такую маеш славу.*

**54**. Распрацуйце тлумачэнне тэмы "Рознаскланяльныя дзеясловы" з выкарыстаннем наступнай табліцы. Абгрунтуйце свой выбар метаду тлумачэння тэмы.

| **Асоба** | **Займен-** | **Адзіночны лік** | **Займен-** | **Множны лік** |
| --- | --- | --- | --- | --- |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | **нікі** | | **нікі** | |
|---|---|---|---|---|
| 1-я | я | бягу, ем, дам | мы | бяжым, ядзім (ямо), дадзім (дамо) |
| 2-я | ты | бяжыш, ясі, дасі | вы | бяжыце, ясце (ясцё), дасце (дасцё) |
| 3-я | ён, яна, яно | бяжыць, есць, дасць | яны | бягуць, ядуць, дадуць |

**55**. Прааналізуйце 2 – 3 групы дадатковых рознаўзроўневых практыкаванняў для індывідуальнай працы, якія прапануюцца школьнікам пры вывучэнні дзеяслова ў 7 класе (Беларуская мова: Падруч. для 7-га кл. устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі з рус. мовай навучання з 12-гадовым тэрмінам навучання / Г. М. Малажай, Н. М. Чалюк. – Мн., 2004). Вызначце, якому ўзроўню складанасці адпавядае кожнае з гэтых практыкаванняў. Абгрунтуйце свой доказ.

**56***. Распрацуйце план-канспект урока камбінаванай структуры па тэме “Правапіс НЕ з дзеепрыметнікамі”.

**57.** Вызначце, з якой мэтай можна выкарыстаць пры вывучэнні дзеепрыслоўя наступны матэрыял. Сфармулюйце заданне да адпаведнага практыкавання.

1. Ідучы па вуліцы, вочы шукалі знаёмы дом. 2. Расчыніўшы акно, пакой напоўніўся свежым паветрам. 3. Убачыўшы на стале свежы пірог, жаданне есці ўзнікла ва ўсіх. 4. Ідучы дадому, нечакана пайшоў моцны дождж.

**58**. З якой мэтай можна прапанаваць вучням наступнае практыкаванне? Фарміраванню якіх уменняў яно садзейнічае?

Перакладзіце на беларускую мову дзеепрыслоўі *получив, прочитав, не пропуская, вникая, продумывая, перелистывая*. Складзіце і запішыце памятку “Як трэба чытаць кнігу”, выкарыстайце перакладзеныя дзеепрыслоўі.

**59**. Прааналізуйце наступныя практыкаванні. На фарміраванне якіх уменняў яны накіраваны? Дапоўніце практыкаванні заданнямі, якія садзейнічалі б удасканаленню маўленчых навыкаў вучняў.

1. Выпішыце з тэксту дзеепрыслоўі і запішыце дзеясловы, формамі якіх яны з’яўляюцца. Абазначце суфіксы дзеепрыслоўяў.

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

*Восеньскія песні*

*Надышла восень. Зарумяніліся чупрыны ў цяністых клёнаў.*

*Цяпер нярэдка зноў можна пачуць птушыныя спевы.*

*Да сваіх шпакоўняў часам вяртаюцца шпакі. Спяваючы каля іх, птушкі, як і ўвесну, узмахваюць чорнымі крыльцамі, шчоўкаюць дзюбкамі, цікаўна аглядаюць шпакоўні. Глядзіш, паспяваюць раніцу-другую, развітваючыся з жыллём, у якім яны нарадзіліся і выраслі, і знікнуць.*

*Пагоднымі лістападаўскім ранкамі нярэдка можна пачуць за вёскай такаванне цецерукоў. Пераапрануўшыся за лета ў свежае чорнае пер'е і набраўшыся сіл, старыя пеўні ганяюцца адзін за адным па шэрым ржэўніку, фарсіста паблісквaючы снежна-белым падхвосцем.*

(Паводле Р. Ігнаценкі.)

2. Спішыце тэкст, устаўце прапушчаныя літары. Ад дзеясловаў, запісаных у дужках, утварыце дзеепрыслоўі.

*Сонца, (схіліцца) на вечар, заліло захад і зазірнула ў ..окны в..сковай хаты. Амялушкі в..лікай чарадой абселі рабіну. В..раб'і пырхнулі з плота і селі ля парог.., пад страхою на пачастунак. Канаплянка, нібы (адгадаць) іх жада...е, шпарка перал..цела і села пад страхою, каб бачыць, чым пачастуюць в..раб'ёў. Сініцы і гілі с..дзелі на ябл..ні н..рухома, (натапырыць) пер'е, якое блішч..ла ад сонца. Яны з-пад крыланазіралі, што робяць в..раб'і.*

(Паводле Я. Крамко.)

**60.** Вядома, што першапачатковае ўяўленне аб прыслоўі школьнікі атрымліваюць у малодшых класах. Падрыхтуйце неабходны матэрыял, на аснове якога вучні успомняць, на якія пытанні адказваюць словы гэтай часціны мовы, што яны абазначаюць, якую часціну мовы паясняюць. Прадумайце далейшы ход тлумачэння тэмы "Прыслоўе як часціна мовы" і аформіце ўсё гэта як адпаведны этап плана-канспекта ўрока.

**61**. У сучасных падручніках па беларускай мове значнае месца займаюць практыкаванні, накіраваныя на працу з тэкстам. Прааналізуйце сістэму практыкаванняў па раздзеле "Прыслоўе". У якой ступені яна адпавядае патрабаванню, што тэксты ў вучэбных кнігах павінны быць падабраны і размешчаны так, каб працу па развіцці маўлення "можна было праводзіць адначасова з вывучэннем граматыкі, абапіраючыся на засвоены вучнямі тэарэтычны матэрыял, глыбей асэнсоўваць і замацоўваць яго" (В. У. Протчанка).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**62**. Актывізацыі пазнавальнай і маўленчай дзейнасці вучняў на ўроках марфалогіі садзейнічаюць праблемныя пытанні.

Праблемныя пытанні, заданні павінны спрыяць фарміраванню наступных уменняў і навыкаў:

1) параўноўваць, супастаўляць падобныя прыметы і на іх аснове выяўляць тое, што адрознівае адну з'яву ад другой, суадносіць агульнае і прыватнае. (Напрыклад: *Параўнайце словы, якія выражаюць колькаснае значэнне: “тры”, “тройка”, “утраіх”, “трэці”. Па якіх прыметах вы вызначыце, што гэтыя словы адносяцца да розных часцін мовы?*);

2) выбіраць з наяўнай інфармацыі тую, якая патрабуецца для рашэння прапанаванай граматычнай задачы. (Напрыклад: *Вучань у сачыненні напісаў "пшанічнае калосся". Выпраўце памылку. Падумайце, чаму з’явілася такая памылка. Якое правіла трэба ведаць, каб не зрабіць падобнай памылкі?*);

3) знаходзіць шляхі і даказваць правільнасць або памылковасць таго ці іншага сцвярджэння. (Напрыклад: *Словы “важаты”, “гальштук” – назоўнікі. Што трэба зрабіць, каб гэтыя словы сталі дзейнікамі? На гэтае пытанне можна адказаць так: а) пабудаваць з імі сказы; б) ужыць гэтыя словы з іншымі словамі; в) падабраць да іх выказнікі; д) уключыць іх у граматычную аснову сказа... Які з гэтых адказаў больш дакладны? Чаму не падыходзяць іншыя адказы?*);

4) падбіраць на аснове назіранняў аргументы для той ці іншай думкі, каменціраваць свае аргументы, разважаць. (Напрыклад: *Ці можна абысціся ў мове без прыназоўнікаў? Яны ж не абазначаюць ні прадметаў, ні прымет, ні дзеянняў, не маюць лексічнага значэння, не з'яўляюцца членамі сказа.*);

5) абагульняць, дыферэнцыраваць моўныя факты і з'явы. (Напрыклад: *Чаму наступныя прыслоўі размеркаваны ў такой паслядоўнасці: неўзабаве, няўхільна, неабходна; нярэдка, недалёка, нядобра; нідзе, нікуды, ніадкуль; па-асенняму, па-мойму, па-дзіцячы?*);

6) уключаць вывучаны матэрыял у звязныя выказванні, паказваць, дзе трэба (або не трэба) яго выкарыстоўваць, папярэджваць моўныя памылкі вучняў. (Напрыклад: *Уявіце, што ідуць выбары капітана каманды для ўдзелу ў пасяджэнні клуба вясёлых і знаходлівых. Вы прапануеце кандыдатуру свайго аднакласніка (аднакласніцы). Дайце яму (ёй) характарыстыку, выкарыстоўваючы прыметнікі, прыслоўі.*)

Улічваючы названыя патрабаванні да праблемных пытанняў і заданняў, прааналізуйце і вызначце долю праблемных заданняў у раздзеле "Марфалогія" школьнага падручніка па мове. Да любой тэмы з раздзела ("Назоўнік", "Прыметнік" і г. д.) падбярыце праблемныя пытанні, заданні па тыпу пералічаных.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**63.** Прадумайце методыку сачынення на "марфалагічныя" тэмы. Ацаніце наступнае сачыненне.

ЯК ПАСВАРЫЛІСЯ НАЗОЎНІК З ПРЫНАЗОЎНІКАМ

Аднойчы Прыназоўнік святкаваў дзень нараджэння. Усіх запрасіў ён на сваё свята. Толькі не заспеў дома Назоўніка. "Няма, то й не трэба, абыдземся", — вырашыў Прыназоўнік.

І вось наступіла свята. Прымчаўся Дзеяслоў, уварвалася Прыслоўе, тоненька хіхікаючы, прыбег Прыметнік, ледзь даехала Дзеепрыслоўе, нават Часціцы, Выклічнікі, Злучнікі — і тыя з'явіліся, цяжка пыхкаючы і вохкаючы.

Пачалася цырымонія віншавання.

— Дарагі ... Віншуем цябе ... . Жадаем табе ....

— Будзь заўседы здаровы і вяселы. Працуй і далей дзеля ....

— Мы хочам падараваць табе гэты....

— А я прынесла табе ....

— А я пашыла табе ....

Здзівіўся Прыназоўнік. Нічога нельга зразумець. Але выгляду не падае ды і кажа:

— Дзякуй. А цяпер прашу ўсіх да ... . Я спёк вам вялікі смачны... .

Толькі цяпер усе зразумелі, у чым справа, і пабеглі па Назоўніка.

А Назоўнік сядзеў у сваім крэсле і таксама быў вельмі раззлаваны. Ён разважаў: "Хай сабе. Абыдуся ... іх. Мне ... аднаму добра .... Падумаеш! ... хочаце ведаць, я ... мове – самы галоўны. Чаго яны вартыя ... мяне. Гэты Дзеяслоў ... мяне неразумны ... бездапаможны, ... прыметнік ... мяне ... залежыць. Ды ... адзін сказ... мяне ... абыдзецца".

Глядзіцца ў люстэрка: "Які я прыгожы, абаяльны, далікатны. Паспяваць ці што?" І пачаў спяваць:

... любіць Беларусь нашу мілую,
Трэба ... розных краях ... ,
Разумею, ... выраю
Жураўлі ... Палессе ляцяць.

"Ой, нешта і песня не атрымліваецца. Вось што значыць пасварыцца з Прыназоўнікам, з іншымі часцінамі мовы! Што я нарабіў!" — падумаў назоўнік. Толькі ён так падумаў, як з'явіліся ўсе сябры – часціны мовы. Узрадаваліся Назоўнік і Прыназоўнік, што зноў будуць дапамагаць адзін аднаму. Усе разам часціны мовы адправіліся святкаваць дзень нараджэння Прыназоўніка. І зноў загучалі прыгожыя словы, прамовы, песні, з'явіліся цудоўныя падарункі, а галоўнае, гасцям вельмі спадабаўся смачны торт. З таго часу Назоўнік і Прыназоўнік жывуць у згодзе.

(Людміла Сланцава)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Спіс літаратуры для самастойнай працы па раздзеле

1. *Варановіч З. Б.* Методыка выкладання беларускай мовы. – Мн.: Універсітэцкае, 1985.

2. Выкладанне беларускай мовы ў школе / Пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мн.: Народная асвета, 1994.

3. *Дудников А. В.* Методика изучения грамматики в восьмилетней школе. – М.: Просвещение, 1977.

4. *Лаўрэль Я. М., Новікава Т. Р., Язерская С. А.* Вывучэнне марфалогіі ў школе. – Мн.: Народная асвета, 1991.

5. *Озерская В. П.* Изучение морфологии на синтаксической основе: 4 – 7 классы. – М.: Просвещение, 1989.

6. *Саўко У. П.* Развіццё маўлення школьнікаў пры вывучэнні марфалогіі (назоўніка і прыметніка). – Мн.: Беллітфонд, 2000.

7. *Текучёв А. В.* Методика русского языка в средней школе. – М.: Просвещение, 1980.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ СІНТАКСІСУ

**1.** Расскажыце пра значэнне вывучэння сінтаксісу ў школе. Пры неабходнасці выкарыстайце наступнае выказванне: “Вывучэнне сінтаксісу ў школе мае вялікае тэарэтычнае і практычнае значэнне. На занятках па сінтаксісе вучні пазнаюць законы сувязі слоў, будову словазлучэнняў і сказаў, іх тыпы, вывучаюць законы пабудовы маўлення, засвойваюць нормы літаратурнай мовы і прытрымліваюцца гэтых нормаў у працэсе вусных і пісьмовых практыкаванняў. Вывучэнне сінтаксісу знаходзіца ў цеснай сувязі з вывучэннем пунктуацыі. Калі вучань добра засвоіў сінтаксіс, ён беспамылкова будзе ставіць знакі прыпынку” (В. І. Лебедзеў).

**2**. Выкарыстоўваючы адпаведныя праграмы, пазнаёмцеся са зместам курса сінтаксісу ў пачатковых класах. Вызначце, што павінны ведаць і ўмець школьнікі пасля яго вывучэння.

**3**. Растлумачце, чаму перад вывучэннем у 5-м класе сістэматычнага курса беларускай мовы ідзе прапедыўтычны (уводны) раздзел "Сінтаксіс і пунктуацыя".

**4.** Улічваючы наступныя выказванні, акрэсліце задачы вывучэння

сінтаксісу ў школе:

*"Сістэматычны курс сінтаксісу вывучаецца ў 8—9-х класах на аснове тых ведаў, уменняў і навыкаў, якія школьнікі набылі ў папярэдніх класах. У час тлумачэння новага матэрыялу неабходна засяроджваць увагу на інтанацыі, паўзах, лагічных націсках у сказах; відах сказаў і выказанай у іх думцы; размяшчэнні слоў, іх формах; сэнсавых адценнях думкі. Усё гэта будзе садзейнічаць развіццю адчування мовы, самастойнасці мыслення, фарміраванню навыкаў пунктуацыйнай пісьменнасці, асноў культуры мовы"* (В. У. Протчанка).

*"Пры вывучэнні сінтаксісу трэба сістэматычна і настойліва выпрацоўваць нормы літаратурнага вымаўлення, папаўняць лексічны запас, удасканальваць граматычны лад мовы вучняў, пунктуацыйныя і інтанацыйныя навыкі, звязную мову"* (В. У. Протчанка).

*"Усведамленне мовы як сістэмы і актыўнае авалоданне моўнымі сродкамі ў разнастайных формах іх праяўлення з'яўляецца цэнтральнай задачай вывучэння роднай мовы, у прыватнасці сінтаксісу, у школе"* (А. Ю. Купалава).

*"Сінтаксіс з'яўляецца базай, фундаментам, на якім развіваецца мысленне вучняў, на якім грунтуецца навучанне дзяцей мове, пунктуацыі; паспяховасць рэалізацыі гэтых задач залежыць ад узроўню сінтаксічных ведаў вучняў"* (Р. А. Маскоўкіна).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**5.** Параўнайце два падыходы да азнаямлення школьнікаў з сінтаксісам як раздзелам мовазнаўства. Якому з іх вы аддалі б перавагу?

А. Настаўнік прапануе вучням са словамі, дадзенымі ніжэй, скласці і запісаць спачатку словазлучэнні, потым сказы:

*1. Воблачка, неба, блакітнае, паплыць, па. 2. У, вокны, ранішняе, пазіраць, ласкава, сонца. 3. Цішыня, у, панаваць, глыбокая, лес. 4. Толькі, дрэвы, дзятлы, па, стукаць.*

Затым вучням задаецца наступнае пытанне: “Што вы зрабілі са словамі, складаючы сказы?”

Пасля гэтага ідзе наступнае паведамленне настаўніка: “Словы, звязваючыся паміж сабой па пэўных правілах, утвараюць словазлучэнні і сказы. Як словазлучэнні, так і сказы маюць сваю будову і значэнне.

Раздзел навукі аб мове, у якім вывучаюцца будова і значэнне словазлучэнняў і сказаў, называецца сінтаксісам”.

Б. Настаўнік пачынае ўрок з наступнага паведамлення:

“Адзін англічанін, перад тым як паехаць ў Беларусь, вырашыў самастойна вывучыць беларускую мову. Ён купіў тоўсты слоўнік і праз некаторы час засвоіў вялікую колькасць беларускіх слоў. Пасля гэтага англічанін палічыў, што зможа свабодна размаўляць па-беларуску. І вось

ён прыляцеў у Мінск і ў аэрапорце сказаў чалавеку, які яго сустракаў, наступныя словы: "Я абяцаць Джон вы пазваніць". Але субяседнік не зразумеў, ці ён павінен пазваніць Джону, ці Джону пазвоніць англічанін. Англічанін таксама не зразумеў, што няясна субяседніку.

Як вы думаеце, чаму беларус не зразумеў англічаніна?”

Пасля таго як прагучаць адказы вучняў, настаўнік паведамляе, што ў мовазнаўстве існуе такі раздзел, што вывучае законы, паводле якіх будуюцца сказы.

**6.** Разуменне сінтаксісу як вучэння пра словазлучэнне і сказ прывяло да змянення прадмета школьнага сінтаксісу, дзе доўгі час разглядалася толькі адна адзінка — сказ.

Чым, на вашу думку, абумоўлена ўключэнне ў школьную праграму тэмы "Словазлучэнне"? Што гэта дало школьнаму курсу мовы? Ці апраўдана гэта з метадычнага пункту гледжання?

**7**. Параўнайце наступныя фармулёўкі азначэння словазлучэння. Якая розніца паміж імі?

1. Словазлучэнне — гэта спалучэнне двух і больш самастойных слоў, звязаных падпарадкавальнай сувяззю: *іду* (куды?) *у лес.*
2. Сам тэрмін "словазлучэнне" паказвае, што гаворка ідзе пра спалучэнне двух або некалькіх слоў. Словы, якія ўваходзяць у словазлучэнне, звязаны паміж сабой па сэнсе і граматычна. Сувязь паміж словамі ўстанаўліваецца з дапамогай пытання: *любоў* (да чаго?) *да Радзімы*.
3. Словазлучэнне складаецца з дзвюх частак: галоўнага слова і залежнага. Залежнае слова паясняе галоўнае і звязваецца з ім па сэнсе і граматычна: *новы дом, жыў у горадзе.*

Якую з фармулёвак азначэння словазлучэння можна праілюстраваць наступнымі прыкладамі: *зялёная мурашка, кусlівы грыб, піць хлеб*? Якія словы настаўніка павінны папярэднічаць гэтым прыкладам?

**8.** Вызначце, на якім этапе вывучэння словазлучэння, з якой мэтай і як можна выкарыстаць наступны апорны канспект:

Словазлучэнне

СЭНС

грам.     прыназ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

якая?
*цікавая кніга*

дзе?
*ісці па вуліцы*

**9.** Складзіце табліцу, якую можна выкарыстаць пры тлумачэнні тэмы “Сувязь слоў у словазлучэнні”. Падрыхтуйце тлумачэнне гэтай тэмы, выкарыстоўваючы падрыхтаваную вамі табліцу.

**10.** Ацаніце метадычную вартасць прапанаванага матэрыялу для знаёмства са спосабамі сувязі слоў у словазлучэнні. Які прынцып падбору словазлучэнняў у першым і другім выпадку? Якому матэрыялу вы аддадзіце перавагу пры тлумачэнні гэтай тэмы? Чаму?

1. Знайдзіце ў кожным словазлучэнні галоўнае і залежнае словы. Вызначце, якой часцінай мовы выражана залежнае слова. Ці змяняецца яно пры змяненні галоўнага слова ў кожнай групе?

| | | |
|---|---|---|
| *працоўны тыдзень* | *будаваць дом* | *ярка расказваць* |
| *трэцяя прэмія* | *марыць аб шчасці* | *крочыць уперад* |
| *сестрыны сшыткі* | *пагаварыць з вамі* | *вельмі высокі* |
| *наша краіна* | *верны дружбе* | *па-летняму гарачы* |

2. Прачытайце словазлучэнні. Чым яны адрозніваюцца? Што агульнага ў характары сувязі паміж галоўным і залежным словамі ў гэтых словазлучэннях? Чым адрозніваюцца спосабы сувязі ў кожным з іх?

Дапасаванне
якое?
*аратарскае майстэрства*
*аратарскага майстэрства*
*аратарскаму майстэрству*

Кіраванне
*якое?*
*майстэрства слова*
*майстэрству слова*
*майстэрствам слова*

Прымыканне
якое?
*майстэрства гаварыць*
*майстэрству гаварыць*
*майстэрствам гаварыць*

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

**11.** Прачытайце выказванні метадыстаў адносна вывучэння словазлучэння ў курсе мовы. У якой ступені матэрыялы падручніка да тэмы "Словазлучэнне" (8 клас) сугучныя гэтым метадычным установкам?

*"Вывучэнне словазлучэння ў цеснай сувязі з лексікай дае магчымасць паглыбіць веды вучняў па лексіцы і граматыцы, паказаць, што лексіка і граматыка — не дзве аўтаномныя галіны моўнай сістэмы, а дыялектычнае адзінства двух бакоў моўнай рэчаіснасці, якія ўзаемадзейнічаюць паміж сабой"* (В.У. Протчанка).

*"Словазлучэнне — гэта тая мінімальная сінтаксічная адзінка, на аналізе якой лёгка паказаць функцыі склонаў, родавых, лікавых і асабовых канчаткаў, прыназоўнікаў, асаблівасці дапасавання і кіравання"* (Н. С. Раждзественскі).

*"Вывучэнне словазлучэнняў у школе, праца з мэтай знаходжання памылкі ў будове словазлучэнняў, паказ норм дапасавання і кіравання — усё гэта павінна ўзбагаціць мову вучняў новымі сінтаксічнымі канструкцыямі, папярэдзіць з'яўленне розных недахопаў у мове"* (Г. А. Фамічова).

**12.** У сістэме працы над словазлучэннем неабходна выкарыстоўваць заданні розных тыпаў, напрыклад:

а) практыкаванні, якія фарміруюць паняцце пра словазлучэнне, яго будову і граматычнае значэнне;

б) практыкаванні, якія выпрацоўваюць уменне правільна вызначаць сэнсавыя адносіны паміж словамі ў словазлучэнні;

в) практыкаванні, якія спрыяюць запамінанню асноўных мадэлей словазлучэнняў;

г) практыкаванні, якія вучаць правільнаму ўжыванню словазлучэнняў у вусным і пісьмовым маўленні.

Зыходзячы з пералічаных тыпаў практыкаванняў, прааналізуйце матэрыял падручніка па тэме "Словазлучэнне" (8 клас). Якім тыпам практыкаванняў аддаюць перавагу аўтары школьных падручнікаў? Наколькі гэта мэтазгодна?

**13.** Прачытайце наступны дыдактычны матэрыял. Калі і з якой мэтай яго можна выкарыстаць пры вывучэнні словазлучэння? Сфармулюйце заданне да практыкавання.

Благодарить брата, шутить над соседом, пойти за хлебом, ходили за грибами, болеть гриппом, старше брата, женился на Ольге, заведующий кафедрой, говорить сквозь зубы, зайти к сестре.

**14.** Метадысты лічаць, што пры вывучэнні тэмы "Словазлучэнне і сказ" (8 клас) "увагу дзяцей трэба скіраваць на адрозніванне слова,

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

словазлучэння і сказа" (Г. А. Фамічова). Як адпавядае гэтая метадычная ўстаноўка тэарэтычнаму і практычнаму матэрыялу падручніка па беларускай мове на адпаведную тэму?

**15.** Параўнайце і ацаніце навучальную і метадычную вартасць наступных практыкаванняў па тэме "Словазлучэнне і сказ":

1. Параўнайце словазлучэнні і сказы. Якія гэта сказы па мэце выказвання і інтанацыі? Ці маюць такія прыметы словазлучэнні? У якіх сінтаксічных адзінках — словазлучэннях ці сказах — выражаны лад і час дзеяння?

*Шырокае мора, бясконца шумець.*
*Шырокае мора бясконца шуміць.*
*Шырокае мора бясконца шумела!*

2. Знайдзіце словазлучэнні, выпішыце іх; з трыма словазлучэннямі складзіце сказы.

*Я люблю наш сад; стары клён; густая зеляніна; Міхась глядзеў; лісце; глядзець на алею; старых ліп; кусты акацыі; я назбіраў кветак; пакрытыя травою.*

3. Складзіце і запішыце словазлучэнні, у якіх галоўнымі словамі будуць: а) назоўнікі *дом, палец*; б) дзеясловы *фарбаваць, мыць*; в) прыметнікі *патрэбны, чырвоны*; г) прыслоўі *блізка, нізка*.

4. Складзіце словазлучэнні, далучыўшы да дзеясловаў назоўнікі. Абазначце склон назоўнікаў:

*Дзякаваць (каму?), падзяка (каму?), удзячны (каму?).*
*Рыхтаваць (што?), падрыхтоўка (да чаго?).*
*Паважаць (каго?), павага (да каго?).*
*Радавацца (чаму?), радасны (з якой прычыны?), радасць (каго?), радасць (за каго?).*
*Ганарыцца (кім?), гонар (за каго?).*

5. Выпішыце словазлучэнні, абазначаючы галоўнае слова.

1. *З дрэў сыплецца залатое лісце* (І. Шамякін). 2. *Па дарогах бягуць калгасныя грузавікі* (У. Краўчанка). 3. *Двары ўначы пабяліў снег* (А. Куляшоў). 4. *За акном разгараецца дзень прамяністы* (П. Панчанка).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

6. Выпішыце спачатку дзеясловы, якія патрабуюць вінавальнага склону назоўніка, затым — роднага склону. Складзіце словазлучэнні.

*Паважаць, хацець, дасягаць, разумець, ненавідзець, жадаць, хваляваць, перайсці, прасіць*.

**16.** Частка вучняў пры разборы сказа "Фабрыка ў Мазыры выракляе цацкі з дрэва" вылучыла сярод іншых наступныя словазлучэнні: *цацкі* (з чаго?) *з дрэва*, *вырабляе* (дзе?) *ў Мазыры*.

У чым вы бачыце прычыну "несінтаксічнага" падыходу да вывучэння дадзеных членаў сказа ў школе, які заключаецца ў "выкарыстанні марфалагічных (не толькі па форме, але і па сутнасці) пытанняў як асноўнага прыёму фарміравання паняцця пра дадзеныя члены сказа і прыёму распазнавання іх"? (А. Ю. Купалава).

Як неабходна арганізаваць вывучэнне дадзеных членаў сказа, калі мець на ўвазе задачы асэнсавання вучнямі сінтаксічнага ладу і свядомага авалодання яго багаццямі, калі клапаціцца "пра развіццё з дапамогай заняткаў граматыкай пэўных здольнасцей чалавека, пра тое, што можна было б назваць "граматычным мысленнем", якое складае неад'емную частку разумовай культуры"? (А. М. Пяшкоўскі).

**17.** Ацаніце адказ вучня, які атрымаў наступнае заданне – вызначыць, якія з запісаных спалучэнняў слоў з'яўляюцца словазлучэннямі: *у сказе*; *сказ з дыктанта*; *сачыненне праверана*; *праверыць сачыненне*; *сачыненне і дыктант*.

**Адказ вучня:**

Першае спалучэнне не з'яўляецца словазлучэннем, бо ў ім — адно самастойнае слова;

Другое спалучэнне складаецца з двух самастойных слоў, звязаных падпарадкавальнай сувяззю. Гэта словазлучэнне можна праверыць наступным чынам: *сказ з дыктанта, сказы з дыктанта, сказу з дыктанта* — падпарадкавальная сувязь захоўваецца.

Спалучэнне *сачыненне праверана* не з'яўляецца словазлучэннем: тут няма галоўнага і залежнага слова. Калі змяніць слова *сачыненне*, сувязь паміж словамі не захоўваецца: *сачыненні – ..., сачыненню – ...*

*Праверыць сачыненне* — словазлучэнне. У ім два самастойныя словы: *праверыць* — галоўнае, *сачыненне* — залежнае. Паміж імі — падпарадкавальная сувязь: *правяраю сачыненне, правяраеш сачыненне, праверыў сачыненне* — сувязь залежнага слова з галоўным захоўваецца.

Спалучэнне *сачыненне і дыктант* не з'яўляецца словазлучэннем, бо нельга ад аднаго слова задаць пытанне да другога, няма галоўнага і залежнага слова, няма падпарадкавальнай сувязі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**18.** Неабходнасць разглядаць кожную сінтаксічную з'яву ў адзінстве граматычнага значэння і формы ў наш час не патрабуе доказаў, тым не менш у школьнай практыцы адсутнічае пытанне пра сінтаксічныя значэнні словазлучэнняў. Чым, на вашу думку, гэта можна растлумачыць?

З пазіцыі адзінства граматычнага значэння і формы сінтаксічных з'яў ацаніце метадычную вартасць наступных заданняў:

1. Назавіце сінтаксічнае значэнне наступных словазлучэнняў. Запішыце словазлучэнні ў адпаведнасці з адценнем асноўнага значэння:

а) адносіны прадмета да матэрыялу, з якога ён зроблены;
б) адносіны прадмета да месца знаходжання;
в) прадмет і яго прызначэнне;
г) адносіны да часу.

*Віцебскія вулачкі, будынак для бібліятэкі, вясенняя сяўба, скульптура з бронзы, дарога ў школу, ключ ад машыны, сукенка з паркалю, ранішняя зарадка, крыштальная ваза, аўтограф на памяць, студзеньскі дзень, мінскае метро.*

2. Ахарактарызуйце любы прадмет:

а) паводле адносін да матэрыялу, з якога ён зроблены;
б) паводле прасторавых адносін;
в) паводле памеру;
г) паводле прызначэння прадмета і г. д.

**19.** Вучань са сказа "Моцны і парывісты вецер злосна шкуматаў дрэвы" выпісаў наступныя словазлучэнні: *моцны вецер, вецер шкуматаў, парывісты вецер, злосна шкуматаў, моцны і парывісты, шкуматаў дрэвы*.

Выберыце аптымальны шлях для тлумачэння дапушчаных памылак.

**20.** Прааналізуйце практыкаванні са школьнага падручніка па беларускай мове да тэмы "Словазлучэнне" (8 клас) з наступнай пазіцыі: "Адна з галоўных задач вывучэння словазлучэння ў школе — узбагачэнне сінтаксічнага ладу мовы вучняў разнастайнымі мадэлямі словазлучэнняў" (А. Ю. Купалава).

**21.** Сярод асноўных прымет канца сказа адны вучоныя вылучаюць паўзу ў канцы сказа, другія – інтанацыю канца сказа.

Якое меркаванне вы прапануеце вучням? Чаму? Выкарыстайце пры гэтым наступны матэрыял:

У кнізе В. Кісялёва "Дзяўчынка і птушкалёт" ёсць такая сцэна:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

размаўляюць дзве бабулі, кожную з якіх хлопчыкі папярэдзілі, што яе субяседніца нібы кепска чуе.

"У кватэры моцна, ненатуральна крычалі жанчыны. Ніводнага слова нельга было разабраць, і крык быў нейкі дзіўны, нейкі пусты, марны.

...На гэты раз крычала Віцева бабуля. Усе словы яны крычала павольна і кожнае слова асобна:

— А. Скажыце. Мне. Калі. Ласка. Ці. Снедае. Ваш. Хлопчык. Перад. Тым. Як. Ідзе. У. Школу.

А Жэнькава бабуля крычала ў адказ:

— Я. Нічога. Не. Разумею..."

**22.** Распрацуйце план-канспект урока на тэму "Віды простых сказаў па мэце выказвання". Улічыце, што паняцце пра сказ, пра апавядальныя, пытальныя і клічныя сказы давалася ў пачатковых класах. Пастарайцеся спланаваць працу на ўроку так, каб паўтарэнне "паказвала вучням новыя бакі ў вывучаным матэрыяле, праводзілася пры іншай групоўцы матэрыялу, чым гэта было пры першым азнаямленні з ім" (А. В. Цекучоў).

**23.** У падручніку па беларускай мове для 8 класа (аўтар Т. І. Тамашэвіч. – Мн., 1999) тэмы “Двухсастаўныя неразвітыя сказы” і “Двухсастаўныя развітыя сказы” раскрываюцца ў розных параграфах. А як бы вы арганізавалі іх вывучэнне: на адным уроку шляхам параўнання, супастаўлення ці на двух уроках? Абгрунтуйце свой адказ правядзеннем адпаведнага этапа ўрока ці ўрокаў.

**24**. У падручніку па беларускай мове для 8 класа (аўтар Т. І. Тамашэвіч. – Мн., 1999) па тэме “Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам” для фарміравання ўменняў і навыкаў прапанаваны практыкаванні з наступнымі заданнямі:

Практ. 126. Спішыце сказы. Пастаўце знакі прыпынку, падкрэсліце іменныя выказнікі. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку. Прачытайце сказы з патрэбнай інтанацыяй.

Практ. 127. Растлумачце пастаноўку працяжніка. Чым выражаны галоўныя члены сказа?

(Сказы падаюцца з усімі знакамі прыпынку.)

Практ. 128. Складзіце сказы па схемах. Прааналізуйце ўмовы пастаноўкі ці адсутнасці працяжніка.

(Прыклад схемы: Назоўнік – назоўнік.)

Практ. 129. Прачытайце сказы з правільнай інтанацыяй. Назавіце галоўныя члены. Чым яны выражаны?

(Сказы падаюцца з усімі знакамі прыпынку.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Аценіце метадычную вартаць практыкаванняў з такімі заданнямі. Ці ў правільнай паслядоўнасці яны прапанаваны вучням? Абгрунтуйце свой адказ.

**25**. Аценіце ў метадычным плане тлумачэнне новага матэрыялу да тэмы "Сказы з аднароднымі членамі" (5 клас).

...Спачатку паслухайце невялічкую дзіўную гісторыю, якую расказаў мне адзін хлопчык. Назавём яго Антосем...

Жылі-былі і зараз жывуць на свеце словы. Жывуць яны дружна, увесь час працуюць разам з людзьмі. Працуюць яны ў сказе, дапамагаюць нам выказваць свае думкі, гаварыць адзін з адным, расказваць.

Ішоў аднойчы наш Антось у школу, і здарылася так, што раптам ён убачыў групку слоў, якія разам рухаліся па гэтай жа дарозе. Яму стала вельмі цікава, што ж гэта за словы, і ён звярнуўся да першага з іх:

— Прабачце, калі ласка. Ці нельга даведацца, як Вас завуць і кім Вы працуеце?

— Я – дзеяслоў *мые* і працую сення выказнікам пры дзейніку *дожджык*.

— А Вы, паважанае слова? – звярнуўся ён да другога слова.

— А я — дзеяслоў *палівае* і працую таксама выказнікам пры дзейніку *дожджык*.

— Як? Значыць, і вы адносіцеся да дзейніка *дожджык*?

— Так, і я. Ты не здзіўляйся, Антось. Уся наша брыгада з трох дзеясловаў працуе выказнікамі і адносіцца да дзейніка *дожджык*. Мы выконваем у сказе аднолькавую сінтаксічную функцыю, адносімся да аднаго і таго ж слова і адказваем на адно і тое пытанне. Мы — аднародныя выказнікі.

— Але вас так многа! — разгубіўся Антось, — Вы не будзеце перашкаджаць адзін аднаму?

— Што ты! – здзівіўся трэці дзеяслоў. — Гэта ж вельмі зручна. Вось паслухай:

Дожджык мые, палівае,
Дожджык песеньку спявае:
"Хто не любіць летні дождж,
Той не ходзіць басанож".

– Так, цікавая ў вас работа, аднародныя выказнікі. А іншыя члены таксама могуць быць аднароднымі? – спытаў хлопчык.

– Выбачай, Антось, мы спяшаемся ў школу. Адказ на сваё пытанне ты знойдзеш у падручніку беларускай мовы ў параграфе "Сказы з аднароднымі членамі".

**26.** На вывучэнне аднасастаўных сказаў з галоўным членам

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выказнікам настаўнік адвёў тры гадзіны. Якія, на ваш погляд, тыпы ўрокаў можна правесці? Абгрунтуйце сваё меркаванне. Сфармулюйце і запішыце мэты гэтых урокаў.

**27.** Распрацуйце план-канспект урока па тэме “Зваротак”. На этапах тлумачэння і замацавання абавязкова звярніце ўвагу вучняў на тое, дзе, у якіх стылях маўлення і з якой мэтай выкарыстоўваюцца звароткі. Дарэчы будуць пры вывучэнні гэтай тэмы і практыкаванні, якія знаёмяць школьнікаў з беларускім маўленчым этыкетам.

**28.** Прачытайце метадычныя парады да раздзела "Сказы са звароткамі, пабочнымі словамі (словазлучэннямі, сказамі) у кнізе В. У. Протчанкі "Шматаспектны аналіз пры вывучэнні сінтаксісу беларускай мовы" (с. 82—86). У якой ступені ў гэтых метадычных парадах рэалізуецца думка аўтара пра тое, што "ў школьным курсе мовы сінтаксічныя адзінкі вывучаюцца ў розных аспектах, з якіх найбольш выразна прадстаўлены лагічны, камунікатыўны, структурны і семантычны"?

**29.** Абгрунтуйце навучальную і выхаваўчую розніцу паміж наступнымі практыкаваннямі да тэмы "Зваротак".

1. Прачытайце выразна. Знайдзіце звароткі і пакажыце, што яны не з'яўляюцца членамі сказа. Вызначце, чым выражаны звароткі, якія яны – неразвітыя ці развітыя.

*1. З ціхай яблыні, з двара, з парога пачынаецца твая дарога і твая Радзіма, юны друг (А. Бялевіч). 2. Я помню летнія часіны і вас, грыбныя баравіны! (Я. Колас). 3. Перад вамі, дзеці, скрозь яснеюць далі (К. Крапіва). 4. Уцякай, мароз-дзядуля! Чуеш ты, стары, ці не? (Я. Колас). 5. Я па табе смуткую, мора (С. Дзяргай).*

2. Прачытайце сказы, раскажыце пра ролю зваротkaў у іх. Паразважайце, што аб'ядноўвае і адрознівае выказванні паэтаў пра Радзіму. Выпішыце 2 выказванні, якія найбольш вам спадабаліся. Растлумачце знакі прыпынку пры звароткy.

*1. Цябе, Радзіма, буду апяваць, пакуль аж не ўздыхну я ў раз астатні (С. Дзяргай). 2. Мілы кут мой, ці восень імжыць, ці плыве над табой дзень ласкавы, ты ў мяне пастаянна ў душы, ты – як дзве дарагія мне явы (А. Русецкі). 3. Радзіма, казачны мой кут, лясы старыя, пералескі, знаходзіў я калісьці тут паміж праталінаў пралескі (С. Шушкевіч).*

**30.** Якая розніца паміж наступнымі практыкаваннямі да тэмы

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

"Пабочныя словы"? Абгрунтуйце сваю думку.

1. Спішыце сказы з пабочнымі словамі, ставячы, дзе трэба, коскі.

*1. На дварэ ранак відаць багаты сонцам і росамі (П. Пестрак). 2. Чуюцца галасы дзяцей. Напэўна прыйшлі паглядзець на шпакоў (П. Пестрак). 3. Неба здавалася варушылася (У. Мезенцаў).*

2. Прачытайце дыялог сяброў аб прачытанай кнізе. Паразважайце, хто з субяседнікаў умее падтрымаць гаворку, паважае думку таварыша. Якую ролю пры гэтым адыгрываюць пабочныя словы? Выпішыце сказы з пабочнымі словамі, правільна расстаўляючы знакі прыпынку пры іх.

*— Ты ведаеш, Міша, мне вельмі спадабалася гэтая кніга. Па-мойму яе карысна прачытаць усім.*
*— А я ледзь дачытаў да канца. Вельмі сумная кніжка.*
*— Чаму? На маю думку сюжэт вельмі займальны. Толькі не ў гэтым справа. Па-першае гэтая кніга...*
*— Глупства! Сумна таму, што там няма нічога новага...*

3. Складзіце сказы з словамі *відаць, праўда, здаецца* так, каб у адных яны былі пабочнымі словамі, а ў другіх – членамі сказа.

4. Вучань у сказе "Аднойчы ён расказаў нам гэтую дзіўную гісторыю" паставіў пасля слова *аднойчы* коску, вырашыўшы, што гэта пабочнае слова. Дакажыце, што гэты вучань памыліўся. У сваім разважанні ўжывайце пабочныя словы.

5. Напішыце памятку "Як правільна рыхтаваць дамашняе заданне па беларускай мове". Пастарайцеся скарыстаць у гэтай памятцы пабочныя словы.

6. Дайце адказ на пытанне "Што агульнага і рознага паміж зваротkамі і пабочнымі словамі?". Пры адказе пастарайцеся выкарыстаць наступныя пабочныя словы: *па-першае, па-другое, напрыклад, наадварот, значыць, такім чынам* і інш.

**31.** Уявіце, што вам даручылі распрацаваць для школьнага падручніка тэму “Адасобленыя прыдаткі”. Які спосаб падачы інфармацыі (індуктыўны, дэдуктыўны, індуктыўна-дэдуктыўны) вы выкарыстаеце і чаму?

Параўнайце свой варыянт з тым, які прадстаўлены ў сучасным падручніку. Якому з іх вы аддалі б перавагу і чаму?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**32.** Настаўнік, рыхтуючыся да ўрока на тэму "Віды складаных сказаў", склаў наступную табліцу:

**Віды складаных сказаў**

| **Прыклады сказаў** | **Сродкі сувязі** | | | | **Від складанага сказа** |
|---|---|---|---|---|---|
| | **Інтана-цыя** | **Злучнікі** | | **Злучаль-ныя словы** | |
| | | **злучаль-ныя** | **падпарад-кавальныя** | | |
| *Навука засцерагае маладое пакаленне ад невуцтва, а мастацтва ратуе ад грубасці і пошласці.* | + | + галоўная прымета | – | – | Складана-злучаны |
| *Словы мудрыя часта называюць простымі таму, што такія словы ў многіх простых людзей абуджаюць уласную думку.* | + | – | + галоўная прымета | – | Складана-залежны |
| *У кожнага ёсць у жыцці вышыня, якую ён паінен узяць калі-небудзь.* | + | – | – | + галоўная прымета | Складана-залежны |
| *Добрае слова ў агні не загубіш, яно не мае цаны.* | + галоўная прымета | – | – | – | Бяззлучні-кавы |

Ацаніце навучальныя магчымасці гэтай табліцы.

Прадумайце методыку працы з табліцай на этапе тлумачэння новага матэрыялу, на этапе замацавання (табліца як сродак самакантролю), на этапе падвядзення вынікаў (табліца як сродак паўтарэння, абагульнення матэрыялу).

Як можна арганізаваць у форме гульні працу з гэтай табліцай на этапе замацавання?

**33.** У чым метадычная вартасць падобных і на першы погляд абсалютна нескладаных заданняў тыпу: "Дакажыце, што ў сказе *Там, дзе ў вішнях сяло расцвіло, завіваюцца кветкамі сцежкі* (П. Трус) дадаць частка акалічнасная месца".

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

Чым у метадычным плане адрозніваюцца падобныя заданні ад наступных: "Знайдзіце складаназалежныя сказы, вызначце дададзеныя часткі і месца іх адносна галоўнай часткі. На якое пытанне адказваюць гэтыя дададныя?"

**34.** Пры аналізе сказа "Капітана карабля ўстрывожыла паведамленне, што набліжаецца шторм" вучань вызначыў, што дададная частка паясняе назоўнік *паведамленне*, адказвае на пытанне “якое?”, і прыйшоў да вываду, что дададная частка – азначальная.

Якую памылку дапусціў вучань пры сінтаксічным разборы сказа? Прадумайце, якім чынам вы дапаможаце яму асэнсаваць памылку.

**35.** Вызначце прынцыповую метадычную розніцу паміж наступнымі – на першы погляд аднатыпнымі – заданнямі:

1. З простых сказаў утварыце складаназлучаныя са злучнікамі *і, а, але*.

*1. Вячэрняя зара дагарала на захадзе. Водбліскі яе адлюстроўваліся на воднай роўнядзі. 2. За дзень мы вельмі натаміліся. Гэта была нейкая лёгкая прыемная стома. 3. Сонца яшчэ не зайшло. На блакітным небе ўжо з'явіўся бледны месяц.*

2. З наступных сказаў утварыце складаназлучаныя, якія перадавалі б указаныя ў дужках сэнсавыя значэнні.

*1. Ад моцнага дажджу дарогі былі разбітыя. Перавозка зерня на элеватар не спынялася. (Супрацьпастаўленне.) 2. Скончылі сваю працу трактары і камбайны. Пацішэла на калгасных палях. (Прычына і вынік.) 3. Дзьме нязлосны паўночны вецер. Мякка падае снег, ухутваючы пасевы. (Адначасовасць дзеянняў.) 4. Шчодра пройдзе дождж. Зноў выгляне з-за хмары, як з акна, радаснае сонейка. (Чаргаванне дзеянняў.)*

**36.** Часам вучням перад той ці іншай творчай працай даюць такія парады: "Старайцеся пісаць кароткімі, простымі сказамі. Каб менш дапускаць памылак, пазбягайце вялікіх, складаных сказаў..."

Ацаніце падобныя парады.

**37.** Апошнім часам многія настаўнікі, метадысты “аддаюць перавагу функцыянальна-сінтаксічнаму падыходу” пры навучанні мове. Растлумачце, у чым сутнасць такога падыходу пры вывучэнні моўных з'яў. (Гл.: Прот-чанка В. У. Шматаспектны аналіз... С. 3—12.)

**38.** Якой павінна быць табліца на ўроку сінтаксісу? Прааналізуйце

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

табліцы да тэм "Азнаямленне з разнавіднасцямі складаназлучаных сказаў", "Прыметы складаназалежных сказаў з даданымі акалічнаснымі часткамі", "Вывучэнне сінтаксічных канструкцый з простай і ўскоснай мовай", прапанаваныя В. У. Протчанка ў кнізе “Вывучэнне сінтаксісу ў школе. Складаны сказ” (Мн., 1989. – С. 31, 73, 114). Прапануйце свае варыянты табліц да гэтых тэм.

**39.** Г. К. Лідман-Арлова адзначала, што "ў сінтаксісе нашай мовы рэалізуюцца лексічны састаў мовы, марфалагічныя формы слоў, арфаграфічныя, пунктуацыйныя нормы. Таму ўсё, што вывучаецца ў школе ў курсе мовы, у выніку служыць сінтаксісу, у гэтым сэнсе ўсе раздзелы курса можна назваць раздзеламі, якія абслугоўваюць найвышэйшы ўзровень моўнай сістэмы — сінтаксіс. Усё гэта выклікае неабходнасць у курсе мовы, ва ўсіх яго раздзелах, пастаяннай, бесперапыннай працы па сінтаксісе".

Пакажыце бесперапыннасць працы па сінтаксісе на прыкладзе 1) вывучэння той ці іншай часціны мовы; 2) працы па развіцці звязнага маўлення.

## Спіс літаратуры для самастойнай працы па тэме


1. *Дудников А. В.* Методика синтаксиса и пунктуации в восьмилетней школе. – М., 1963.
2. *Купалова А. Ю.* Методика синтаксиса // Основы методики русского языка в 4 – 8 классах. – М., 1983.
3. *Купалова А. Ю.* Словосочетание и предложение в школьном курсе синтаксиса. – М., 1974.
4. *Протчанка В. У.* Вывучэнне сінтаксісу ў школе. Словазлучэнне. Просты сказ. – Мн., 1984.
5. *Протчанка В. У.* Вывучэнне сінтаксісу ў школе: Просты сказ. – Мн., 1986.
6. *Протчанка В. У.* Вывучэнне сінтаксісу ў школе: Складаны сказ. – Мн., 1989.
7. *Протчанка В. У.* Шматаспектны аналіз пры вывучэнні сінтаксісу беларускай мовы. – Мн., 1987.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ ПУНКТУАЦЫІ

**1.** Раскажыце пра значэнне вывучэння пунктуацыі ў школе. Пры неабходнасці выкарыстайце наступныя выказванні:

*“Пунктуацыя, як і арфаграфія, мае надзвычай важнае значэнне для афармлення пісьмовага маўлення. Прытрымліванне прынятых у дадзенай мове пунктуацыйных правіл аблягчае разуменне напісанага, адсутнасць жа ці няправільная расстаноўка знакаў прыпынку ўскладняе разуменне, а часам і скажае сэнс”* (А. А. Барынава).

*“Знакі прыпынку з’яўляюцца нотамі пры чытанні”* (А. П. Чэхаў).

*“Валоданне пунктуацыйнай пісьменнасцю мае вялікае агульнакультурнае значэнне, з’яўляецца паказальнікам узроўню маўленчага развіцця чалавека”* (М. Т. Баранаў).

**2.** Карыстаючыся адпаведнымі праграмамі, пазнаёмцеся са зместам і структурай школьнага курса пунктуацыі. Вызначце, якія пунктуацыйныя веды атрымліваюць вучні ў пачатковых класах, што яны павінны ведаць і умець пасля пэўнага этапа вывучэння пунктуацыі ў сярэдняй школе.

**3.** Вядома, што ў курсе сучаснай беларускай мовы, які выкладаецца ў вышэйшых навучальных установах, раздзелы "Сінтаксіс" і "Пунктуацыя" разглядаюцца як асобныя, самастойныя. Як вы думаеце, чаму ў школьнай практыцы гэтыя раздзела аб’яднаны ў адзін – "Сінтаксіс і пунктуацыя"?

**4.** Назавіце канчатковую мэту навучання пунктуацыі ў школе. Якія прыватныя мэты павінен вырашыць настаўнік для яе дасягнення?

**5.** Вядома, што сучасная ўсходнеславянская пунктуацыя грунтуецца на трох прынцыпах: сэнсавым, граматычным (сінтаксічным) і інтанацыйным. Аднак, як заўважае Н. С. Валгіна, “самым вялікім дасягненнем сучаснай пунктуацыі... з’яўляецца тое, што ўсе тры прынцыпы дзейнічаюць у ёй не раз’яднана, а ў адзінстве... Выдзяляць асобныя прынцыпы можна толькі ўмоўна, для зручнасці вывучэння”. Ці згодныя вы з гэтай думкай? Абгрунтуйце свой адказ.

**6.** Назавіце і ахарактарызуце метадычныя прынцыпы навучання пунктуацыі ў школе. Пакажыце, як яны ўлічваюцца пры вывучэнні канкрэтных пунктуацыйных тэм.

**7.** В. У. Протчанка піша, што “пад пунктуацыйнай пісьменнасцю варта разумець не толькі ўменне правільна, да месца ўжываць знакі прыпынку на пісьме, але і ўменне выразна “чытаць” іх. А гэта азначае, што



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

без назіранняў над інтанацыяй, паўзамі і лагічнымі націскамі нельга метадычна правільна наладзіць навучанне школьнікаў пунктуацыі". Ці згодныя вы з гэтай думкай? Прааналізуйце 2–3 пунктуацыйныя тэмы і вызначце, ці рэалізавана яна ў сучасных школьных падручніках.

**8.** Прачытайце наступныя выказванні пра ролю інтанацыі пры вывучэнні пунктуацыі, акрэсліце сваю пазіцыю ў гэтым плане:

"*Правілы расстаноўкі знакаў прыпынку значна больш звязаны з нармальным вымаўленнем фраз, чым з навыкамі вока і рукі... Хто навучыўся гаварыць з паўзамі, выразна, у таго знак прыпынку сам просіцца стаць на свае месца пры перадачы жывога слова на паперы. Асабліва гэта справядліва ў адносінах да простых і найважнейшых знакаў прыпынку: кропкі, пытальніка, клічніка, коскі. А хто настолькі дасягнуў поспеху ў выразным чытанні, што добра выдзяляе голасам і сказы, таму яшчэ лягчэй выдзяляць іх знакамі прыпынку на пісьме*" (В.У.Чарнышоў).

*"Пастаноўка заняткаў па пунктуацыі будзе толькі тады правільнай, калі выкладчыкі не толькі будуць фармуляваць правілы расстаноўкі знакаў на інтанацыйнай аснове, але, наадварот, будуць сістэматычна даводзіць да вучняў думку, што знакі прыпынку ніколі не ставяцца "на слых", г. зн. на аснове інтанацыі і паўз, а толькі на аснове правіл...*" (С. І. Абакумаў).

*"Ад назіранняў над інтанацыяй пры навучанні знакам прыпынку адмаўляцца нельга: мала таго, гэтыя назіранні павінны насіць сістэматычны характар... Калі ў працэсе працы над знакамі прыпынку назіранняў над інтанацыяй не праводзіць, вучні не будуць ведаць, як ім адносіцца да інтанацый... настаўніка ў час дыктанта. Аднаго недаверу да інтанацыі мала: неабходны дакладныя веды, у якіх выпадках пунктуацыя адпавядае інтанацыі і ў якіх не адпавядае*" (В. А. Дабрамыслаў).

**9.** З якой мэтай пры вывучэнні пунктуацыі можна выкарыстаць наступныя сказы з пунктуацыйнымі памылкамі?

1. Спявае лета, над барамі сасонкі струнамі звіняць, гамоніць поле, каласамі шапоча ў кветках сенажаць. 2. Гаснуць у хатах агні, залатыя цені начныя ў палях паляглі. 3. Дол, засланы шышкамі, цвіце, сунічнік, брусніча перагукваюцца, птушкі звіняць, камары — усё тут знаёмае. 4. Плывуць самалёты, у небе ўдаль імчацца цягнікі. 5. Звыклыя гукі напоўнілі лясныя гушчары ў галлі: заварушылася сонная птаха, піскнуў заяц бязгучна, мільгануў кажан. 6. Неба сеяла цяпло, цёплы дожджык церушыў у думках, радасна было, беглі песні ад душы. 7. Жыта вакол густа засцілаў дым пасвяжэлы, вецер гнаў яго клубамі ў поле. 8. Зачэпіш галіну на галаву — снег як са страхі.

**10.** Раскрыйце сутнасць паняццяў "пунктаграма", "пунктуацыйнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

правіла”, “знак прыпынку”. Раскажыце пра методыку азнаямлення школьнікаў з пунктаграмай, пунктуацыйным правілам. Праілюструйце свой адказ какрэтным прыкладам вывучэння пэўнай пунктуацыйнай тэмы.

**11.** Пры вывучэнні сінтаксісу і пунктуацыі нярэдка ўзнікае патрэба ў параўнанні і супастаўленні моўных адзінак. На думку Г. І. Блінава, “выкарыстанне супастаўлення з’яўляецца адным з галоўных прыёмаў навучання пунктуацыі”.

Прааналізуйце раздзел “Сінтаксіс і пунктуацыя”. Наколькі часта і эфектыўна аўтары падручніка карыстаюцца згаданымі прыёмамі?

**12.** Як вядома, "прызначэнне любой граматычнай структуры — перадаць пэўную думку" (Н. С. Валгіна). Ці не зніжаецца, на вашу думку, роля сэнсавага аналізу пры расстаноўцы знакаў прыпынку, калі мы прызнаём, што ў аснове пунктуацыі ляжыць сінтаксічны прынцып?

**13.** Як вядома, разуменне правіла звычайна кантралюецца самастойным падборам прыкладаў. Але ці заўсёды за словам “напрыклад” — асэнсаванне правіла, яго ўмоў?

Прааналізуйце ўмовы заданняў да тэмы "Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам". Чым яны адрозніваюцца? Які ўзровень асэнсавання правіла спатрэбіцца для выканання кожнага з заданняў?

1. Перачытайце правіла да тэмы "Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам". На кожны пункт правіла прывядзіце свой прыклад.
2. Прыдумайце некалькі сказаў з састаўнымі іменнымі выказнікамі. Узор: *Якуб Колас – мой любімы пісьменнік*.
3. Прывядзіце сказ, у якім пры наяўнасці іменнага выказніка і нулявой звязкі працяжнік не ставіцца. Складзіце сказ, у якім дзейнік і выказнік выражаны назоўнікам у назоўным склоне, але працяжнік пры гэтым не ставіцца. Перабудуйце гэтыя сказы так, калі пры тых жа ўмовах (наяўнасць іменнага выказніка і нулявой звязкі; дзейнік і выказнік выражаны назоўнікам у назоўным склоне) працяжнік неабходны.

**14.** Пры вывучэнні тэмы "Пабочныя словы" некаторыя метадысты прапануюць прыём пропуску пабочных слоў у сказе: маўляў, ад пропуску пабочных слоў сэнс сказа не змяняецца. Дакажыце мэтазгоднасць, эфектыўнасць (немэтазгоднасць, неэфектыўнасць) гэтага прыёму.

**15.** Дакажыце, што паспяховае вывучэнне пунктуацыі ў складаназлучаным сказе залежыць (не залежыць) ад ступені засваення вучнямі правіл пастаноўкі знакаў прыпынку паміж аднароднымі членамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**16.** Пералічыце тэмы, якія вы паўторыце з вучнямі перад вывучэннем тэмы "Знакі прыпынку ў складаназлучаным сказе".

**17.** У якіх выпадках, на вашу думку, паўтарэнне матэрыялу па пунктуацыі мэтазгодна весці па сінтаксічных тэмах, у якіх перавагу варта аддаваць паўтарэнню з абагульненнем і сістэматызацыяй матэрыялу па пунктуацыі.

**18.** Большасць умоў практыкаванняў, уключаных у раздзел "Сінтаксіс і пунктуацыя", сфармуляваны аднастайна: "Спішыце, расстаўце знакі прыпынку". Растлумачце прычыны такой аднастайнасці.

Ацаніце ў метадычным плане наступныя заданні:

1. Прачытайце сказы. Растлумачце, чым яны адрозніваюцца.

*1. Яго, брата, прынялі ў інстытут. Яго брата прынялі ў інстытут. 2. Прыйдуць дзеці, пойдзем у парк. Прыйдуць дзеці – пойдзем у парк.*

2. Назавіце магчымыя варыянты пастаноўкі знакаў прыпынку ў наступных сказах. Як змяняецца сэнс сказа ў залежнасці ад той ці іншай пастаноўкі знакаў прыпынку?

*1. Брыгадзір пахваліў тых, хто добра працаваў (,) і пайшоў дадому толькі ўвечары. 2. Стомленая (,) бабуля хутка заснула. Таня (,) падрыхтавала ўрок (?).*

3. А зараз пагуляем з вамі ў сур'ёзную гульню "Затрымаць парушальніка". У час гэтай гульні здараюцца розныя дзівы. Чаму? Таму што словы з аднаго сказа парушаюць мяжу і нейкі час знаходзяцца на тэрыторыі другога сказа. Затрымайце парушальніка ў наступных сказах:

*1. Я падышоў да хаты з радасным брэхам, насустрач мне выбег Барбос. 2. Рыбы гавораць: рыбаловы добра клююць на кавалачак сала. 3. На арэну цырка выйшаў дрэсіроўшчык, высока задраўшы хобат; за ім ішоў слон.*

**19.** Вядомы метадыст XIX ст. Л. І. Паліванаў быў катэгарычна супраць расстаўлення знакаў прыпынку ў тэксце, надрукаваным без іх. Гэта, як сцвярджаў Л. І. Паліванаў, "прывучае да самага шкоднага... – звычкі расстаўляць знакі пасля напісання дыктанта, перакладу або сачынення. Кожны добры настаўнік лічыць паловай справы пры навучанні інтэрпункцыі (г.зн. пунктуацыі) пастаноўку знака адначасова з напісаннем слоў і сказаў, узаемаадносіны якіх гэтым знакам выражаюцца".

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

У падручніках заданні тыпу "Спішыце тэкст, пастаўце знакі прыпынку і растлумачце іх" даволі частыя. Выкажыце сваё меркаванне адносна такіх заданняў.

**20.** Прааналізуйце наступныя сказы і вызначце, пры тлумачэнні якой пунктуацыйнай тэмы іх можна выкарыстаць. Праілюструйце свой адказ правядзеннем адпаведнага этапа ўрока.

1. Ночы былі ўжо доўгія і халодныя, але днём яшчэ грэла сонца (К. Чорны). 2. Стаяць вакол маўкліва хвоі, бы служкі ў панскім дзесь пакоі; і дрэмлюць чорныя яліны, і моўкне ў лесе спеў птушыны, і толькі дрозд высвістваў штучна, як на кларнеце, мілагучна; ды змоўк і ён, і ўсё знямела (Я. Колас). 3. Узыдзе месяц – і ўсё тут зменіцца, павесялее (А. Кулакоўскі). 4. У хвойных лясах густа рос верас і зелянеў ягаднік (К. Чорны).

**21.** Назавіце і ахарактарызуйце асноўныя віды практыкаванняў, што выкарыстоўваюцца для фарміравання пунктуацыйных уменняў і навыкаў. Паразважайце, чаму на апошнім этапе фарміравання пунктуацыйных уменняў і навыкаў метадысты раяць праводзіць пісьмовыя творчыя працы.

**22.** Як вы ставіцеся да наступных заданняў настаўніка перад запісам вучнямі сказаў: “Паслухайце сказ і скажыце, чым ён ускладнены”, “Скажыце, якія пунктуацыйныя правілы вы будзеце прымяняць у гэтым сказе”?

**23.** Якому парадку разбору складаназалежнага сказа вы аддаяце перавагу? Чаму?

1. Назваць: а) галоўную і даданую часткі, злучнікі або злучальныя словы, якімі яны звязаны; б) пытанне, на якое адказвае даданая частка; від даданай часткі (азначальная, дапаўняльная і г. д.). Зрабіць сінтаксічны разбор галоўнай і даданай частак па схеме разбору простага сказа.

2. У сказе... асновы... .

Гэта складаназалежны сказ.

Галоўны сказ — ....

... (пытанне ад слова, словазлучэння або ад усяго галоўнага сказа).

Гэта дадаены сказ... .

Ён далучаецца да ... злучнікам (злучальным словам)... У галоўным сказе ёсць (няма) указальнае слова... .

Дадаены сказ размешчаны... .

На пісьме ён... .

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**24.** Падрыхтуйце план-канспект урока паўтарэння і сістэматызацыі па тэме “Знакі прыпынку ў складаных сказах”.

## Спіс літаратуры для самастойнай працы па раздзеле

1. *Блинов Г. И.* Методика пунктуации в школе. – М., 1978.

2. Выкладанне беларускай мовы ў школе / Пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мн., 1994.

3. *Григорян Л. Т.* Обучение пунктуации в средней школе. – М., 1982.

4. *Лаўрэль Я. М.* Некаторыя асаблівасці вывучэння пунктуацыі простага сказа ў 7 класе // Развіццё граматычнага ладу мовы вучняў. – Мн., 1977. – С. 38 – 57.

5. *Ломизов А. Ф.* Обучение пунктуации в средней школе. – М., 1975.

6. *Протчанка В. У.* Актуальные праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове. – Мн., 2001.

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

## МЕТОДЫКА НАВУЧАННЯ АРФАГРАФІІ

**1**. У гісторыі методыкі існавалі розныя погляды на праблему навучання арфаграфіі. Адны вучоныя (К. Дз. Ушынскі, А. М. Пяшкоўскі, Дз. І. Ціхаміраў і інш.) сцвярджалі, што свядомае засваенне арфаграфіі немагчыма без ведання граматыкі; іншыя ж (У. П. Шарамецеўскі і інш.) лічылі, што пры засваенні правапісу граматычныя веды не маюць ніякага значэння ці яно вельмі абмежаванае.

З пазіцыі сённяшняй методыкі дайце ацэнку наступным выказванням прыхільнікаў граматычнага і антыграматычнага напрамкаў у навучанні арфаграфіі. Дакажыце, што патрабаванне ўзаемасувязі навучання арфаграфіі з граматыкай з’яўляецца адным з асноўных у сучаснай методыцы.

*"Ніяк нельга сказаць, што без граматыкі, адным навыкам, лягчэй было навучыцца правільна пісаць, чым з дапамогай граматыкі. Патрэбны дзесяткі гадоў і пастаяннае спісванне прыкладаў, каб адным навыкам, без дапамогі граматычных правіл, навучыцца пісаць правільна, ды і то ўсякае новае слова будзе ставіць у тупік такога грамацея... Для засваення правільнага пісьма дзецьмі, безумоўна, патрэбна практыка, але практыка, якую накіроўвае граматыка"* (К. Дз. Ушынскі).

*"Граматычныя веды могуць служыць сродкам да правільнага пісьма толькі пры ўмове іх абсалютнага засваення; а такое засваенне адбываецца з часам, шляхам працяглых практыкаванняў"* (Дз. І. Ціхаміраў).

*"Дзіця толькі тады скарыстае вядомае яму правіла, калі яно зможа правільна адказаць самому сабе на пастаўленыя ім самім пытанні: "Да якой часткі правіла адносіцца канкрэтны выпадак правапісу?", "Да якога разраду слоў належыць гэтае слова?", "Якая гэта форма?", "Якое правіла адносіцца да гэтай формы?" Такім чынам, карыстанне правіламі абумоўлена цвёрдым веданнем граматыкі: толькі дакладнае веданне граматычных форм дае адказ на пытанні арфаграфіі"* (Дз. І. Ціхаміраў).

*"Канчатковы мой вывад: поўная неабходнасць вывучэння граматыкі пры навучанні арфаграфіі"* (А. М. Пяшкоўскі).

*"Арфаграфія ёсць мастацтва графічнае (зрокавае), а таму пісьмо са слыху пад дыктоўку наогул немэтазгоднае... Практыкаваннямі больш мэтазгоднымі для правільнага пісьма ў элементарным узросце варта прызнаць тыя, якія развіваюць менавіта зрокавую памяць і арфаграфічную зоркасць"* (В. П. Шарамецеўскі).

*"Чым меней тэорыі, тым лепш, і чым пазней пачынаецца вывучэнне тэорыі, тым лепш; чым марудней ідзе вывучэнне тэорыі, тым лепш"* (В. П. Шарамецеўскі).

*"Патрабаваць прымянення правіл арфаграфіі для дзяцей, якія не ўмеюць выказваць свае думкі пісьмова, — гэта тое самае, што патрабаваць ведання граматыкі ад суб'екта, што не ўмее гаварыць. Навучыце папугая або аднагадовае дзіця грамаце, і я паверу, што дыктоўка карысная для арфаграфічных і стылістычных мэт"* (І. Саламаноўскі).

**2*.** Пытанні навучання арфаграфіі займаюць значнае месца ў "Методыцы роднай мовы" К. М. Міцкевіча (Якуба Коласа). Пазнаёмцеся з адпаведным раздзелам кнігі і выявіце погляды вядомага пісьменніка і вучонага на праблему фарміравання арфаграфічнай пісьменнасці вучняў.

**3.** Як вы разумееце паняцці "абсалютная пісьменнасць", "адносная пісьменнасць"? Які ўзровень арфаграфічнай пісьменнасці фарміруецца ў школе? Абгрунтуйце свой адказ.

**4**. Карыстаючыся адпаведнымі праграмамі, пазнаёмцеся са зместам і структурай школьнага курса арфаграфіі. Колькі этапаў у ім можна ўмоўна вылучыць? Якія ўменні фарміруюцца ў вучняў на кожным з іх? Як называюцца раздзелы школьнага курса беларускай мовы, пры вывучэнні якіх прадугледжана засваенне вучнямі арфаграфічных тэм?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**5.** Вядома, што сучасная беларуская арфаграфія цесна звязана з усімі раздзеламі мовазнаўства. Дакажыце, што трывалае засваенне фанетыкі, словаўтварэння, лексікалогіі, марфалогіі з'яўляецца абавязковым для авалодання арфаграфічнымі ўменнямі і навыкамі. Падмацуйце свой адказ прыкладамі вывучэння пэўных арфаграфічных тэм.

**6.** А. В. Цекучоў піша, што "арфаграфічныя навыкі фарміруюцца ў выніку апоры не на адзін толькі які-небудзь псіхафізіялагічны фактар – зрок, слых, кінэстэзію, мысліцельную дзейнасць, – а на іх сукупнасць як нешта цэлае, адзінае, унутрана ўзаемаабумоўленае". Растлумачце, як вы разумееце гэтае выказванне. Як яго трэба ўлічваць пры навучанні арфаграфіі?

**7.** Сучасная методыка лічыць неабходнай умовай фарміравання арфаграфічных навыкаў развіццё ў вучняў арфаграфічнай зоркасці, якая мае на ўвазе "бачанне кожнага элемента слова, марфемы, склада, уменне выдзяляць іх, распазнаваць арфаграмы "ў твар", адрозніваць іх адну ад другой" (А. В. Цекучоў).

Прачытайце і асэнсуйце наступныя рэкамендацыі метадыстаў па фарміраванні арфаграфічнай зоркасці:

— вучыць школьнікаў розным відам разбору слоў;

— практыкаваць дыктант "Правяраю сябе";

— вучыць школьнікаў прынцыпы дыктанта "Правяраю сябе" прымяняць і пры напісанні творчых прац;

— выкарыстоўваць у навучальным працэсе слоўнікі, розную даведачную літаратуру;

— практыкаваць узаемаправерку пісьмовых прац, карэктуру тэкстаў са знарок дапушчанымі памылкамі;

— праводзіць спецыяльную трэніроўку па выяўленні і распазнаванні арфаграм у прапанаваных тэкстах, словах.

Падбярыце да канкрэтнага ўрока па арфаграфіі заданні, практыкаванні, скіраваныя на развіццё арфаграфічнай зоркасці.

**8.** Якія вывады метадычнага плана вы зробіце, пазнаёміўшыся з наступнымі высновамі навуковага даследавання В. Н. Шаўчэнкі:

"Навучанне арфаграфіі не дае жаданых вынікаў, у прыватнасці з-за таго, што вучні не бачаць арфаграм. Сярэдні працэнт бачання арфаграм у вучняў, якія прыйшлі ў 4-ы клас, вагаецца ад 30 да 50 %.

Заўважана таксама, што пры слыхавым успрыманні тэксту працэс распазнавання арфаграм у 2—3 разы меншы, чым пры зрокавым успрыманні: на слых вучні 5—8-х класаў выяўляюць у тэксце 17,7 % арфаграм, а пры зрокавым успрыманні — 40,5%.

Даследаванне гэтай праблемы дазволіла ўстанавіць, што ў працэсе

навучання арфаграфіі ўменне вучняў знайсці арфаграму расце само па сабе, але без спецыяльна арганізаванага навучання застаецца на нізкім узроўні — узрастае не больш чым на 13 %".

**9.** Прааналізуйце арфаграфічныя практыкаванні пры вывучэнні адной з часцін мовы ў школьным падручніку. Вызначце месца практыкаванняў, скіраваных на развіццё арфаграфічнай зоркасці вучняў. Якое месца сярод прааналізаваных матэрыялаў займаюць наступныя разнавіднасці практыкаванняў:

а) знайсці ў тэксце вывучаныя арфаграмы (вусна або пісьмова);

б) запісаць тэкст, падкрэсліць вывучаныя арфаграмы;

в) падабраць словы з такой жа арфаграмай, што і ў прапанаваным прыкладзе;

г) згрупаваць арфаграмы (вусна або пісьмова);

д) спісаць тэкст з пропускам тых літар, у правільнасці напісання якіх ёсць сумненні.

**10.** Адным з прынцыпаў навучання арфаграфіі з'яўляецца сувязь фарміравання арфаграфічных навыкаў з работай па развіцці маўлення вучняў. Ахарактарызуйце сутнасць гэтага прынцыпу. Пакажыце, як ён рэалізуецца на практыцы, г. зн. пры вывучэнні канкрэтных арфаграфічных тэм.

**11.** Чаму дзіця, якое прыходзіць у школу і якое на дастатковым узроўні валодае мовай у вуснай форме, трэба працяглы час вучыць арфаграфічным нормам? Граматычны лад пісьмовай і вуснай мовы аднолькавы, слоўнікавы састаў адзін і той жа. Здавалася б, пры гэтых умовах засваенне норм пісьмовай мовы не будзе выклікаць вялікіх цяжкасцей у дзіцяці, але гэта не так... Чаму?

**12.** Прачытайце і параўнайце наступныя азначэнні арфаграмы, прапанаваныя рознымі вучонымі. Якое з гэтых азначэнняў выберацe вы для азнаямлення вучняў з паняццем "арфаграма"?

*Арфаграма – "напісанне, якое адпавядае правілам арфаграфіі і патрабуе прымянення гэтых правіл*" (Дз. Э. Разенталь),

*"Арфаграма – частка слова (літара, спалучэнне літар ці асобная марфема), якая заключае ў сабе пэўную "незразумеласць", незразумелае ў напісанні*" (Б. А. Дзмітрыеў).

*"Арфаграмай з'яўляецца не кожнае напісанне, а толькі тое (у марфеме, паміж марфемамі), якое можа быць перададзена рознымі спосабамі, але для якога існуе адзін спосаб, што адпавядае правілам арфаграфіі"* (М. Т. Баранаў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*За арфаграму трэба прымаць такія суадносіны адзінак вуснай і пісьмовай мовы, калі "гукавой адзінцы можа адпавядадь некалькі варыянтаў напісанняў, правільным з якіх з'яўляецца толькі адзін"* (М. М. Разумоўская).

*"Арфаграма — такое напісанне, якое не падпарадкоўваецца вымаўленню, а патрабуе прымянення арфаграфічных правіл або запамінання"* (Л. А. Зюганава).

*"Арфаграма — правільнае напісанне літары ў слове, слоў (разам, асобна, праз злучок, з вялікай або малой літары і інш.)"* (З. Б. Варановіч).

*Арфаграма – "правільнае (што адпавядае правілам ці традыцыі) напісанне, якое трэба выбраць з рада магчымых"* (В. Ф. Іванова).

**13.** М. Т. Баранаў у кнізе "Методика преподавания русского языка в школе" (М., 2000) піша, што азнаямленне з арфаграмай і арфаграфічным правілам складваецца з наступных элементаў: успрыманне слоў з арфаграмай, што вывучаецца; азнаямленне з умовамі выбару правапіснай нормы і з апазнавальнай прыметай арфаграм гэтага тыпу; запамінанне і ўзнаўленне вучнямі новага арфаграфічнага правіла; навучанне прымяненню на практыцы новага правіла.

Праілюструйце прапанаваную методыку азнаямлення з арфаграмай на прыкладзе вывучэння канкрэтнай арфаграфічнай тэмы.

**14.** Растлумачце, як вы разумееце наступнае патрабаванне навучання арфаграфіі: "Усякае пісьмо павінна быць усвядомленым".

**15.** Да ўступнага ўрока па арфаграфіі настаўнік падабраў наступныя тэксты. З якой мэтай іх можна выкарыстаць на ўроку?

"Усім вядома, як цяжка чытаць непісьменную працу: на кожнай памылцы спатыкаешся, а часам проста не адразу разумееш напісанае. Пісаць з памылкамі — значыць не берагчы час людзей, да якіх звяртаешся. Нельга цярпець непісьменных". (Л. У. Шчэрба.)

"Арфаграфічны слоўнік — ваш сябра і дарадца. Ён падкажа, як пазбегнуць памылак пры пісьме. Асабліва пры напісанні такіх слоў, правапіс якіх трэба запомніць.

З дапамогай слоўніка можна абмінуць не толькі арфаграфічныя памылкі, але і памылкі ў пастаноўцы націску, у вымаўленні, асабліва ў словах, запазычаных з іншых моў. Заўсёды трэба кіравацца правілам: не прапускаць нічога, у чым сумняваешся, даведацца, што правільнае і што няправільнае. Калі нельга даведацца адразу ж, трэба не забыцца зрабіць гэта пазней, калі з'явіцца такая магчымасць" (А. В. Цекучоў).

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

**16.** Прааналізуйце наступны матэрыял. Пры вывучэнні якой тэмы яго можна выкарыстаць? Растлумачце тэму, выкарыстоўваючы ў якасці прыкладаў прапанаваныя словы.

Возера – озеро — Вуліца – улица
Воблака – облако — Вугаль – уголь

Восень, востраў, Вольга.
Вуліца, навука, павуцінне.

Восень – асенні, вокны – акно.
Але: вачэй, вастрыць, васьмёра.

Опера, ордэн, універсітэт.
Унук, учора, ураджай.

**17.** У кнізе "Методыка выкладання беларускай мовы" (Мн., 1995) З. Б. Варановіч прапаноўвае наступную паслядоўнасць выканання практыкаванняў, накіраваных на фарміраванне арфаграфічных уменняў і навыкаў:

I этап – практыкаванні на знаходжанне арфаграм;

II этап – практыкаванні на тлумачэнне, абгрунтаванне напісанняў;

III этап – практыкаванні на ўстаўку прапушчаных літар, дапісванне слоў і інш.;

IV этап – практыкаванні на падбор уласных прыкладаў у адпаведнасці з узорам;

V этап – сінтэтыяныя творчыя практыкаванні.

Прааналізуйце 2 – 3 арфаграфічныя тэмы, змешчаныя ў сучасных падручніках. Ці прытрымліваюцца іх аўтары названай паслядоўнасці практыкаванняў?

Кіруючыся прапанаванай паслядоўнасцю, падбярыце практыкаванні, якія можна выкарыстаць пры вывучэнні канкрэтнай арфаграфічнай тэмы.

**18.** Пералічыце, якія віды практыкаванняў выкарыстоўваюцца для фарміравання арфаграфічных уменняў і навыкаў?

Ахарактарызуйце спісванне як від арфаграфічнага практыкавання: у якіх формах яно існуе, з якой мэтай выкарыстоўваецца і г. д.

Прааналізуйце ў падручніку для сярэдняй школы 2 – 3 арфаграфічныя тэмы і выявіце, які від спісвання прадстаўлены ў іх найбольш часта.

**19.** Ахарактарызуйце дыктант як від арфаграфічнага практыкавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пералічыце падставы, па якіх класіфікуюцца дыктанты. Назавіце віды дыктантаў з улікам іх класіфікацыі.

**20.** З якой мэтай, на якім этапе вывучэння арфаграфічнай тэмы і як праводзіцца папераджальны дыктант?

Праілюструйце методыку яго правядзення, выкарыстоўваючы ў якасці дыдактычнага матэрыялу наступныя словы: *Вязьма, пісьмо, моладзь, Кузьма, чацвер, меншы, стэп, дзверы, сем, агеньчык, пяцьсот, восеньскі, ноч*.

**21.** Прачытайце наступныя сказы і вызначце, пры вывучэнні якой арфаграфічнай тэмы іх можна выкарыстаць як матэрыял для тлумачальнага дыктанта. Пакажыце методыку правядзення дыктанта, выкарыстоўваючы прапанаваныя сказы.

1. Без навук як без рук (Прыказка). 2. Плача восень за акном (Я. Купала). 3. Азёрная сінь пакрыта лёгкім туманам. 4. За вокнамі павольна падаў снег (П. Пестрак). 5. Патрывожаная лугавая мята разліла навокал востры пах (Я. Колас). 6. За акном ціхая зімняя ноч (Г. Васілеўская). 7. Новыя вуліцы, новыя дамы былі непадалёку ад цэнтра саўгаса (Г. Далідовіч).

**22.** Падрыхтуйце дыдактычны матэрыял, які можна выкарыстаць для выбарачнага дыктанта пры вывучэнні правапісу канчаткаў назоўнікаў 2-га скланення ў родным склоне.

На аснове падабраных прыкладаў пакажыце методыку правядзення выбарачнага дыктанта.

**23.** Пры правядзенні творчага дыктанта ў тэкст, які дыктуе настаўнік, вучні ўносяць пэўныя змены. Што гэта за змены, з якой мэтай яны ўносяцца?

Праілюструйце методыку правядзення творчага дыктанта канкрэтным прыкладам.

**24.** Адзначаючы каштоўнасць вольнага дыктанта, Я. М. Пятрова піша, што ён “прывучае дзяцей адносіцца з аднолькавай увагай і да арфаграфіі, і да зместу тэксту”. Ці згодныя вы з гэтай думкай? Абгрунтуйце свой адказ.

**25.** М. С. Раждзественскі пісаў: "Метад супастаўлення ў двух яго варыянтах (вызначэнне падабенства і адрознення) дапамагае раскрыць семантыку правапісу, яго ўнутраны сэнс". Безумоўна, супастаўленне ў навучанні мове з'яўляецца наглядным сродкам дэманстрацыі правіл правапісу, значэнняў слоў і асаблівасцей іх граматычных форм.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Наколькі эфектыўна, на вашу думку, выкарыстоўваецца супастаўленне ў наступнай табліцы? Што вы можаце прапанаваць для большай эфектыўнасці, кампактнасці, запамінальнасці гэтай табліцы?

**Напісанне ўласных і агульных назоўнікаў**

| Уласныя назоўнікі | Агульныя назоўнікі |
|---|---|
| Назвы марак, гатункаў, тыпаў вырабаў:<br>*"Беларус"* (марка трактара)<br>*"Мішка"* (цукеркі)<br>*"Электрон"* (марка тэлевізара)<br>Назвы дзейных асоб у байках, у драматычных, іншых мастацкіх творах:<br>*Байка К.Крапівы "Сава, Асел ды Сонца"*<br>Словы *Сонца, Месяц, Зямля*, калі яны ўжываюцца ў значэнні назваў планет (параўн.: *Марс, Венера, Юпітэр*):<br>*Найбліжэйшая да Зямлі зорка — Сонца.*<br>*Месяц — спадарожнік Зямлі.*<br>*Касмічная траса Зямля — Месяц — Зямля.* | Назвы, выражаныя агульнымі назоўнікамі:<br>*беларус* (жыхар Беларусі)<br>*мішка* (цацка)<br>*электрон* (часціца з адмоўным электрычным зарадам)<br>Назвы, выражаныя агульнымі назоўнікамі:<br>*сава, асел, сонца*<br>Словы *сонца, месяц, зямля*, калі яны не ўжываюцца ў значэнні назваў планет:<br>*Мы назіралі ўсход сонца.*<br>*Маракі ўбачылі на гарызонце зямлю.*<br>*Высока стаяў поўны месяц.* |

**26.** У школьнай практыцы частыя выпадкі, калі вучань, добра ведаючы арфаграфічнае правіла, дапускае памылкі на гэтае правіла, што звязана найперш з наяўменнем практычна выкарыстоўвасць свае веды. Таму мала дабіцца, каб вучань запомніў правіла, трэба навучыць карыстацца правілам практычна, г. зн. навучыць прымяняць агульнае правіла да канкрэтнага слова.

Прасачыце, якой аналітыка-сінтэтычнай дзейнасці патрабуе ад вучня ўменне прымяніць правіла: "У родным, давальным і месным склонах адзіночнага ліку назоўнікі 3-га скланення маюць аднолькавыя канчаткі: *-і* – пасля асноў на мяккі і цвёрды зычны; *-ы* – пасля асноў на зацвярдзелы зычны".

*На прыстан... сабралася шмат людзей.*

1. Якая часціна мовы слова *прыстань*? — Гэта слова абазначае прадмет, адказвае на пытанне “што?”. Значыць, гэта назоўнік.

2. Да якой часткі слова адносіцца літара, якую трэба дапісаць? — Слова змяняецца (*прыстань, прыстані, прыстанню*). Значыць, літару неабходна напісаць у канчатку.

3. Каб даведацца, якую літару трэба пісаць у канчатку назоўніка, неабходна вызначыць, да якога скланення належыць слова *прыстань*. – Слова прыстань жаночага рода, у назоўным склоне заканчваецца на мяккі зычны. Такім чынам, гэта назоўнік 3-га скланення.

4. Каб даведацца, які канчатак трэба пісаць у слове, неабходна вызначыць яго склон і лік. – *Шмат людзей сабралася* "дзе?", "на чым?" *на прыстані*. Гэта форма меснага склону адзіночнага ліку.

5. Такім чынам, слова *прыстань* — назоўнік 3-га скланення, адзіночнага ліку з мяккай асновай. У форме меснага склону такія назоўнікі маюць канчатак *-і.*

Значыць, правільна трэба напісаць: *На прыстані сабралася шмат людзей*.

Прасачыце самастойна, якія аналітыка-сінтэтычныя ўменні спатрэбяцца вучням для прымянення арфаграфічных правіл "Правапіс *-нн-* у прыметніках", "Правапіс *не (ня)* з дзеепрыметнікамі".

Паразважайце, як рэалізуецца працэс прымянення арфаграфічнага правіла шляхам такога аналітыка-сінтэтычнага аналізу, калі патрабуецца хуткі запіс тэксту (напрыклад, у час дыктанта).

**27.** Наколькі эфектыўныя, на вашу думку, у арфаграфічных адносінах у школьных падручніках рубрыкі тыпу "Пішыце правільна" або падача ў рамачках слоў, напісанне якіх трэба запомніць.

У якім выпадку падобныя запісы могуць мець станоўчы "арфаграфічны эфект"?

**28.** Пракаменціруйце ў метадычным плане фрагмент урока на тэму "Правапіс звонкіх і глухіх зычных" (этап замацавання новага матэрыялу).

Настаўнік выклікае вучня да дошкі, дыктуе яму наступны ўрывак з верша:

*Сцежкай вузкаю, звярынай*
*Ходзіць, кружыць дзед-мароз,*
*Беліць інеем рабіны,*
*Косы доўгія бяроз.*

(М. Арочка)

— А цяпер растлумач правапіс зычных у словах *сцежкай, вузкаю, дзед-мароз, бяроз.*

**29.** Наколькі эфектыўным, на вашу думку, будзе наступнае слова настаўніка перад вывучэннем тэмы "Правапіс *-нн-, -н-* у прыметніках"?

*— Мы сёння будзем вывучаць правапіс суфіксаў прыметнікаў, каб даведацца, калі прыметнікі пішуцца з адным -н-, калі з двума. Гэтае правіла вельмі важнае. Будзьце ўважлівыя.*

Прапануйце свой варыянт уступнага слова настаўніка перад вывучэннем гэтага правіла з мэтай зацікавіць вучняў тэмай, выклікаць іх актыўнасць.

**30.** Прааналізуйце, ці ўсё метадычна правільна ў наступным практыкаванні (умова, матэрыял для назірання, заданне), якое выкарыстоўваецца з мэтай тлумачэння правапісу прыставак *раз- (рас-).*

Прачытайце, звярніце ўвагу, перад якімі зычнымі кораня ў прыстаўцы *рас-* пішацца *с:*

| | |
|---|---|
| раздаў | расшнураваў |
| разгрузіў | раскалоў |
| разрэзаў | распілаваў |
| развесіў | расцвіў |
| разбіў | рассыпаў |
| разліў | растлумачыў |

**31.** Адкажыце, чаму настаўніка не могуць задаволіць наступныя фармулёўкі арфаграфічных правіл у адказах вучняў:

1. *Не* з дзеепрыметнікамі пішацца разам, калі няма паясняльных слоў.
2. *Не* з дзеясловамі заўсёды пішацца асобна.
3. Да II спражэння адносяцца ўсе дзеясловы на *-іць (-ыць),* астатнія дзеясловы адносяцца да I спражэння.
4. Займеннікі з прыстаўкай *абы-* пішуцца праз дэфіс.

**32.** Якому з варыянтаў тлумачэння вучнем правапісу суфіксаў *-ак, -ык (-ік)* вы аддаяце перавагу ? Чаму?

*Замоч..к, ключ..к.*

1. У слове *замочак* трэба пісаць суфікс *-ак*, таму што ён выпадае; у слове *ключык* – суфікс *–ык,* таму што ён застаецца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Каб высветліць, якую галосную трэба пісаць у суфіксе першага слова, паставім яго ў родным склоне адзіночнага ліку: *няма чаго? — замочка*. Галосная *а* выпадае. Значыць, трэба пісаць суфікс -*ак: замочак*.

Каб высветліць, якую галосную трэба пісаць у суфіксе другога слова, таксама паставім яго ў родным склоне адзіночнага ліку: *няма чаго? — ключыка.* Галосная *ы* не выпадае. Значыць, трэба пісаць суфікс *–ык: ключык.*

**33.** Прачытайце пра вопыт працы па арфаграфіі настаўніцы В. Д. Захаравай. Выкажыце сваё меркаванне наконт прачытанага.

Прадумайце свае прапановы адносна сістэматызацыі вывучаных арфаграфічных правіл.

У пачатку навучальнага года В. Д. Захарава вывешвае ў класе табліцу для правіл – вялікі, прыгожа аформлены ліст паперы. На працягу года табліца пастаянна запаўняецца назвамі новых вывучаных правіл (з прыкладамі). Кожнае правіла мае свой умоўны значок. Калі правіла вывучана, яно ўваходзіць “у актыў” вучняў: пра яго кожны раз напамінае табліца, яно прымяняецца пры арфаграфічным разборы, пры адшукванні арфаграм у тэксце, пры выкананні практыкаванняў. З дапамогай гэтай табліцы выпраўляюцца памылкі ў дамашніх заданнях, аналізуецца правапіс найбольш цяжкіх для напісання слоў, паўтараюцца ўсе пройдзеныя правілы і спосабы іх прымянення.

У кожным наступным класе вывешваецца табліца правіл, вывучаных у мінулым годзе. Апрача таго, у кожным класе паступова запаўняецца новая табліца. Праца з табліцаю ставіць за мэту выпрацаваць уменне класіфікаваць арфаграмы і дапушчаныя памылкі.

**35.** Прааналізуйце тлумачэнне новага матэрыялу па тэме "Правапіс прыставак". Назавіце станоўчыя і адмоўныя моманты такой формы працы.

1. Паведамленне настаўніка:

Сёння мы прыступаем да вывучэння новай тэмы "Правапіс прыставак". Мы павінны навучыцца правільна пісаць словы з прыстаўкамі, правільна ўжываць іх у сваім маўленні, паўторым некаторыя арфаграмы з раздзелаў "Фанетыка" і "Словаўтварэнне".

2. Франтальнае апытванне:

— Успомніце, з якіх значымых частак складаецца слова.

— Якая частка слова называецца коранем?

— Што трэба зрабіць, каб правільна вызначыць корань у слове?

— Якая частка слова называецца прыстаўкай?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

— А зараз звернемся да "Фанетыкі". Скажыце, якімі бываюць зычныя гукі паводле звонкасці-глухасці?

— Назавіце звонкія і глухія зычныя гукі.

3. Паведамленне настаўніка:

Вось мы і ўспомнілі тое, што спатрэбіцца нам для вывучэння новай тэмы. Перад знаёмствам з новым правілам я хачу расказаць вам гісторыю, вельмі падобную на казку.

У некаторым царстве стаялі два вялікія палацы. А жылі ў гэтых палацах прынцэсы-прыстаўкі. Жылі яны тут вельмі даўно, і ніхто не ведаў, адкуль яны з'явіліся. Прынцэсы былі вельмі прыгожыя і ганарлівыя, але не зусім звычайныя: гэтым прынцэсам кожны дзень прыходзілася працаваць — утвараць словы з новым значэннем.

Так праходзіў дзень за днём, месяц за месяцам. І ўсё было спакойна, але аднойчы прынцэсы даведаліся, што вучні аднаго класа ніяк не могуць засвоіць правіла на правапіс прыставак. Прынцэсы вельмі пакрыўдзіліся і адмовіліся працаваць. Але ў тым незвычайным царстве трэба было працаваць усім. А пакрыўджаныя прыстаўкі нічога не хацелі рабіць, яны толькі глядзеліся ў люстэрка і ўздыхалі. А тым часам словы з прыстаўкамі ўжо зусім не ўтвараліся.

Разгневалася на прынцэс каралева Мова і загадала паклікаць іх да сябе. Спачатку прыехалі прынцэсы з першага палаца. З залачонай карэты пачалі выходзіць прыстаўкі *аб-, ад-, пад-, над* і іншыя. Следам за імі прыехалі прынцэсы з другога палаца: *з-, уз-, раз-, без-* і іншыя.

Каралева сустрэла іх грозна:

— Калі вы не пачняце працаваць, я выганю вас са свайго каралеўства.

Прыстаўкі спалохаліся. Параіўшыся, яны сказалі каралеве:

— Калі ты нас выганіш, мова нашага каралеўства стане намнога бяднейшай. Мы згодзімся працаваць, калі ты прымеш нашы ўмовы.

Пачалі размову прыстаўкі з першага палаца, а былі яны вельмі ганарлівыя і з цвёрдым характарам.

— Наша ўмова такая. Мы не хочам, каб звонкія гукі [б], [д] змяняліся на адпаведныя глухія. Хочам, каб мы ва ўсіх словах пісаліся нязменна.

Прыстаўкі з другога палаца былі таксама ганарлівыя і з капрызным характарам.

— А мы хочам, каб [з] заставаўся перад звонкімі гукамі, а перад глухімі змяняўся на [с].

— Добра, я прымаю вашыя ўмовы, а зараз — за працу, — сказала каралева.

Вось такая гісторыя адбылася аднойчы ў краіне каралевы Мовы.

4. Пытанне да вучняў:

Так што прапанавалі прынцэсы-прыстаўкі?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. А цяпер паглядзіце на дошку. Там запісаны словы, але прапушчаны ў іх літары. Нам трэба правільна ўставіць літары, успамінаючы ўмовы прынцэс. Але спачатку ў словах з кожнага слупка трэба вызначыць корань.

| | | | |
|---|---|---|---|
| У...ход | У...лезці | На...пісаць | **А...чыніць** |
| ра...казаць | ра...лічыць | а...лятаць | **а...ходзіць** |
| ра...сыпаць | ра...важыць | а...маўляць | **па...лезці** |
| бя...сільны | бя...донны | па...пісаць | а...бегчы |
| ...казаць | ...далёк | а...клеіць | на...вязаць |

**36.** Прадумайце методыку правядзення сачыненняў-мініяцюр на арфаграфічныя тэмы.

Праналізуйце наступнае сачыненне-мініяцюру:

Ганаровую і ўпартую часціцу Не пакахаў Дзеяслоў. Цяжкім і сумным было гэта каханне. Ён гаварыў: "Я кахаю", а яна яму: "Не кахаю". Ён казаў: "Веру", а яна: "Не веру".

Часціца Не ніколі не падыходзіла да Дзеяслова блізка і пісалася ад яго асобна. Аднак Дзеяслоў был пастаянным у сваіх пачуццях. Вось аднойчы часціца Не гаворыць яму: "Я адкажу табе каханнем, калі ты дакажаш, што жыць без мяне не можаш".

Уздыхнуў Дзеяслоў сумна ды й пайшоў падарожнічаць па слоўніках ды падручніках. Калі ж ён вярнуўся да сваёй каханай, яна, пакрыўджаная, адбегла ад яго з крыкам "ненавіджу!" І раптам спынілася ад неспадзяванага: на гэты раз Дзеяслоў застаўся побач. Так ён даказаў, што ў некаторых выпадках сапраўды жыць не можа без Не.

**37.** Уявіце, што настаўніца вельмі дэталёва, падрабязна растлумачыла вучням правіла на тэму "Правапіс слоў з падоўжанымі зычнымі". У працэсе замацавання вучні без памылак выканалі практыкаванні з наступнымі заданнямі:

1) змяніце словы, як паказвае ўзор; запішыце;

2) прачытайце словазлучэнні, падбіраючы патрэбныя словы (словы прыведзены ў даведцы да практыкавання); запішыце;

3) прачытайце словы, вызначце, якія літары прапушчаны; запішыце;

4) перакладзіце словы на беларускую мову, запішыце; параўнайце правапіс і вымаўленне рускіх і беларускіх слоў;

5) спішыце словазлучэнні, ўстаўце патрэбныя арфаграмы;

6) прачытайце словы іншамоўнага паходжання, запішыце іх; пры спісванні падкрэсліце выдзеленыя літары;

7) дапішыце сказы патрэбнымі словамі з правага слупка; словы, у якіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ёсць падоўжаныя зычныя, падзяліце для пераносу.

Ці можна сцвярджаць, што вучні пасля правільнага выканання ўсіх гэтых практыкаванняў набылі ўстойлівы навык напісання слоў з падоўжанымі зычнымі? Чаму?

**38.** Прааналізуйце схему да тэмы "Правапіс мяккага знака".

Прапануйце свой варыянт схемы да гэтай або іншай арфаграфічнай тэмы.

Правапіс мяккага знака

*ь* **не** пішацца

пасля *б, п, ф, в, м*

*стэп, насып, голуб*

*ь* пішацца

1) на канцы слова пасля *л, н, з, дз, ц*;
2) у сярэдзіне слова пасля *л, н*;
3) перад цвёрдымі зычнымі пасля *з, с, дз, ц*

*сталь, медзь, гульня, дзянькі, пісьмо, Кузьма*

**39.** Акрэсліце ролю і месца этымалагічных даведак на ўроках па арфаграфіі. Якая форма такой працы дасць, на вашу думку, аптымальны вынік?

Напрыклад:

*Ветэран.* Слова *ветэран* прыйшло з французскай мовы, у яго аснове – слова *ветус* (лац.) — ‘стары’.

*Тэрыторыя. Тэра* (грэч.) — ‘зямля’: *тэраса, тэрарыум.*

*Авіяцыя. Авія* (лац.) — ‘паветраны’: *авіяпошта.*

*Тэлефон. Тэле* (грэч.) – ‘далёка’: *тэлеграф, тэлеграма, тэлескоп.*

**40.** Азнаёмцеся з наступным тэкстам, які прапануецца як кантрольная дыктоўка пасля вывучэння тэмы "Прыслоўе". Наколькі гэты тэкст адпавядае метадычным патрабаванням, што прад'яўляюцца да кантрольных дыктантаў?

На радзіме песняра

Вязынка... Некалі тут была даволі шырокая рэчка. Па ёй сплаўлялі лес, а на гэтым месцы вязалі плыты. Адсюль і яе назва.

Вязынка надзвычай дарагая нам, бо тут нарадзіўся вялікі беларускі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

паэт Янка Купала. Тут ён упершыню ўбачыў родныя краявіды, пачуў цудоўныя беларускія песні. Калі сонца хавалася за лес, маці брала Яся ў сад слухаць песні. Услаўляючы чалавека, яго працу, яны плылі па-над рэчкай і лугам.

Увосень і ўзімку да Луцэвічаў збіраліся галасістыя пявунні. Рана пачуў Янка Купала песню і пасябраваў з ёю на ўсё жыццё. Маляўнічыя краявіды не маглі не крануць сэрца паэта. Ён захапляўся прыгажосцю свайго краю, душэўнай шчодрасцю роднага народа.

(105 слоў)

**41.** Паразважайце, ці патрэбны ўлік арфаграфічных памылак. Калі патрэбны, то дзеля чаго? У якой форме найлепш весці ўлік арфаграфічных памылак?

**42.** Паразважайце, наколькі эфектыўнай бачыцца вам праца над памылкамі. Якія формы працы над памылкамі вы можаце прапанаваць?

**43.** Прааналізуйце памятку “Работа над арфаграфічнымі памылкамі”. Ці можна яе прапанаваць вучням?  Калі не, то чаму? Калі так, то ў якім класе?

Работа над арфаграфічнымі памылкамі

1. Высветлі лексічнае значэнне слова (па тлумачальным слоўніку).
2. Вызначы, да якой часціны мовы яно адносіцца.
3. Разбяры па саставу і ўкажы частку, у якой дапушчана памылка.
4. Высветлі, на якое правіла дапушчана памылка.
5. Паўтары правіла.
6. Выпраў памылку ў рабоце.
7. Правер напісанне слова па слоўніку.
8. Запішы слова, абазнач арфаграму, прывядзі прыклады.
9. Выканай практыкаванне на гэтае правіла.

Памятай, што працаваць над памылкамі трэба сістэматычна!

Прапануйце свой варыянт памяткі "Як працаваць над арфаграфічнымі памылкамі".

## Спіс літаратуры для самастойнай працы па раздзеле


1. *Алгазина Н. Н.* Формирование орфографических навыков. – М., 1987.
2. *Богоявленский Д. Н.* Психология усвоения орфографии. – М., 1966.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. *В249ановіч З. Б.* Методыка выкладання беларускай мовы. – Мн., 1995.
4. Выкладанне беларускай мовы ў школе / Пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мн., 1993.
5. *Разумовская М. М.* Методика обучения орфографии в школе. – М., 1996.
6. Шатова Е. Г. Работа над орфографическим правилом. – М., 1998.

## МЕТОДЫКА РАЗВІЦЦЯ МАЎЛЕННЯ ВУЧНЯЎ
(агульныя пытанні)

**1.** Раскажыце, што такое мова і маўленне, чым адрозніваюцца гэтыя паняцці. Калі неабходна, выкарыстайце пры адказе наступны тэкст:

Адрозненне паняццяў «мова» і «маўленне» мае прынцыповы характар. Гэта можна лепш асэнсаваць, калі прыгадаць такую сітуацыю: мы слухаем маўленне на замежнай мове, якую не ведаем.

Што ж мы ў такім выпадку чуем? Маўленне. Пэўныя ланцужкі гучанняў з гэтага маўлення мы можам вылучыць або, калі ў нас добрая памяць, нават паўтарыць.

Вучоныя-лінгвісты тлумачаць паняцце «мова» наступным чынам. Мова — гэта сістэма знакаў, правіл, якія дазваляюць нам пабудаваць маўленне. Каб вывучыць пэўную мову, мы павінны ведаць яе фанетыку, граматыку, слоўнік.

Калі мы ведаем мову, то нам лёгка выказваць свае думкі. Маўленне — гэта арганізаваны па законах мовы працэс выкарыстання моўных адзінак з мэтаю выражэння пэўнага зместу, гэта канкрэтная праява мовы.

(Паводле Л. Ц. Выгоннай)

**2.** У сучаснай праграме па беларускай мове сказана, што развіваць маўленне вучняў неабходна пастаянна. Гэтым самым сцвярджаецца, што развіццё маўлення – адна з асноўных задач школьнага курса роднай мовы. Як вы разумееце паняцце “развіццё маўлення вучняў”?

Пры адказе можаце выкарыстоўваць наступныя выказванні:

*Развіццё маўлення вучняў – гэта ўся праца, “якую праводзіць славеснік спецыяльна і ў сувязі з вывучэннем школьнага курса (граматыкі, словаўтварэння, правапісу і г. д.) для таго, каб вучні авалодалі нормамі*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*мовы (вымаўленчымі, лексічнымі, марфалагічнымі, сінтаксічнымі), а таксама ўменнем выказваць свае думкі ў вуснай і пісьмовай форме, карыстаючыся патрэбнымі сродкамі мовы ў адпаведнасці з мэтай, зместам маўлення і ўмовамі зносін”* (Т. А. Ладыжанская).

*Развіццё маўлення “ў шырокім сэнсе – гэта працэс, накіраваны на забеспячэнне практычнага авалодання мовай, якая выконвае сваю галоўную, камунікатыўную, функцыю ў дзвюх формах – вуснай і пісьмовай”* (М. Г. Яленскі).

*Пад развіццём маўлення “мы разумеем такую арганізацыю аналітыка-сінтэтычнай моўнай і практычнай маўленчай дзейнасці школьнікаў, якая з дапамогай дыдактычных сродкаў садзейнічае мэтанакіраванаму развіццю інтэлекту і маўленчых механізмаў дзяцей і падлеткаў, выпрацоўцы нормаў літаратурнага вымаўлення і правапісу, стымулюе ўзбагачэнне слоўніка і граматычнага ладу мовы вучняў, фарміруе ўменне ўспрымаць і ствараць звязныя тэксты, разнастайныя па стылістычнай і жанравай прыналежнасці, структурна-моўнай арганізацыі, мэтанакіраванасці, паўнаце і дакладнасці выражэння думкі”* (В. У. Протчанка).

**3.** В. У. Протчанка піша, што “вывучэнне мовы і развіццё маўлення – працэсы, цесна звязаныя адзін з другім, але не тоесныя”. Ці згодныя вы з гэтым? Абгрунтуйце свой адказ.

**4.** Назавіце і ахарактарызуйце асноўныя прынцыпы методыкі развіцця маўлення.

**5.** Вызначце, ажыццяўленню якіх (ці якога) метадычных прынцыпаў развіцця маўлення садзейнічае наступнае заданне, прапанаванае школьнікам пры вывучэнні тэмы “Скланенне якасных і адносных прыметнікаў”. Абгрунтуйце свой адказ.

Складзіце невялікі тэкст-апавяданне “У грыбы”. Выкарыстайце ў ім, па магчымасці, наступныя апорныя словазлучэнні: *жнівеньск.. раніцай, са старэйш.. братам, на шырок.. лузе, у хваёв.. бары, грыбн.. мясціны, крамян.. баравікі, поўн.. кошыкі, цудоўн.. настрой.*

**6.** Ахарактарызуйце слуханне (аўдзіраванне) як від маўленчай дзейнасці. Назавіце метадычныя прыёмы, якія можна выкарыстаць для ўдасканалення навыкаў аўдзіравання. Прывядзіце прыклады пэўных сітуацый, калі патрабуецца той ці іншы від слухання.

**7.** Ахарактарызуйце гаварэнне як від маўленчай дзейнасці. Пры неабходнасці выкарыстайце інфармацыю, змешчаную ў наступным тэксце:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гаварэнне як від маўленчай дзейнасці ўяўляе сабой працэс выражэння сваіх і чужых думак у гукавой форме пры дапамозе моўных сродкаў. У рэальнай камунікацыі асноўнымі функцыямі гаварэння з'яўляецца перадача інфармацыі, вербальнае ўздзеянне на субяседніка, пабуджэнне субяседніка да паведамлення неабходнай інфармацыі і г. д.

Гаварэнне можа быць рознай ступені складанасці, пачынаючы ад выражэння афектыўнага стану пры дапамозе выклічнікаў і заканчваючы самастойным разгорнутым выказваннем.

Гаварэнне бывае прадуктыўным (ствараецца тым, хто гаворыць) і рэпрадуктыўным (уяўляе сабой перадачу слоў, сказаў, тэкстаў без змянення), падрыхтаваным (змест і моўны матэрыял выказвання папярэдне адпрацоўваецца) і непадрыхтаваным (выказванні фарміруюцца і фармулююцца як непасрэдная рэакцыя на маўленчую сітуацыю).

Прывядзіце прыклады сітуацый, калі гаварэнне з'яўляецца: а) прадуктыўным, падрыхтаваным; б) прадуктыўным, непадрыхтаваным; в) рэпрадуктыўным, падрыхтаваным.

**8.** Ахарактарызуйце чытанне як від маўленчай дзейнасці: назавіце яго функцыі, віды, пералічыце прыёмы, што садзейнічаюць авалоданню тым ці іншым прыёмам чытання.

**9.** Вызначце, якія від чытання неабходны для выканання наступных заданняў:

– вызначыць стыль тэксту;
– вызначыць тэму і асноўную думку тэксту;
– прачытаць тэкст і пераказаць яго змест.

**10.** Існуюць меркаванні, што задача фарміраванння навыкаў аўдзіравання і чытання ў сярэдняй школе актуальная толькі пры навучанні замежнай мове, а не роднай. Выкажыце сваю думку наконт гэтага.

**11.** У метадычнай навуцы традыцыйна выдзяляюцца тры накірункі работы па развіцці маўлення школьнікаў: узбагачэнне слоўнікавага запасу і развіццё граматычнага ладу маўлення вучняў, навучанне нормам літаратурнай мовы, фарміраванне ўменняў і навыкаў звязнага маўлення.

Як вы думаеце, чаму паміж гэтымі напрамкамі работы па развіцці маўлення існуе цесная ўзаемасувязь і на ўроках мовы трэба комплексна вырашаць праблему маўленчага развіцця школьнікаў?

**12.** Як вы разумееце паняцце “звязнае маўленне”? У чым заключаецца асноўная задача работы па развіцці звязнага маўлення

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

вучняў? Пры неабходнасці выкарыстайце пры падрыхтоўцы адказу інфармацыю, змешчаную ў наступных выказваннях:

“*Звязнае маўленне можа быць акрэслена як маўленне змястоўнае, тэматычна скіраванае, лагічна паслядоўнае, аформленае ў адпаведнасці з прынятымі ў мове нормамі, а таксама мэтамі і ўмовамі камунікацыі”* (А. А. Барынава).

*У якасці звязнага маўлення “разумеецца і працэс, маўленчая дзейнасць, і пэўны вынік акта камунікацыі, г. зн. разгорнуты адказ вучня па матэрыяле вучэбнай дысцыпліны, вусны і пісьмовы пераказ тэксту, рэферат, артыкул ў насценгазету і г .д. – тэкст”* (Т. А. Ладыжанская).

*Тэрмін “звязнае маўленне ў методыцы мовы ўжываецца ў трох значэннях: 1) дзейнасць таго, хто гаворыць, працэс выражэння думкі; 2) тэкст, выказванне, прадукт маўленчай дзейнасці; 3) назва раздзела методыкі развіцця маўлення”* (М. Р. Львоў).

**13***. З мэтай развіцця звязнага маўлення вучні павінны авалодаць спецыяльнымі тэарэтычнымі ведамі пра маўленне і камунікатыўнымі ўменямі і навыкамі. Карыстаючыся адпаведнымі праграмамі, выявіце, з якімі маўленчымі паняццямі павінны пазнаёміцца вучні ў 5 – 10 класах сярэдняй школы і якія камунікатыўна-маўленчыя ўменні павінны быць сфарміраваны ў іх за гэты перыяд навучання.

**14.** Каб паспяхова фарміраваць камунікатыўна-маўленчыя ўменні школьнікаў, неабходна выкарыстоўваць спецыяльныя практыкаванні і заданні.

Прааналізуйце сістэму заданняў па развіцці звязнага маўлення, што прапанавала Т. А. Ладыжанская, і выкажыце свае меркаванні аб гэтай сістэме.

1. Заданні аналітычнага характару па гатовым тэксце. Напрыклад: вызначыць асноўную думку выказвання; знайсці частку, у якой змяшчаецца прыклад-доказ..., у якой даецца апісанне чаго-небудзь; знайсці ў тэксце лішняе; вызначыць частку, якую мэтазгодна пашырыць; прасачыць залежнасць ужывання пэўных моўных сродкаў ад задачы выказвання; супаставіць зыходны тэкст і канспект і г. д.

2. Заданні аналітыка-сінтэтычнага характару па гатовым тэксце. Гэтыя заданні патрабуюць аналізу гатовага тэксту і стварэння на яго базе элементаў тэксту (але не тэксту ў цэлым). Напрыклад: даць тэксту загаловак, падабраць эпіграф, стварыць кампазіцыйную схему тэксту і г. д.

3. Заданні на перапрацоўку гатовага тэксту ў плане яго ўдасканалення. Напрыклад: выправіць хібы ў змесце і моўным афармленні выказвання, увесці ў тэкст цытаты, якія пацверджваюць пэўныя меркаванні, і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Заданні, што патрабуюць пабудовы новага тэксту на аснове дадзенага. Напрыклад: перадаць падрабязна (сцісла) якую-небудзь частку тэксту ці ўвесь тэкст; падрыхтаваць вуснае паведамленне на пэўную тэму на аснове дадзенага тэксту; дапоўніць тэкст сваімі разважаннямі па сутнасці пытання, якое ў іх разглядаецца; запісаць пачутае апавяданне і г. д.

5. Заданні, што патрабуюць стварэння свайго (у поўным сэнсе гэтага слова) тэксту (выказвання). Напрыклад: скласці тэзісы выступлення; напісаць нататку; апісаць у навуковым стылі праведзены вопыт; напісаць водгук на сачыненне сябра; падрыхтаваць даклад на пэўную тэму.

**15.** У методыцы выкладання мовы доўгі час дамінавала думка, што развіццё звязнага маўлення – задача спецыяльных урокаў. Згодна з патрабаваннямі сучаснай методыкі, удасканальваць звязнае маўленне неабходна і паралельна з вывучэннем школьнага курсе лексікі, граматыкі і г. д. Якога пункту гледжання на гэтую праблему прытрымліваецеся вы? Чаму?

**16.** У навуковай літаратуры тэрмін “тэкст” ужываецца ў розных значэннях. Некаторыя навукоўцы лічаць, што тэкстам можа называцца любое выказванне, у тым ліку і тое, што ўяўляе сабой сказ ці нават слова. Іншыя ж мяркуюць, што “праблема тэксту існуе толькі там, дзе ёсць, як мінімум, два сказы” (гл.: *Капинос В. И., Сергеева Н. Н., Соловейчик М. С.* Развитие речи: теория и практика обучения: 5 – 7 классы. – М., 1991. – С. 23.). Выкажыце свой погляд наконт гэтага.

**17.** Як вы думаеце, чаму навучанне тэорыі тэкстаўтварэння пачынаецца з асэнсавання вучнямі паняцця “тэкст”, з азнаямлення школьнікаў з асноўнымі прыметамі тэксту: члянімасцю (наяўнасцю групы сказаў), сэнсавай цэласнасцю, тэматычным адзінствам і інш.?

**18.** Прачытайце матэрыял, пададзены ніжэй. Як вы будзеце тлумачыць вучням, што гэтая група сказаў з’яўляецца тэкстам?

У цэнтры Мінска, недалека ад Свіслачы, у засені маладзенькіх дрэўцаў стаіць акружаны кветкамі невялікі двухпавярховы дом – музей Янкі Купалы. Калі мы гаворым пра Янку Купалу, перад вачамі ўстаюць адкрытыя сонцу жытнёвыя палеткі, шырокія лугі пад легкімі, як пух, воблакамі, вялікія і маленькія рачулкі, старыя, векавечныя лясы і пушчы — сама Беларусь. Беларусь, яе маляўнічыя краявіды, працавітыя і мужныя людзі, яе мінуўшчына і сучаснасць натуральна і хораша ўвайшлі ў звонкую купалаўскую песню.

Вось чаму заўсёды з такім хваляваннем адчыняем мы дзверы музея.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**19*.** Прааналізуйце прыкладны варыянт азнаямлення школьнікаў з паняццем “тэкст”, змешчаны ў кнізе М. Г. Яленскага “Развіццё вуснай мовы вучняў: 4 – 6 класы” (Мн., 1985, с. 102 – 104) і адпаведны параграф ў падручніку па беларускай мове для 5 класа.

**20*.** Падрыхтуйце план-канспект урока на тэму “Тэкст, яго асноўныя прыметы (паўтарэнне). Сродкі сувязі сказаў у тэксце” (6 клас).

**21.** Як лічыць А. В. Цекучоў, развіццю звязнага маўлення вучняў садзейнічаюць разгорнутыя вусныя адказы, якія “могуць уяўляць сабой абагульненне, падвядзенне вынікаў па якім-небудзь раздзеле (склад слова, віды даданых і ад т. п.), матываваны самастойны граматычны разбор па пэўнай схеме з разважаннямі і доказамі, чаму вучань адносіць слова, якое разбірае, да той ці іншай катэгорыі”.

Ці згодныя вы з думкай вучонага? Абгрунтуйце свой адказ.

**22.** Ацаніце метадычную вартасць наступнага задання. На якім этапе вывучэння тэмы і з якой мэтай яго можна прапанаваць вучням?

Падрыхтуйце вуснае паведамленне на тэму “Прыметнік як часціна мовы”. Выкарыстайце пры неабходнасці наступны план:

1. Што абазначае прыметнік, на якія пытанні адказвае?
2. З якой часцінай мовы ў сказе звязаны прыметнік, як вызначаецца яго род, лік, склон?
3. Якія існуюць лексіка-семантычныя разрады прыметнікаў?
4. Якую сінтаксічную ролю выконвае прыментнік у сказе?
5. Для чаго ўжываецца прыметнік у маўленні?

**23.** Акрэсліце ролю і месца працы па развіцці звязнага вуснага маўлення вучняў на аснове наступных выказванняў:

*"Практыкаванні дару слова павінны быць вусныя і пісьмовыя, і прычым вусныя павінны папярэднічаць пісьмовым. У нашых школах надзвычай мала звяртаюць увагі на практыкаванні вуснай мовы"* (К. Дз. Ушынскі).

*"Вуснай мовай чалавек карыстаецца часцей, чым пісьмовай, таму перад сённяшняй школай стаіць вельмі адказная задача — навучыць дзяцей не толькі пісаць правільна, але і гаварыць пераканальна, лагічна, аргументавана, з захаваннем патрэбнага тону, тэмпу, эмацыянальнага настрою, адпаведных зместу выказвання"* (М. Г. Яленскі).

*"Калі роля вуснага слова такая значная, то, відавочна, сярэдняя школа павінна ўзброіць вучняў неабходнымі навыкамі вуснага маўлення. Між тым гэтая задача вырашаецца да гэтага часу нездавальняюча: нізкі*

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

*ўзровень вуснага маўлення выпускнікоў школы з'яўляецца агульнапрызнаным фактам"* (Т. А. Ладыжанская).

**24.** Якую розніцу вы бачыце паміж наступнымі прапановамі настаўніка вучню: "Прывядзі прыклад", "Растлумач гэта на прыкладзе".

**25.** Прааналізуйце наступныя адказы вучняў з улікам таго, што "ў ідэальным вусным адказе ёсць: 1) тэарэтычнае паведамленне (правіла, азначэнне і г. д.); 2) прыклад; 3) тлумачэнне прыклада" (Т. А. Ладыжанская).

1. "Пабочныя словы і сказы — гэта такія словы і сказы, з дапамогай якіх мы выражаем свае адносіны да таго, пра што паведамляецца ў сказе. Напрыклад: *На жаль, я не змагу паехаць да бабулі ў вёску. На жаль* — пабочнае слова".

2. "Зваротак — гэта слова або словазлучэнне, што называе асобу ці прадмет, да якіх звяртаюцца. Зваротак звычайна выражаецца назоўнікам у форме назоўнага склону. Напрыклад: *Не гніся да долу пад бурай, бярозка!* У гэтым сказе зваротак — слова *бярозка*. Гэта назоўнік, ён мае форму назоўнага склону. З дапамогай зваротка мы выражаем сваю просьбу да бярозкі".

3. "Прыназоўнік — службовая часціна мовы. Прыназоўнікі паказваюць залежнасць адных слоў ад другіх у словазлучэнні.

Напрыклад: *У шэсць гадзін мы пойдзем у кіно*. Прыназоўнік *у*. Без прыназоўніка было б так: *Шэсць гадзін мы пойдзем кіно*. Сказ страціў бы сэнс. *Пойзём кіно* — няма сувязі паміж залежным словам *кіно* і галоўным словам — дзеясловам".

4. "Дзеепрыметнікі бываюць цяперашняга і прошлага часу. Напрыклад: *Хвалюючыя сустрэчы* — сустрэчы, якія хвалююць нас цяпер, зараз, у гэты момант. *Хвалюючыя* — дзеепрыметнік у форме цяперашняга часу. *Пасеяная пшаніца* — гэта пшаніца, якую ўжо пасеялі, пасеялі раней. *Пасеяная* — дзеепрыметнік прошлага часу".

**26.** Прааналізуйце адзін са школьных падручнікаў па мове і выявіце практыкаванні, у якіх падаюцца: а) планы адказаў; б) узоры адказаў, разважанняў; в) узоры вусных разбораў. Якая роля гэтых практыкаванняў у развіцці звязнага вуснага маўлення вучняў?

**27.** Прааналізуйце наступны вусны адказ вучня: ці адпавядае ён тым патрабаванням, пра якія гаварылася ў заданні 25. Ацаніце адказ,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

матывуйце выстаўленне пэўнага бала.

"У няпэўна-асабовых і безасабовых сказаў аднолькавае тое, што яны — аднасастаўныя, але ў іх выказнікі не падобныя. У безасабовых сказах выказнік — безасабовы дзеяслоў. У няпэўна-асабовых зусім не такі дзеяслоў. У іх дзеяслоў – у 3-й асобе множнага ліку і яшчэ 2-й асобе адзіночнага ліку. Так што паміж імі многа непадобнага..."

**28.** Разгледзьце табліцу. На якіх уроках можна яе выкарыстаць з мэтай развіцця звязнага вуснага маўлення вучняў? Сфармулюйце адпаведнае заданне.

КЛАСІФІКАЦЫЯ ЧАСЦІН МОВЫ




**29.** Для ўдасканалення навыкаў звязнага маўлення некаторыя метадысты (А. В. Цекучоў, Л. А. Вінаградава і інш.) прапаноўваюць выкарыстоўваць творчае спісванне. Што гэта за від працы? Фарміраванню яшчэ якіх уменняў яно садзейнічае? Прааналізуйце некалькі раздзелаў аднаго са школьных падручнікаў і выявіце, ці прадстаўлены ў іх такі від практыкавання.

**30.** Акрэсліце месца і значэнне творчых дыктантаў у сістэме працы па развіцці звязнага маўлення школьнікаў. Пры адказе ўлічыце наступныя меркаванні:

*Творчы дыктант садзейнічае "замацаванню арфаграфічных навыкаў, агульнаму развіццю і развіццю маўлення вучняў, дапамагае засваенню*

*граматычных ведаў”* (А. В. Цекучоў).

*Прымяненне творчых дыктантаў вучыць назіраць, прымушае карыстацца катэгорыямі, што вывучаюцца, прывучае ярка, выразна, маляўніча апісваць прадметы і з’явы”* (З. Ф. Ульчанка).

Падбярыце адпаведны тэкст, сфармулюйце да яго заданне і пакажыце, як трэба праводзіць творчы дыктант на ўроках беларускай мовы.

**31.** Акрэсліце месца і значэнне вольных дыктантаў у развіцці звязнага маўлення вучняў. Можаце выкарыстаць наступнае меркаванне Т. А. Ладыжанскай: “Сістэматычнае правядзенне вольных дыктантаў дапамагае пераадолець асноўны недахоп вучнёўскіх пераказаў: непаўнату і непаслядоўнасць у перадачы зместу”

Успомніце методыку правядзення вольнага дыктанта і праілюструйце яе канкрэтным прыкладам.

**32.** Абгрунтуйце мэтазгоднасць выкарыстання з мэтаю развіцця маўлення школьнікаў перакладу. Улічыце пры адказе наступную думку М. Г. Яленскага: “Пераклад з рускай мовы на беларускую садзейнічае развіццю маўленчай мабільнасці, адчування слова, удасканальвае навык дакладнасці выбару слова ў адпаведнасці з кантэкстам”.

Прааналізуйце адзін са школьных падручнікаў і выявіце, якое месца ў ім займае пераклад. На аснове канкрэтнага прыкладу пакажыце методыку правядзення перакладу тэксту.

**33.** Прачытайце наступнае практыкаванне. У якой ступені тэкст практыкавання, заданне да яго адпавядаюць методыцы працы над перакладам тэксту на ўроках мовы?

Прачытайце. Вусна перакладзіце на беларускую мову. У перакладзеным тэксце спачатку назавіце словы, якія з'яўляюцца агульнымі для беларускай і рускай моў, потым – тыя, якім у беларускай мове адпавядаюць іншыя словы.

*Некоторые признаки ухудшения погоды*

*Отдельные облака плывут навстречу друг другу. Днем ясно, но к вечеру облака начинают опускаться, ветер не стихает, а усиливается.*

*Роса вечером и ночью не образуется. Около Солнца и Луны появляются большие цветные круги. Утренняя заря отличается особенно ярким красным цветом.*

**34*.** Прааналізуйце дапаможнік У. М. Вярбілы, Я. М. Лаўрэля,

М. Г. Яленскага "Багата, родная ты мова..." (Мн., 1988).

Ці згодны вы з наступнай ацэнкай гэтай кнігі: "Істотную дапамогу ў развіцці маўлення вучняў сярэдняга школьнага ўзросту акажуць настаўніку матэрыялы і метадычныя парады, якія склалі кнігу "Багата, родная ты мова...". Аўтары яе знайшлі лаканічную і прыдатную для карыстання сістэму падачы матэрыялу: тэксты – метадычныя каментарыі – пытанні і заданні. Выдавецтва са свайго боку таксама паклапацілася, каб дапаможнік, як кажуць, сам прасіўся ў рукі: да тэкстаў, каментарыяў, пытанняў і заданняў распрацаваны адпаведныя сімвалы-абазначэнні. Звяртаюць на сябе ўвагу і ўдала падабраныя тэксты — тут інфарматыўнасць і мастацкасць, ілюстрацыя моўных з'яў і выхаваўчы акцэнт " (*Станкевіч М. П.* Духоўны свет і моўная культура // Беларуская мова і літаратура ў школе.– 1988, № 11).

Напішыце водгук на гэты дапаможнік.

## Методыка навучання пераказам

**1.** У розныя часы да пераказаў ставіліся па-рознаму – ад поўнага іх адмаўлення як механічнай малаэфектыўнай працы да прызнання іх значнай ролі ў развіцці звязнага маўлення школьнікаў. Чаму сёння лічыцца, што пераказ як найлепш адпавядае сучасным патрабаванням навучання мове? Чым тлумачыцца метадычная мэтазгоднасць выкарыстання гэтага віду працы на ўроках беларускай мовы?

**2.** Як вы лічыце, чаму ў метадычнай навуцы няма адзінага погляду на класіфікацыю пераказаў?

Параўнайце наступныя класіфікацыі. Якая з іх, на вашу думку, больш дакладная? Абгрунтуйце свой адказ.

Пераказы адрозніваюцца: а) па змесце (апавяданні, апісанні, партрэтныя характарыстыкі, разважанні); б) па мэце правядзення (навучальныя і кантрольныя); в) па аб’ёме (сціслыя і разгорнутыя); г) па адносінах да тэкстаў (блізкія да тэксту і больш вольныя); д) па ступені ўскладненасці дадатковымі заданнямі (з дадатковымі заданнямі і без іх); е) па адносінах да плана (з планам і без плана); ж) па спосабу азнаямлення вучняў з тэкстам (пераказ тэксту, прачытанага настаўнікам і ўспрынятага вучнямі на слых; пераказ тэксту, які ўслых прачыталі самі вучні; пераказ тэксту, прачытанага вучнямі ў класе пра сябе, і інш.); з) па ступені самастойнасці выканання (індывідуальныя і калектыўныя).

(А. В. Цекучоў)

Пераказы класіфікуюцца: 1) па адносінах да аб’ёму зыходнага тэксту: падрабязныя і сціслыя; 2) па адносінах да зместу: поўныя, выбарачныя, з

дадатковымі заданнямі; 3) па ўскладненасці моўным заданнем: з лексічным, граматычным, стылістычным і інш. заданнямі; 4) па ўспрыманні зыходнага тэксту: пераказ прачытанага (успрынятага зрокава), пачутага (успрынятага на слых), успрынятага на слых і зрокава; 5) па ступені знаёмства з зыходным тэкстам: пераказ незнаёмага тэксту і знаёмага, вядомага вучням.

(Т. А. Ладыжанская)

Пераказы бываюць рознага віду: падрабязныя і сціслыя (па адносінах да аб’ёму зыходнага тэксту), поўныя, выбарачныя і з дадатковым заданнем (па адносінах да зместу зыходнага тэксту).

(З. Б. Варановіч)

**3.** У некаторых метадычных дапаможніках вылучаюццца як асобныя падрабязныя пераказы і пераказы, блізкія да тэксту. Сцвярджаецца, што пераказ, блізкі да тэксту, адрозніваецца ад падрабязнага тым, "што на ўроку разам са зместам глыбока аналізуюцца і моўныя сродкі, пры гэтым найбольш вобразныя выразы падкрэсліваюцца, запісваюцца, а затым выкарыстоўваюцца ў пераказе" (А. А. Барынава). Наколькі мэтазгодным бачыцца вам такое размежаванне?

На аснове аналізу праграмы па беларускай мове выявіце, ці прадугледжваецца ў іх напісанне пераказаў з захаваннем аўтарскіх моўных асаблівасцей, г. зн. пераказаў, блізкіх да тэксту.

**4.** Як вы думаеце, чаму праца па навучанні школьнікаў напісанню пераказу пачынаецца з фарміравання ўмення ствараць пераказы падрабязныя, а не, напрыклад, сціслыя ці выбарачныя?

**5.** Паводле праграмы па мове пераказ як самастойны від працы ў старшых класах адсутнічае. Ці азначае гэта, што ўменні, якія фарміраваліся пры правядзенні пераказаў у папярэдніх класах, не атрымліваюць свайго прымянення і развіцця?

**6.** Да тэкстаў для пераказаў існуюць пэўныя патрабаванні. Напрыклад, тэксты павінны:

а) быць даступнымі па змесце;
б) мець пазнавальную і выхаваўчую каштоўнасць;
в) з’яўляцца ўзорам у выкарыстанні моўных сродкаў;
г) ілюстраваць вывучаемы і раней вывучаны праграмны матэрыял;
д) змяшчаць патрэбную колькасць слоў;
е) з’яўляцца цэласным творам ці адносна завершанай яго часткай;
ж) адпавядаць характару пераказу, задачам, якія неабходна вырашыць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і інш.

Улічваючы гэтыя патрабаванні, прааналізуйце некалькі тэкстаў, змешчаных у зборніках ці дапаможніках для настаўніка (гл., напрыклад: *Несцяровіч В. А.* Зборнік тэкстаў для ізлажэнняў: 4 – 8 кл. – Мн., 1976; *Піскун У. Ц., Кацапаў Л. А., Краўчанка Л. А.* Зборнік тэкстаў для пераказаў: 4 – 6 кл. – Мн., 1982; *Вярбіла У. М., Лаўрэль Я. М., Яленскі М. Г.* Багата, родная ты мова... : Матэрыялы і метадычныя парады па развіццю звязнай мовы вучняў, 4 – 8 кл. : Дапаможнік для настаўніка. – Мн., 1988 і інш.)

**7.** Дайце метадычную ацэнку таму, што ў школьнай практыцы пераказы ў асноўным праводзяцца на аснове ўрыўкаў з мастацкіх твораў.

**8.** У якой ступені метадычна апраўданая, на вашу думку, адаптацыя мастацкіх тэкстаў для іх выкарыстання ў якасці тэкстаў для пераказаў?

**9***. Самастойна падбярыце тэксты для правядзення падрабязнага, сціслага і выбарачнага пераказаў. Абгрунтуйце правільнасць падбору тэкстаў.

**10.** Раскажыце пра навучальны падрабязны пераказ: дайце азначэнне гэтаму віду працы, пералічыце камунікатыўныя ўменні, што фарміруюцца пры яго правядзенні, назавіце і ахарактарызуйце этапы ўрока правядзення навучальнага падрабязнага пераказу.

**11***. Распрацуйце план-канспект урока навучальнага падрабязнага пераказу ў 7 класе. Выкарыстайце падрыхтаваны вамі ці наступны тэкст:

Партызанская дзяжа

Да ўсяго ў нашай сям'і адносіліся з павагай, кожную рэч шанавалі, асабліва дзяжу, карміліцу. Яе заўсёды аберагалі, з любоўю даглядалі, каб не стукнуць, бо цеста не падыдзе. Спечаны хлеб будзе ацеслівы, сядзе на скарынку, а то і верхняя скарынка адстане.

... Дзяжу змайстраваў вясковы ўмелец Ахрэм. Сонечнай чэрвеньскай раніцай прынёс яе нам у хату. Шчыра пажадаў: “Няхай будзе шчасце ў сям'і і смачны хлеб з гэтай дзяжы”.

Маці запарыла новенькую дзяжу варам і вынесла на сонца прасушыць. Вечарам учыніла хлеб. А назаўтра чорная вестка абляцела вёску: вайна.

Прыйшлі фашысты.

У Прыхабскіх лясах арганізаваўся патрызанскі атрад. Да народных мсціўцаў пайшла і наша сям'я. Дзяжу не пакінулі чужынцам, забралі з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сабою: без хлеба ні сняданку, ні абеду.

– У цеснай зямлянцы дзяжа адначасова была і сталом, – ціха расказвае маці, успамінаючы былое. – Прыйдуць партызаны з задання, стомленыя, галодныя. Пастаўлю на дзяжу чыгунок з варывам, хлеб пакладу. А які быў хлеб... Галоўкі дзікай канюшыны сушылі, ліпавае лісце. Патаўчом у ступе, потым крыху мукой патрусім – і замешваем цеста...

Прагналі захопнікаў. Адышло ваеннае ліхалеццe. Вярнуліся ў паўразбураную вёску партызанскія сем'і. Вярнулася і наша сям'я. Павольна ўсталёўвалася мірнае жыццй. Але не-не, ды аддаваў гаркавым прысмакам мінулай вайны хлеб, выпечаны з Ахрэмавай дзяжы.

Раз у тыдзень маці ставіла дзяжу на ўслон каля печы і, замясіўшы цеста, клала на лапату прыгожыя круглыя боханы, каб пасадзіць іх на гарачы под печы. Ах, якая смачная была скарынка, пасыпаная соллю!

Па часе не стала патрэбы пячы хлеб дома. І каравай, і белую булку, і чорны бохан – на любы густ – заўсёды можна было купіць у магазіне.

Але дзяжа засталася на ранейшым месцы. Стаіць яна на покуце, накрытая тканым ручніком з чырвонымі пеўнямі. Я памятаю яе, бадай, з таго часу, як стаў памятаць самога сябе.

(Паводле В. Дзеравяшкі)

**12.** Ахарактарызуйце сціслы пераказ як від навучальнага практыкавання па развіцці звязнага маўлення вучняў.

**13.** Прааналізуйце план-канспект урока напісання сціслага пераказу, падрыхтаваны студэнткай у час педагагічнай практыкі. Падумайце, як можна ўдасканаліць план-канспект, каб ён адпавядаў тым патрабаванням, што прад'яўляюцца на ўрока навучальнага сціслага пераказу.

**Тэма**. Сціслы пераказ тэксту “Возера Свіцязь” (7 клас)

**Мэты**: 1) узнавіць веды вучняў пра сціслы пераказ і пашырыць іх;

2) удасканаліць уменні школьнікаў сцісла, у абагульненай форме перадаваць успрынятую інфармыцыю;

3) фарміраваць уменне выдзяляць галоўнае, скарачаць тэкст рознымі спосабамі, знаходзіць і выкарыстоўваць моўныя сродкі для абагульненай перадачы зместу;

4) выхоўваць любоў да роднага краю, цікавасць да яго гісторыі.

**Тып урока**. Урок развіцця звязнага маўлення.

**Ход урока**

I. <u>Арганізацыйны момант</u>.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

II. Паведамленне тэмы і мэты ўрока.

– Сёння мы з вамі будзем далей развіваць уменне пераказваць пачуты тэкст. Але пераказ тэксту будзе не падрабязны, а сціслы. Вам неабходна будзе сцісла перадаць пачутае. Тэкст я буду чытаць адзін раз, таму вы павінны быць вельмі ўважлівымі. Увагу неабходна сканцэнтраваць на асноўным у змесце тэксту, каб потым выдзяліць галоўнае, найбольш значнае і сцісла перадаць альбо зусім апусціць другараднае. Скарачаць тэкст можна рознымі шляхамі: скарачаць і аб’ядноўваць некалькі сказаў ці частак ў адну, выключаць, апускаць менш значнае, розныя дробныя дэталі і інш.

III. Уступнае слова настаўніка.

– Паслухайце, калі ласка, тэкст Яраслава Пархуты, у якім вы пачуеце яшчэ адну са шматлікіх легенд пра наш родны край, пра яго загадкавасць, таямнічасць. І ў выніку, я спадзяюся, у чарговы раз вы пранікнецеся пачуццём павагі, любові да нашай Беларусі і гонару за яе.

IV. Чытанне тэксту настаўнікам.

Возера Свіцязь

Я ішоў да возера, але разгубіўся: якою сцяжынкаю падацца?

– А тут усе вядуць на Свіцязь! – пачулася нечакана, глухавата, як з-пад зямлі. – Ступай якой хочаш!..

Праз хвіліну лесавік-праваднік зноў загаварыў пра сваё:

– Наша Свіцязь усім азерам возера. Уяві сабе ланцуг узвышшаў. А на адным з хрыбтоў таго ланцуга – круглае люстра вады. Ва ўпадзіне. Наўкола – лес. І дрэвы навіслі над гэтым люстрам. Вада чысцюткая. А дно белае. Толькі сям-там плёсы рэдкім чаротам засеяны. Уявіў? Ну, вось гэта будзе Свіцязь.

... Раптам бор расступіўся, і ля ног нечакана ўзнікла вада!..

– Свіцязь! – нібы робячы самае важнае ў жыцці адкрыццё, радасна ўсклікнуў лесавік.

Свіцязь ляжала перад намі адкрыта, даверліва і спакойна. У падвячоркавай цішыні ледзь чутна шамацелі блізкія чараты. Паволі гайдалася і само сябе закалыхвала возера. Надыходзіў вечар, і усё рыхтавалася да спачыну – і вада, і зямля: не трэсне сучок у бары, не ўсплёсне рыбіна ў возеры.

Лесавік нечакана ажывіўся.

– А калісьці, ой, даўным-даўно тое было. Тут, на гэтым месцы, горад казачнай прыгажосці стаяў. І светлае імя ён меў – Свіцязь-град. Самыя



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прыгожыя дзяўчаты былі свіцязянкі. Самыя смелыя воіны-віцязі былі таксама тут. Ды аднойчы навала страшная навалілася на гэты край – нашэсце ворагаў ішло чорнай хмараю. Усе воіны, як адзін, пайшлі з горада, каб спыніць гэтае нашэсце. Ды не змаглі. У бітве палеглі віцязі, а нашэсце ўсё паўзло і паўзло. І тады безабаронныя свіцязянкі звярнуліся да неба. “О неба! – сказалі яны. Нашы заступнікі-віцязі пaляглі ў бітве справядлівай. Цяпер нас няма каму бараніць. А мы не хочам, каб ворагі таптaлі нашу зямлю. Хай праваліцца яна пад нагамі іхнімі”. І злітавалася неба. І паслала страшэнную маланку. І раскалолася зямля. І паглынула горад. З усімі яго жыхарамі. На месцы гэтым потым возера зрабілася. А свіцязянкі ў русалак ператварыліся. Іншы раз іх бачаць.

Я не перабіваў лесавіка. Ад легенды веяла такой язычаскай вернасцю да роднай зямлі, што я ўвесь гэты час знаходзіўся ў нейкім казачным свеце.

На небе прарэзаліся зоркі, а левы край яго ўспыхнуў, нібы ад пажару. Той пажар разгараўся хутка, і неўзабаве з яго выплыла залацістая поўня і пакацілася па вершалінах дрэў. Ад поўні зрабілася залацістай і вада ў Свіцязі. Яна вясёлай дарожкай свяцілася ў наш бок. Возера паволі ўбірала ў сябе неба.

(Паводле Я. Пархуты)

V. <u>Аналіз тэксту для пераказу</u>.

– Які стыль тэксту?

– Па якіх прыметах вы яго вызначылі? Назавіце характэрныя для гэтага стылю мастацкія сродкі.

– Якая тэма гэтага невялікага твора?

– Якая асноўная думка тэксту?

– Ад чыйго імя вядзецца апавяданне? Але вы свой пераказ павінны зрабіць ад трэцяй асобы.

– Хто паведаў пісьменніку пра возера Свіцязь?

– Якую легенду расказаў лесавік?

– Ці адпавядала легенда пра возера таму настрою, які выклікаў выгляд Свіцязі, навакольнай прыроды?

VI. <u>Аналіз кампазіцыі тэксту, састаўленне плана, адбор рабочых матэрыялаў</u>.

– Колькі частак можна выдзяліць у тэксце?

– Вызначце асноўную думку кожнай часткі.

– Давайце паспрабуем скласці план гэтага тэксту

Прыкладны план

1. Апісанне возера лесавіком-правадніком.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Выгляд возера пад вечар.
3. Легенда пра Свіцязь.
4. Пачуцці аўтара, выкліканыя легендай.
5. Выгляд Свіцязі ўначы.

– Але ў нас пераказ сціслы. Ці можна некаторыя пункты плана аб'яднасць у адзін ці наогул апусціць?
– Давайце складзем план сціслага пераказу і запішам рабочыя матэрыялы:

| **План** | **Рабочыя матэрыялы** |
|---|---|
| 1. Апісанне возера лесавіком-праваднiком. | *Возера Свіцязь, ланцуг узвышшаў, круглае люстра вады, лес, чарот.* |
| 2. Выгляд возера пад вечар. | *Шамацелі чароты, падвячоркавая ціўшыня, гайдалася і само сябе закалыхвала, рыхтавалася да спачыну.* |
| 3. Легенда пра Свіцязь. | *Свіцязь-град, свіцязянкі, воіны-віцязі, страшная навала, нашэсце ворагаў, маланка, возера, русалкі.* |
| 4. Выгляд Свіцязі ўначы. | *Прарэзаліся зоркі, пажар, выплыла залацістая поўня, начное неба.* |

VII. <u>Арфаграфічная падрыхтоўка</u>.

1. Слоўнікавы тлумачальны дыктант.
*Калісьці, лесавік-праваднік, легенда, даўным-даўно, прыгажосць, нашэсце, воіны-віцязі, заступнікі-віцязі.*

2. Марфемны разбор.
*Расступіўся, падвячоркавай, безабаронныя.*

VIII. <u>Пунктуацыйная падрыхтоўка</u>.

1. Сказы з простай мовай перабудаваць у сказы з ускоснай мовай.
2. Растлумачыць пастаноўку знакоў прыпынку ў наступных сказах:
*1. Свіцязь ляжала перад намі адкрыта, даверліва і спакойна. 2. Той пажар разгараўся хутка, і неўзабаве з яго выплыла залацістая поўня і пакацілася па вершалінах дрэў.*

IX. <u>Пераказ тэксту ў адпаведнасці з планам і рабочымі матэрыяламі</u>.

X. <u>Напісанне пераказу на чарнавік.</u>

XI. Аналіз і рэдагаванне чарнавікоў.

XII. Напісанне пераказу на чыставік.

**14.** Акрэсліце месца выбарачнага пераказу ў сістэме працы па фарміраванні камунікатыўна-маўленчых уменняў і навыкаў. Раскажыце пра методыку правядзення выбарачнага пераказу.

**15***. Падрыхтуйце план-канспект урока навучальнага выбарачнага пераказу на аснове тэксту Алеся Пальчэўскага “Жывы барометр”.

Улічыце, што вучням неабходна пераказаць падтэму “Прырода – гэта найцікавейшая кніга” (прыметы дажджу), у выніку чаго павінен атрымацца тэкст-разважанне ў навукова-папулярным падстылі.

Жывы барометр

У Мішы цётка – настаўніца. Працуе ў сельскай школе біёлагам. На лета хлопчык паехаў гасцяваць да яе. Там ён хутка пасябраваў з такімі, як сам, вучнямі і цэлымі днямі каратаў час з імі то на рэчцы, то ў лесе.

– Цётка Паліна, мы сёння зноў пойдзем у лес, – сказаў Міша за снеданнем.

– Тады вазьмі з сабою плашчык.

– Плашчык? – здзівіўся Міша. – Навошта?

– Можа быць дождж.

Міша засмяяўся:

– Адкуль ён будзе? На небе ні хмурынкі.

– А ты паглядзі, што паказваюць наготкі, – паказала цётка на градку пад акном, дзе расло шмат кветак.

Хлапчук зірнуў і пацікнуў плячыма.

– Нічога не паказваюць.

– Як жа не паказваюць? Каторая пара ўжо, а яны не раскрылі пялёсткаў. Тыя раніцы аж зіхацелі ў гэты час, а сёння спяць.

– Я ні разу не бачыў, калі яны распускаюцца.

– Трэба, Міша, прыглядацца да таго, што вакол цябе. Прырода – найцікавейшая кніга. Запомні: перад дажджом белая лілея таксама аберагае свае суквецці ад дажджавых кропляў, хоць і расце сама ў вадзе. А ці бачыў ты калі, як “плача” клён?

– Не.

– Прыгледзься, гэта цікава. У тым месцы, дзе пачынаюцца чаранкі лісцяў, на дождж выступаюць слёзы. Хочаш ведаць чаму? Перад дажджом у паветры з’яўляецца шмат вільгаці, а клён сваю не можа выпарыць праз лісце, от і капае лішняя вада... Ты, мусіць, не ведаеш, што і акацыя перад

РЕПОЗІТОРЫЙ БГПУ

дажджом выдзяляе куды больш нектару, чым звычайна. Правер. Калі над кветкамі акацыі многа мошак, чакай дажджу.

Міша чуў гэта ўпершыню і не ведаў, верыць ці не, а цётка казала далей:

– І дым, бачыш, з коміна ў дзядзькі Ціта не слупам ідзе ўгору, а рассейваецца, таксама прыкмета на дождж. А ластаўкі, паглядзі, высока ці нізка лятаюць? – спытала цётка.

– Ды вунь, над самай зямлёю, – паказаў хлапчук.

– А ўчора дзеляталі?

– Высока ў небе.

– Значыць, мошкі ціснуцца да зямлі перад дажджом, і птушкі зніжаюцца, каб лавіць іх.

Міша аж пляснуў рукамі:

– Ой, як цікава! Без барометра можна сказаць, якое надвор’е будзе. Адкуль вы, цётачка, уведалі пра гэта?

– Што з кніжак, а што і са сваіх назіранняў...

Хоць Мішу і не верылася, што будзе дождж, а дождж сапраўды прайшоў пасля абеду. Невялікі, але прайшоў.

**16.** Ацаніце змест і моўнае афармленне выбарачнага пераказу, які зрабіў вучань восьмага класа па тэксце А. Пальчэўскага “Жывы барометр”.

Прырода – гэта найцікавейшая кніга. Калі ўважліва прыглядацца да таго, што знаходзіцца вакол, можна заўважыць шмат цікавага.

Напрыклад, калі наготкі раніцай не раскрылі пялёсткаў, пасля абеду трэба чакаць дажджу. Перад дажджом белая лілея таксама аберагае свое суквецці ад яго кропель, хоць і расце сама ў вадзе. Клен на дождж “плача”, з яго ў тым месцы, дзе пачынаюцца чаранкі лісцяў, выступаюць кроплі. Гэта адбываецца таму, што перад дажджом у паветры з’яўляецца шмат вільгаці, і клён не можа выпарыць сваю вільгаць праз лісце. Чакаць дажджу можна і тады, калі над кветкамі акацыі многа мошак, таму што акацыя перад дажджом выдзяляе куды больш нектару, чым звычайна.

На набліжэнне дажджу рэагуюць не толькі расліны. Перад дажджом і ластаўкі лятаюць нізка, таму што мошкі ціснуцца да зямлі, а ластаўкам трэба іх злавіць. Калі дым з коміна не ідзе слупам угору, а рассейваецца, гэта таксама прыкмета дажджу.

Такім чынам, нават без барометра можна сказаць, якое будзе надвор’е.

**17.** Прачытайце і прааналізуйце памятку для вучняў "Як самастойна працаваць над сціслым пераказам".

1. Прачытайце тэкст, вызначце яго тэму і галоўную думку.
2. Прадумайце, каму будзе адрасаваны сціслы пераказ, якая яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

задача.

3. Выдзеліце ў тэксце ўсе часткі.

4. Вызначце, якія часткі можна аб'яднаць, якія — апусціць. Чаму?

5. Складзіце план сціслага пераказу.

6. У кожнай частцы тэксту адзначце галоўнае.

7. Адзначце тое, што можна аб'яднаць.

8. Падбярыце словы, словазлучэнні і сказы для абагульненай перадачы зместу.

9. Сцісла перакажыце кожную частку.

10. Прадумайце, як звязаць часткі паміж сабой.

11. Перачытайце напісаны пераказ. Ці ўсё ў ім будзе зразумела таму, каму ён адрасаваны?

Складзіце памятку "Як самастойна працаваць над выбарачным пераказам". У памятцы падрабязна пералічыце ўсё, што павінен зрабіць вучань, каб падрыхтаваць выбарачны пераказ тэксту.

**18.** Якія вывады вы зробіце для сваёй будучай настаўніцкай дзейнасці, улічваючы, што "асноўныя недахопы ў методыцы правядзення пераказаў на ўроках мовы заключаюцца найперш у тым, што гэта праца часта не мае мэтанакіраванага, паступальнага характару, назіраецца пэўны разрыў паміж навучаннем пераказам у пачатковай школе і працай над пераказам у 4—6-х і 7—8-х класах; не рэалізуюцца міжпрадметныя сувязі ў методыцы пераказу; пры правядзенні пераказаў не заўсёды дастаткова выразна акрэсліваюцца задачы працы; не ўлічваецца спецыфіка відаў пераказаў, іх месца ў агульнай сістэме навучанне мове, іх узаемасувязь з іншымі формамі працы па развіцці маўлення"? (І. Д. Марозава).

**19.** Традыцыйна вусны пераказ шырока выкарыстоўваецца ў школьнай практыцы як прыём падрыхтоўкі да пісьмовага ўзнаўлення тэксту. Аднак многія даследчыкі лічаць, што вусны пераказ аддаляе вучня ад узору, бо "паміж пісьменнікам-майстрам, чый тэкст быў прыняты за ўзор, і вучнямі, якія падрыхтаваліся пісаць пераказ паводле гэтага тэксту, узнікае рамесніцкая падробка ў выглядзе вучнёўскага пераказу" (Н. А. Плёнкін).

Якая ваша думка адносна значэння і неабходнасці выкарыстання вуснага пераказу ў працэсе падрыхтоўкі да розных відаў пісьмовых пераказаў?

**20.** Улічваючы меркаванне І. Д. Марозавай, што ўрок аналізу пераказу павінен вырашаць тры асноўныя задачы (развіваць адчуванне мовы вучнем; выхоўваць увагу да зместу і моўнага афармлення тэксту; фарміраваць уменне ўдасканальваць напісанае, г. зн. паляпшаць свой

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тэкст; рыхтаваць да больш паспяховага выканання наступных пераказаў), паразважайце над тым, якое месца на гэтым уроку павінна заняць праца па выпраўленні арфаграфічных і пунктуацыйных памылак.

**21.** Ці згодны вы з думкай пра тое, што, ацэньваючы вынікі напісання школьнікамі пераказу, настаўнік ацэньвае і сваю дзейнасць па падрыхтоўцы вучняў да гэтага віду творчай працы?

## Методыка навучання сачыненням

**1.** Якое значэнне маюць сачыненні ў сістэме работы па развіцці звязнага маўлення вучняў? Пры адказе, калі неабходна, выкарыстайце наступнае меркаванне А. В. Цекучова: “Сачыненні сярод іншых відаў працы займаюць выключна важнае месца. У іх з найбольшай сілай і выразнасцю адлюстроўваецца ўнутраны свет вучня, па сачыненнях можна прасачыць развіццё школьніка, фарміраванне яго светапогляду, адносін да жыцця. Сачыненне дае магчымасць меркаваць пра веданне школьнікамі фактычнага матэрыялу, пра ўменне карыстацца моўнымі сродкамі пры афармленні думак. З дапамогай сачыненняў адбываецца асэнсаванне вывучанага, удасканальваюцца стыль, выразнасць і кампазіцыя звязных выказванняў”.

**2.** Як вядома, школьныя сачыненні адрозніваюцца вялікай разнастайнасцю. У залежнасці ад чаго і як яны класіфікуюцца?

**3*.** На аснове патрабаванняў школьнай праграмы па мове прадоўжыце пералік уменняў і навыкаў, якімі павінны авалодаць вучні ў працэсе напісання сачыненняў:

— разумець тэму, асэнсоўваць яе межы і паслядоўнасць раскрыцця;
— вызначаць галоўную думку выказвання;
— збіраць і сістэматызаваць матэрыял;
— будаваць выказванне ў пэўнай кампазіцыйнай форме...

**4.** Прачытайце наступныя выказванні адносна выкарыстання ці невыкарыстання ўзору на этапе падрыхтоўкі вучняў да сачыненняў. Акрэсліце сваю — метадычна абгрунтаваную — пазіцыю ў гэтым пытанні.

*Настаўнік павінен "назваць некаторыя крыніцы, каб узбагаціць змест сачынення або даць узор для пераймання"* (Ф. І. Буслаеў).

*"Пэўная пераймальнасць, залежнасць сачыненняў вучня ўпадабанага паэтычнага твора, сапраўды, не павінна палохаць выкладчыка... Наадварот, чуйнасць у выбары "ўзора", сама схільнасць юнага аўтара*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*можа гаварыць пра наяўнасць умоў, неабходных або, ва ўсякім выпадку, карысных для творчасці"* (К. Б. Бархін).

*Узор – "той раздражняльнік, які дасць патрэбную рэакцыю, рэакцыю эмацыянальную і арганічную, заўсёды багатую і складаную па сваёй паэтычнай прыродзе"* (М. А. Рыбнікава).

*"Перайманнем можна навучыць рамяству, але не мастацтву"* (І. І. Траяноўскі);

*"Толькі дзіцячыя сачыненні трэба прапаноўваць як узор, бо дзіцячыя сачыненні заўсёды больш справядлівыя, прыгожыя і маральныя, чым сачыненні дарослых"* (Л. М. Талстой);

*"Наўрад ці можна пярэчыць супраць вывучэння класікаў пры азнаямленні з формамі сачынення, але яны даюць узоры такой недасягальнай прыгажосці і зладжанасці, што пачынаць працу з пераймання іх — значыць найперш падарваць веру дзяцей у свае сілы, паслабляць дух іх самастойнасці"* (?. М. Сакалоў).

**5.** Як вы разумееце наступнае выказванне В. А. Нікольскага: "Школьнае сачыненне ёсць працэс і вынік працы над тэмай, прапанаванай выкладчыкам, вучня і самога выкладчыка".

**6.** Ці аднолькавыя па сваёй складанасці для вучняў 5-га класа наступныя тэмы сачыненняў: "Мой распарадак дня", "Адзін з самых цікавых (памятных) дзён", "Рабочы дзень майго бацькі (маці, брата, сястры)", "Як праводзіць выхадны дзень наша сям'я". Чаму?

**7.** У методыцы існуюць розныя меркаванні адносна мэтазгоднасці або немэтазгоднасці падзелу школьных сачыненняў на апавяданне, апісанне, разважанне, напрыклад:

а) гэты падзел "памылковы не таму, што яны ідуць не ў той паслядоўнасці, якая адпавядае ўзроставаму развіццю чалавека, а таму, што няма такога ўзросту, які спецыяльна быў бы схільны або расказваць, або апісваць, або разважаць (А. Д. Алфераў);

б) "карысна як для старэйшага, так і для малодшага ўзросту не размяжоўваць строга элементаў апісання і апавядання, а па магчымасці прывучыць вучняў адначасова і да апісання, і да апавядання" (М. С. Дзяржавін);

в) "каб навучыць школьнікаў пісаць сачыненне, трэба мець на ўвазе яго форму, таму што ў любой літаратурнай працы, калі форма не даведзена да пэўнага "майстэрства", то твора, як такога, не існуе пры самым выдатным змесце" (А. І. Багамолава).

Чаму, нягледзячы на розны падыход да гэтага пытання, сучасная школьная праграма па мове вучыць дзяцей уменню пісаць апавяданне, апісанне, разважанне?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**8.** Як вы думаеце, чаму для вучняў 6-га класа будзе цяжкай тэма "У чым я бачу сэнс жыцця"?

**9.** Прааналізуйце тэмы сачыненняў, якія прапануе праграма па беларускай мове, з пазіцыі наступнай думкі: "Нельга не прызнаць, што нярэдка мы патрабуем ад вучняў таго, чаму іх яшчэ не навучылі, і тым самым міжволі падштурхоўваем школьнікаў да пошукаў розных несумленных абходных шляхоў. Між тым першым асноўным крытэрыем пры выбары тэмы (апрача яе ідэйна-выхаваўчай значнасці) павінна з'яўляцца, безумоўна, яе адпаведнасць сілам і магчымасцям вучняў, набытым імі раней навыкам" (А. А. Озерава).

**10.** Ацаніце метадычную вартасць наступных заданняў:

а) вызначце розніцу паміж тэмамі "Якой я ўбачыў (-ла) восень учора на экскурсіі" і "Наш школьны сад восенню";

б) падумайце, ці адпавядае сачыненне тэме.

Якая мэта падобных заданняў?

**11.** Як вы думаеце, з якой мэтай настаўнік на ўрок падрыхтоўкі да сачынення "Як я правёў выхадны дзень" выпісаў наступныя ўрыўкі з вучнёўскіх прац:

а) "Потым я пайшоў у кіно. Пасля кіно я вучыў урокі. Пасля ўрокаў стаў чытаць кнігу. Потым я стаў глядзець перадачу па тэлевізары. Пасля я стаў глядзець канцэрт";

б) "Калі мы прыйшлі дадому, я села рабіць урокі. Калі я зрабіла ўрокі, то я стала памагаць маме на кухні. Потым я глядзела тэлевізар. Калі закончылася перадача, я пайшла гуляць з сяброўкай. Калі мама мяне паклікала, я пайшла дадому...".

**12.** Наколькі метадычна ўдалымі бачацца вам наступныя заданні настаўніка І. Ф. Ганчарова па збіранні матэрыялаў для сачынення "Вясновы вечар" (8 клас):

1) за 10 хвілін да заходу сонца паназірайце яго розныя адценні каля гарызонта і ў верхняй частцы;

2) паназірайце за з'яўленнем першых зорак, звярніце ўвагу на іх яркасць;

3) звярніце ўвагу на зоркі ў той частцы неба, дзе ўсходзіць месяц;

4) вызначце, дзе болей зорак: каля гарызонта ці ў зеніце;

5) устанавіце, якую форму маюць зоркі;

6) правядзіце назіранні і скажыце, што робіцца з няяркай зоркай, калі вы ўглядаецеся ў яе?

Прапануйце свой план назіранняў пры падрыхтоўцы да гэтага

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

сачынення.

**13.** Настаўнік аб'явіў агульную тэму сачынення "Асеннія замалёўкі". Ці правільна вучнямі былі абраныя наступныя тэмы: "Лістапад", "Кляновы ліст", "Асенняя бярозка”, "Перад домам", "У парку", "Рабіна ўвосень", "Асенняе неба"?

Якая розніца паміж такімі сачыненнямі і сачыненнямі на так званыя "сезонныя" тэмы тыпу "Зіма наступіла", "Восень прыйшла", "Як я правёў (правяла) летнія канікулы" і г. д.?

**14.** Паразважайце на аснове прачытанай метадычнай літаратуры над пытаннем, у якіх выпадках вучні павінны складаць план да сачыненняў.

Часам выказваюцца думкі, што план наогул не патрэбны, паколькі ён скоўвае свабоду вучняў, іх самастойнасць. Кіруючыся гэтым, некаторыя настаўнікі не патрабуюць ад школьнікаў плана да сачынення. Іншыя настаўнікі лічаць, што план дапамагае развіваць думку, што складанне плана — гэта актыўная падрыхтоўка да сачынення, і патрабуюць, каб план быў у любой пісьмовай працы, нават зніжаюць адзнаку, калі ён адсутнічае або складзены няўдала. Хто ж мае рацыю?

**15.** Прааналізуйце наступныя вучнёўскія планы да сачыненняў. Як вы будзеце весці ў класе працу над удасканаленнем планаў?

**На заводзе**

1. Агульнае ўражанне ад завода.
2. Цяжкасці пры афармленні пропуска.
3. Уражанне ад цэха.
4. Апісанне яго.
5. Што мы даведаліся пра вытворчасць:
   а) што вырабляюць;
   б) як выконваюць план;
   в) хто наперадзе.
6. Што карыснага робіць завод для краіны.
7. Ці хацеў бы я працаваць на заводзе?
8. Чым мне спадабалася экскурсія.

**Веснавая навальніца**

1. Перад навальніцай.
2. Навальніца.
3. Пасля навальніцы.

**Наша школа**

1. Калідор.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Бібліятэка.
3. Буфет.
4. Настаўніцкая.
5. Афармленне.
6. Мая думка.

**16.** У сачыненні-апавяданні пяцікласнікі пераважна выкарысталі дзеясловы *сказаць, расказаць, спытаць, адказаць*. Ці можна падобныя недахопы растлумачыць толькі невялікім слоўнікавым запасам вучняў?

**17.** Прааналізуйце, наколькі мэтазгодна прапанавана дамашняе заданне на ўроку вывучэння новага матэрыялу (тэма "Назыўныя сказы").

Мэты ўрока:

1) даць паняцце аб назыўных сказах, іх месцы ў тэксце, аб асаблівасцях, сферы ўжывання;

2) выпрацоўваць навык выкарыстання назыўных сказаў у маўленні;

3) выхоўваць пачуццё нянавісці да вайны, пачуццё адказнасці за сваё жыццё перад загінуўшымі.

Дамашняе заданне: Напісаць сачыненне-мініяцюру "Гэта не забываецца" (з выкарыстаннем аднасастаўных сказаў)".

**18.** Узнавіце ход урока, на якім настаўніца пасля тэмы "Прыметнік. Паўтарэнне вывучанага ў 6-м класе" прапанавала сачыненне пад назвай "Мае любімыя кветкі" з мэтай паказаць ролю прыметнікаў у маўленні, у мастацкім тэксце.

Настаўніца падабрала да гэтага ўрока наступныя тэксты:

1. У кожнага народа — свае любімыя кветкі. У грэкаў і рымлян — ляўконіі, у егіпцян — вадзяныя лілеі, у французаў — чырвоныя гваздзікі, у беларусаў "цвяток радзімы" – васілёк. Любімай кветкай у Японіі з'яўляецца хрызантэма, а кветка, якой аддаюць перавагу, – лотас. У іх гонар праводзяцца народныя святы, гулянні. На гербе і дзяржаўнай пячатцы Японіі –шаснаццаціпялёсткавая хрызантэма. Ордэн хрызантэмы — найвышэйшая ўзнагарода ў краіне.

2. Мяне разбудзіў шоргат. Ліст, стары шэры ліст варухнуўся, прыўзняўся, і з-пад яго выглянуў зялёны парастак. Выглянуў, выпрастаўся і пацягнуўся ўверх. І тут я заўважыў, што малюсенькія парасткі расхінаюць старое лісце, прыўзнімаюць чорныя галоўкі і рыхтуюцца сустрэць свой першы сонечны прамень. А гэта што? Вялікая блакітная кветка! Не было – і раптам нарадзілася на голай халоднай зямлі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

без адзінага лісціка, на маленькай пушыстай ружовай сцяблінцы... Такая пяшчотная, кволая, безабаронная!

Якая мэта такога падбору? У якім рэчышчы павінен ісці аналіз узораў, каб дасягнуць мэты ўрока?

**19.** Якім, на вашу думку, павінен быць характар метадычных распрацовак, адрасаваных настаўніку? Ацаніце метадычную каштоўнасць наступных парад па развіцці звязнага маўлення вучняў:

"Заданні на развіццё ўласнай моўнай творчасці вучняў цесна звязаны з вывучаемым матэрыялам. Напрыклад, пры вывучэнні азначэння даецца заданне скласці тэкст па малюнку, перадаць з дапамогай азначэнняў характэрныя прыметы прадметаў. Гэта сачыненне-апісанне патрабуе пэўнай падрыхтоўчай работы. Пачаць працу можна ў класе, а закончыць дома...

Прасцейшымі відамі сачыненняў з'яўляюцца сачыненні па ўзоры. Для таго каб напісаць, напрыклад, сачыненне на тэму "Апошні дзень восені", спачатку трэба выканаць практыкаванне, тэкст якога ў пэўнай меры з'яўляецца ўзорам для стварэння ўласнага звязнага выказвання.

...Пры напісанні пісьма таксама выкарыстоўваецца ўзор тэксту. Але вучні могуць узяць і іншую форму (традыцыйную або больш свабодную). Гэта іх права, бо толькі пры напісанні афіцыйна-дзелавых пісем трэба прытрымлівацца прынятых стандартаў".

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

* Перагледзьце метадычныя матэрыялы часопіса "Роднае слова" за апошні год па развіцці звязнага маўлення вучняў. Якія публікацыі, на вашу думку, акажуць найбольш эфектыўную дапамогу настаўніку ў падрыхтоўцы да ўрокаў?

**20.** Прачытайце наступны ўрывак з кнігі Ю. І. Карынца "Там, удалечыні за ракой" (раздзел "Сачыненне на вольную тэму"). Ці можна (а калі можна, то як) скарыстаць гэты матэрыял на ўроку, прысвечаным асноўным патрабаванням да сачынення?

...Дома я адразу сеў за стол і стаў пісаць сачыненне. Я напісаў:

Сачыненне
на вольную тэму.

Потым я напісаў:

МОЙ ДЗЯДЗЯ

І задумаўся. Я не ведаў, як пачаць...

Я хацеў напісаць пра дзядзю як мага лепей. Я хацеў напісаць пра тое, як мой дзядзя быў радавым на флоце. І як ён трапіў у палон. І як ён уцёк з

палону. І пайшоў добраахвотнікам у Чырвоную Армію. Як ён прымерваў шынялі, і ўсе яны былі яму не па росту, таму што мой дзядзя быў маленькага росту. І як ён потым адрэзаў шынель і пайшоў на фронт. І спыніў немцаў пад Нарвай. Гэта было ў дзень нараджэння Чырвонай Арміі. Усё гэта расказваў мне сам дзядзя.

І як ён быў паранены. Мой дзядзя быў ранены некалькі разоў. Да гэтай пары ён насіў у сваім целе асколкі. Пра ўсё гэта я хацеў напісаць як мага лепш. І раптам зайшоў дзядзя...

– Што гэта ты тут пішаш? — спытаў ён.

– Сачыненне!

– Пра што, калі не сакрэт?

– Пра цябе!

– Пра мяне? – здзівіўся дзядзя. – Чаму?.. Гэтага яшчэ не хапала! Перастань зараз жа!

– Чаму?

– Таму што гэта нясціпла! Я не Юлій Цэзар! І не Аляксандр Македонскі!.. Пішы пра што-небудзь іншае!.. Толькі не пра мяне!

– А пра што?

– Пісаць можна пра ўсё!.. Напрыклад, вось пра гэты кубак!

– Як – пра кубак?

– Вельмі проста!.. Пісаў жа Пушкін пра чарніліцу! І цудоўна напісаў! Канечне, трэба мець талент. Калі ты бяздарны, лепей не пішы! Чытай, што напісалі іншыя!

– Але нам задалі!

– Тады пішы пра кубак!.. Або вось пра гэтую герань!

– Я не ведаю, што пісаць пра герань! – сказаў я тужліва... Дзядзя стаў за маёй спіной.

Я ўзяў ручку.

– Пішы: "Герань". Што можна сказаць пра гэтую герань?

Я напісаў: "Што можна сказаць пра гэтую герань?"

– Гэта не пішы! — сказаў дзядзя. — Гэта я проста ўголас думаю. Трэба спачатку падумаць, перш чым пісаць!”

. . .

ГЕРАНЬ

Сачыненне на вольную тэму

У нас на акне герань. Яна цвіце ружовымі кветачкамі. Мы з дзядзем купілі яе на рынку, каб апраўдаць. Таму што яна ні ў чым не вінавата. Вінаватыя мяшчане. Яны вельмі кепскія людзі. Яны зрабілі герань сваім сімвалам, бо думаюць толькі пра сябе. А трэба думаць пра народ. І вуж таксама не вінаваты. Таму што "той, хто народжаны поўзаць, лятаць не можа". Гэта сказаў Максім Горкі. Я даўно палімаю сваю герань кожны дзень. Яна вельмі прыгожая. А хутка дзядзя купіць мне вужа. І я буду яго даглядаць. Канец.

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

За гэтае сачыненне я атрымаў "два". Настаўніца сказала, што маё сачыненне — звычайная бязглуздзіца.

Я вельмі перажываў з-за гэтай адзнакі. І дзядзя таксама...

**21.** Прачытайце фрагмент урока на тэму «Падрыхтоўка да сачынення "Мой любімы куток прыроды"». У якой ступені задавальняе вас аналіз сачынення?

– ...А зараз я прачытаю вам сачыненне аднаго з вучняў, потым мы пагаворым пра яго.

МАЕ СЯБРЫ

У кожнага чалавека ёсць свае блізкія людзі. Гэта нашы родныя і сябры. У мяне таксама ёсць сябры. Але яны не зусім звычайныя — гэта маленькія таполі ў парку насупраць майго дома. Парк гэты стары і вельмі вялікі. У ім жывуць сапраўдныя волаты — дубы, зяленыя лістоўніцы, стройныя і пяшчотныя бярозкі.

Я люблю праводзіць свой вольны час тут, у гэтым дзіўным кутку прыроды. І найчасцей я бываю там, дзе весела гамоняць між сабой маладзенькія таполі. Яны з'явіліся тут зусім нядаўна і яшчэ не прывыклі да сваіх магутных суседзяў. Мы амаль равеснікі, можа быць, таму мы і сталі сябрамі. Мне здаецца, што ім больш, чым старым дрэвам, патрэбныя чалавечыя ласка і клопат. У дажджлівае і халоднае надвор'е яны здаюцца мне кволымі і безабароннымі. Напэўна, таму я больш за ўсё люблю вясну і лета, калі цёпла і весела становіцца маім сябрам і мне. Асабліва прыгожыя таполі сонечнай вясновай раніцай. Яркія зялёныя лісточкі весела шапацяць на ветры — расказваюць пра дабрыню і прыгажосць сонца. Відаць, таму што я патрэбны гэтым маладым далікатным дрэўцам, я палюбіў іх і стаў іх сябрам.

– Ці спадабалася вам гэта сачыненне? Калі спадабалася, то чым?

(Сачыненне цікава напісана. Відаць, што аўтару вельмі блізкія таполі — яны ж яго сябры.)

– А ці звярнулі вы ўвагу на кампазіцыю апавядання? Як яно пабудавана?

(У апавяданні ёсць уступ, у якім гаворыцца пра тое, што аўтару вельмі блізкія таполі. Потым ідзе развіццё гэтай думкі – апісанне таполяў).

– Я з вамі згодная, гэтае сачыненне мне таксама падабаецца. Каб наша будучае сачыненне было больш мэтанакіраванае, выразнае, мы пашукаем да яго эпіграф...

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Прадумайце, у якой паслядоўнасці і як вы аналізавалі б гэтае сачыненне, каб аналіз максімальна працаваў на развіццё мыслення, творчасці вучняў.

**22.** Настаўніца на ўроку падрыхтоўкі да сачынення прачытала фельетон-пародыю М. Разоўскага "Школьнае сачыненне". Прадумайце методыку падачы такога матэрыялу, слова настаўніка перад і пасля чытання пародыі. У якім класе можа быць выкарыстаны гэты матэрыял?

Быў звычайны ўрок. Вучні павінны былі пісаць сачыненне на тэму "Вобраз Бабы-Ягі – героя мінулага часу".

Настаўнік прадыктаваў план. Пункт за пунктам. Адзін за другім. Усё, як звычайна.

План.

I. Уступ. Гістарычныя абставіны таго яшчэ часу.

II. Галоўная частка. Паказ Бабы-Ягі – яркага прадстаўніка цёмных сіл.

Рысы Бабы-Ягі:

1. Станоўчыя:

а) смеласць;

б) сувязь з народам;

в) вера ў будучае.

2. Адмоўныя:

а) баязлівасць;

б) эгаізм;

в) песімізм;

г) касцяная нага.

III. Заключэнне. Бабізм-ягізм у нашы дні.

Такім чынам, настаўнік даў план, і цяпер вучні па плану пачалі пісаць сачыненне. І напісалі. Трэба сказаць, што гэта было звычайнае сачыненне.

"...Выдатны твор – казка пра Бабу-Ягу – з'яўляецца выдатным узорам нашай выдатнай літаратуры.

Цяжкае становішча сялянства ў змрочную, беспрасветную эпоху, якая характарызавалася бязлітасным, страшным, змрочным, беспрасветным прыгнётам, было нясцерпнае, беспрасветнае, змрочнае, страшнае і бязлітаснае.

І ў гэты час асабліва звонка прагучаў светлы голас невядомага аўтара казкі пра Бабу-Ягу, якая назаўсёды ўвайшла ў скарбніцу літаратуры...

У вобразе Бабы-Ягі – тыповай прадстаўніцы кансерватыўнага старэйшага пакалення – увасоблены лепшыя рысы адмоўнага героя ў пачатку першай палавіны канца ...наццатага стагоддзя. Бабе-Язе супрацьпастаўляецца светлы вобраз Іванушкі-дурачка, у якім зроблена яркая спроба паказу новага, маладога ў барацьбе са старым, аджылым,

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

састарэлым. Не, Іванушка-дурачок — гэта не Анегін. Ён не лішні чалавек! Ён любіць працу і родную зямлю. Калі добра прыгледзецца, ён зусім не дурачок, а разумнік...

У галерэі жаночых вобразаў Баба-Яга займае асаблівае месца...

Мова Бабы-Ягі простая, чыстая, магутная, не шурпатая.

У наш час бабізм-ягізм адыгрывае вялікае значэнне і мае вялікую ролю. Іванушка-дурачок ператварыўся ў сімвал, а Баба-Яга незваротна адышла ў далёкае мінулае..."

**23.** Прачытайце наступныя выказванні адносна ацэнкі агульнага ўзроўню школьных сачыненняў. У чым вы бачыце прычыну палярнасці гэтых думак?

*"Школьныя сачыненні ў сваёй большасці ўяўляюць досыць сумную карціну. Такое ўражанне, быццам школьнікаў, якія жывуць у розных канцах рэспублікі, неяк сабралі разам і яны пісалі пад кіраўніцтвам аднаго настаўніка. Справа нават не ў тым, што ў аснове работ, дзе раскрываюцца нейкія "тэма" ці "вобраз", ляжыць агульны (па сутнасці адзіны) план-схема. Ад гэтага, пэўна, нікуды не дзенешся, бо існуюць міністэрская праграма і падручнік. Але на дзіва мала самастойнасці і ў сачыненнях на так званую вольную тэму. Відаць, яна запраграмавана і запланавана гэтак жа, як усе іншыя... Работы, як правіла, агульныя, амаль з поўнай адсутнасцю таго, што называюць аўтарскай індывідуальнасцю, адметнасцю"* (Т. К. Грамадчанка).

*"Шмат гадоў назад я вырашыў завесці спецыяльны альбом, куды запісваў лепшыя сачыненні сваіх вучняў. Альбом запаўняўся хутка. Так з часам у кабінеце сабралася некалькі дзесяткаў тамоў вучнёўскіх сачыненняў — з аналізам, цікавымі апісаннямі, назіраннямі, споведдзю, крыкам душы. І тады неяк нечакана для самога сябе я ўбачыў, што сачыненне — гэта не толькі адзін з відаў творчых работ, гэта шлях да чалавека, яго думак, меркаванняў, душы. Словам, сродак развіцця творчых здольнасцей вучня і фарміравання яго як асобы"* (В. М. Туркевіч).

**24*.** Пазнаёмцеся з вопытам працы над сачыненнем настаўніка В. М. Туркевіча (*Туркевіч В. М.* Творчасці зярняты залатыя... – Мн., 1988). У чым вы бачыце сакрэт поспеху Васіля Макаравіча?

Ці змаглі б вы у сваёй школьнай практыцы скарыстаць наступны прыклад з дзейнасці педагога? Ці вы лічыце, што такія метадычныя прыёмы "падрываюць" аўтарытэт настаўніка?

Калі даю творчую работу і кансультую, як над ёй працаваць, вучні, бывае, даволі настойліва просяць:

— Васіль Макаравіч, а вось калі б вам трэба было пісаць сачыненне,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

якую з прапанаваных тэм вы ўзялі б? Успомніце свой школьны час, далучайцеся да нас!

І я іншы раз пішу такое сачыненне, чытаю яго вучням пасля таго, як іх работы прааналізуем у класе. Бывае, што знарок дапускаю стылістычныя ці нават сэнсавыя недакладнасці, каб праверыць іх назіральнасць. Карысць ад такой работы вучням будзе. А баяцца, што гэта падрыў аўтарытэту (як гэта настаўнік апускаецца да ўзроўню вучня?), не трэба.

**25.** Прааналізуйце план-канспект урока падрыхтоўкі на напісання водгуку на літаратурны твор (8 клас).

**Тэма.** Пісьмовы водгук на верш Р. Барадуліна “Мая Бацькаўшчына”.

**Мэты**:

1) актуалізаваць веды школьнікаў пра напісанне водгуку на літаратурны твор;

2) удасканальваць уменні і навыкі вучняў працаваць над зместам, кампазіцыяй і мовай водгуку, складаць рабочыя матэрыялы пры падрыхтоўцы да яго напісання; аналізаваць лірычны твор, улічваючы спецыфіку жанру і асаблівасці творчасці Р. Барадуліна;

3) развіваць навыкі звязнага і правільнага маўлення школьнікаў;

4) выхоўваць пачуццё патрыятызму, нацыянальнай годнасці, любоў да вобразнага слова.

**Тып урока**. Урок развіцця звязнага маўлення.

**Абсталяванне**: надрукаваныя тэксты-ўзоры; тэксты верша Р. Барадуліна “Мая Бацькаўшчына”.

**Выкарыстаная літаратура:**

1. Методические указания к факультативному курсу «Теория и практика сочинений разных жанров» (8 – 9 классы): Пособие для учителя / Сост. Т. А. Ладыженская, Т. С. Зепалова. – М., 1990.

2. *Пичугов Ю. С.* Обучение сочинениям на свободную тему в 7 – 8 классах. – М., 1986.

3. *Рагаўцоў В*. Нататкі з Рэспубліканскай алімпіяды: Пісьмовы конкурс: водгук // Роднае слова. – 1995, № 1. – С. 32 – 39.

4. *Скарына Г.* Як напісаць водгук? // Роднае слова. – 1992, № 6. – С. 19.

5. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. Т. 4. – Мн., 1987.

**Ход урока**

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

I. Арганізацыйны момант.

II. Паведамленне тэмы, мэты і задач урока.

На сённяшнім уроку мы павінны падрыхтавацца да напісання водгуку на верш Рыгора Барадуліна “Мая Бацькаўшчына”. Сам водгук вам патрэбна будзе напісаць дома. Таму мы ўспомнім неабходныя звесткі пра водгук і рэцэнзію як жанры сачынення, разгледзім тэкст-ўзор, падрыхтуем матэрыялы для напісання водгуку.

III. Актуалізацыя ведаў пра водгук і рэцэнзію.

1. Франтальнае апытванне.

– Што вы ведаеце пра такія жанры, як водгук і рэцэнзія? Што ў іх блізкае і чым яны адрозніваюцца?

– Якая кампазіцыя водгуку?

– Якім павінен быць змест водгуку?

–А цяпер у аналагічным парадку ўспомніце тое, што вы ведаеце пра рэцэнзію.

2. Паведамленне настаўніка.

Так, сапраўды, водгук і рэцэнзія – вельмі блізкія жанры, маюць шмат агульных ці падобных рысаў, але ўсё ж гэта не ідэнтычныя паняцці, таму важна ўмець размяжоўваць іх, каб не дапусціць памылак у сваіх працах.

У рэцэнзіі даецца крытычны аналіз і ацэнка літаратурнага твора з пункту погляду вартасцей і недахопаў яго зместу, формы і моўнага афармлення. Яна уключае бібліяграфічнае апісанне кнігі, некаторыя звесткі пра яе змест, кола закранутых праблем, выкарыстаны матэрыял, кампазіцыю і інш. Рэцэнзія дае аб’ектыўную ацэнку твора (у гэтым яе асаблівасць як жанру) – сутнасць вобразаў, стылю, мовы, паказвае яго месца сярод іншых твораў аналагічнага жанру або тэмы, ролю ў творчасці аўтара, у літаратурным працэсе.

Але сёння нас цікавіць менавіта водгук. Чым жа водгук адрозніваецца ад рэцэнзіі і чым падобны на яе?

У водгуку на літаратурны твор аўтар дзеліцца ўласнымі ўражаннямі пра яго, выяўляе свае адносіны да ўчынкаў герояў, адлюстраваных падзей, свае меркаванні пра тое, як ставіцца да герояў аўтар твора. Але разам з тым у водгук уключаюцца элементы аналізу мастацкага твора: вызначаецца жанр твора, яго тэма, сюжэт, раскрываецца характар героя, вызначаецца роля мастацкіх сродкаў, роля элементаў кампазіцыі ў выражэнні аўтарскай пазіцыі. Хаця мэта ўсебаковай характарыстыкі зместу і мастацкай вартасці твора пры гэтым не ставіцца.

Водгук звычайна пішацца ад першай асобы. Назвай можа стаць ужо

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

само слова “водгук”, але можа быць і іншы загаловак.

Водгук пішацца па схеме разважання: уступ – доказ – заключэнне (вывады). Уступ – частка, якая несе думку, што будзе развівацца; доказ – частка, якая змяшчае аргументы, абгрунтаванне выказаных думак і меркаванняў; заключэнне – частка, якая падкрэслівае створанае раней уражанне ад твора, яго ацэнку, змяшчае вывады.

У разважанні можа тлумачыцца ці даказвацца як адна думка, так і некалькі.

Пераказ зместу твора ў водгуку можна выкарыстоўваць, аднак ён павінен быць невялікім і матываваным.

IV. Чытанне ўзору водгуку на верш.

Паслухайце, калі ласка, водгук на верш Пімена Панчанкі «Не люблю я слова “пакарыцель”» Веранікі Сурмач.

Усё чалавечае жыццё з яго прыгажосцю і недахопамі не застанецца без увагі Пімена Панчанкі. Верш «Не люблю я слова “пакарыцель”» таксама поўны філасофскай развагі над сучасным жыццём, якое поўнае несправядлівасці, і над будучым, невядомым і зманлівым.

У нас час нярэдка можна пачуць словы “ўладар”, “пакарыцель”, і аўтар пратэстуе супраць гэтага. “Зямля зялёная ... для жыцця” павінна належаць усім. Ёсць уладар – ёсць і пакораныя, а гэта

... пахне трохі рабствам,
Карай, і рабункам, і крывёй.

Верш Пімена Панчанкі – гэта маналог, маналог аўтара, думкі якога поўныя горычы і ў той жа час надзеі. Надзі на тое, што пакарэнне не будзе карэннем “будучых прасветленых эпох”. Аўтар спадзяецца, што надыдзе такі час, калі словы “пакарыцель”, “пакарэнне” не будуць ужывацца, што яны назаўсёды знікнуць.

З хваляваннем чытаю радкі:

Для стварэння лепшых пакаленняў
Трэба помніць гора ўсіх дарог.

Яны гучаць як наказ усім нам у далейшае жыццё. Мы – гэта будучыя яго будаўнікі, яго стваральнікі. Пімен Панчанка хвалюецца за будучыню нашай краіны, за тое, якімі мы станем, ці будуць сярод нас такія, хто зможа “ўдарыць ... па душы жывой”, за тое, ці зберажом мы цудоўную беларускую прыроду. Таму ён просіць нас рабіць усё “з добрым сэрцам” і пакідаць “і буслу, і чайцы больш вады і неба на душу”.

Кожны радок верша запаў мне ў душу і глыбока ўскалыхнуў яе. Мне хочацца адказаць Пімену Панчанку:

Вы паверце: мы такімі і будзем,
З сэрцам добрым, як і наракаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Прынясем мы шчасце, волю людзям
І забудзем “пакарыцель”, “уладар”.

Верш здзівіў мяне сваёй прастатой. Кожны радок – гэта шчырыя словы аўтара, якія ідуць ад сэрца. Аўтар, ужыўшы і простыя, і складаныя сказы, лёгка данёс да чытача ўсе свае думкі і пачуцці.

Я хачу ўсім параіць прачытаць гэты верш, бо тады кожны з нас стане крышачку лепшым. А, можа, нехта задумаецца над сваім жыццём, убачыць яго недахопы і вырашыць выправіць іх. А, можа, каго-небудзь гэты верш натхніць, як гэта стала са мной:

Не трэба “ўладарыць”, “пакараць”,
Лепш берагчы,
Лепш светлае ствараць.
І нават птушкам даць святочныя
Імгненні.
Самім ляцець пад ветразем
Сумлення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

V. Аналіз водгуку.

– Знайдзіце ў водгуку тыя часткі, якія мы толькі што згадвалі.

– Падбярыце сінонімы (лексічныя і кантэкстуальныя) да наступных слоў: *спадабацца, апісваць, цікавы*.

– Якая роля ў тэксце водгуку пабочных слоў?

– Якая роля ў тэксте водгуку складаных сказаў са злучнікамі *каб, як, так як, таму што* і інш.?

VI. Чытанне тэксту для напісання водгуку
(верш Рыгора Барадуліна “Мая Бацькаўшчына”).

VII. Праца школьнікаў па асэнсаванні тэксту.

Прыкладныя пытанні і заданні:

1. Які загаловак можна даць водгуку?
2. Як можна пачаць такое сачыненне?
3. Чым гэты верш зацікавіў вас больш за іншыя, якія вы прачыталі самастойна: асобай аўтара, выказанымі думкамі і пачуццямі, адлюстраванымі ў ім вобразамі, формай выкладання ці яшчэ нечым? Што вы адкрылі для сябе ў вершы? Прывядзіце прыклады, якія даказваюць вашу думку.
4. Як можна закончыць такое сачыненне?

VIII. Напісанне водгуку на чарнавік.

IX. Напісанне водгуку на чыставік.

**26.** Як вы разумееце наступнае выказванне М. А. Рыбнікавай: "Вопытны настаўнік так падбярэ калекцыю памылак, што разгорнецца цэлая праграма дзеяння для стварэння будучага, больш дасканалага сачынення"?

**27.** Школьная праграма па развіцці звязнага маўлення ўключае "рэцэнзаванне і абмеркаванне пісьмовых работ вучняў".

Прааналізуйце наступны план рэцэнзіі пісьмовай вучнёўскай працы, ацаніце яго. Якія з прапанаваных пытанняў вы пакінеце? Якія зменіце, апусціце? Якія новыя ўключыце?

1. Ці адпавядае змест сачынення яго назве?
2. Якая асноўная думка сачынення, наколькі яна раскрыта аўтарам?
3. Якія станоўчыя моманты сачынення (напрыклад, самастойнасць, арыгінальнасць меркаванняў аўтара, яго шчырасць; своеасаблівасць пабудовы, мовы сачынення, удалыя фразы, эпітэты, метафары, параўнанні і інш.)?
4. Якія недахопы працы (кампазіцыйныя, сэнсавыя, лагічныя, моўныя, недахопы ў афармленні) вы можаце назваць?
5. Якая агульная ацэнка працы?
6. За што можна пахваліць аўтара гэтага сачынення?

**28.** Прааналізуйце наступнае сачыненне вучня 5 класа. Распрацуйце канкрэтны план работы над удасканаленнем мовы, зместу гэтага сачынення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ЗІМОВЫ ЛЕС

Я вырашыў пайсці на прагулку ў зімовы лес. Адразу я адчуў моцны мароз. Навокал ляжыць снег. Ён злёгку паскрыпвае пад нагамі.

Дрэвы ў лесе як у казцы, яны ўсе ў інеі. На бярозках вісяць, як сярэбраныя, пацеркі і завушніцы. А сосны, здаецца, апранулі шубы і шапкі.

Рэчка пакрылася лёдам. На рацэ весела, дзеці катаюцца на каньках. Вось што я ўбачыў на прагулцы.

## Спіс літаратуры для самастойнай працы па раздзеле

1. *Гринина-Земскова А. М.* Сочинения в газетных жанрах (IV – VIII классы): Пособие для учителей. – М., 1977.

2. *Ивченков П. Ф.* Обучающие изложения. 5 – 9 классы. – М., 1994.

3. *Ладыженская Т. А.* Система работы по развитию связной устной речи. – М., 1975.

4. *Лаўрэль Я. М.* Выбарачны пераказ і методыка яго правядзення // Народная асвета. – 1986, № 5. – С. 37 – 42.

5. *Лаўрэль Я. М.* Навучанне сцісламу пераказу // Народная асвета. – 1985, № 2. – С. 34 – 39.

6. *Лаўрэль Я. М.* Падрыхтоўка да сачынення-апісання знешнасці чалавека // Роднае слова. – 1994, № 2. – С. 31 – 39.

7. *Лаўрэль Я. М.* Пераказ з творчымі заданнямі // Народная асвета. – 1986, № 8. – С. 43 – 48.

8. Методика развития речи на уроках русского языка: Кн. для учителя / Под ред. Т. А. Ладыженской. – М., 1991.

9. Методические указания к факультативному курсу «Теория и практика сочинений разных жанров» (8 – 9 классы) / Сост. Т. А. Ладыженская, Т. С. Зепалова. – М., 1990.

10. *Морозова И. Д.* Виды изложений и методика их проведения. – М., 1984.

11. *Николаенко Г. И.* Теоретико-методические основы обучения жанрам речи на уроках русского языка в средней школе. – Мн., 2001.

12. *Петрович В. Г.* Как надо писать сочинения. – М., 1998.

13. *Пленкин Н. А.* Изложения с языковым разбором текста: Пособие для учителя. – М., 1988.

14. *Савко И. Э., Савко В. П.* Формирование речевых умений школьников при подготовке к выборочному изложению текста // Коммуникативная компетенция: принципы, методы, приёмы формирования: Сборник научных статей. Вып. 4. – Мн., 2002. – С. 34 – 38.

15. Система обучения сочинениям на уроках русского языка (V – VIII классы) / Под ред. Т. А. Ладыженской. – М., 1978.

16. *Супрун А. Е.* Лекции по теории речевой деятельности: Пособие для студ. филол. факультет. вузов. – Мн., 1996.

17. *Яленскі М. Г.* Развіццё вуснай мовы вучняў: 4 – 6 класы. – Мн., 1985.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ СТЫЛІСТЫКІ

**1***. Карыстаючыся адпаведнымі праграмамі, вызначце, што павінны

ведаць і ўмець школьнікі пасля вывучэння стылістыкі ў пачатковых класах і ў сярэдняй школе.

**2.** Многія метадысты лічаць, што вывучэнню функцыянальных стыляў у сярэдняй школе павінна папярэднічаць азнаямленне вучняў з паняццем “маўленчая сітуацыя”: “Каб спецыфіка кожнага функцыянальнага стылю была асэнсавана вучнямі, неабходна пазнаёміць іх з экстралінгвістычнай асновай стыляў, якая можа быць пададзена ў выглядзе мадэлі сітуацыі зносін” (Методика развития речи на уроках русского языка: Кн. для учителя. – М., 1991. – С. 50).

Пакажыце, як гэта можна зрабіць з дапамогай наступнай схемы:

**Маўленчая сітуацыя**

| **з кім гаворым** | | **дзе гаворым** | | **з якой мэтай гаворым** | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| з адным чалавекам | з групай людзей | у афіцый-ных аб-ставінах | у неафі-цыйных абставінах | зносіны | паведам-ленне | уздзеянне |

**3*.** У вучэбным дапаможніку па беларускай мове для 11 класа агульнаадукацыйных школ з беларускай мовай навучання (Мн., 2000) рэкамендуецца наступны план стылістычныга аналізу тэксту:

1. Ахарактарызаваць маўленчую сітуацыю і задачы маўлення.
2. Пералічыць асноўныя стылёвыя рысы.
3. Назваць моўныя сродкі, з дапамогай якіх асноўныя стылёвыя рысы рэалізуюцца ў тэксце.
4. Вызначыць стыль тэксту.

Падбярыце тэксты розных стыляў і зрабіце іх стылістычны аналіз у адпаведнасці з прапанаваным планам.

**4.** Сучасны падыход да моўнай адукацыі прадугледжвае асобнае вывучэнне стылістыкі і культуры маўлення. Як вы ставіцеся да гэтага?

**5**. К. Дз Ушынскі пісаў, што асновай усякага асэнсавання з’яўляецца параўнанне. Пакажыце ролю параўнання пры вывучэнні функцыянальных стыляў. Выкарыстайце для гэтага наступныя тэксты:

1. Захад хмурнеў. Чорная сцяна хмар рабілася ўсё больш шчыльнай. За нядоўгі час усё навакольле змянілася. Сонца патускнела. Цемра насоўвалася на зямлю. Далёкі глухі гром раз-пораз чуўся мацней, бліжэй,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

магутней. Хутка пасыпаліся буйныя кроплі дажджу, упала некалькі галак граду, як бы нейкі жартаўнік сыпануў жменю белых каменчыкаў.

(Якуб Колас)

2. Навальніца – атмасферная з’ява, якая выклікаецца кандэнсацыяй вадзянога пару і суправаджаецца электрычнымі разрадамі (маланкамі). Першай прыметай прыбліжэння навальніцы служыць паяўленне кучава-дажджавых аблокаў.

(БелСЭ)

**6.** В. І. Капінос піша: “Прыцягнуць ўвагу да стыляў маўлення і сістэматычна, пачынаючы з 5 класа, паказваць асаблівасці ўжывання лексічных адзінак, словаўтваральных мадэлей і граматычных форм і канструкцый у розных функцыянальных стылях – задача школьнай стылістыкі”. Прааналізуйце тэарэтычны і практычны матэрыял аднаго са школьных падручнікаў па беларускай мове. У якой ступені там вырашана гэтая задача?

**7.** Прааналізуйце стылістычную прыналежнасць тэкстаў у адным са школьных падручнікаў па беларускай мове. Наколькі раўнамерна пададзены ў ім тэксты розных стыляў? Як гэта суадносіцца, напрыклад, з метадычнымі рэкамендацыямі Ф. І. Буслаева наконт таго, што ў падручніку павінны быць:

а) прыклады з узорных тэкстаў айчынных пісьменнікаў;

б) прыклады з той або іншай галіны навукі (тэксты з гісторыі, геаграфіі, заалогіі, батанікі і інш.);

в) прыклады з народнай творчасці (казкі, песні, прыказкі);

г) прыклады з гутарковай мовы?

**8.** Сярод патрабаванняў, што прад'яўляюцца да адбору тэкстаў для стылістычнага аналізу, метадысты вылучаюць наступныя:

а) наяўнасць так званай "дамінанты стылю";

б) узорнасць у моўных адносінах;

в) інфармацыйная насычанасць;

г) выразнасць структуры, кампазіцыі.

Якія яшчэ патрабаванні да тэкстаў, прызначаных для стылістычнага аналізу, вы маглі б назваць? У якой ступені адпавядаюць гэтым патрабаванням тэксты школьных падручнікаў?

**9.** Калі і з якой мэтай можна выкарыстаць на ўроку наступную табліцу? Праілюструйце свой адказ правядзеннем адпаведнага этапа ўрока.

**Гутарковы стыль**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| Дзе выкарыс-тоўваецца | Для чаго выкарыс-тоўваецца | Асноўныя стылёвыя рысы | Сродкі мовы |
|---|---|---|---|
| У гутарцы, размове. | Для абмену думкамі, пачуццямі. | 1. Жывасць, непасрэднасць.<br>2. Выражаюцца адносіны да з'яў і падзей.<br>3. Дыялагічнасць. | 1. Словы, што выражаюць пачуцці, даюць ацэнку падзеям і з'явам.<br>2. Словы з пераносным значэн-нем.<br>3. Пытальныя, пабуджальныя і клічныя сказы.<br>4. Сказы са звароткамі і простай мовай. |

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

**10.** З якой мэтай і да якіх урокаў настаўнік падрыхтаваў наступныя тэксты:

1. – Ты чытаў гэту кніжку?
– Ага!
– Ну як?
– Парадак!
– А ў тэатры быў?
– Ага!
– Ну як, спадабалася?
– Парадак!
– Пойдзем абедаць?
– Ага!
– А як сёння надвор'е?
– Парадак!..

2. Валерка... гэта самае... Ты як? Ды ладна: вось мы тут ... гэта самае! Ну я, Мішка, Тоська... Ай, гэта самае... давай разам! Давай, хуценька...

**11.** Параўнайце наступныя меркаванні:

*"Падлеткам уласцівы ... страшэнны грэх: яны пачынаюць прыносіць са школы дадому своеасаблівы школьнарскі жаргон, пачынаючы з вядомых кожнаму "пара", "кол" і заканчваючы праз меру вычварнымі новаўтварэннямі. Я ўжо гаварыў: не варта ў сувязі з гэтым узнімаць паніку. Школьны жаргон — з'ява старажытная, як свет, і, відаць, нармальная. Ён прыліпае да вучня, нібы адзёр у пэўным узросце, а затым у старшых класах знікае бясследна"* (Л. Успенскі).

*"Барацьба за маўленчую культуру прама пераходзіць у барацьбу за маральную культуру чалавека. Калі грамадства здолее перамагчы слоўнае хамства, тым самым будуць рэзка павялічаны духоўныя сілы і знешнія праявы ўзаемнай павагі людзей. Унутраная ветлівасць, тактоўнасць, клапатлівыя адносіны да таварыша, уменне своечасова падумаць пра настрой і турботы блізкіх – усе гэта не спалучаецца з моўным хуліганствам. І кожны чалавек, перамагаючы ў сабе парывы да маўленчай распушчанасці, прывычку да грубасці, вульгарнасці і хамства, дапамагае станаўленню сапраўднай чалавечнасці"* (Б. Галавін).

Якую пазіцыю ў адносінах да жаргонных, грубых слоў у маўленні школьнікаў займаеце вы?

**12***. Распрацуйце план-канспект урока (ці яго частку) азнаямлення школьнікаў з публіцыстычным стылем.

**13***. У метадычнай літаратуры называюцца такія прыёмы стылістычнай працы на ўроках беларускай мовы, як:

1) знаходжанне і аналіз стылістычных сродкаў лексікі, фразеалогіі, граматыкі ў мастацкім ці іншым тэксце, высвятленне мэтазгоднасці іх ужывання;

2) праца са слоўнікамі: знаходжанне слоў, што маюць стылістычныя паметы; аналіз прыкладаў, у якіх паказана ўжыванне гэтых слоў;

3) падбор слоў з пэўнымі стылістычнымі ўласцівасцямі;

4) канструяванне стылістычна адрозных сказаў;

5) трансфармацыя са стылістычнымі мэтамі сказаў і тэкстаў;

6) напісанныне пераказаў з дадатковым стылістычным заданнем;

7) пабудова тэкстаў у пэўным стылі (напісанне стылістычных эцюдаў);

8) рэдагаванне тэктаў;

9) стылістычны аналіз тэксту і інш.

Да канкрэтных урокаў па мове падбярыце спецыяльныя практыкаванні, заданні, якія ілюстравалі б сутнасць кожнага з названых прыёмаў.

**14.** Выйграюць або прайграюць нашы падручнікі, калі стылістычныя практыкаванні арганічна ўвойдуць у кожны з раздзелаў школьнага курса беларускай мовы? Напрыклад, якія вашы адносіны да таго, што тэма "Даданыя члены сказа" (9 клас), апрача традыцыйных заданняў ("Абазначце дапаўненні (азначэнні, акалічнасці) і вызначце, якімі часцінамі мовы яны выражаны"), папоўніцца наступнымі заданнямі:

1. Вызначце, у якіх сказах дапаўненні працуюць толькі на лагічнае ўдакладненне, а ў якіх, апрача гэтага, даюць эмацыянальную ацэнку

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прадметам і з'явам.

2. Як адрозніваюцца азначэнні ў навуковым і мастацкім тэкстах? Чым вы растлумачыце такое адрозненне?

3. Назавіце акалічнасці, якія з'яўляюцца параўнаннямі, вызначце іх стылістычную ролю.

**15**. Якія метадычныя вывады вы зробіце для сябе з наступнага выказвання Б. Т. Панова: "Пачынаючы працу над сачыненнем, школьнік часам не ўяўляе сабе, сродкі якога стылю спатрэбяцца для раскрыцця тэмы. У гэтым, на нашу думку, адна з прычын невысокай стылістычнай культуры шматлікіх вучнёўскіх прац"?

**16.** Растлумачце, чаму ўстаноўка на напісанне сачынення пэўнага стылю і жанру ў значнай ступені вызначае асноўныя асаблівасці сачынення (яго кампазіцыю, план, моўныя сродкі).

**17.** Школьная праграма па беларускай мове не вылучае як асобны тып стылістычныя памылкі, падводзячы іх пад паняцце "маўленчыя недахопы". Ці патрэбна, на вашу думку, уводзіць у школьны ўжытак паняцце "стылістычнай памылкі"? Калі патрэбна, то якім з наступных азначэнняў паняцця "стылістычнай памылкі" вы кіраваліся б?

*"Стылістычныя памылкі выклікаюцца няўвагай да эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбаванасці слова, выразу"* (А. К. Юрэвіч).

*"Пад стылістычнымі памылкамі мы маем на ўвазе такое ўжыванне слоў і такую пабудову сказаў, якія не супярэчаць правілам граматыкі, але скажаюць думкі або ўскладняюць іх разуменне"* (Б. М. Шчарбацкі).

*"Стылістычнымі памылкамі могуць быць названы толькі такія парушэнні мовы, якія звязаны з недарэчным паводле функцыянальна-стылістычнай або паводле экспрэсіўна-стылістычнай афарбоўкі ўжываннем пэўнага моўнага сродку, або такія, якія прыводзяць да змяншэння выразнасці, экспрэсіўнасці і эмацыянальнасці маўлення"* (М. Н. Кожына).

*"Стылістычная памылка — гэта парушэнне тых правіл словаўжывання, якімі вызначаецца семантычная, функцыянальная і эмацыянальна-ацэначная мэтазгоднасць (і дапушчальнасць) ужывання слоў для перадачы зместу"* (Н. Я. Суліменка).

*"Стылістычныя памылкі акрэслім як выпадкі парушэння стылістычных правіл... Стылістычныя правілы (або патрабаванні) не маюць катэгарычнага характару. Для захавання іх неабходна веданне стылістычных норм і таго, што называецца "адчуваннем мовы"* (П. Г. Чарамісін).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**18**. Л. У. Шчэрба падкрэсліваў вялікую тэарэтычную значнасць пытання пра маўленчыя памылкі: "Для сапраўднага лінгвіста-тэарэтыка, для якога пытанні "як?" і "чаму?" з'яўляюцца самымі важнымі, памылкі маўлення з'яўляюцца каштоўным матэрыялам... "Адмоўны (няправільны) моўны матэрыял", па-майстэрску падабраны і забяспечаны адпаведным знакам, мог бы быць вельмі карысны".

Падбярыце "адмоўны" матэрыял да ўрока на тэму "Стылістычнае выкарыстанне назоўніка (прыметніка, дзеяслова, займенніка)".

**19.** Прадумайце методыку працы з наступнымі памылкамі:

а) "Аркестранты ігралі так заўзята, што ўсім стала весела. Яны дзьмулі ў розныя трубачкі, трубы, жалейкі, білі ў барабаны";

б) "Асабліва ярка ў рамане паказана Ганна Чарнушка";

в) "У рамане праяўляецца вера аўтара ў светлае будучае народа";

г) "Я хачу быць настаўнікам, мяне спакушае гэтая праца";

д) "Маці-мядзведзіца сачыла, каб яе дзеці не атрымалі траўмы";

дж) "Бабка вырвала куст крапівы і залегла ў засаду".

**20.** Супастаўце два варыянта сачынення вучня і вызначце, наколькі мэтазгоднымі з’яўляюцца праўкі, зробленыя ў другім варыянце.

| | |
|---|---|
| Вы не ведаеце нашага Сцяпана? Хвалько ён страшны.<br>– Я ўчора за паўгадзіны ўсе дровы перакалоў, – сказаў Сцёпка аднойчы.<br>– Калі ты навучыўся? – спыталіся мы ў яго.<br>– А я даўно ўмею, – адказаў ён.<br>– Тады пакажы, а мы прыйдзем паглядзець, як у цябе атрымліваецца<br>І вось пасля ўрокаў усе пайшлі на Сцёпкаў двор. Ён жа нацягаў на сярэдзіну двара паболей цурбаноў і выбраў самы вялізны<br>Сцёпка важна ўстаў, спытаў:<br>– Усе сабраліся?<br>– Так, – адказалі мы.<br>Хвалько як размахнецца – так, што ўсе затаілі дыханне, затым ён увагнаў сякеру ў пень, у самую сярэдзіну. Потым хлопчык з усіх сіл упёрся і пачаў выцягваць яе. Але | Вы не ведаеце нашага Сцяпана?<br>Хвалько ён страшны.<br>– Я ўчора за паўгадзіны ўсе дровы перакалоў, – заявіў Сцёпка аднойчы.<br>– Калі ты навучыўся? – пытаемся мы.<br>– А я даўно ўмею, – адказвае ён.<br>– Тады пакажы, а мы паглядзім, як у цябе атрымліваецца.<br>І вось аднойчы пасля ўрокаў мы сабраліся на двары ў Сцёпкі. Хлопчык нанасіў цурбаноў і выбраў для сябе самы вялікі. Затым ён знайшоў сякеру і важна спытаў:<br>– Усе сабраліся?<br>– Усе, – адказалі мы.<br>– Ну дык глядзіце, – ганарліва |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | |
|---|---|
| упартая сякера не паддавалася. Яна сядзела на адным месцы. Сцёпа таксама не здаваўся, і, тузануўшы апошні раз, ён выцягнуў сякеру. Пры гэтым герой так моцна стукнуў сябе, што ў яго іскры з вачэй пасыпаліся.<br>Цяпер Сцяпан ніколі не бярэцца за тое, чаго не ўмее рабіць.<br>(Ігар М.) | сказаў Сцяпан. Хвалько як размахнецца, ды так, што ўсе затаілі дыханне. Пасля гэтага ён увагнаў сякеру ў самую тоўшчу цурбана. Хлопчык з усіх сіл упёрся ў цурбан, спадзяючыся выцягнуць сякеру. Але ўпартая сякера не хацела паддавацца. Сцёпа стараўся і сяк і так, але сякера і не паварушылася. Тады Сцяпан, сабраўшыся з сілаю, яшчэ раз тузануў яе. Хлопчыку ўдалося выцягнуць сякеру, але пры гэтым ён так моцна стукнуў сябе, што ў нашага героя пацямнела ў вачах.<br>Цяпер Сцяпан ніколі не бярэцца за тое, чаго не ўмее рабіць. І галоўнае – больш не хваліцца.<br>(Ігар М.) |

**21.** Прадумайце вартасць і методыку правядзення стылістычнага дыктанта, мэта якога ў тым, каб у выніку трэніровак школьнікі навучыліся на слых знаходзіць памылкі ў тэксце, вызначаць іх характар (від памылкі) і хутка выпраўляць. Школьнікі запісваюць у сшытках ужо выпраўленыя сказы.

**22.** Ці згодны вы з наступнымі назіраннямі-абагульненнямі метадыста П. Г.Чарамісіна. Чаму?

а) "Асноўная цяжкасць пры выкладанні стылістыкі заключаецца ў азнаямленні вучняў са стылістычнымі ўласцівасцямі вялікай колькасці слоў, фразеалагічных зваротаў, форм слоў і канструкцый";

б) "Праца з канкрэтным матэрыялам цяжкая і для настаўніка, бо пакуль што няма надзейнага даведніка, з якога ён мог бы браць неабходныя звесткі аб прыналежнасці тых або іншых слоў да разрадаў стылістычных сродкаў мовы. Настаўнік вымушаны выкарыстоўваць як стылістычныя даведнікі тлумачальныя слоўнікі і слоўнікі сінонімаў, удакладняючы па іх правільнасць сваіх ацэнак тых слоў, якія намечаны для аналізу ў класе... Слоўнікі з'яўляюцца пакуль што адзінай крыніцай, з якой могуць і павінны брацца звесткі пра стылістычныя паметы адзінак

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

слоўніка мовы";

в) "Прычынай многіх стылістычных памылак з'яўляецца няправільная стылістычная спалучальнасць слоў... Напрыклад: "Перад ёю стаяў белабрысы юнак" (з сачынення пра станоўчага героя).

Аўтар сачынення не ведаў і таму не ўлічваў таго, што слова “белабрысы” — гутарковае, з адценнем зняважлівасці. Яно, такім чынам, дае падставу для няправільнага меркавання пра адносіны аўтара сачынення да героя, пра якога ідзе размова. Разам з тым гэтае слова разбурае стыль сачынення, прычым матываваць гэта "разбурэнне" немагчыма. Трэба было выкарыстаць замест слова “белабрысы” нейтральны сінонім “светлавалосы”?

**23.** Ацаніце метадычную вартасць наступнага прыёму працы з памылкамі, выкліканымі парушэннямі стылістычных нормаў.

Настаўнік, папярэдне праверыўшы сачыненне (але не падкрэсліўшы стылістычных памылак), прапануе вучням абмяняцца працамі і знайсці ў работах сваіх таварышаў памылкі, абумоўленыя парушэннямі стылістычных нормаў (усе астатнія тыпы памылак настаўнік адзначае). Кожны з вучняў выступае з кароткім паведамленнем пра знойдзеныя стылістычныя недакладнасці. Аўтар сачынення атрымлівае права "абараняцца", г. зн. даказваць, што названыя памылкі да стылістычных (і наогул да памылак) не адносяцца. Такім чынам, адбываецца своеасаблівы дыспут пра стылістычныя якасці творчай працы.

**24.** Школьная праграма па мове арыентуе на фарміраванне навыкаў дзелавога пісьма. Безумоўна, іх можна сфарміраваць, калі такая праца будзе весціся не эпізадычна, а па пэўнай сістэме. Метадыст К. П. Шчэпіна лічыць, што вывучэнне жанраў афіцыйна-дзелавога стылю маўлення мэтазгодна звязаць з наступным граматычным матэрыялам:

1) дзелавое пісьмо — з тэмай "Сказы са звароткам";
2) адрас і тэлеграма – з правапісам уласных і агульных назоўнікаў;
3) аб'ява, заява — з правапісам склонавых канчаткаў назоўнікаў;
4) запрашальны білет — з вывучэннем назоўніка;
5) распіска — з вывучэннем лічэбніка;
6) памятка — з вывучэннем тэмы “Лады дзеяслова”;
7) характарыстыка — з паўтарэннем тыпаў простага сказа;
8) план работы — з паўтарэннем марфалогіі;
9) даведка — з вывучэннем састаўнога іменнага выказніка;
10) інструкцыя — з вывучэннем тыпаў простага сказа;
11) давераснасць – з вывучэннем тэмы "Сказы з адасобленымі членамі";
12) пратакол — з вывучэннем простай і ўскоснай мовы;

РЕПОЗІТОРЫЙ БДПУ

13) аўтабіяграфія – з паўтарэннем адасобленага прыдатка;

14) справаздача — з паўтарэннем сінтаксісу простага сказа.

Наколькі матываванай, лагічна і метадычна апраўданай бачыцца вам такая сувязь?

Прапануйце свой – абгрунтаваны – варыянт вывучэння жанраў афіцыйна-дзелавога стылю ў сувязі з канкрэтным граматычным матэрыялам.

### Спіс літаратуры для самастойнай працы па раздзеле


1. Асновы культуры маўлення і стылістыкі / Пад рэд. У. В. Анічэнкі. – Мн., 1992.
2. *Амяльковіч А. А.* Практычныя заняткі па стылістыцы: дапаможнік для школьнікаў васьмігадовай і сярэдняй школы. – Мн., 1972.
3. *Иконников С. Н.* Стилистика в курсе русского языка. VII – VIII классы. – М., 1979.
4. *Капинос В. И.* Стилистика // Методика развития речи на уроках русского языка. – М., 1980.
5. *Каўрус А. А.* Стылістыка беларускай мовы. – Мн., 1980.
6. *Ляшчынская В. А., Станкевіч А. А.* Практыкаванні па лексіцы і стылістыцы. – Мн., 1984.
7. *Холад І.* Урокі практычнай стылістыкі ў 9-м класе // Народная асвета. – 1975, № 8. – С. 65 – 73; № 10. – С. 50 – 61; № 11. – С. 43 – 47.
8. *Чижова Т. И.* Основы методики обучения стилистике в средней школе. – М., 1987.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## МЕТОДЫКА ПАЗАКЛАСНАЙ ПРАЦЫ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

**1.** Прачытайце і законспектуйце раздзел "Методыка арганізацыі пазакласнай працы па мове" ў кнізе Малажай Г. М. і Рачэўскага С. Р. “Пазакласная праца па беларускай мове” (Мн., 1990).

Як вы думаеце, што трэба рабіць, "каб пазакласная праца па беларускай мове, захоўваючы агульнадыдактычныя і спецыфічныя прынцыпы, мела выразную нацыянальную адметнасць" (с. 3)?

**2.** Ці пагаджаецеся вы з наступным меркаваннем: "Галоўнае, што патрабуецца ад настаўніка, які хоча выклікаць цікавасць да пазакласных заняткаў, – забеспячэнне жывога і цікавага вядзення ўрокаў, нестандартны разгляд і тлумачэнне праграмнага матэрыялу" (Г. М. Малажай, С. Р. Рачэўскі)? Чаму?

**3**. Якія формы пазакласнай працы па беларускай мове вы ведаеце? Што трэба ўлічваць пры выбары формаў пазакласнай працы ў канкрэтным класе?

**4.** Ахарактарызуйце гурток як асноўны і найбольш пашыраны від пазакласнай працы: мэта  і задачы работы, планаванне працы, колькасць удзельнікаў, частотнасць правядзення заняткаў, формы, метады і прыёмы працы.

**5.** Прааналізуйце наступную анкету. У якой ступені яна дапамагае выявіць лінгвістычныя інтарэсы вучняў? Якія пытанні з гэтай анкеты задавальняюць вас як кіраўніка гуртка, якія — не задавальняюць?

Анкета
ўдзельніка гуртка лінгвістаў
(прозвішча пісаць не абавязкова)

1. Клас.

2. Пра што ты хочаш даведацца на занятках гуртка (падкрэслі свой адказ):

а) пра паходжанне слоў;
б) пра значэнне слоў:
в) пра будову слоўнікаў;
г) пра паходжанне і значэнне выразаў тыпу "дарогу перасякерыць";
д) пра ўтварэнне сінанімічных радоў;
дж) пра паходжанне і развіццё пісьма;
дз) пра класіфікацыю моў;
з) пра стылістычныя рэсурсы мовы.

3. Якія мерапрыемствы ты хочаш рыхтаваць: тэматычныя ранішнікі (вечары), канферэнцыі, вусныя часопісы, тэатралізаваныя гульні, выпуск лінгвістычных насценных газет, алімпіяды па мове, лінгвістычныя гульні, віктарыны, конкурсы?

**6**. Параўнайце наступныя фармулёўкі тэм заняткаў гуртка. Якія з гэтых фармулёвак вам больш падабаюцца і чаму?

1. “Словы-архаізмы" – "Ці паміраюць словы?"
2. "З гісторыі пісьма" — "Чаму не было пошты ў старажытныя часы?"
3. "Ці ведаеш ты родную мову?" — "У краіне нявывучаных урокаў".
4. "Фразеалогія беларускай мовы" — "Ці можна зламаць язык?"

**7*.** Распрацуйце адну з наступных тэм заняткаў гуртка “Аматары



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

беларускага слова”:

1. Розныя мовы. Роднасныя мовы.
2. Слоўнікавае багацце беларускай мовы.
3. Біяграфія слоў.
4. Прыгожа мова прыказкай.

**8.** Прааналізуйце пытанні віктарыны на пасяджэнні гуртка, прысвечанага фразеалогіі. У якой ступені ў змесце гэтай віктарыны рэалізаваліся прынцыпы пазакласнай працы па беларускай мове?

1. Што значыць “вочы мазоліць”?
2. Хто ў нас востры на язык і калі так можа сказаць?
3. Калі гавораць, што чалавек даў маху?
4. Ці не занямог хто-небудзь з гурткоўцаў на панскую хваробу? Што гэта такое?
5. Які фразеалагізм можна выкарыстаць, каб сказаць, што два вучні аднолькава нестаранныя ў вучобе?
6. Нехта вельмі хутка, не адрываючыся, прачытаў кнігу. Як можна пра гэта сказаць, выкарыстоўваючы фразеалагізм?
7. У адным з вершаў Я. Купалы ёсць радкі: "Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына". Як называецца гэты верш? Што значыць “спакон вякоў”?

(*Малажай Г. М., Рачэўскі С. Р.* Пазакласнаая праца па беларускай мове)

**9*.** Параўнайце два варыянты гульні "Што? Дзе? Калі?" на матэрыяле тэмы “Назоўнік”. Якому з іх вы аддалі б перавагу? Чаму?

***

**Хто ці што?**

Перад вамі словы *раман, танк, вера, грыф, лезгінка, мядзведзіца*. Якія з гэтых назоўнікаў вы лічыце адушаўлёнымі і якія – неадушаўлёнымі? Але не спяшайцеся з адказам... У вас ёсць хвіліна на роздум.

**Падарункі**

Мовы, як і людзі, абменьваюцца падарункамі. Яны дораць адна другой на памяць словы. Таму часта бывае так, што ў кожнай мове ёсць сваё слова і слова-падарунак з чужой мовы – яго сінонім. Паспрабуйце за адну хвіліну да слоў *экспарт, антракт, рэсурсы, турыст, сітуацыя, інцыдэнт, сакрэт* падабраць спрадвечна беларускія словы-сінонімы.

**Непакорныя назоўнікі**

Ёсць назоўнікі, якія называюць "непакорнымі" за тое, што яны не

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

хочуць скланяцца. Яны — "іншаземцы", не ведаюць нашых правіл скланення. Ну і няхай жывуць па-свойму, трэба паважаць чужыя норавы. Але ведаць гэтых "іншаземцаў" нам трэба, бо прыходзіцца мець з імі справу.

Увага! Пытанне: як называюцца гэтыя назоўнікі? Раскажыце, што вы пра іх ведаеце. Ці ёсць сярод спрадвечна беларускіх слоў "непакорныя" назоўнікі?

**Падарожжа па карце**

Перад вамі геаграфічная карта з маршрутам падарожжа па зямным шары. Мы пабываем у Індыі, Кітаі, Галандыі, Швецыі, Фінляндыі, Даніі, Швейцарыі, Турцыі, Афганістане, Егіпце.

Але ў падарожжа з намі адправіцца той, хто за адну мінуту правільна запіша назвы карэнных жыхароў гэтых краін (асоб мужчынскага і жаночага полу).

**Колькі іх?**

У дамашнім сачыненні пра надыход зімы Рая напісала: "Дзятва радуюцца першаму снегу, катаюцца на санках..." Калі настаўнік выправіў *ю* на *е*, Рая ніяк не хацела згадзіцца з гэтай папраўкай:

— Радуецца, катаецца — гэта адзін. А іх жа многа!

А вы згодны з Раяй? Чаму?

**Экскурсія**

Праз тры хвіліны капітан кожнай каманды выступіць у ролі экскурсавода і раскажа, што ўбачыла яго каманда за словамі *тэатр, каманда, фае, гардэроб, партрэт, балкон, білет, заслона, спектакль, артысты, роля, кулісы, рэжысёр, прэм'ера.*

(Паводле Малажай Г. М., Рачэўскага С. Р.)

* * *

1. Ці можна вызначыць, хто з названых асоб з'яўляецца жанчынай: *рэкорд В. Корбут, майстэрства Т. Мархель.*

2. Настаўнік прапанаваў Ані запісаць сказы, паставіўшы прозвішчы і назвы гарадоў у патрэбным склоне. Але яна разгубілася, бо не паўтарыла правіла. Дапамажыце ёй.

*1. Шкада было расставацца з горадам Рагачов..., як след не пабачыўшы яго. 2. Народным артыстам СССР Барысам Платонав... на беларускай сцэне створана шмат незабыўных вобразаў.*

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

3. У вас ёсць хвіліна часу, каб падкрэсліць назоўнікі, якія маюць толькі адзіночны лік.

Хоць невялікія прысмакі —
Цыбуля, перчык, ліст бабкоў
Ды сальца некалькі брускоў,
Мука і квас — і ўся прыправа,
Але ўсё ж снеданне цікава,
А для дзяцей найбольша свята
Абы наесціся багата.

(Я. Колас)

(Гульня падрыхтавана і праведзена настаўнікам Ю. А. Марозам.)

**10.** Ці згодны вы з меркаваннем, што ўся дзейнасць прадметных гурткоў павінна быць падрыхтоўкай да масавага мерапрыемства, якое будзе ўяўляць сабой і справаздачу кожнага гуртко ўца, і абагульненне працы гуртка, і спосаб лінгвістычнай прапаганды, выхавання і навучання, і асноўны метад далучэнння новых, раней пасіўных груп вучняў да свядомага карыстання роднай мовай? Чаму?

**11.** Прааналізуйце наступную аб'яву да вечара "Матчына слова". Падрыхтуйце аб'яву пра “Тыдзень роднай мовы” ў школе.

Увага! Увага! Увага!

Чым вабіць нас роднае слова? Найперш прыгажосцю, сакавітасцю, мілагучнасцю. Прыходзьце на наш вечар "Матчына слова" — і вы ўбачыце, пачуеце, пераканаецеся, што гэта так. Чакаем усіх 12 лістапада ў 18-00.

**12.** Падрыхтуйце да вечара плакат, які ўяўляў бы сабой кароткую цікавую анатацыю да той ці іншай кнігі пра мову.

**13.** Апошнім часам настаўнік-моваевед не можа паскардзіцца на поўную адсутнасць матэрыялаў для пазакласнай працы. Безумоўна, вельмі добра, што ён можа знайсці гатовыя сцэнарыі ранішнікаў, вечароў, пасяджэнняў гурткоў на розныя тэмы. Гэта эканоміць час настаўніка, яго сілы. Аднак ці не здаецца вам, што нярэдка гатовы сцэнарый пазбаўляе настаўніка магчымасці (неабходнасці?) шукаць, прыдумваць? Якім вам бачыцца аптымальны выхад з такой сітуацыі?

**17.** Прааналізуйце наступны статут клуба знаўцаў роднай мовы і

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

кнігалюбаў. Калі ў сваёй школе вы арганізуеце падобны клуб, ці стане гэты статут статутам вашага клуба? Чаму?

Членам клуба можа стаць кожны вучань школы, які цікавіцца роднай мовай і літаратурай, які хоча паглыбляць свае веды па гэтых прадметах, які прызнае статут клуба.

Член клуба абавязаны дабівацца глыбокіх і трывалых ведаў па роднай мове і літаратуры, узбагачаць сваю мову, актыўна ўдзельнічаць у рабоце школьнага друку і ва ўсіх мерапрыемствах, што праводзіць клуб.

Член клуба павінен быць настойлівым прапагандыстам кнігі, першым памочнікам настаўніка і класнага кіраўніка ў арганізацыі дыспутаў, чытацкіх канферэнцый, сустрэч з пісьменнікамі.

Член клуба павінен змагацца з засмечваннем мовы словамі-паразітамі, з брыдкаслоўем, прымітыўнасцю і грубасцю ва ўласнай мове і мове таварышаў.

Член клуба абавязаны падпарадкавацца агульнай для ўсіх дысцыпліне, выконваць даручэнні, звязаныя з працай клуба.

**18.** Распрацуйце заданні па беларускай мове (лінгвістычны конкурс) для ўдзельнікаў школьнай алімпіяды (5—6 класы).

**19.** Прааналізуйце праграму канферэнцыі, прысвечанай Ф. М. Янкоўскаму.

**Праграма канферэнцыі**
**“Руплівы даследчык роднага слова”,**
**прысвечанай беларускаму пісьменніку і лінгвісту Ф. М. Янкоўскаму**

1. “Жыццё, запоўненае працаю для Бацькаўшчыны” (з біяграфіі Ф. М. Янкоўскага).
2. Вывучэнне жывога народнага слова.
3. Здабыткі беларускай фразеалагічнай школы Ф. М. Янкоўскага.
4. Праблемы гісторыі беларускай мовы ў працах вучонага.
5. Штодзённая ўвага да культуры роднай мовы.
6. Прафесар Ф. М. Янкоўскі – настаўнік (па матэрыялах кніг “Абразкі”, “Прыпыніся на часіну”, “І за гарою пакланюся”, “Радасць і боль”, “З нялёгкіх дарог”).
7. “Слова вучыць жыць” (па матэрыялах кнігі “Само слова гаворыць”).

## Спіс літаратуры для самастойнай працы

1. *Емельяновіч В. М.* Тапанімічны гурток // Народная асвета. – 1987,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

№ 6.
2. *Лаўрэль Я. М., Прыймак Ж. Н., Раманцэвіч В. К.* Алімпіяды па беларускай мове. – Мн., 1987.
3. *Малажай Г. М., Рачэўскі С. Р.* Пазакласная праца па беларускай мове. – Мн., 1990.
4. *Панов Б. Т.* Внеклассная работа по русскому языку. – М., 1980.
5. *Ушаков Н. Н., Суворова Г. И.* Внеклассная работа по русскому языку в восьмилетней школе. – М., 1984.
6. *Юбко В. А.* Гурток "Роднае слова" ў VI – VII класах // Народная асвета. – 1987, № 8.
7. *Юбко В. А.* Лінгвістычны гурток // Народная асвета. – 1985, № 6.
8. *Юбко В. А.* Прыкладнае планаванне дзейнасці гуртка "Роднае слова" // Народная асвета. – 1985, № 8.

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

**Тэма.** **Дзеепрыслоўны зварот (7 клас)**

**Мэты:** 1) узнавіць і замацаваць веды школьнікаў пра дзеепрыслоўе як асобую форму дзеяслова: яго агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю; удасканаліць уменне распазнаваць дзеепрыслоўі ў сказах;
2) даць паняцце пра дзеепрыслоўны зварот, пазнаёміць з асноўнымі правіламі яго пунктуацыйнага афарм-лення;
3) фарміраваць уменні знаходзіць у сказах і адасабляць адзіночныя дзеепрыслоўі і дзеепрыслоўныя звароты;
4) удасканальваць уменне правільна ўжываць дзеепрыслоўі і дзеепрыслоўныя звароты ў маўленні для абазначэння дадатковага дзеяння;
5) развіваць уменне аналізаваць моўныя з’явы і рабіць правільныя вывады;
6) выхоўваць у вучняў імкненне да ўласнага інтэлектуальнага развіцця.

**Тып урока:** камбінаваны

**Абсталяванне:** 1) Беларуская мова: падручнік для 7 класа устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульная сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання з 12-гадовым тэрмінам навучання / Г. М. Малажай, Н. М. Чалюк. – Мінск, 2004.
2) раздатачны матэрыял: карткі, матэрыял для самастойнай працы.

**Літаратура:**
*Малажай Г. М., Чалюк Н. М.* Беларуская мова ў 7 класе: вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульная сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання. – Мінск, 2004.

**Ход урока**

**I. Арганізацыйны пачатак урока.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**II. Паведамленне тэмы, пастаноўка мэт ўрока, матывацыя вучэбнай дзейнасці.**

Паведамленне настаўніка.

Сёння на ўроку мы працягнем вывучаць дзеепрыслоўе як асобую форму дзеяслова, пазнаёмімся з паняццем “дзеепрыслоўны зварот” і асноўнымі правіламі яго пунктуацыйнага афармлення; будзем вучыцца афармляць сказы, у якіх ёсць дзеепрыслоўі, у адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі; правільна ўжываць дзеепрыслоўі (як адзіночныя, так і з залежнымі словамі) у вусным і пісьмовым маўленні.

Веды, якія вы атрымаеце на ўроку, дапамогуць вам не рабіць граматычных і пунктуацыйных памылак пры ўжыванні дзеепрыслоўяў у маўленні.

**III. Праверка дамашняга задання (з адначасовай актуалізацыяй апорных ведаў).**

1. Камбінаванае апытванне.

1.1. Індывідуальнае пісьмовае апытванне па картках (выконваецца на дошцы).

| |
|---|
| Картка № 1<br>Тэма: Дзеепрыслоўе як асобая форма дзеяслова (7 клас)<br><br>Спішыце, раскрываючы дужкі, устаўляючы патрэбныя літары. Знайдзіце дзеепрыслоўі, вызначце ў іх прыметы дзеяслова і прыслоўя.<br><br>1. *Ціха гутарылі Міколка з дзедам, адпачываючы на ўскрайк.. лес..* (М. Лынькоў). 2. *Пав..рнуўшыся тварам да лес.., Кавалевіч упэўнена павёў рукою ў бок чыгункі* (І. Мележ). 3. *Высоцкі, (не)адыходзячы ад стала, гл..дзіць у акно* (І. Навуменка). |
| Картка № 2<br>Тэма: Дзеепрыслоўе як асобая форма дзеяслова (7 клас)<br><br>Спішыце, раскрываючы дужкі, устаўляючы патрэбныя літары. Знайдзіце дзеепрыслоўі, вызначце ў іх прыметы дзеяслова і прыслоўя. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. *Лісіца кінулася ўбок, пабегла, падм..таючы хвастом парошу* (А. Асіпенка). 2. *Назбіраўшы яшчэ сушняк.., Міколка з дзедам расклалі (не)в..лікі агонь* (М. Лынькоў). 3. *(Не)б..ручыся за работу, майстрам не станеш* (Прыказка).

1.2. Франтальнае вуснае апытванне.

– Што называецца дзеепрыслоўем? Якое дзеянне яно абазначае ў сказе?
– Назавіце агульныя граматычныя прыметы дзеепрыслоўя і дзеяслова, дзеепрыслоўя і прыслоўя.
– Якую сінтаксічную ролю выконвае дзеепрыслоўе ў сказе?
– Як пішацца часціца НЕ з дзеепрыслоўямі?

1.3. Самаправерка дамашняга пісьмовага практыкавання 372 (узор спраецыраваны на дошку з дапамогай кадаскопа).

1.4. Праверка і ацэнка выканання індывідуальных пісьмовых заданняў.

**IV. Тлумачэнне новага матэрыялу.**

1. Аналіз моўнай з’явы (калектыўна, вусна).

Матэрыял для аналізу – сказы, запісаныя на дошцы:

I. 1. *Падышоўшы бліжэй, ляснік заўважыў бабровую хатку.*
2. *Жанчына кінулася на дапамогу, зусім не думаючы пра небяспеку.*
3. *Учора, наблізіўшыся да вады, я зразумеў, што бераг можа абваліцца.*

II. 1. *Хлопчык ішоў не спяшаючыся.*
2. *Растуць яны тут у нас на лес гледзячы.*

Заданні:
– Прачытайце першую групу сказаў, знайдзіце дзеепрыслоўі.
– Вызначце залежныя ад дзеепрыслоўяў словы.
– Зрабіце вывад, што называецца дзеепрыслоўным зваротам.

2. Самастойны аналіз моўнай з’явы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З а д а н н е. Паглядзіце яшчэ раз на сказы першай групы і адкажыце на наступныя пытанні:

– Якія знакі прыпынку ставяцца пры дзеепрыслоўным звароце?

– Ці залежыць пастаноўка знакаў прыпынку ад таго, дзе знаходзіцца дзеепрыслоўны зварот: перад дзеясловам-выказнікам ці пасля яго?

Сфармулюйце правіла пастаноўкі знакаў прыпынку пры дзеепрыслоўным звароце.

3. Паведамленне настаўніка з адначасовым аналізам моўнай з’явы.

Паглядзіце на сказы другой групы. У першым з іх ёсць адзіночнае дзеепрыслоўе *не спяшаючыся*, у другім – дзеепрыслоўны зварот *на лес гледзячы*. Запомніце, што пры адзіночным дзеепрыслоўі, якое стаіць ў канцы сказа і адказвае на пытанне “як?”, коска не ставіцца. Не выдзяляюцца коскамі і дзеепрыслоўныя звароты, якія з’яўляюцца ўстойлівымі спалучэннямі слоў – фразеалагізмамі.

4. Чытанне тэарэтычнага матэрыялу падручніка.

З а д а н н е. Уважліва прачытайце тэарэтычны матэрыял на старонцы 200, параўнайце вывады, якія мы зрабілі, з тымі, што ёсць ў падручніку. Пра што яшчэ вы даведаліся, прачытаўшы правіла?

**V. Першаснае замацаванне набытых ведаў.**

Узнаўляльная гутарка.

– Што называецца дзеепрыслоўным зваротам?

– Якім членам сказа ён з’яўляецца?

– Як пунктуацыйна афармляецца дзеепрыслоўны зварот?

**VI. Фарміраванне ўменняў і навыкаў.**

1. Знаходжанне і тлумачэнне моўнай з’явы.

Практыкаванне 377 (вусна, калектыўна).

З а д а н н е. Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў ім дзеепрыслоўныя звароты. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з дзеепрыслоўнымі зваротамі.

* Падбярыце сінонімы да слоў *ласунак, кліч, клопат*.

(*Ласунак – далікатэс, прысмакі; кліч – заклік, прызыў, клопат – турбота, марока*.)

2. Ускладненае спісванне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Практыкаванне 378 (1–3 сказы паўсамастойна (адзін вучань каля дошкі), 4–6 сказы – самастойна).

Заданне. Спішыце сказы, расставіўшы неабходныя знакі прыпынку. Пяты–шосты сказы разбярыце па членах сказа.

3. Канструяванне сказаў па апорных словазлучэннях (пісьмова, калектыўна).

Заданне. Пабудуйце сказы з наступнымі дзеепрыслоўнымі словазлучэннямі, запішыце, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

Падкрэсліце граматычную аснову і дзеепрыслоўныя звароты як члены сказа. Звярніце ўвагу на тое, што і асноўнае, і дадатковае дзеянне павінна выконваць адна і тая ж асоба.

Словазлучэнні (запісаны на дошцы):

*Не гледзячы на прысутных, старанна падбіраючы словы, закасаўшы рукавы, падзякаваўшы брату.*

4. Рэдагаванне сказаў (калектыўна, першы сказ – вусна, астатнія – пісьмова).

Заданне. Прачытайце сказы, знайдзіце граматычную аснову і дзеепрыслоўны зварот. Вызначце, ці адна і тая ж асоба (прадмет) з'яўляецца ўтваральнікам і асноўнага, і дадатковага дзеяння. Адрэдагуйце сказы, выправіўшы памылкі ва ўжыванні дзеепрыслоўных словазлучэнняў.

Сказы (запісаны на дошцы):

1. *Праязджаючы па гэтай вуліцы, яго позірк шукаў будынак старой школы.*
2. *Вось і зараз, успамінаючы гэтыя дарагія майму сэрцу мясціны, смутак зноў агортвае мяне.*
3. *Выйшаўшы з лесу, перада мною ляжаў скошаны луг.*

5. Творчы дыктант.

Заданне. У час запісу тэксту замяніце, дзе гэта магчыма, дзеясловы з залежнымі словамі на дзеепрыслоўныя звароты.

*Хлопчык зірнуў на неба і убачыў белых буслоў. Яны нібы па нейкай сцяжынцы падымаліся ўверх, плылі адзін за адным. Паступова птушкі рабіліся ўсё меншымі і меншымі, знікалі ў бясконцай глыбіні неба.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**VII. Падвядзенне вынікаў урока.**

1. Самастойная праца з наступнай праверкай (вусна, два варыянты, у кожнага вучня індывідуальная картка).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**1 варыянт**

1. Закончыце фармулёўку.

Дзеепрыслоўе з залежнымі словамі называецца ______________

2. Вызначце, дзе ў сказах неабходна паставіць знакі прыпынку.

1. *Міхал вярнуўшыся з абходу адзначыў добрую прыгоду* (Я. Колас). 2. *Пачуўшы голас сына не азіраючыся маці стала завіхацца хутчэй* (І. Мележ). 3. *Ішлі яны не спяшаючыся выбіраючы найбольш глухія лясныя дарожкі і сцежкі* (Я. Колас).

3. Знайдзіце сказы, у якіх дзеепрыслоўныя звароты ўжыты правільна. Абгрунтуйце свой адказ.

1. *Падыходзячы да школы, у вучняў узнікла спрэчка*. 2. *Над лесам, выплыўшы з туману, стаяў месяц.* 3. *Алёшу проста хацелася спяваць, працуючы на камбайне.*

**2 варыянт**

1. Закончыце фармулёўку.

Дзеепрыслоўны зварот у сказе з’яўляецца ______________

2. Вызначце, дзе ў сказах неабходна паставіць знакі прыпынку.

1. *Сядзець цяпер склаўшы рукі Андрэй таксама не мог* (У. Шахавец). 2. *І раптам схіліўшыся трошкі набок схіснуўся і знік пад вадой паплавок* (П. Глебка). 3.

*Стараючыся не адстаць ад дарослых ззаду шпарка ішоў хлопчык..*

3. Знайдзіце сказы, у якіх дзеепрыслоўныя звароты ўжыты правільна. Абгрунтуйце свой адказ.

1. *Лясной сцяжынкай, мінаючы пясчаныя ўзгоркі, ішлі партызаны*. 2. *Даведаўшыся пра поспехі сястры, мяне ахапіла радасць*. 3. *Сустрэўшыся пасля доўгай разлукі, сябры ўспаміналі гады маладосці*.

2. Ацэнка вучэбнай дзейнасці школьнікаў.

**VIII. Інфармацыя пра дамашняе заданне.**

Слова настаўніка.

Дома вам неабходна вывучыць тэарытычны матэрыял параграфа 42 і выканаць адно з наступных заданняў (на выбар):

1) практыкаванне 385;

2) выпісаць з мастацкага твора, які вывучаецца на ўроках беларускай літаратуры ў 7 класе, пяць сказаў з дзеепрыслоўнымі зваротамі. Адзін сказ разабраць па членах сказа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Прыкладная тэматыка дыпломных прац

1. Навучанне сінтаксічным нормам на ўроках беларускай мовы ў 9 – 10 класе.

2. Вывучэнне сінтаксісу ў функцыянальным аспекце.

3. Развіццё маўлення школьнікаў на ўроках вывучэння сінтаксісу ў сярэдняй школе.

4. Навучанне школьнікаў на ўроках марфалогіі беларускаму маўленчаму этыкету.

5. Навучанне марфалагічным нормам на ўроках беларускай мовы ў 5 – 7 класах.

6. Фарміраванне пунктуацыйных уменняў школьнікаў на ўроках беларускай мовы ў 9 – 10 класах.

7. Выкарыстанне персанальнага камп'ютэра пры навучанні арфаграфіі на ўроках беларускай мовы.

8. Сачыненні ў газетных жанрах на ўроках беларускай мовы.

9. Пераказ у сістэме працы па развіцці звязнага маўлення вучняў 5 – 9 класаў.

10. Навучанне перакладу на ўроках беларускай мовы ў сярэдняй школе.

11. Вывучэнне афіцыйна-дзелавога стылю маўлення на ўроках беларускай мовы ў сярэдняй школе.

12. Пазакласная праца па беларускай мове ў сярэдняй школе.

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

## Прыкладная тэматыка курсавых прац

1. Удасканаленне арфаэпічных і акцэнталагічных навыкаў пры вывучэнні марфалогіі.
2. Фарміраванне стылістычных уменняў школьнікаў пры вывучэнні часцін мовы ў сярэдняй школе.
3. Праблемнае навучанне марфалогіі ў сярэдняй школе.
4. Метады і прыёмы вывучэння марфалогіі.
5. Фарміраванне арфаграфічных навыкаў пры вывучэнні марфалогіі.
6. Методыка вывучэння назоўніка на ўроках беларускай мовы ў сярэдняй школе.
7. Методыка вывучэння прыметніка на ўроках беларускай мовы ў сярэдняй школе.
8. Методыка вывучэння лічэбніка на ўроках беларускай мовы ў сярэдняй школе.
9. Методыка вывучэння займенніка на ўроках беларускай мовы ў сярэдняй школе.
10. Методыка вывучэння дзеяслова на ўроках беларускай мовы ў сярэдняй школе.
11. Методыка вывучэння прыслоўя на ўроках беларускай мовы ў сярэдняй школе.
12. Методыка вывучэння службовых часцін мовы на ўроках беларускай мовы ў сярэдняй школе.
13. Вывучэнне словазлучэння ў школьным курсе сінтаксісу.
14. Навучанне сінтаксічным нормам пры вывучэнні простага сказа ў сярэдняй школе.
15. Методыка вывучэння складанага сказа на ўроках беларускай мовы ў сярэдняй школе.
16. Фарміраванне пунктуацыйных уменняў школьнікаў пры вывучэнні часцін мовы.
17. Фарміраванне пунктуацыйных уменняў школьнікаў пры вывучэнні простага сказа.
18. Фарміраванне пунктуацыйных уменняў школьнікаў пры вывучэнні складнага сказа.
19. Выкарыстанне навучальных дыктантаў пры вывучэнні арфаграфічных тэм у 5 класе.
20. Навучанне арфаграфічным нормам на ўроках беларускай мовы ў 6 класе.
21. Навучанне арфаграфічным нормам на ўроках беларускай мовы ў 7 класе.
22. Навучанне школьнікаў напісанню водгуку на ўроках беларускай мовы.
23. Навучанне школьнікаў напісанню нататкі на ўроках беларускай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мовы.

24. Навучанне школьнікаў напісанню сачыненняў-апісанняў на ўроках беларускай мовы ў 7 класе.

25. Развіццё звязнага маўлення школьнікаў пры вывучэнні назоўніка (ці іншай самастойнай часціны мовы).

26. Пераказ ў сістэме працы па развіцці звязнага маўлення вучняў 5 класа (ці 6, 7, 8 класа).

27. Арганізацыя працы па стылістыцы пры вывучэнні раздзела "Лексіка і фразеалогія".

28. Арганізацыя працы па стылістыцы пры вывучэнні самастойных часцін мовы.

29. Методыка вывучэння стылістыкі ў 12 класе сярэдняй школы.

30. Моваўнаўчы гурток у сярэдняй школе.

31. Арганізацыя і правядзенне алімпіяд па беларускай мове ў сярэдняй школе.

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

**П Р А Г Р А М А**
**ЭКЗАМЕНУ ПА МЕТОДЫЦЫ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ**
**НА 4 КУРСЕ**
**(СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА. ДАДАТКОВАЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ”)**

1. Методыка выкладання беларускай мовы як навука. Прадмет, задачы, змест методыкі беларускай мовы, метады даследавання. Сувязь методыкі з іншымі навукамі: лінгвістыкай, педагогікай, псіхалогіяй і інш.

2. Станаўленне метадычнай думкі на Беларусі. Асветніцкая дзейнасць Ф. Скарыны. Роля Б. Тарашкевіча, Б. Пачобкі, Я. Лёсіка, І. Пратасевіча, І. Самковіча і інш. у развіцці методыкі беларускай мовы. Метадычныя погляды К. Міцкевіча (Якуба Коласа).

3. Развіццё метадычнай думкі на Беларусі ў 40–90 гады XX стагоддзя, пачатку XXI стагоддзя.

4. Беларуская мова як вучэбны прадмет і задачы яе выкладання ў агульнаадукацыйных установах РБ. Змест і структура школьнага курса беларускай мовы. Крытэрыі адбору сучаснага зместу школьнага курса беларускай мовы.

5. Вучэбная праграма па беларускай мове для 5–11 класаў агульнаадукацыйных устаноў: структура, змест, прынцыпы пабудовы. Асноўныя кампаненты праграмы, іх характарыстыка.

6. Сродкі навучання беларускай мове. Класіфікацыя сродкаў навучання. Падручнік – асноўны сродак навучання роднай мове. Функцыі, структурныя кампаненты, метадычная сістэма сучасных школьных падручнікаў.

7. Арганізацыя вучэбнага працэсу па беларускай мове ў агульнаадукацыйных установах РБ. Віды вучэбных планаў: каляндарны (гадавы), тэматычны, каляндарна-тэматычны, паўрочны.

8. Агульнадыдактычныя прынцыпы навучання беларускай мове.

9. Агульнаметадычныя прынцыпы навучання беларускай мове.

10. Метады і прыёмы навучання беларускай мове. Паняцце метаду і прыёму навучання. Праблема класіфікацыі метадаў навучання. Характарыстыка асноўных метадаў навучання.

11. Кантроль на ўроках беларускай мовы. Асноўныя патрабаванні да кантролю. Віды, функцыі, метады кантролю.

12. Вуснае апытванне на ўроках беларускай мовы. Ацэнка вуснага адказу вучня.

13. Урок як асноўная форма навучання і выхавання ў сучаснай школе. Класіфікацыя ўрокаў мовы. Структурныя кампаненты ўрока мовы і іх функцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

14. Традыцыйныя тыпы ўрокаў беларускай мовы, іх мэты і структура (урок вывучэння новага матэрыялу; урок замацавання ведаў, уменняў і навыкаў; камбінаваны ўрок; урок паўтарэння і абагульнення вывучанага).

15. Нетрадыцыйныя формы правядзення ўрока беларускай мовы ў сучаснай школе. Мэтазгоднасць выкарыстання нетрадыцыйных урокаў у школе. Праблема класіфікацыі нетрадыцыйных урокаў. Методыка правядзення нетрадыцыйных урокаў (урок-лекцыя, урок-семінар, урок-залік і інш.).

16. Умовы эфектыўнага правядзення ўрока беларускай мовы. Аналіз урока беларускай мовы.

17. Фарміраванне ў вучняў паняцця пра тэкст, яго асноўныя прыметы.

18. Пераказ як від работы па развіцці звязнага маўлення вучняў. Метадычная мэтазгоднасць выкарыстання пераказу на ўроках роднай мовы. Класіфікацыя пераказаў. Методыка правядзення падрабязнага пераказу (навучальнага і кантрольнага).

19. Сціслы пераказ, методыка яго правядзення.

20. Выбарачны пераказ, методыка яго правядзення.

21. Сачыненне як від работы па развіцці звязнага маўлення вучняў. Класіфікацыя сачыненняў. Спосабы падрыхтоўкі да сачыненняў.

22. Методыка правядзення сачыненняў розных відаў.

23. Ацэнка камунікатыўных уменняў і навыкаў вучняў. Класіфікацыя, улік, прыёмы выпраўлення памылак.

24. Пераклад як від навучальных практыкаванняў па развіцці маўлення вучняў. Метадычная мэтазгоднасць выкарыстання перакладу на ўроках беларускай мовы. Тыпалогія перакладаў. Прыёмы перакладу. Методыка правядзення перакладу.

25. Методыка навучання арфаграфіі. Значэнне, задачы, этапы навучання арфаграфіі ў школе. Умовы і асаблівасці фарміравання арфаграфічных уменняў і навыкаў. Прынцыпы методыкі арфаграфіі.

26. Паняцце аб арфаграме. Методыка азнаямлення школьнікаў з арфаграмай і арфаграфічным правілам.

27. Спецыяльныя арфаграфічныя практыкаванні, методыка іх правядзення (спісванне, папераджальны, тлумачальны і каменціраваны дыктанты, дыктант “Правяраю сябе”).

28. Спецыяльныя арфаграфічныя практыкаванні, методыка іх правядзення (выбарачны, слоўнікавы, камбінаваны дыктанты, пісьмо па памяці). Кантрольны дыктант, яго віды. Методыка правядзення кантрольнага дыктанта.

29. Неспецыяльныя арфаграфічныя практыкаванні, методыка іх правядзення (вольны дыктант, творчы дыктант і інш.). Арганізацыя працы па арфаграфіі пры вывучэнні неарфаграфічных тэм у 5–7 класах. Праца па арфаграфіі ў 8–9 і 10–11 класах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

30. Ацэнка арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці вучняў. Класіфікацыя, улік, прыёмы выпраўлення памылак.

31. Методыка работы над памылкамі на ўроках беларускай мовы.

32. Методыка вывучэння фанетыкі. Змест, задачы, прынцыпы, метады і прыёмы вывучэння фанетыкі. Практыкаванні на фарміраванне фанетычных уменняў і навыкаў. Вымаўленчыя памылкі, іх прычыны.

33. Методыка вывучэння лексікі і фразеалогіі. Змест, задачы, прынцыпы, метады і прыёмы вывучэння лексікі і фразеалогіі. Практыкаванні на фарміраванне лексічных і фразеалагічных уменняў і навыкаў.

34. Методыка вывучэння словаўтварэння. Змест, задачы, прынцыпы, метады і прыёмы вывучэння будовы слова, словаўтварэння. Практыкаванні на фарміраванне словаўтваральных уменняў і навыкаў.

35. Методыка вывучэння марфалогіі. Змест, задачы, прынцыпы, метады і прыёмы вывучэння марфалогіі. Практыкаванні на фарміраванне вучэбна-моўных уменняў і навыкаў пры вывучэнні часцін мовы.

36. Методыка вывучэння сінтаксісу. Змест, задачы, прынцыпы, метады і прыёмы вывучэння сінтаксісу. Практыкаванні на фарміраванне сінтаксічных уменняў і навыкаў.

37. Методыка вывучэння пунктуацыі. Мэты навучання пунктуацыі і яе месца ў школьным курсе беларускай мовы. Пунктуацыйныя ўменні. Прынцыпы методыкі пунктуацыі.

38. Методыка вывучэння пунктаграмы, пунктуацыйнага правіла. Практыкаванні на навучанне пунктуацыі.

39. Вывучэнне стылістыкі ў школе. Значэнне, задачы, асаблівасці вывучэння стылістыкі. Арганізацыя працы па стылістыцы пры вывучэнні розных раздзелаў школьнага курса беларускай мовы. Стылістычныя ўменні. Практыкаванні на фарміраванне стылістычных уменняў і навыкаў.

40. Методыка азнаямлення вучняў з функцыянальнымі стылямі маўлення.

41. Факультатыўныя заняткі па беларускай мове, іх мэты, арганізацыя, методыка правядзення.

42. Пазакласная праца па беларускай мове ў сучаснай школе. Значэнне, задачы, прынцыпы, формы пазакласнай працы па беларускай мове.

43. Моўны разбор у сярэдняй школе: віды, методыка правядзення.

44. Інструкцыя аб парадку фарміравання культуры вуснага і пісьмовага маўлення ў агульнаадукацыйных установах РБ. Колькасць і прызначэнне вучнёўскіх сшыткаў па беларускай мове, парадак іх афармлення і вядзення. Парадак праверкі навучальных, кантрольных, экзаменацыйных работ і работ над памылкамі.

## Літаратура

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Методыка выкладання беларускай мовы / Пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мн., 2007
2. Вучэбная праграма па беларускай мове для агульнаадукацыйных устаноў (апошняе выданне).
3. Падручнікі па беларускай мове для сярэдняй школы (апошнія выданні).
4. Нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў агульнаадукацыйных устаноў па вучэчбных прадметах. Беларускай мова. – Рэжым доступу: http://www.minedu.unibel.by/ru/main.aspx?guid=14421
5. Інструкцыя аб парадку фарміравання культуры вуснай і пісьмовай мовы ў агульнаадукацыйных установах РБ. – Рэжым доступу: http://www.minedu.unibel.by/ru/main.aspx?guid=1401

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

### АСНОЎНАЯ

*Варановіч, З. Б.* Методыка выкладання беларускай мовы / З. Б. Варановіч. – Мінск, 1995.

Методыка выкладання беларускай мовы / М. Г. Яленскі [і інш.]; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск, 2007.

*Яленскі, М. Г.* Методыка выкладання беларускай мовы: практыкум / М. Г. Яленскі, У. П. Саўко, Л. С. Васюковіч. – Мінск, 2006.

*Ляшчынская, В. А.* Методыка выкладання беларускай мовы / В. А. Ляшчынская, З. У. Шведава. – Мінск, 2007.

Яленскі, М. Г. Методыка выкладання беларускай мовы. Сучасная лінгвадыдактыка / М. Г. Яленскі. – Мінск, 2005.

*Протчанка, В. У.* Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове / В. У. Протчанка. – Мінск, 2001.

Вучэбныя праграмы і падручнікі па беларускай мове для агульнаадукацыйных устаноў (апошнія выданні).

### ДАДАТКОВАЯ

*Алгазина, Н. Н.* Формирование орфографических навыков/ Н. Н. Алгазина. – М., 1987.

*Архипова, Е. В.* Основы методики развития речи учащихся / Е. В. Архипова. – М., 2004.

*Баранов, М. Т.* Методика лексики и фразеологии в средней школе / М. Т. Баранов. – М., 1988.

*Блинов, Г. И.* Методика изучения пунктуации в школе / Г. И. Блинов. – М., 1990.

*Валочка, Г. М.* Тэарэтыка-метадычныя асновы развіцця звязнага маўлення вучняў на ўроках беларускай мовы: 5–10 класы / Г. М. Валочка. – Мінск, 2005.

*Васюковіч, Л. С.* Вучэбны тэкст у школьным падручніку па беларускай мове / Л. С. Васюковіч. – Мінск, 2005.

*Воителева, Т. М.* Теория и методика обучения русскому языку / Т. М. Воителева. – М., 2006.

*Выгонная, Л. Ц.* Фанетыка беларускай мовы ў школе / Л. Ц. Выгонная. – Мінск, 1995.

*Даніловіч, М. А.* Вывучэнне фразеалогіі на ўроках мовы / М. А. Даніловіч. – Мінск, 1991.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Жуковская, О. А.* Изучение словобразования в восьмилетней школе / О. А. Жуковская, Т. А. Шаповалова. – М., 1983.

*Зельманова, Л. М.* Кабинет русского языка в средней школе / Л. М. Зельманова. – М., 1981.

*Зельманова, Л. М.* Наглядность в преподавании русского языка / Л. М. Зельманова. – М., 1984.

*Ипполитова, Н. А.* Текст в системе обучения русскому языку в школе / Н. А. Ипполитова. – М., 1998.

*Капинос, В. И.* Развитие речи: теория и практика обучения. 5–7 классы / В. И. Капинос, Н. Н. Сергеева, М. С. Соловейчик. – М., 1991.

*Красней, В. П.* Грані слова: факультатыўны курс "Лексіка і фразеалогія беларускай мовы" / В. П. Красней. – Мінск, 1986.

*Лаўрэль, Я. М.* Вывучэнне марфалогіі ў школе / Я. М. Лаўрэль, Т. Р. Новікава, С. А. Язерская. – Мінск, 1991.

*Литвинко, Ф. М.* Методика изучения разделов школьного курса русского языка (функциональный подход). – Минск, 2001.

*Львов, М. Р.* Словарь-справочник по методике русского языка / М. Р. Львов. – М., 1999.

*Ляшчынская, В. А.* Методыка выкладання беларускай мовы: задачы і практыкаванні / В. А. Ляшчынская. – Мінск, 1998.

*Малажай, Г. М.* Пазакласная праца па беларускай мове / Г. М. Малажай, С. Р. Рачэўскі. – Мінск, 1990.

Методика преподавания русского языка в школе / М. Т. Баранов [и др.]; под ред. М. Т. Баранова. – М., 2000.

Методика развития речи на уроках русского языка / Под ред. Т. А. Ладыженской. – М., 1980.

*Морозова, И. Д.* Виды изложений и методика их проведения / И. Д. Морозова. – М., 1984.

*Панов, Б. Т.* Типы и структура уроков русского языка / Б. Т. Панов. – М., 1986.

*Паўлоўская, В. І.* Мова: цікава і займальна / В. І. Паўлоўская. – Мінск, 1989.

*Петровский, Г. Н.* Педагогические и образовательные технологии современной школы / Г. Н. Петровский. – Минск, 2003.

*Протчанка, В. У.* Вывучэнне сінтаксісу ў школе. Складаны сказ / В. У. Протчанка. – Мінск, 1989.

*Протчанка, В. У.* Вывучэнне сінтаксісу ў школе. Словазлучэнне. Просты сказ / В. У. Протчанка.– Мінск, 1984.

*Протчанка, В. У.* Шматаспектны аналіз пры вывучэнні сінтаксісу беларускай мовы / В. У. Протчанка. – Мнінск, 1987.

*Саўко, У. П.* Развіццё маўлення школьнікаў пры вывучэнні марфалогіі (назоўніка і прыметніка) / У. П. Саўко. – Мінск, 2000.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Селевко, Г. К.* Современные образовательные технологии / Г. К. Селевко. – М., 1998.

Теория и практика обучения русскому языку / Е. В. Архипова [и др.]; под ред. Р. Б. Сабаткоева. – М., 2005.

*Туркевіч, В. М.* Творчасці зярняты залатыя / В. М. Туркевіч. – Мінск, 1988.

*Яленскі, М. Г.* Развіццё вуснай мовы вучняў: 4–6 класы / М. Г. Яленскі. – Мінск, 1985.

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗІТОРЫЙ БГПУ